65. Лютер, М. О светской власти / М. Лютер // Избранные произведения / М. Лютер; сост.-ред. А.П. Андрюшкин; пер. и коммент. К.С. Комарова [и др.]. – М.-СПб.: Андреев и согласие, 1994. – С. 131-163.

66. Лягчылін А.А. Метадалагічны дыскурс філасофскай традыцыі на Беларусі / А.А. Лягчылін, І.М. Бабкоў // Ноумен: сб. науч. работ по философии и социальным наукам. Вып. 6 / ред. совет: А.И.Зеленков (пред.) [и др.]; редкол.: А.В.Рубанов (гл.ред.) [и др.]. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2006. – с.6-19.

67. Марзалюк, І. Наша «кіеўская» й «літоўская» спадчына / І.Марзалюк // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступу: 20.09.2007.

68. Мельникова, Е.А. К типологии предгосударственных и раннегосударственных образований в Северной и Северо-восточной Европе (постановка проблемы)/ Е.А.Мельникова //Древнейшие государства Восточной Европы. Материалы и исследования. 1992-1993. – М.: Наука, 1995. – 219с.

69. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. / М.П. Касьцюк [и др.]; АН Беларусі, Ін-т гісторыі. - Мн.: Беларусь, 1994. - Ч.1. – 527 с.

70. Нерсесянц, В.С. Философия права: учебник для вузов/ В.С. Нерсесянц. – М.: Изд-во НОРМА (Изд-ская группа НОРМА-ИНФРА М), 2000. – 652 с.

71. Нижник, Н.С. Регулирование брачно-семейных отношений на Руси в условиях язычества/ Н.С.Нижник// История государства и права. – 2003. - №2, - с.31-33.

72. Нікалаеў,М. Пачаткі кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага / М.Нікалаеў // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступу: 20.09.2007.

73. О концепции совершенствования законодательства Республики Беларусь: Указ Президента Респ. Беларусь, 10 апр. 2002 г., N 205 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. - №46. – 1/3636.

74. О концепции судебно-правовой реформы: Постановление Верховного Совета Республики Беларусь, 23 апреля 1992г. // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь, - 1992. - N 16. - ст. 270.

75. О национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь / Закон Республики Беларусь от 6 октября 1994 г. N 3277-XII // Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/webnpa/text_txt.asp?RN=V19403277. – Дата доступа: 25.08.2006.

76. О силе для ССРБ декретов и распоряжений РСФСР: Декрет Президиума ЦИК ССР Белоруссии, 21.01.1922г. // Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзен): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд. – Мн.: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – С. 230.

77. О товарных знаках и знаках обслуживания/ Закон Республики Беларусь от 5 февраля 1993 г. 2181-XII // Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/webnpa/text_txt.asp?RN=V19302181. – Дата доступа: 21.05.2005.

78. Об утверждении Основных направлений социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996-2000 годы: Указ Президента Республики Беларусь, 14 ноября 1996г. №464 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь". – 1996. - N 32. - ст. 829.

79. Об утверждении Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2001-2005 годы: Указ Президента Республики Беларусь, 8 августа 2001г., №427 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006.

80. Основные положения Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2006-2010 годы // Президент Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/press28530.html#doc . – Дата доступа: 25.09.2006.

81. Основы идеологии белорусского государства: учебное пособие для вузов / С.Н. Князева, С.В. Решетникова; под общ. ред. С.Н. Князева, С.В. Решетникова. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 491 с.

82. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 111с.

83. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.

84. Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.

85. Пазднякоў, В. Паўлаўская рэспубліка / В.Пазднякоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1999. - Т.5: М - Пуд. – с.438-439.

86. Пазднякоў, В. Сарматызм / В.Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Т.2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў, [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2006. - с. 552-553.

87. Полякова, Н.Л. XX век в социологических теориях общества / Н.Л. Полякова. – Москва: Логос, 2004. – 384 с.

88. Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў // Адраджэнне: гіст. альманах. Вып.1. / Склад. і навук. рэд. А.П.Грыцкевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – с.212-213.

89. Пугачев, А.Н. Общая теория права: учеб.-метод. комплекс для студ. юрид. спец. / сост. и общ. ред. А.Н. Пугачева. - Новополоцк: ПГУ, 2007. – 424 с.

90. Радаман, А. Сойм / А. Радаман // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2001. - Т.6. Кн.1: Пузыны – Усая. – с. 375-382.

91. Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: монография / Я.Г. Риер. - Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. – 154 с.

92. Розин, В.М. Генезіс права: методологический и культурологический анализ. – М.: NOTA BENE Медиа Трейд Компани, 2003. – 336с.

93. Розин, В.М. Становление права в культуре средних веков // Право и политика. – 2003. - №9. – с.126-136.

94. Рубинов, А. Еще раз об идеологии / А. Рубинов // Советская белоруссия. – 2006. – 28 июля. - №140. - С. 4-5.

95. Рудкоўскі, П. Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці. Пара зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці / П. Рудкоўскі // ARCHE Пачатак. - 2006. - №1-2. - С. 62-68.

96. Саверчанка, І. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі / І.Саверчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 67 с.

97. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагоддзя/ Г.Сагановіч. – Мінск, «Энцыклапедыкс», 2001. – 412с.

98. Сакалова, М. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / М.Сакалова. - [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://autary.iig.pl/sakalova/art_ruchi_liberalizm.htm. – Дата доступу: 26.09.2007.

99. Слінка, Т. Праблема беларускай ідэнтычнасці ў тэксце Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» / Т.Слінка. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://baj.ru/belkalehium/lekcyji/litaratura/slinka01.htm. – Дата доступу: 21.10.2007.

100. Социалистическое право // Всемирная история государства и права: энцикл. словарь/ под ред. А.В. Крутских. – М.: ИНФРА-М, 2001. – С. 322-324.

101. Союзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссией 1921 года // Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзен): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мн.: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003.–С. 228-229.

102. Статут Великого княжества Литовского 1529 года (Текст, перевод и словарь-комментарий) / Минск. АН БССР**;** под ред. К.И. Яблонского**. –** Минск: Изд-во Акад. Наук БССР, 1960. – 253 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vostlit.narod.ru/Texts/Dokumenty/Litva/XVI/1520-40/Statut1529/text1.htm . – Дата доступа: 11.07.2005.

103. Стучка, П.И. Избранные произведения по марксистско-ленинской теории права / П.И.Стучка; сост. Г.Я. Клява; Институт истории партии при ЦК КП Латвии - филиал Института Марксизма-Ленинизма при ЦК КПСС. - Рига : Латвийское гос. изд-во, 1964. -748 с.

104. Тесля, А.А. О парадигмах юриспруденции/ А.А.Тесля. - [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://civil-law.narod.ru/wissled/teslya/paradig1.html. – Дата доступа: 26.09.2006.

105. Тойнби, А.Дж. Постижение истории/ А.Дж. Тойнби; пер. с англ.; сост. А.П. Огурцов; вступ. ст. В.И. Уколовой; закл. ст. Е.Б. Рашковского. - М.: Прогресс, 1991. – 736 с.

106. Фроянов, И.Я. К истории зарождения Русского государства/ И.Я.Фроянов //Из истории Византии и византиноведения. Межвуз.сб./Под ред. Г.Л. Курбатова. – Л., 1991. - с.57-93.

107. Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь от 15 декабря 1998 г. №219-З // Ведомости Национального Собрания Республики Беларусь. – 1999. - №13-14.

108. Царьков, И.И. Историческая школа права Германии XIX века / И.И. Царьков // Право и политика. – 2000. - №1. – С. 126-134.

109. Чертков, А.Н. Древнерусская Федерация/ А.Н.Чертков //Журнал Российского права. – 2000. - №2, – с.162-173.

110. Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (1447-1996 гг.): монография / М.Ф.Чудаков. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 327с.

111. Шалькевіч, В. Невядомыя старонкі з жыцця Кастуся Каліноўскага / В.Шалькевіч // Сыны і пасынкі Беларусі / С.В.Барыс, С.В.Тарасаў, Г.А.Ланеўскі і інш.; Уклад. Барыс С.В. – Мн.: Полымя, 1996. – с.165-188.

112. Шаставец, У. Брэсцкая унія: перадгісторыя, падрыхтоўка і заключэнне / У.Шаставец // З гісторыі ўніяцтва на Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай царкоўнай уніі) / Інстытут гісторыі АН Беларусі; Пад рэд. М.В.Біча і П.А.Лойкі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – с.40-54.

113. Шмурло, Е.Ф. Курс русской истории. — [Т. 1]: Возникновение и образование Русского государства (862-1462): учеб. пособие для высш. и сред. спец. учеб. Заведений/ Е.Ф.Шмурло. - СПб: Алетейя, 1999. - 541 с.

114. Шпарага, О. Поиск идентичности в контексте пограничья: белорусская версия / О. Шпарага. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.belintellectuals.com/community.phd?id=48. – Дата доступа: 27.10.2005.

115. Шпенглер, О. Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории: в 2 т. / О. Шпенглер; пер. с нем. С.Э. Борич; науч. ред. О.Н. Шпарага. - Мн.: ООО «Попурри»:, 1999. - Т.2. Всемирно-исторические перспективы. – 720 с.

116. Юхо, Я. Наш нацыянальны герой / Я.Юхо // Сыны і пасынкі Беларусі / С.В.Барыс, С.В.Тарасаў, Г.А.Ланеўскі і інш.; Уклад. Барыс С.В. – Мн.: Полымя, 1996. – с.95-134.

117. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права беларусі: вучэб. дапам. у 2 ч. Ч.1/ Я.А.Юхо. - Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 352с.

118. Яскевич, Я.С. Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты: учеб.-метод. пособие / Я.С. Яскевич.- Мн.: РИВШ БГУ, 2003. – 360 с.

## ЗМЕСТ КУРСА

### ТЭМА І
### ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

Прадмет, задачы і метадалогія курса гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Праблемы вызначэння прадмета гісторыі прававой і палітычнай думкі Беларусі. Крыніцы па гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Перыядызацыя гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі курса, яе асаблівасці.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў па праблемах прадмета, метадалогіі і перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.*

### ТЭМА ІІ
### ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ Ў ІХ - ПАЧАТКУ ХІІІ СТ.

Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі ХІ - пачатку ХІІІ ст. Прыняцце хрысціянства. З'яўленне царкоўна-палітычнай ідэалогіі. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізму. Зараджэнне палітыка-прававой думкі на старажытнабеларускіх землях: грамадска-палітычныя погляды Ефрасінні Полацкай, Клімента Смаляціча, Кірылы Тураўскага.

Палітычныя ідэі старажытнарускіх летапісаў.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра ўмовы, у якіх складваліся першыя формы грамадска-палітычнай і прававой думкі ў славяна-балцкага насельніцтва раннесярэднявечных дзяржаў-княстваў на тэрыторыі Беларусі, аб уплыве палітыка-прававых вучэнняў, якія аформіліся ў Візантыі на палітычную і прававую думку нашых продкаў, сістэматызацыя і абагульненне ведаў па пытаннях станаўлення раннесярэднявечнай палітычнай і прававой думкі Беларусі.*

### ТЭМА ІІІ
### ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ХІV-ХV СТ.

Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі ў ХІV-ХV ст. Характар палітычнай і сацыяльнай сістэмы ў перыяд палітычна-тэрытарыяльнай кансалідацыі беларуска-літоўскіх земляў у Вялікім княстве Літоўскім.

Прынясце каталіцызму. Сутнасць ідэалогіі папства (папацэзарызму), асаблівасці яе ўплыву на землях Беларусі. Палітычныя ідэі сярэднявечных ерасяў у ВКЛ.

Рэлігійна-палітычныя супярэчнасці і іх адлюстраванне ў палітычнай і прававой думцы ( XIV-XV стст.). Праграма стварэння аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў ВКЛ і яе рэалізацыя. Царкоўна-палітычная дзейнасць і грамадска-палітычныя погляды Р.Цамблака. Палітыка-прававое значэнне рэлігійнай уніі хрысціянскай царквы для дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага XIV–XV стст.

Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў («Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.», «Хроніка Быхаўца»).

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра асаблівасці пабудовы феадальнай саслоўнай дзяржавы ў ВКЛ, успрымання заходнееўрапейскіх царкоўна-палітычных ідэяў, пра развіццё дзяржаўнай ідэалогіі ВКЛ, яе адлюстраванне ў беларуска-літоўскіх летапісах.*

## ТЭМА IV
## ПАЛІТЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ ПОГЛЯДЫ БЕЛАРУСКІХ ГУМАНІСТАЎ (Ф.СКАРЫНА, М.ГУСОЎСКІ, М.ЛІТВІН, Л.САПЕГА)

Перадумовы і асаблівасці фармавання палітычнай і прававой думкі эпохі Рэнесансу на Беларусі. Ідэі і прынцыпы Адраджэння. Спецыфічныя рысы рэнесансавай палітыка-прававой думкі ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім.

Палітычныя і прававыя погляды Ф.Скарыны. Ф.Скарына аб ідэальных дзяржаўна-прававых формах. Класіфікацыя права, прапанаваная Ф.Скарынай. Сэнс ідэі «агульнага дабра».

Палітычныя і прававыя погляды М.Гусоўскага. Яго ўяўленні аб «ідэальным уладары». М.Гусоўскі аб грамадска-палітычных праблемах у ВКЛ. Міжнародны праект М.Гусоўскага.

Палітычныя і прававыя погляды Міхалона Літвіна. Трактат «Аб норавах татар, літвінаў і маскавіцян», як крыніца вывучэння поглядаў М.Літвіна на грамадскі, палітычны і прававы лад ВКЛ. М.Літвін аб шляхах удасканалення судовага ладу і судовага працэсу.

Прававыя ідэі Льва Сапегі. Прадмовы да Статута ВКЛ 1588 г. як адлюстраванне палітыка-прававых поглядаў Л.Сапегі. Погляды Л.Сапегі на найлепшую форму кіравання, яго ўяўленні аб ролі і функцыях права. Абгрунтаванне Л.Сапегам прынцыпу рэлігійнай цярпімасці, як аднаго з галоўных прынцыпаў унутранай палітыкі шматканфесійнай дзяржавы, якой было Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы - фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра асаблівасці рэнесанснай ідэалогіі на тэрыторыі Беларусі, погляды выбітных дзеячаў Адраджэння на праблемы дзяржавы і права, іх прапановы па ўдасканаленню дзяржаўнага і грамадскага ладу ВКЛ.*

## ТЭМА V
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА ЭПОХІ РЭФАРМАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Палітычная і прававая думка пратэстантызму. Яе асаблівасці на беларускіх землях. Лютэранства, кальвінізм, антытрынітарызм – асноўныя напрамкі пратэстантызму ў ВКЛ у XVI-XVII стст.

Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютэранства. А.Кульва. Прычыны непапулярнасці лютэранства ў ВКЛ.

Асноўныя прычыны папулярнасці кальвінскіх ідэй. Дзяржаўныя і палітычныя погляды Мікалая Радзівіла Чорнага. Погляды Андрэя Волана на грамадскі лад, паходжанне і функцыі дзяржавы, формы палітычнага кіравання. Права і яго функцыі ў творах А. Волана. А.Волан аб «натуральных» правах. Суадносіны права і свабоды.

Раскол кальвінісцкага руху, з’яўленне антытрынітарызму ў ВКЛ. Два напрамкі антытрынітарызму. Палітычныя і прававыя погляды правага крыла аптытрынітарыяў. Палітычныя і прававыя погляды Сымона Буднага. Палемічны твор «Аб свецкай уладзе», гісторыя яго стварэння, асноўныя ідэі. С.Будны аб функцыях дзяржаўнай улады і метадах яе ўздзеяння на грамадзян. Палітычныя ідэі ў творчай спадчыне Васіля Цяпінскага.

Палітычныя і прававыя погляды радыкальнага крыла антытрынітарыяў (П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі і інш.). Сацыяльная база радыкальнай ідэалогіі. Адносіны да дзяржаўнай улады, прыватнай маёмасці, удзелу хрысціяніна ў войнах. Шляхі і сродкі барацьбы за сацыяльныя правы, роўнасць, справядлівасць, прапанаваныя сялянска-плебейскімі рэфарматарамі-рэвалюцыянерамі. Крыніцы вывучэння поглядаў радыкальнага крыла антытрынітарызму.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра ўплыў ідэй Рэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім на развіццё палітыка-прававой думкі, адрозненне іх зместу і ўплыву ад рэфармацыйных ідэй у Заходняй Еўропе, наступствах Рэфармацыі.*

## ТЭМА VI
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА ПЕРЫЯДУ КОНТРРЭФАРМАЦЫІ І БРЭСЦКАЙ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

Сутнасць контррэфармацыі. Асноўныя прычыны распаўсюджвання контррэфармацыйнай ідэалогіі ў Вялікім княстве Літоўскім. Езуіты ў Беларусі. Палітыка-прававыя погляды лідэраў Контррэфармацыі на Беларусі (П.Скарга). Пётр Скарга і абгрунтаванне ідэі царкоўнай уніі. Погляды П. Скаргі на палітычны лад, заканадаўства, суадносіны паміж свецкай і духоўнай уладамі. Сацыяльныя погляды П. Скаргі.

Праграма уніі паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. Палітыка-прававыя погляды прыхільнікаў і праціўнікаў Берасцейскай царкоўнай уніі (І.Пацей, К.Астрожскі). Іпацій Пацей як абаронца царкоўнай уніі. Ацэнка і аналіз Пацеем праграмы уніі, прадстаўленай К.Астрожскім у «Лісце да М. Рагозы». Асаблівасці праграмы Іпація Пацея, барацьба за яе ажыццяўленне.

Палітычныя і прававыя ідэі ў антыўніяцкай літаратуры (М.Сматрыцкі, А.Філіповіч). Вынікі рэлігійнай палемікі.

Юрыдычная адукацыя ў ВКЛ у XVII ст. Дзейнасць юрыдычнага факультэта ў Віленскай езуіцкай акадэміі. Палітычныя і прававыя погляды А.Алізароўскага, яго трактат «Аб палітычнай супольнасці людзей». Алізароўскі аб паходжанні, сутнасці і функцыях дзяржавы. Класіфікацыя права.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра грамадска-палітычную думку ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім у перыяд контррэфармацыі і рэлігійнага процістаяння, ролю прафесуры Віленскай езуіцкай Акадэміі ў пашырэнні прававых ідэй.*

## ТЭМА VII
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА ПЕРЫЯДУ КРЫЗІСУ ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКІХ АДНОСІН У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (СЯР. XVII-СЯР. XVIII СТСТ.)

Панаванне ідэалогія сарматызму. Абгрунтаванне палітычнага дамінавання шляхты, яе паходжанне, роўнасць, функцыі. Адносіны да альтэрнатыўных поглядаў у Рэчы Паспалітай.

Погляды К.Лышчынскага. Трактат «Аб неіснаванні бога», «Маніфест Бжоскі» – асноўныя крыніцы вывучэння поглядаў К.Лышчынскага. Атэізм К.Лышчынскага, яго ідэал грамадскага ладу.

Грамадска-палітычныя і прававыя погляды С.Полацкага. Ідэі мысліцеля аб ролі і функцыях манарха, прававой роўнасці людзей, справядлівым заканадаўстве і судзе.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра палітычную і прававую думку перыяду крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін у Рэчы Паспалітай, ідэі, якія перашкаджалі рэформам грамадскага і дзяржаўнага ладу, альтэрнатыўныя пануючым погляды на праблемы дзяржавы і права.*

## ТЭМА VIII
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ АСВЕТЫ

Галоўныя ідэі палітычнай і прававой думкі эпохі Асветы на Беларусі.

Праваабарончая думка ВКЛ. Палітычна-прававыя погляды Г.Каніскага, выкладзеныя у творах «Правы дысідэнтаў» і «Правы і свабоды дысідэнтаў хрысціянскага веравызнання Каралеўства Польскага і Вялікага княства і Літоўскага…».

Палітычныя і прававыя погляды прыхільнікаў рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Крытыка магнацкай алігархіі і феадальнай сістэмы права ў шляхецкай публіцыстыцы, навуковых і гістарычных трактатах: Я.Ябланоўскі «Што робіцца без усялякага сораму ў Польшчы, альбо тлумачэнне грахоў для народа нашага прывычных», К.Галоўка «Сеймуючая Еўропа», Матэуш Белазор «Вольны голас у абарону свабоды», С.Канарскі «Аб эфектыўным правядзенні нарадаў» і Volumina legum.

Сутнасць ідэалогіі фізіякратызму. Крытыка сацыяльна-палітычнага ладу і праграма рэфармавання грамадства. Прадстаўнікі фізіякратызму і асветнікі-рэфарматары ў ВКЛ (І.Страйноўскі, М.Карповіч, К.Багуслаўскі, Д.Пільхоўскі, А. Тызенгаўз, І. Храптовіч). Рэалізацыя ідэй фізіякратызму: П.Бжастоўскі і Паўлаўская рэспубліка.

Палітычныя і прававыя ідэі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Адлюстраванне прынцыпаў прававой дзяржавы ў Канстытуцыі 1791 г.

Палітычныя і прававыя ідэі лідэраў паўстання 1794 г. Творы Андрэя Тадэвуша Касцюшкі («Мемарыял аб Польшчы» (1793 г.), «Ці могуць палякі дамагчыся незалежнасці?», Паланецкі універсал 1794 г.) як крыніца вывучэння палітыка-прававых поглядаў рэвалюцыянера і мысліцеля.

Рэспубліканскія і дэмакратычныя ідэі Я.Ясінскага. Крытыка асноў феадальнага грамадства ў паэтычнай спадчыне Я.Ясінскага.

Ідэі утапічнага сацыялізму ў ВКЛ. Я.Яленскі – прадстаўнік радыкальнага утапізму ў грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі XVIII ст. Уяўленне аб ідэальным грамадстве, заснаваньм на сацыяльнай, палітычнай і прававой роўнасці ў творы «Дабравесць да Ізраіля Расійскага». «Сапраўднае тлумачэнне правоў чалавека» С.Зяновіча.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра палітычную і прававую думку у Рэчы Паспалітай у перыяд распаўсюджвання ідэй Асветніцтва і Вялікай французскай рэвалюцыі, сістэматызацыя і абагульненне ведаў пра эвалюцыю палітычнай і прававой думкі ў эпоху Асветніцтва.*

## ТЭМА IX
## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ПАЧ.-СЯР.XIX СТ.

Перадумовы фармавання і асноўныя тэмы грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў першай трэці XIX ст. Уздзеянне польскай і расійскай палітыка-прававой ідэалогіі на фарміраванне ўласна беларускай палітычнай і прававой думкі. Пытанні адраджэння дзяржаўнасці ВКЛ у грамадска-палітычнай думцы канца XVIII - пачатку XIX стст. (Міхаіл Клеафас Агінскі).

Лібералізм і асноўныя праблемы грамадска-палітычнага жыцця. Дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага універсітэта – ідэйнага цэнтра лібералізму. Ліберальныя ідэі братоў Яна і Анджэя Снядэцкіх, В.Страйноўскага.

Палітычныя погляды прадстаўнікоў кансерватызму. Ігнат Лабажэўскі. Палеміка паміж ліберaламі і кансерватарамі.

Палітычны рамантызм. Погляды І.М.Даніловіча. Палітычныя і прававыя погляды сяброў тайных студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта – філаматаў і філарэтаў.

Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі ў другой трэці XIX ст. Узмацненне кансерватыўнага напрамку ў палітычнай і прававой думцы пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Генрых Ржавускі, Ігнат Галавінскі, Казімір Буйніцкі.

Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак грамадска-палітычнай і прававой думкі Беларусі: Міхаіл Валовіч, Юльян Бакшанскі. Франц Савіч і арганізацыя «Дэмакратычнае таварыства». Браты Аляксандр і Франц Далеўскія і «Братні саюз літоўскай моладзі».

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра асноўныя ідэйныя цячэнні і напрамкі ў грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў* пач.-сяр.XIX ст.

## ТЭМА X
## ПАЛІТЫКА-ПРАВАВАЯ ДУМКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Палітыка-прававая думка напярэдадні студзеньскага паўстання (1856-1864 гг.). Вільна, Мінск, Віцебск – тры цэнтры інтэлектуальнага жыцця Беларусі ў 50 гг. XIX ст. Адраджэнне лібералізму ў канцы 50-х – пачатку 60-х гг. XIX ст. Гістарычная ліцвінская свядомасць як аснова палітычных поглядаў Адама Кіркора, Віктара Старжынскага.

Ідэалогія рэвалюцыйнага дэмакратызму ў 50-60-я гг. XIX ст. Іасафат Агрызка. Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі. Праграма дэмакратычных пераўтварэнняў грамадства Вінцэнта Канстанціна Каліноўскага. «Мужыцкая праўда» як крыніца вывучэння поглядаў К.Каліноўскага.

Палітычная і прававая думка у канцы XIX ст. Узмацненне кансерватыўных ідэй пасля падаўлення паўстання 1863 году. Ідэя «заходнерусізму» у палітычнай думцы Беларусі. Погляды М. Каяловіча і інш. Палітычныя погляды ідэолагаў заходнерусізму ў пачатку XX ст.. «Народная манархія» І.Саланевіча.

Палітычны радыкалізм. Палітычныя і прававыя ідэі рэвалюцыйных народнікаў. Распаўсюджванне марксізму ў Беларусі.

Ліберальна-буржуазны напрамак палітыка-прававой думкі Беларусі 80-90 гг. Ідэя палітычнага кампрамісу з самадзяржаўем. «Минский листок» – орган ліберальнага народніцтва. Нацыянальнае пытанне ў поглядах беларускіх лібералаў канца XIX ст.

Развіццё юрыдычнай думкі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Уладзімір Спасовіч.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра асноўныя ідэйныя цячэнні і напрамкі ў грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі ў складзе Расійскай імперыі, сістэматызацыя і абагульненне ведаў пра эвалюцыю палітычнай і прававой думкі ў другой палове XIX ст.*

## ТЭМА XI
## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ Ў КАНЦЫ XIX – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XX СТСТ.

Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў канцы XIX – пач. XX ст. Асаблівасці ўзнікнення беларускай нацыі. Палітычныя ідэі ў творчасці пачынальнікаў беларускага адраджэння - Францішка Багушэвіча, Адама Гурыновіча. Прадмовы Ф.Багушэвіча да «Дудкі беларускай» і «Смыка беларускага» як ідэйны падмурак беларускага руху.

Палітычныя і прававыя погляды ў праграмах беларускіх палітычных арганізацый канца XIX – пачатку XX стагоддзя (Гоман, Беларуская сацыялістычная грамада). Праграма БСГ.

Нацыянальна-асветніцкая і рэвалюцыйна-прапагандысцкая дзейнасць першых беларускамоўных газет: «Наша доля» і «Наша ніва». Уздзеянне мастацкай літаратуры пачатку XX ст. на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў (Янка Купала, Якуб Колас, Цётка, Максім Багдановіч, Зміцер Жылуновіч і інш.). Асноўныя палітычныя ідэі іх творчасці.

Абгрунтаванне права Беларусі на свабоднае дэмакратычнае развіццё ў творчай спадчыне ідэолагаў нацыянальнага адраджэння (Вацлаў Іваноўскі, Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі).

Канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці. Актывізацыя беларускага нацыянальнага руху ў напрамку распрацоўкі канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці з пачаткам першай сусветнай вайны. Тры цэнтры беларускага вызваленчага руху. Станаўленне нацыянальна-дзяржаўнай ідэі ў праграмных дакументах беларускіх нацыянальных арганізацый у Менску (БНК, ІДРБ, ЦВБР ВБР).

«Адвечным шляхам (Дасьледзіны беларускага сьветагляду)» Ігната Абдзіраловіча (Ігната Канчэўскага), аналіз асаблівасцяў гісторыі беларускага народа. Яго свядомасці. Ацэнка І.Абдзіраловічам палітычных партый рухаў.

Палітычныя і прававыя погляды Уладзіміра Самойлы (1878-1941).

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра асноўныя ідэйныя цячэнні і напрамкі ў грамадска-палітычнай і прававой думцы Беларусі перыяду нацыянальнага адраджэння канцу XIX – пач.XX ст., асаблівасці станаўлення нацыянальнай ідэі і беларускага адраджэння.*

## ТЭМА XII

## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Асноўныя тэндэнцыі развіцця палітыка-прававой думкі 20–30 гг. ХХ ст. Рэалізацыя ідэі дзяржаўнага суверэнітэту БССР у партыйна-дзяржаўнай практыцы Савецкай Беларусі. Зміцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Усевалад Ігнатоўскі і інш. Падыходы кіраўніцтва партыі бальшавікоў да адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання краіны.

Распрацоўка і рэалізацыя ідэалогіі беларусізацыі. Каранізацыя. Узбуйненне БССР. Ідэалагічнае абгрунтаванне адыходу ад палітыкі беларусізацыі і станаўленне таталітарнай сістэмы.

Фармаванне савецкага права. Падыход савецкай юрыдычнай навукі да разумення сутнасці савецкага права, функцыі і прынцыпы савецкага права.

Станаўленне беларускай юрыдычнай і гісторыка-прававой навукі (У.Пічэта, В.Дружчыц, Р.Парэчын, Л.Рудзіцкі, М.Грэдзінгер, Ф. Гаўзе і інш.).

Новыя тэндэнцыі ў грамадскай свядомасці беларускага народа, выкліканыя перамогай СССР у Вялікай Айчынай вайне. Барацьба з іншадумствам – аснова афіцыйнай пасляваеннай дзяржаўнай ідэалогіі. Падпольныя беларускія патрыятычныя арганізацыі, «стыхійная дэсталінізацыя» насельніцтва.

Асноўные тэндэнцыі ў ідэйнам жыцці пасляcталінскай эпохі – дэмакратычная і кансерватыўная. Хрушчоўская «адліга». Пашырэнне дагматызму, параднасці, славаслоўя ў тэарэтычнай думцы 70–80-х гг. Падаўленне іншадумства.

Развіццё юрыдычнай навукі ў Беларусі (1945-1980-я гады ХХ ст.). Даследаванні ў галінах дзяржаўнага і міжнароднага права (В.Дарогін, С.Віхараў, Ю.Броўка, В.Сярэбрэннікаў, Г.Байгараў). Аднаўленне даследавання праблем гісторыі дзяржавы і права Беларусі (С. Маргунскі, В.Круталевіч, І.Марціновіч, Я.Юхо, С.Сокал). Даследаванні ў галіне цывільнага і цывільна-працэсуальнага права (Ф.Гаўзе, А.Рамановіч, В.Чігір).

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра грамадска-палітычную і прававую думку Беларусі перыяду нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, фарміравання таталітарнай савецкай сістэмы, пасляваеннага перыяду, сістэматызацыя і абагульненне ведаў пра эвалюцыю палітычнай і прававой думкі ў 1919-1990 гг.*

## ТЭМА XIII
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Новыя палітыка-эканамічныя рэаліі канца 1980 - пачатку 1990-х гадоў і іх уздзеянне на палітычную і прававую думку Беларусі. Сутыкненне дэмакратычных і кансерватыўных тэндэнцый у грамадскай свядомасці насельніцтва, іх уплыў на фармаванне прававой сістэмы.

Канстытуцыйны працэс у Рэспубліцы Беларусь і яго адлюстраванне ў палітыка-прававой думцы краіны. Праблемы формы дзяржаўнага кіраўніцтва у прававой думцы. Праблема забеспячэння прынцыпу падзела ўладаў у прававой думцы.

Абмеркаванне пытанняў дзяржаўнай ідэалогіі ў палітычнай думцы.

Развіццё юрыдычнай навукі Рэспублікі Беларусь.

*Мэты і задачы вывучэння дадзенай тэмы – фарміраванне тэарэтычных ведаў і ўяўленняў пра сучасную грамадска-палітычную і прававую думку Рэспублікі Беларусь, асноўныя праблемы, якія актыўна абмяркоўваюцца пры ўдзеле палітыкаў і навукоўцаў, сістэматызацыя і абагульненне ведаў пра эвалюцыю палітычнай і прававой думкі Рэспублікі Беларусь.*

## АСНОЎНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ І ЛІТАРАТУРА

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lib.by/abdziralovic/. – Дата доступу: 21.03.2005.
2. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005. – 1015 с.
3. Асветнікі зямлі беларускай (X – пачатак XX ст.). Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.
4. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
5. Булгакаў, В. Гісторыя беларускага нацыяналізму / В.Булгакаў. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – 326 с.
6. Бяляцкі, А. Літаратура і нацыя / Алесь Бяляцкі. – Мн.: Арт Гейзер, 1991. – 104 с.
7. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
8. Вішнеўская, І. Андрэй Волан – вялікі беларускі мысліцель эпохі Адраджэння і Рэфармацыі / І.Вішнеўская // Юстыцыя Беларусі. – 2007. - №9. – с.70-71.
9. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.
10.Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206 с.
11.Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік для курсантаў 2-га курса вочнай формы навучання / Склад. А.А.Радаман, А.М.Сувалаў. – Мн.: Акадэмія МУС, 2007. – 61 с.
12.Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя / Уклад., прадм. і заўв. У.Казберука. – Мн.: Маст. літ., 2001. – 606 с.
13.Козел А.А. История философской мысли Беларуси (XII–XX вв.). Учебное пособие. Мн., 1998.
14.Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура: падручнік / А.А.Лойка. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 319 с.
15.Лушчыцкі І.Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX в. Мн., 1958.
16.Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л.Лыч, У.Навіцкі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.
17.Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.
18.Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. / М.П. Касьцюк [и др.]; АН Беларусі, Ін-т гісторыі. - Мн.: Беларусь, 1994 - 1995.

19.Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.
20.Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.
21.Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 111с.
22.Сакалова, М. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / М.Сакалова. - [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://autary.iig.pl/sakalova/art_ruchi_liberalizm.htm. – Дата доступу: 26.09.2007.
23.Саракавік І.А. Беларусазнаўства. Ч. 2. Мн., 2001.
24.Сокал С.Ф. Кароткі агляд гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі (лекцыйны матэрыял). Магілёў, 1999.
25.Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (1447-1996 гг.): монография / М.Ф.Чудаков. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 327с.
26.Чыгрынаў П.Г. Грамадская думка ў Беларусі: палітыка-гістарычны аспект (X – пачатак XX ст.): Вучэбны дапаможнік. Мн., 1996.
27.Шалькевіч В.Ф. Філасофская думка Беларусі. Мн., 1976.
28.Шыбека З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). Мн., 2003.
29.Юхо Я.А. Гісторыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі. Мн., 1999. Ч. 1.
30.Юхо И., Сокол С. История юридической науки Беларуси. Мн., 2000.
31.Dubel L. Historia doktryn politycznych i prawnych do końca XIX wieku. Wyd. 2. W., 2003.
32.Historia doktryn politycznych i prawnych do początku XX w.: materiały źródłowe. Lublin, 2003.
33.Justyński J. Historia doktryn polityczno-prawnych. Wyd. 2 popr. Toruń, 2000.
34.Olszewski H., Zmierczak M. Historia doktryn politycznych i prawnych. Wyd. 2 Poznań, 1994.
35.Sylwestrzak A. Historia doktryn politycznych i prawnych. Wyd. 4 zm. (dodr.). W., 2003.

# ЛЕКЦЫЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## ТЭМА 1.
## ПРАДМЕТ, ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ «ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫЧНАЙ І ПРАВАВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ»

### 1. Прадмет і задачы дысцыпліны

«Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі» вывучае кнігі. Кнігі і змешчаныя ў іх ідэі. Але гэта не проста кнігі і ідэі. Гэта кнігі і ідэі, што адлюстроўваюць сэнс палітычнага і прававога жыцця, ствараюць палітыка-прававое аблічча эпохі, даюць азначэнне накірункам развіцця дзяржавы і права.

Прадметам гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі з'яўляецца ўзнікненне і развіццё тэарэтычных палажэнняў аб дзяржаве і праве, заканадаўстве і палітыцы, выказаных нацыянальнымі мысліцелямі, грамадскімі, дзяржаўнымі і рэлігійнымі дзеячамі, паэтамі, пісьменнікамі, навукоўцамі, публіцыстамі ў той ці іншай форме. Дадзеная вучэбная дысцыпліна вывучае адначасова як палітыка-прававыя вучэнні, так і асобныя выказванні, не развітыя да узроўню самастойных і арыгінальных тэорый.

Палітыка-прававое вучэнне азначаецца як тэарэтычна афармленыя ў цэласную дактрыну погляды на дзяржаву, права, палітыку [9, с. 2]. Вучэнне складаецца з трох частак:

1. логіка-тэарэтычная філасофская або іншая (напрыклад, рэлігійная) аснова – метадалагічны элемент вучэння;
2. змест дактрыны, або выражаныя у выглядзе азначальна-катэгарыяльнага апарата рашэнні пытанняў аб паходжанні дзяржавы і права, сутнасці і заканамернасцях іх развіцця, аб форме, сацыяльным прызначэнні, функцыях і прынцыпах уладкавання дзяржавы, форме, прынцыпах і функцыях права, яго суадносінах з дзяржавай, асобай, грамадствам і інш.;
3. праграмныя палажэнні – ацэнкі існуючых дзяржавы і права, іх палітычных мэт і задач, прапановы па іх удасканаленні.

Логіка-тэарэтычная аснова палітыка-прававога вучэння цесна злучана з іншымі формамі грамадская свядомасці, з светапоглядам таго гістарычнага перыяду, калі яно створана. Так, вучэнні Сярэднявечча абапіраліся на рэлігійны светапогляд, а ў перыяд Новага часу іх падставай сталіся рацыяналізм, нацыяналізм і індывідуалізм.

Зместам палітыка-прававой дактрыны з'яўляецца яе азначальна-катэгарыяльны апарат, тэарэтычнае рашэнне агульных праблем тэорыі дзяржавы і права, завершаная сістэма поглядаў, заснаваных менавіта на вызначанай філасофскай дактрыне.

Да традыцыйнага шэрага пытанняў, вырашэнне якіх стварае змест палітыка-прававога вучэння, адносяцца пытанні паходжання дзяржавы і права, іх сувязі з грамадствам, з асобай, з адносінамі ўласнасці, формы дзяржавы і права і інш. У прадмет вывучэння гісторыі палітычнай і прававой

думкі ўключаны толькі вучэнні і думкі, змяшчаючыя толькі рашэнні агульных праблем тэорыі дзяржавы і права. Астатнія пытанні вывучаюцца ў межах гістарычнага блоку кожнай асобнай галіновай юрыдычнай дысцыпліны.

Да поглядаў мысліцеляў мінулага на рашэнні праблем галіновых юрыдычных навук гісторыя палітычнай і прававой думкі звяртаецца толькі тады, калі гэтыя рашэнні неразрыўна злучаны з агульнатэарэтычнай канцэпцыяй, з’яўляюцца формай яе выражэння.

Праграмныя палажэнні, (ацэнкі дзяржавы і права, мэт і задач палітычнай дзейнасці і барацьбы), уласцівы кожнай палітыка-прававой дактрыне, надаюць ёй сацыяльна важкі характар, ускладаюць адбітак на змест яе тэарэтычнай часткі і нярэдка прадвызначаюць выбар метадалагічнай асновы самой дактрыны. У праграмных палажэннях найбольш поўна і змястоўна выкладзены ідэалагічны характар вучэння, праз іх яно звязана з практыкай палітычнай і ідэалагічнай барацьбы. Яны непасрэдна выражаюць інтарэсы і ідэалы канкрэтных класаў, станаў, іншых сацыяльных груп, іх адносіны да дзяржавы і права.

У залежнасці ад суадносін у вучэнні праграмных палажэнняў і метадалагічнай і змястоўнай частак, «матэрыяльнай» і «фармальнай» частак, яны могуць падраздзяляцца на фармальныя і матэрыяльныя вучэнні [11, с. 8]. Фармальныя канцэпцыі прадстаўляюць сабой тэарэтычныя мадэлі, у рамках якіх усталёўваюцца фундаментальныя кампаненты і функцыянальныя сувязі між імі, прыналежныя кожнай дзяржаве і праву, незалежныя ад іх канкрэтнага гістарычнага віду і стану.

Фармальнае вучэнне можа набыць змястоўную або гістарычную спецыфікацыю, становячыся ў гэткім выпадку матэрыяльнай тэорыяй дзяржавы і права, напрыклад, «тэорыя станавых дзяржавы і права», «вучэнне аб сацыялістычных дзяржаве і праве» і г.д.

У той жа час гісторыя нацыянальнай, а не сусветнай палітычнай і прававой думкі не можа засноўвацца выключна на вучэннях. Справа ў тым, што завершаных тэарэтычных канцэпцый дзяржавы і права на нацыянальным узроўне можа быць няшмат. Аднак акрамя іх, а часам паралельна з імі ў грамадстве суіснуюць шматлікія фрагментарныя тэарэтычныя погляды на дзяржаву, права, палітыку, заканадаўства. Яны прыналежаць нацыянальным мысліцелям, дзяржаўным і грамадскім дзеячам, пісьменнікам, паэтам і інш., і выражаюцца ў форме шматлікіх выказванняў.

Палітычная і прававая думка – гэта рэакцыя той ці іншай часткі грамадства на сучасную ім палітыку, заканадаўства, судаводства і г.д. Думка ў большасці выпадкаў з’яляецца яшчэ толькі зародкам палітычнага або прававога вучэння. Яна выступае сродкам асэнсавання ўзнікнення дзяржавы, права, палітыкі, заканадаўства тады, калі яшчэ адсутнічаюць прафесійныя палітычныя і прававыя вучэнні. Часам яны існуюць адначасова, іх палажэнні могуць супрацьпастаўляцца.

Як палітычнае і прававое вучэнне, так і палітычная і прававая думка з’яўляюцца прадметам гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.

Палітычная і прававая думка заўсёды цесна звязана з сучаснай ёй палітычнай і прававой рэчаіснасцю. Кожная эпоха нашай гісторыі мела свае, уласцівыя толькі ёй палітычныя і прававыя ўстановы. Менавіта таму ў творах нацыянальных мысліцеляў, рэлігійных, грамадскіх і дзяржаўных дзеячоў, асветнікаў, пісьменнікаў і г.д. адлюстроўваліся розныя палітыка-прававыя праблемы, цесна звязаныя з асаблівасцямі мясцовых дзяржаўных установаў і прынцыпаў права. Менавіта таму, матэрыяльныя палітычныя і прававыя вучэнні, палітычная і прававая думка, апісваючая сучасную ім рэчаіснасць з'яўляюцца прыдатным інструментам для канцэптуалізацыі гістарычных этапаў развіцця дзяржавы і права, для разумення сутнасці іх гістарычнай трансфармацыі. Гісторыя дзяржавы і права, фактычна можа быць адлюстравана праз гісторыю паслядоўных зменаў палітычных і прававых вучэнняў і думак.

Гісторыя палітычнай і прававой думкі з'яўляецца школай альтэрнатыўнага мыслення, бо дае магчымасць суадносіць розныя тэорыі, накірункі палітычнай і прававой думкі з улікам плюралістычнасці дыскусій па праблемам станаўлення беларускай дзяржаўнасці і права, дзяржавы і права ў цэлым. Да таго ж, шмат актуальных праблемаў тэорыі дзяржавы і права ставіліся і абмяркоўваліся на розных этапах гісторыі народа. Здабыткі мінулых пакаленняў дазваляюць больш змястоўна зразумець іх сутнасць.

Вывучэнне палітычнай і прававой думкі Беларусі мае не толькі навукова-пазнавальнае, але і вялікае выхаваўчае значэнне. Яно фармуе ў будучых юрыстаў уяўленне аб высокім тэарэтычным узроўні нацыянальнага мыслення, яго цеснай сувязі з філасофскімі, грамадска-палітычнымі і прававымі традыцыямі Захаду і Усходу, што ў сваю чаргу садзейнічае развіццю і ўмацаванню патрыятызму і гонару за беларускую культуру.

Пры вывучэнні «Гісторыі палітычнай і прававой думкі» узнікае шэраг праблем. Так, значнай праблемай пры вызначэнні прадмета дысцыпліны з'яўляецца праблема вызначэння нацыянальнай прывязкі. Асаблівасць гісторыі Беларусі, з яе перманентнымі хістаннямі між цывілізацыйнымі цэнтрамі, згубай і аднаўленнем незалежнасці дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях, канчаткова заблыталі пытанне «нацыянальнага», «спадчыны». Нават у стабільна існуючых дзяржаўных грамадствах часам цяжка знаходзіць агульнае паміж культурай, філасофіяй, правам розных эпох. Ці роднасныя адзін аднаму салічны франк Хлодвіга, француз эпох Анры IV, Людовіка XIV, крывавы якабінец канца XVIII ст. і самаздаволены буржуа эпохі Напалеона?

Яшчэ большыя цяжкасці ўзнікаюць у дачыненні да свядомасці жыхароў Беларусі. Ці можна аднесці да традыцыі нацыянальнай філасофскай, палітычнай думкі творы крывічанкі Прадславы, літвіна М.Гусоўскага, русіна Ф.Скарыны, шматлікіх дзеячаў «нацыі польскай роду беларускага» XVIII стагоддзя, беларуса І.Абдзіраловіча, грамадзян Рэспублікі Беларусь М.Пастухова, Я.Юхо, В.Круталевіча і інш.? Становішча ўскладняецца і тым, што самі беларусы заўсёды адчувалі сваю раздвоенасць, памежнасць: «Над зімнымі хвалямі Дзьвіны я быў візантыйцам Юрым, а у Кракаве, куды мяне

пацягнула за эўрапейскаю ведай, - лацінікам Францішкам. А дапраўды, я ня быў ні Юрым, ні Францішкам, а быў вольным, незалежным духам, якога вы шукаеце, духам агульначалавечым толькі ў беларускай скуры» [1].

Сучасныя беларускія філосафы даюць тры адказа на пытанне аб граніцах нацыянальнага ў філасофскай думкі Беларусі, якія могуць выкарыстоўвацца і пра вызначэнні прадмета «Гісторыі палітычнай і прававой думкі». Першы, больш традыцыйны, адносіць да нацыянальнай філасофіі ўсе, што стваралася на тэрыторыі Беларусі або этнічнымі беларусамі і «мела станоўчае значэнне на фармаванне беларускай нацыянальнай культуры, у тым ліку і філасофскай» [6, с. 827-828]. Зразумела адкрытым застаецца пытанне як вызначаць станоўчы уплыў.

Другі падыход прапануе філосафы А.А.Лягчылін і І.М.Бабкоў. Усе традыцыі філасофскай думкі яны разглядаюць як лакальныя, як падаснову для будучых філасофскіх традыцый сучасных Беларусі, Польшчы, Літвы, Украіны. Усе традыцыі разумеюцца як цалкам самастойныя лакалізаваныя храналагічна, але аб'яднаныя геаграфічна – тэрыторыяй Памежжа, на якой зараз і існуюць адпаведныя дзяржавы і іх народы [10, с. 11].

Трэці падыход прэзентаваны тэкстам В.Акудовіча «Разбурыць Парыж»: усё мінулае – набор аскепкаў ад бессэнсоўных спробаў навязаць нейкія *ідэі* (Літвы, Крывіі, Беларусі) сапраўднаму *быццю* або *дыскурсу* Беларусі. Фактычна, чалавеку не абазнанаму ў постмадэрнізме, адразу напрошваецца вынік – ніякага сэнса ў самой пастаноўцы пытання аб «Гісторыі філасофскай думкі Беларусі» няма [2].

Метадалогію «Гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі» састаўляюць прынцып гістарызму і параўнальна-гістарычны метад.

## <u>2. Крыніцы па гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі</u>

Вывучэнне гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі ставіць перад студэнтамі не толькі задачу па атрыманню ведаў аб галоўных праблемах і тэмах палітычнай і прававой думкі Беларусі, асноўных прававых канцэпцыях, якія былі сфармуляваны нашымі папярэднікамі, але і па фармаванню навыкаў аналізу палітыка-прававых вучэнняў мінулых эпох, вылучэнню іх асаблівасцей. Студэнты павінны навучыцца крытычна і незалежна ацэньваць навуковыя і гістарычныя матэрыялы, фармуляваць сваю пазіцыю па вызначаных праблемах. Толькі сур'ёзнае вывучэнне першакрыніц дапамагае ў поўнай ступені дасягнуць гэтых мэтаў.

Першакрыніцы па гісторыі палітычнай і прававой думкі гэта не толькі палітычныя і прававыя трактаты кшталту прац А.Волана «Пра палітычную, альбо грамадзянскую свабоду», А.Алізароўскага «Аб палітычнай супольнасці людзей», але і шматлікія творы, у разнастайнай форме каторых утрымліваюцца фрагментарныя тэарэтычныя погляды на дзяржаву, права, палітыку, заканадаўства, якія былі выказаны нацыянальнымі мысліцелямі, дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі, паэтамі і інш. Да падобных першакрыніцаў можна аднесці:

- жыційную літаратуру (напрыклад, «Жыціе Ефрасінні Полацкай», «Жыціе Кірылы Тураўскага» інш.);
- летапісы («Аповесць мінулых гадоў», «Слова аб палку Ігаравым», «Хроніка Быхаўца» і інш.);
- творы рэлігійна-палемічнай літаратуры (творы І.Пацея «Унія, альбо выклад преднейших артикулов к зъедночению греков з костелом римским», М.Сматрыцкага «Трэнас, альбо лямант Усходняй царквы», «Верыфікацыя невінаватасці», А.Філіповіча «Фундамент бязуладдзя касьцёла рымскага»);
- прадмовы, альбо ўступныя артыкулы да перакладзеных і выдадзеных беларускімі культурнымі дзеячамі кніг («Прадмова» Ф.Скарыны да Бібліі, альбо «Прадмовы» да вершаваных зборнікаў Ф.Багушэвіча);
- філасофскія эсэ (І.Абдзіраловіч «Адвечным шляхам», У.Самойла «Гэтым пераможаш!..»)
- творы мастацкай літаратуры (творчая спадчына Я.Купалы, М.Багдановіча, Цеткі і інш.);
- розныя публіцыстычныя матэрыялы, змешчаныя на старонках газет, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі («Мужыцкая праўда», «Наша доля», «Наша Ніва»);
- эпісталярная спадчына (перапіска канцлера ВКЛ Л.Сапегі і біскупа Іязафата Кунцевіча, «Ліст да князя Канстанціна Астрожскага» І.Пацея);
- і г.д.

## 3. Перыядызацыя гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі

Для разумення своеасаблівасці гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі вялікае значэнне мае перыядызацыя. У яе аснову пакладзена сацыяльна-эканамічнае жыццё, культурнае развіццё грамадства, узровень кааперацыі і ментальнай злучанасці насельніцтва, з якімі палітычная і прававая думка цесна звязана.

Пры перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі трэба ўлічваць дзве акалічнасці. Па першае, асаблівасці культурнай падсістэмы, з якой праз свае метадалагічны і ідэалагічны элементы звязаны вучэнні і думкі, дазваляюць выдзеліць шэраг цывілізацый. Грамадствы, ствараючыя цывілізацыю, не прадстаўляюць сабой этнічную і дзяржаўную аднароднасць, наадварот, гэта сукупнасць дзяржаўнаафармленых грамадстваў. Цывілізацыю складае культурнае ядро – адно або некалькі найбольш сацыяльна і тэхналагічна паспяховых грамадстваў, што перадаюць свой варыянт успрыняцця і развіцця агульных культурных узораў і стэрэатыпаў грамадствам-субдамінантам. Апошнія з’яўляюцца рэцыпіентамі ўзораў грамадстваў-дамінантаў, але пры гэтым маюць выражаную цывілізацыйную прыналежнасць.

Узаемадзеянне грамадстваў прыводзіць ня толькі да знікнення адных ды з’яўлення іншых цывілізацый, але і да змянення суадносін грамадстваў-дамінантаў і субдамінантаў у межах адной цывілізацыі, абумоўленаму розным узроўнем мадэрнізацыі тэхналогій, рэсурсавай забяспечанасцю,

вайсковым і палітычным развіццём, геапалітыкай. Пад уздзеяннем розных фактараў грамадства могуць перайсці з сферы прыцяжэння аднаго культурнага ядра ў сферу дамінавання іншай цывілізацыі. Гэта можа вызваць часовае або пастаяннае прыпыненне гісторыі дзяржаўнасці дадзенага грамадства, перарыўнасць у развіцці яго дзяржаўнасці і права.

Да таго ж, навукоўцы выдзяляюць гэтак званыя грамадствы памежнай (маргінальнай) зоны, размешчаныя на памежжы двух ці болей цывілізацый [7; 8; 12; 15]. Гэтыя грамадствы перыядычна падпадалі пад ўплыў розных культур, што прыводзіла, у тым ліку, да перыядычнай змены ідэалогіі, атрыманню і згубе дзяржаўнасці, перарыўнасці ў самастойным развіцці права.

Яскравым прыкладам падобных грамадстваў выступаюць усходнееўрапейскія народы, у тым ліку і беларускі, змешчаныя воляй лесу на памежжы заходнееўрапейскага і еўразійскага накірункаў еўрапейскай хрысціянскай цывілізацыі.

Па-другое, на развіццё палітычнай і прававой думкі ўплываюць сучасныя ім тыпы дзяржавы і права, абумоўленыя ўзроўнем экатэхналагічнага і сацыяльнага падпрастранстваў грамадства.

Такім чынам, толькі сумяшчэнне культурнага і сацыяльна-эканамічнага крытэраў дапаможа дакладна правесці перыядызацыю гісторыі палітычнай і прававой думкі, растлумачыць умовы і прычыны ўзнікнення тых ці іншых канцэпцый ці меркаванняў. У дадзеным выпадку сацыяльныя і экатэхналагічныя ўмовы будуць вызначаць этапы гісторыі палітычнай і прававой думкі, а культурныя – перыяды ў межах этапаў.

Абапіраючыся на выкладзеныя разважанні, трэба падкрэсліць, што Памежнасць Беларусі сталася прычынай трансліравання праз яе тэрыторыю розных светапоглядных канцэптаў, філасофскіх, палітыка-прававых тэкстаў. З’яўленне кожнай новай ідэалагічнай парадыгмы было вынікам чарговай змены геапалітычных інтарэсаў эліт дзяржавы, ў межы каторай на той момант уваходзілі беларускія землі. Новыя геапалітычныя змены прыводзілі да распаўсюджвання на прасторы Беларусі культурных, палітычных і філасофскіх стэрэатыпаў, характэрных для дамінуючага над Беларуссю цывілізацыйнага цэнтра.

Прыйшоўшыя ідэі пашыраліся пераважна сярод палітычнай эліты грамадства, яны крайне марудна распаўсюджваліся зверху ў ніз па сацыяльных структурах беларускага грамадства. Эліты змянялі веравызнанне, перабудоўвалі дзяржаўныя структуры. Аднак калектыўны светапогляд народа з-за перманентнасці кардынальных пераўтварэнняў, ніколі не паспяваў за элітарным. У сферы палітыкі і права гэта наогул вылілася ў характэрную для беларускага народа палітычную апатыю і прававы нігілізм.

З-за аб’ектыўнай неабходнасці лавіравання паміж цывілізацыйнымі цэнтрамі, філасофская, культурная і палітычная прастора засмечвалася ўсё новымі і новымі аскепкамі ідэй. Пры гэтым трэба згадзіцца з І.Бабковым, калі ён кажа пра перэферыйнасць філасофіі Беларусі, бо айчынныя філосафы, а

разам з імі і палітыкі і юрысты, не проста ўспрымалі замежныя канструкты. Яны ўспрымалі тэмы, пытанні, прававыя мадэлі, але адказы на іх давалі нацыянальна афарбаваныя ўсімі тымі традыцыямі, што існавалі раней [10, с. 10]. Адсюль і хрысціянскі характар Адраджэння ў ВКЛ у XVI ст., і сінтэз Асветніцтва і феадалізма ў XVIII ст.

Змена геапалітычнай арыентацыі беларускіх зямель па рознаму ўплывала на характар развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі. Некаторыя з іх абумоўлівалі сабой разрывы, або кардынальныя змены ў духоўнай, палітычнай, прававой сферах грамадства, але магла быць і сітуацыя, калі ўспрымаемыя ідэі ўплаўляліся ў сукупнасць пануючых.

Да першых можна аднесці разрывы ў развіцці палітычных і прававых ідэй, якія адбыліся ў:

1. 1387 г. (умоўная дата кардынальнай пераарыентацыі ад старажытнаславянскай да заходнееўрапейскай палітычнай культуры);
2. XIX ст. (пераарыентацыя на расейскі філасофскі і палітычны дыскурс);
3. 1905 г. фармаванне палітычных ідэй беларускага адраджэння;
4. 1917 г. станаўленне савецкай палітычнай і прававой філасофіі;
5. 1990-я гг. пачатак фармавання сучаснай беларускай палітычнай і прававой думкі.

Да другіх адносяцца:

1. Хрышчэнне Русі, прыход філасофіі заснаванай на візантыйскай праваслаўнай культуры, яе сінтэз з элементамі традыцыйнай культуры.
2. Прыход Рэнесанснай ідэалогіі і яе сінтэз з элементамі палітычных і прававых ідэй феадалізму.
3. З'яўленне палітычных і прававых ідэй пратэстанцкага руху, іх функцыянаванне на прасторы насычанай ідэямі мінулых накірункаў.
4. З'яўленне ідэй Асветніцтва і іх узаемадзеянне з сармацкай (контрэфармацыйна-феадальнай) палітычнай і прававой думкай.

Абапіраючыся на выкладзеныя меркаванні, трэба адзначыць, што агульна прынятая перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права Беларусі, не можа быць у поўнае меры прыдатнай для перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Традыцыйная перыядызацыя прапануе выдзяленне шасці этапаў развіцця беларускай дзяржавы і права: «Старажытная гісторыя Беларусі», «Вялікае княства Літоўскае», «Рэч Паспалітая – канфедэратыўная дзяржава Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польшчы», «Беларусь у складзе Расейскай імперыі», «Савецкі перыяд беларуская дзяржаўнасці», «Абвяшчэнне і станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь».

Дадзеная перыядызацыя закранае толькі палітычныя аспекты гісторыі беларускай дзяржаўнасці, паслядоўнае развіццё дзяржаўных форм беларускага народа. Яна не ўлічвае асаблівасці дзяржавы і права, і адпавядаючай ім палітычнай і прававой думкі, прадвызначаных ўзроўнем развіцця грамадства.

Прадстаўляецца, што мэтазгодна выдзяляць 10 этапаў развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі.

**Першы этап** адпавядае развіццю на беларускіх землях грамадстваў з ранняй дзяржаўнасцю (IX – XIV вв.): - Полацкае княства, Вялікае княства Літоўскае да XIV в. На працягу існавання Кіеўскай Русі і пачаткаў Вялікага княства палітычная думка Беларусі развівалася пад уплывам візантыйскай палітыка-прававой культуры, яе сінтэзу з аскепкамі традыцыйнага паганскага светапогляду і ідэямі да дзяржаўнага ладу, і ставіла сваёй мэтай тэарэтычнае абгрунтаванне абсалютнай палітычнай улады, якой прыпісвалася боскае паходжанне. Мовай палітычнай думкі была царкоўнаславянская мова. Часткова гэтыя палітычныя і прававыя ідэі сустракаюцца ў беларуска-літоўскіх летапісах.

Асноўнымі прадстаўнікамі палітычнай думкі названага перыяду былі Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі, аўтары беларуска-літоўскіх летапісаў і іншыя.

**Другі этап** адпавядае станаўленню і развіццю феадальнага саслоўнага грамадства і сталай дзяржаўнасці на беларускіх землях. Фактычна, гэты перыяд працягнуўся з XIV па сярэдзіну XVIII ст.ст. Аднак, палітычная і прававая думка мае асаблівасць ня толькі адпавядаць існуючаму грамадскаму стану, але, часам і апярэджваць яго. Таму, у адрозненні ад гісторыі дзяржавы і права, у гісторыі палітычнай і прававой думкі гэты этап падраздзяляецца на больш дробныя. Перш за ўсе выдзяляецца перыяд XIV-XV ст., калі частка жыхароў ВКЛ (у канцы XIV ст.) прыняла каталіцтва. Пачынаецца знаёмства грамадства з заходнееўрапейскай палітычнай культурай, што паклала пачатак дэсакралізацыі свецкай улады, гэта значыць пазбаўленню боскіх атрыбутаў зямных носьбітаў, перш за ўсё тых, хто займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Палітычная думка паступова пачынае набываць свае адметныя рысы, спецыфічныя асаблівасці. Уплыў візантыйскай палітычнай культуры пачынае слабець, а заходнееўрапейскай узмацняцца, асабліва пасля таго, як частка шляхецкай моладзі з ВКЛ стала сістэматычна атрымліваць юрыдычную і іншую вышэйшую адукацыю ў заходнееўрапейскіх каталіцкіх універсітэтах. Мовай грамадска-палітычнай і прававой думкі таго часу становіцца старабеларуская мова. Уладныя структуры, грамадскія сувязі з дапамогай прававых нормаў пачынаюць радыкальна змяняцца, што выклікае супраціў грамадства, нават грамадзянскія войны.

Асноўнымі прадстаўнікамі палітычнай думкі названага перыяду сталі Вялікі князь Вітаўт, Р.Цамблак, аўтары агульнаграмадскіх прывілеяў, Судзебніка 1468 г. і інш.

**Трэці перыяд**: характарызуе палітычную і прававую думку эпохі Адраджэння (пачатак-сярэдз. XVI ст.). У гэты перыяд ажыццявілася ўкараненне на землях ВКЛ ідэй саслоўна-прадстаўнічай манархіі, значнага развіцця дасягнула сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё беларускіх гарадоў. У гэты перыяд усталяваліся пастаянныя шматбаковыя (у тым ліку і духоўныя) сувязі з краінамі Заходняй Еўропы, з'явіліся даволі шматлікія прыхільнікі ідэй гуманізму, у грамадскае жыццё ўвайшло кнігадрукаванне, высокага ўзроўню развіцця дасягнула нацыянальная мова.

У цэнтры ўвагі беларускіх палітычных мысліцеляў таго часу, як і ў

творах прадстаўнікоў заходнееўрапейскай палітычнай думкі, знаходзяцца пытанні роўнасці людзей перад законам, правоў і свабодаў асобы, рэлігійнай талерантнасці і палітычнага плюралізму, свабоднага і незалежнага нацыянальнага развіцця, неабходнасці нацыянальнага самавызначэння, шанавання ўласных нацыянальных духоўных каштоўнасцей як асновы захавання самастойнасці этнаса і дзяржавы.

Галоўнымі прадстаўнікамі думкі эпохі Адраджэння ў Беларусі былі Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Міхалон Літвін, Леў Сапега і іншыя.

**Чацверты перыяд** адпавядае распаўсюджванню на землях Беларусі ідэй Рэфармацыі. З сярэдзіны XV–XVI ст.ст. у Еўропе мела месца Пратэстанцкая рэвалюцыя, закрануўшая асновы светапогляду той эпохі, выклікаўшая сутнасныя змяненні ў праве, адпавядаўшыя змяненням у эканамічнай падструктуры грамадства. У галіне права Адраджэнне і Рэфармацыя вылучылі наступныя ідэі: прымат дзяржаўнага правапарадку над царкоўным, прыярытэт права і законаў, гарантый і правоў асобы на жыццё і ўласнасць, свяшчэнны характар і непарушнасць дамоў і маёмасных правоў. У Заходняй і Цэнтральнай Еўропе пратэстантызм выклікаў рэвалюцыю ў грамадскім светапоглядзе, і яго ідэі замацаваліся у выніку працяглых войнаў і сацыяльных перабудоў. Спачатку гэта выявілася ў распаўсюджванне лютэранства ў XVI ст., забяспечыўшага пераразмеркаванне юрысдыкцыі і ўлады на карысць дзяржавы ў асобе абсалютнага манарха і афармленне яго як вярхоўнага свецкага законатворцы. В XVII ст. атрымаў распаўсюджанне кальвінізм, які сваімі ідэямі аб здольнасці ўсіх хрысціян, а ня толькі ўрадоўцаў да выпраўлення свету і прыярытэце мясцовай грамады, узначаленай выбарным святаром і старэйшынамі, над любымі палітычнымі ўладамі, заклаў фундамент англійскага і амерыканскага заканадаўства аб грамадзянскіх правах і свабодах.

Прававыя і грамадскія ідэі пратэстантызму ўспрынялі ўсе дзяржавы Еўропы, у тым ліку і адрынуўшыя яго рэлігійную дактрыну.

У Вялікае княства Літоўскае ідэі рэфармацыі пачалі пранікаць з XV ст., калі Вітаўт падтрымліваў міжнародныя сувязі з гусітамі. У XVI ст. на Беларусі атрымалі распаўсюд ідэі розных накірункаў пратэстантызму: лютэранства (А.Кульва), кальвінізму (Мікалай Радзівіл Чорны, А.Валовіч, А.Волан), арыянства (Ян Кішка, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, П.Гезка, М.Чаховіц, Л. Крышкоўскі).

Аднак спазненне прыходу феадальных адносін, неразвітасць гарадоў і буржуазных адносін не дазволілі гуманістычна-рэфармацыцыйным ідэям правесці пераварот у сацыяльнай структуры грамадства. Яны засвойваліся кампрамісна, узгадняліся з феадальнымі сярэднявечнымі ўяўленнямі аб дзяржаве, грамадстве і праве.

**Пяты перыяд:** Палітычная і прававая думка перыяду Контррэфармацыі і крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (XVII - сярэдзіна XVIII ст.). На першым этапе рэалізацыі Контррэфармацыйных ідэй асноўнае месца ў палітычнай думцы пачынае займаць рэлігійна-палітычная палеміка паміж прадстаўнікамі розных этнаканфесійных групаў Рэчы Паспалітай, у першую

чаргу паміж каталікамі і прыхільнікамі Уніі з аднаго боку і рэфарматамі і праваслаўнымі з другога. Асноўнымі прадстаўнікамі той эпохі з'яўляюцца П.Скарга, І.Пацей, М.Сматрыцкі, К.Астрожскі, А.Філіповіч.

На аснове перамогі Контррэфармацыйныга руха, які замацаваў перавагу сярэднявечных палітычных плыняў, у XVII - сярэдзіне XVIII ст. у Рэчы Паспалітай сфармавалася палітычная парадыгма «еўрапейскай сарматыі». Нацыянальна-палітычныя ідэі ў гэты перыяд знаходзілі выяўленне на лацінскай, польскай і рускай мовах, паколькі беларуская на дзяржаўным і навуковым узроўне з канца XVII ст. амаль што не ўжывалася. Аднак менавіта ў гэты час склалася і дзейнічала даволі эфектыўная сістэма сярэдняй адукацыі, паўстаў першы ва Усходняй Еўропе універсітэт (1579), у складзе якога быў адкрыты юрыдычны факультэт (1644).

Аднак праціўнікі дзяржаўнай рэлігійна-грамадскай ідэалогіі цярпелі праслед, шмат хто з іх быў вымушаны з'ехаць за межы краіны і працаваць пры дварах іншаземных манархаў. Да асноўных прадстаўнікоў палітыка-прававой думкі дадзенага перыяду адносяць А.Алізароўскага, Сімяона Полацкага, Казіміра Лышчынскага, Афанасія Філіповіча і іншых.

**Шосты перыяд** звязваецца з развіццём палітычнай і прававой думкі Беларусі эпохі Асветніцтва (другая палова XVIII ст.), якая была адлюстраваннем тых сацыяльных змен, якія ў другой палове XVIII ст.. прывялі да сутнаснай змены ўсіх падсістэм грамадства. «Індывідуалізм, рацыяналізм, нацыяналізм - гэтае трыадзіны ідал дэмакратыі - знайшлі юрыдычнае выражэнне ва ўзнясенні ролі заканадаўчага органа і наступным скарачэнні законатворчай ролі судовых органаў; у вызваленні дзеянняў індывіда ад кантролю грамадства, асабліва ў эканамічнай сферы; у патрабаванні кадыфікацыі крымінальнага і грамадзянскага права; у спробе зрабіць прадказальнымі прававыя наступствы індывідуальных дзеянняў (у эканамічнай сферы)» [3, с. 46-47].

Стабілізацыя міжнародных сувязяў у сярэдзіне XVIII ст. паскорыла эканамічнае адраджэнне дзяржавы, спрыяла развіццю капіталістычных адносін. У духоўнай сферы ім адпавядала і спрыяла ідэалогія Асветніцтва. Па словах вядомага юрыста XIX ст. У.Спасовіча, папулярная філасофія французскіх энцыклапедыстаў дапамагла грамадству Рэчы паспалітай «паглядзець на свой побыт крытычна і сфармуляваць свае смутныя імкненні да лепшага парадку рэчаў» [4, с. 86]. У рознай ступені ў творчасці І.Страйноўскага, С.Канарскага, К.Нарбута, І.Храптовіча, А.Тызенгўуза, П. Бжастоўскага, Т.Касцюшкі, Я.Ясінскага і інш. змяшчаецца крытыка саслоўных парадкаў «шляхецкай анархіі», бяспраўя значнай часткі насельніцтва, юрыдычнай непісьменнасці службоўцаў і суддзяў, і прапановы па рэфармаванні дзяржавы на прынцыпах рацыянальнасці, усялякай адукацыі жыхароў, пераўтварэнні правапарадку ў адпаведнасці з ідэямі натуральнага права, замацаванні натуральных правоў і свабодаў. Абапіраючыся на іх ідэі, ажыццяўляліся рэформы Рэчы паспалітай сярэдзіны - канца XVIII стагоддзі.

**Сёмы перыяд** развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі ўключае XIX ст. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі апынуліся ў

складзе Расійскай імперыі. Палітычная і прававая думка гэтай пары адлюстроўвала тыя крызісныя палітычныя, сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываліся ў Расіі ў XIX ст. На яе развіццё ўплывала як расійская, так і польская палітыка-прававая думка, распаўсюджваліся агульнаеўрапейскія ідэалогіі: кансерватызму, лібералізму і сацыялізму. Разам з тым, з'яўляюцца і ўласныя праблемы, якія фармуюць нацыянальныя асаблівасці палітычнага жыцця: перш за ўсе нацыянальна-культурнага, а пазней і нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту, якія шырока абмяркоўваюцца прадстаўнікамі розных напрамкаў палітычнай і прававой думкі Беларусі. Ліберальны напрамак быў прадстаўлены выкладчыкамі Віленскага ўніверсітэта: братамі Я. і А.Снядэцкімі, М.Баброўскім, І.Даніловічам, а таксама такімі беларускімі пісьменнікамі-рамантыкамі як Ян Чачот, Я.Баршчэўскі, А.Міцкевіч, В.Дунін-Марцынкевіч, археолагам і краязнаўцам А.Кіркорам. Сярод прадстаўнікоў кансерватыўнага напрамку значнае месца займалі К.Буйніцкі, М.Каяловіч. Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак палітычнай і прававой думкі Беларусі XIX ст. прадстаўляюць Ф.Савіч, К.Каліноўскі, Ф.Багушэвіч [4, с. 8].

**Восьмы перыяд** уключае палітычную і прававую думку беларускага адраджэння канца XIX – пач.XX стст. З канца XIX ст. у асяродку студэнцкай моладзі, інтэлігенцыі ствараюцца шматлікія і разнастайныя палітычныя групоўкі. У рознай ступені яны ўсе ставілі пытанне барацьбы за нацыянальнае самавызначэнне. Найбольш вядомымі з іх з'яўляюцца «Гоман», Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), рэдакцыі газет «Наша доля», «Наша ніва». Крыніцамі вывучэння іх палітычных і прававых поглядаў з'яўляюцца праграмныя дакументы арганізацый і партый, публікацыі легальных і нелегальных газет і часопісаў, публіцыстычная і навуковая творчасць відных прадстаўнікоў нацыянальнага руху: братоў Івана і Антона Луцкевічаў, В.Ластоўскага, Я.Лесіка, Я.Варонкі, А.Цвікевіча, а таксама творы і публіцыстыка такіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў пачатку XX ст., як Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, Э.Пашкевіч, З.Жылуновіч, А.Гарун і інш.

**Дзевяты перыяд** ахоплівае палітычную і прававую думку савецкай Беларусі (1919-1991 гг.). Пачатак XX стагоддзі апынулася звязаным з радыкальнай трансфармацыяй фундаментальных падстаў сацыяльнага парадку. Бурны рост новых тэхналогій, індустрыялізацыя, сусветныя эканамічныя крызісы 1870-1913 гг., пераход да манаполіі як новай форме сацыяльных і эканамічных адносін, трансфармацыя адносін уласнасці, імперыялізм, якія суправаджаліся распаўсюджваннем нацыяналістычных і сацыялістычных ідэй, што адмаўлялі індывідуалізм, прывялі да трансфармацыі ўсіх падсістэмаў грамадства. Адбылося змену сутнасці права з-за мадыфікацыі паданняў аб справядлівасці як яго асновы. Калі на папярэднім этапе яна асацыяваліся з грамадскай думкай, розумам і правамі чалавека, то зараз - з калектывізмам, планавай эканомікай і сацыяльнай роўнасцю [3, с. 37].

Трансфармацыя закранула ўсе палітычныя і прававыя сістэмы, але ў найболей радыкальнай форме яна выявілася ў перыяд Рэвалюцыі 1917 гады ў

Расійскай імперыі. Падчас апошняй адбылося адраджэнне беларускай дзяржаўнасці. Абедзве мадэлі палітыка-прававога будаўніцтва - савецкая ўлада бальшавікоў і Беларуская Народная Рэспубліка (далей БНР) - развіваліся ў рамках трансфармацыйных ідэй і ў сваіх статутных дакументах (Устаўныя граматы БНР і Маніфест аб незалежнасці ССРБ ад 1 студзеня 1919г., Канстытуцыя ССРБ 1919г.) замацоўвалі прынцыпы сацыялістычнага грамадства [13, с. 197-199].

БНР з-за неспрыяльнага вонкавага- і ўнутрапалітычнага становішча не змагла стаць дзяржавай у юрыдычным сэнсе [5, с. 178-179]. Мадэль дзяржаўнасці і правы, заснаваная на кампрамісе буржуазных і сацыялістычных ідэй была адпрэчаная гісторыяй і ўзяла верх мадэль радыкальнага пераўтварэння грамадства ў рамках БССР.

У межах савецкай дзяржаўнасці ў перыяд з 1919 па 1929 гг. разам з сацыялістычнай арыентацыяй у палітычнай і прававой думцы ў БССР працягваюць развівацца ідэі нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, фарміравання беларускай нацыянальнай свядомасці, пошукаў шляхоў нацыянальна-культурнага адраджэння. Да грамадскіх дзеячаў, навукоўцаў, якія працавалі на ніве беларускага адраджэння можна аднесці А.Чарвякова, І.Канчэўскага (Абдзіраловіча), У.Самойлу, А.Смоліча, Л.Акіншэвіча, Б.Тарашкевіча і многіх іншых.

З 1929 г. пачынае ўзмацняцца таталітарны рэжым, выціскаецца іншадумства, палітыка-прававая думка адпавядае сталінскай версіі сацыялістычнай дзяржавы і права.

У пасляваенны перыяд некалькі пашыраецца магчымасць праватворчай дзейнасці рэспублікі, што ў сваю чаргу садзейнічала развіццю юрыдычнай навукі ў БССР. З'яўляюцца новыя галіны юрыдычных ведаў – гісторыя дзяржавы і права Беларусі, судовая псіхалогія і інш. Прававая і палітычная думка найбольш поўнае развіццё атрымала ў навуковых працах такіх беларускіх даследчыкаў, як Я.Юхо, В.Круталевіча, І.Марціновіча, А.Дулова, Г.Глазырына, Р.Гаўзе, В.Чыгіра, Н.Маргунскага, С.Сокала, У.Кучынскага і інш. [4, с. 9].

**Да дзесятага перыяду** адносіцца развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі ў 90-я гады XX-пачатку XXI стст. Абвяшчэнне 27 ліпеня 1990 г. незалежнасці рэспублікі, будаўніцтва самастойнай беларускай дзяржавы выклікала новы ўздым у развіцці палітычнай і прававой думкі. Аб'ектамі навуковых і публіцыстычных дыскусій сталі пытанні дзяржаўнай незалежнасці рэспублікі, пабудовы ў Беларусі прававой сацыяльнай дэмакратычнай дзяржавы, судова-прававой рэформы, пытанні нацыянальнай гісторыі і нацыянальнай ідэалогіі, прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці ва ўмовах рынкавых адносін, правоў чалавека ў Беларусі і інш. Сярод шматлікіх прадстаўнікоў сучаснай палітычнай і прававой думкі можна назваць такіх навукоўцаў, як У.Оргіш, А.Майсеня, В.Фамін, М.Касцюк, А.Вішнеўскі, У.Кучынскі, В.Ціхіня, М.Пастухоў, А.Цікавенка, А.Абрамовіч, С.Драбязка, М.Гарбаток, Т.Доўнар, М.Сільчанка, В.Шалькевіч, С.Падокшын, І.Басецкі, Г.Васілевіч, У.Вітушка, Л.Лыч і інш. [4, с. 9-10].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lib.by/abdziralovic/. – Дата доступу: 21.03.2005.
2. Акудовіч В. Разбурыць Парыж: два няспраўджаныя эсэ / В. Акудовіч. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://knihi.com/frahmenty/9akudovich.htm. – Дата доступу: 21.12.2007.
3. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624 с.
4. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. установ/ І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
5. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дап. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мн.: Акад. МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319 с.
6. Гісторыя філасофіі: вучэб. дапам. для ВНУ / Ч.С. Кірвель [і інш.]; ГрДУ імя Я.Купалы; пад рэд. праф. Ч.С. Кірвеля. - Гр.: ГрДУ, 1997. – 917 с.
7. Гумилев, Л.Н. Этногенез и биосфера Земли / Л.Н. Гумилев / сост. Н.В. Гумилева. – М.: Танаис ДИ-ДИК, 1994. – 544 с.
8. Данилевский, Н.Я. Россия и Европа / Н.Я. Данилевский. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gumilevica.kulichki.net/DNY/dny05.htm. – Дата доступа: 11.05.2005.
9. История политических и правовых учений: учебник / О.Э. Лейст [и др.]; под ред. О.Э. Лейста. – М.: Изд-во Зерцало, 2000. – 688 с.
10. Лягчылін А.А. Метадалагічны дыскурс філасофскай традыцыі на Беларусі / А.А. Лягчылін, І.М. Бабкоў // Ноумен: сб. науч. работ по философии и социальным наукам. Вып. 6 / ред. совет: А.И.Зеленков (пред.) [и др.]; редкол.: А.В.Рубанов (гл.ред.) [и др.]. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2006. – с.6-19.
11. Полякова, Н.Л. XX век в социологических теориях общества / Н.Л. Полякова. – Москва: Логос, 2004. – 384 с.
12. Тойнби, А.Дж. Постижение истории/ А.Дж. Тойнби; пер. с англ.; сост. А.П. Огурцов; вступ. ст. В.И. Уколовой; закл. ст. Е.Б. Рашковского. - М.: Прогресс, 1991. – 736 с.
13. Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (1447-1996 гг.): монография / М.Ф. Чудаков. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 327 с.

14. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.

15. Шпенглер, О. Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории: в 2 т. / О. Шпенглер; пер. с нем. С.Э. Борич; науч. ред. О.Н. Шпарага. - Мн.: ООО «Попурри»:, 1999. - Т.2. Всемирно-исторические перспективы. – 720 с.

## ТЭМА 2.
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ Ў ІХ - ПАЧАТКУ ХІІІ СТ.

### 1. Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі ХІ - пачатку ХІІІ ст.

Працэсы развіцця грамадства, дзяржавы і права ў старажытных жыхароў Беларусі былі ідэнтычныя працэсам развіцця ўсіх усходнеславянскіх грамадстваў. Першааснову экатэхналагічнай падсістэмы старажытнаславянскага грамадства Ўсходняй Еўропы вызначыў клімат, які патрабаваў прыкладання большых высілкаў пад час аграрных працаў у карацейшыя цёплыя прамежкі часу чым у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе [7, с. 60; 16, с. 65]. Ён забяспечыў працяглае захаванне калектыўнай працы, моцных супольных сувязяў, павольную сацыяльную дыферэнцыяцыю ў старажытных усходніх славян.

Прыродныя ўмовы вызначылі і меншую шчыльнасць насельніцтва, што доўгі час дазваляла вырашаць зямельны голад праз засваенне новых земляў, а не інтэнсіфікаваць гаспадарчую дзейнасць [16, с. 67]. Калектыўная аграрная праца мела месца аж да XIII-XIV стагоддзяў, калі з’яўляюцца толькі няясныя звесткі аб з’яўленні алодаў [8, с. 105-107].

Перавага калектыўнай працы ў аграрнай сферы, супольная ўласнасць на зямлю не маглі не адбіцца на фармаванні сацыяльных парадкаў. На аснове супольнага спосабу гаспадарання да IX стагоддзю на Русі ўжо склалася даволі ўстойлівая сістэма публічнай улады, асноўным элементам якой выступалі інстытуты непасрэднай дэмакратыі і супольна-вечавое самакіраванне ў гарадах і сельскай мясцовасці [9, с. 104].

Толькі да VIII - пачатку IX стагоддзяў у ўсходніх славян склаліся перадумовы да пераходу ад стану ваеннай дэмакратыі да раннедзяржаўнага ладу [11, с. 126-127]. Прызванне варагаў і ўзнікненне гандлёвага шляху "з варaг у грэкі" выступіла «каталізатарам» паскарэнні маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі, палітычнага і эканамічнага аб’яднання, прылеглых да шляху земляў [14, с. 26-28]. У выніку адбывалася назапашванне багаццяў і ўлады ў руках тых вышэйшых пластоў грамадства, якія здзяйснялі кантроль над гандлем.

Знешні гандаль, выклікаючы сацыяльныя змены ў вышэйшых пластах ранняга грамадства, толькі ў малой ступені аказвае ўплыў на яго эканамічнае развіццё [14, с. 27], таму пабудова дзяржаўнасці ў усходніх славян будавалася на абшчыннай аснове. «Пры паўсюдным дамінаванні ў старэйшых валасных гарадах, прыгарадах і сельскай мясцовасці калектыўна-абшчыннай уласнасці ні аб якім панаванні, у тым ліку палітычным, каго-кольвечы, акрамя абшчыны і яе ўладных інстытутаў, нельга гаварыць ў прынцыпе» [9, с. 122]. Князь і акружаючая яго арыстакратыя (дружына, баярская рада), існаваўшыя нараўне з супольнымі органамі ўлады,

інстытуцыянальна «яшчэ не ператварыліся ў адмысловае саслоўе, адгароджанае ад радавых абшчыннікаў. Яны выступалі ў якасці лідэраў і кіраўнікоў, але ўлада яны пакуль атрымлівалі з рук народа» [18, с. 84].

Такім чынам, у старажытных усходнеславянскіх княствах у дамангольскі перыяд, а ў княствах на беларускіх землях і да XIV стагоддзя існаваў адмысловы дуалізм палітычнага ладу, які спалучаў цеснае ўзаемадзеянне і ўзаемасувязь манархічнага (у выглядзе запрошанага або спадчыннага князя) і дэмакратычнага (у выглядзе народных вечавых збораў старэйшых валасных гарадоў) элементаў. Дуалізм як прынцып дзяржаўнага права таго перыяду выяўляўся ў канцэнтрацыі ў руках князя аператыўнага кіравання «даручанай» яму тэрыторыяй і ў ажыццяўленні вечам агульнага кантролю за яго дзейнасцю, з умяшаннем у крайніх, выключных выпадках. Пры гэтым, у залежнасці ад змены геапалітычнай сітуацыі і іншых фактараў, у княствах у розныя перыяды маглі змяняцца суадносіны паміж уладай князя і веча.

Сама княжацкая ўлада разглядалася ў катэгорыях патрыярхальных сваяцкіх адносін. Пасля Рурыка «сіла асобных плямёнаў, якая раней персаніфікавалася у племянных князях, пераходзіла ў вачах насельніцтва, на звёўшы іх княжы род» [9, с. 98]. Пасля, у перыяд незалежнасці Полацкага княства падобныя адносіны пераносілася на Ізяслававічаў, а пасля стварэння Вялікага княства Літоўскага - на Гедзімінавічаў. Самі чальцы кіруючай дынастыі разглядалі дзяржаву як вотчыну і спадчыннае сямейнае валоданне.

У адпаведнасці з патрыманіяльнай канцэпцыяй сыны кіруючага князя валодалі сямейным правам панавання, якое рэалізоўвалася альбо праз падзел тэрыторыі княства на меншыя, надзелы, альбо праз непадзельнае валоданне братоў [17, с. 67; 19, с. 166-167]. Адзінства дзяржавы разглядалася ў рэчышчы спадчыннай уласнасці ўсіх братоў, якія выступалі пад кіраўніцтвам аднаго з іх - вялікага князя, і які ў сілу свайго першародства валодаў вяршэнствам над астатнімі братамі і раздаваў ім надзелы ў выглядзе ўдзелаў, а як вялікі князь валадарыў над усімі князямі дынастычнага роду. Дамовы, якія складаліся паміж князямі, ўсталёўвалі адносіны паміж імі ў катэгорыях сямейнага права [2, с. 39]. Пры гэтым землі пераразмяркоўваліся пры частай змене вялікіх князёў, што запавольвала станаўленне феадальных адносін. Па меркаванні Ю.Бардаха, такія рысы дзяржаўнага права ВКЛ мелі месца і ў перыяд заключэння Крэўскай уніі ў 1385 г. [2, с. 37].

Ратацыі князёў, моцная ўлада абшчыны, адсутнасць аладзіяльных уладанняў запавольвала працэс асядання на зямлю і баяраў. Распачаты ў XII-XIII стагоддзях, ён быў перарваны мангольскай заваёвай. Толькі ў княствах, існаваўшых на беларускіх землях, надзяленне баяраў зямлёй атрымала працяг у рамках новай дзяржаўнасці - Вялікага княства Літоўскага. Дзякуючы гіпатэтычна вольнаму доступу да службы ў княжай дружыне, а, такім чынам, да баярства, яно не ўтварала ўнутрана замкнёнага сацыяльнага стану [20, с. 107]. І калі за службу баярыну даравалі землі, то надзел, які ён атрымоўваў, станавіўся яго асабістай уласнасцю і не абумоўліваў цвёрдых абавязкаў несці княжацкую службу. Баярын, ці з'яўляўся ён чальцом княжай рады або проста

нёс службу ў князя, быў у гэты перыяд не яго васалам [4, с. 202, 203], а хутчэй прыдворным [16 с. 73].

Пры гэтым аж да XIII-XIV стагоддзяў на землях ВКЛ адсутнічала буйная зямельная ўласнасць [16, с. 62]. Уласнасць князёў і баяраў абмяжоўвалася некалькімі сёламі (рэдка больш 10), населеных закупамі і халопамі. Багацце шляхты складалася не столькі з зямельнай уласнасці, колькі з рухомай маёмасці ў выглядзе ювелірных упрыгожванняў, дарагога посуду і зброі [12, с. 47].

З'яўленне дзяржавы і права ва ўсходніх славян паклалі пачатак палітычнай і прававой думцы.

Другім важным фактарам, які аказаў моцны ўплыў на ўмацаванне дзяржаўнасці і на змест палітычнай і прававой думкі ўсходніх славян, было прыняцце Кіеўскай Руссю хрысціянства. Менавіта дзякуючы хрысціянству пачалі распаўсюджвацца і ўмацоўвацца ў грамадскай свядомасці насельніцтва Кіеўскай Русі ўяўленні аб прыродзе дзяржаўнай улады, паходжанні і прызначэнні дзяржавы, палітычных дабротах хрысціянскага князя.

## 2. Прыняцце хрысціянства. З'яўленне царкоўна-палітычнай ідэалогіі

У X стагоддзі адбылася істотная змена ў культурнай падсістэме грамадства ўсходніх славян Хрышчэнне Русі. Аднак хрысціянізацыя ўсходніх славян не адбылася імгненна. Гэты працэс завяршыўся толькі ў сяр. XIII ст. Перш за ўсё, сучасныя даследнікі адзначаюць павярхоўны характар успрымання хрысціянства старажытнаславянскімі плямёнамі [16, с. 75], яго працяглае ўкараненне ад вышэйшых пластоў насельніцтва да ніжэйшых, адпаведна якому павольна змяняліся абрады і звычаі [15, с. 32]. Яно распаўсюджвалася па напрамках князь-дружына-горад-веска, і быццам напластоўвалася на папярэднюю культуру. У дадзеным выпадку неабходна памятаць і аб моцнай сацыяльнай інерцыі пры змене культурных каштоўнасцяў.

Па-другое, хрысціянства ўсходняга ўзору, як і хрысціянства заходняга ўзору да канца IX ст., што прыйшло да германцаў, не было заклапочана рэформай грамадскіх інстытутаў. «Яго пасланне людзям датычылася жыцця града нябеснага і падрыхтоўкі да гэтага жыцця» [3, с. 74]. Аднак хрысціянства заклала і патэнцыял да грамадскіх змен, мадыфікацый у разуменні ўлады і права. Так, адзіная хрысціянская вера пераадолела розніцу міжпляменных вераванняў. Вялікі князь стаў прадстаўніком універсальнага бога, чыя ўлада распасціралася на ўсе плямёны.

Хрысціянства ўзмацніла ролю князёў у вобласці правасуддзя, лічылася, што яны прызначаныя Госпадам быць суддзямі ў адмысловых выпадках. І самае галоўнае, пераход у хрысціянства дало штуршок запісу племянных звычаяў. Па-першае, хрысціянства прынесла пісьмо, а яно дазволіла фіксаваць звычаі, што палягчала перамовы па ўладжванні спрэчак і

умацоўвала ўзнікшую юрысдыкцыю ўладаў па пакаранні самых сур'ёзных злачынстваў. Па-другое, запіс звычаяў даваў магчымасць унесці ў іх некаторыя змены. Дадзеныя тэндэнцыі не вылучалі ўплыў хрысціянства на старажытнаславянскіх землях у параўнанні з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі.

Акрамя спрыяння развіццю дзяржаўнай улады і правы, хрысціянства прывяло да змен у шэрагу сфер грамадскага жыцця, выводзячы іх з-пад рэгуляванні звычаёвага права і княжацкіх загадаў. Перш за ўсё, прыняццё хрысціянства закранула шлюбна-сямейныя адносіны. Царкоўнымі канонамі былі строга сфармуляваныя правілы заключэння шлюбу з абавязковым вянчаннем у царкве, забаронена шматжонства, на спадчыну маглі прэтэндаваць толькі дзеці, народжаныя ў шлюбе [21, с. 92].

На мяжы X-XI стст. на аснове пацвярджальнай граматы Ўладзіміра Святаслававіча было ажыццёўлена размежаванне юрысдыкцыі грамадзянскай і царкоўнай улад і ўсталёўваліся прававыя нормы, якія знаходзіліся ў вядзенні апошняй [5, с. 187]. На старажытнаславянскіх землях пачынаюць распаўсюджвацца зборнікі царкоўнага права - Кормчыя кнігі. У пачатку свайго існавання з-за значнай розніцы ў сацыяльна-эканамічным развіцці паміж Візантыйскай імперыяй і Руссю яны не выступалі ў якасці дзеючых крыніц права, таму ў XII-XIII стст. ствараюцца іх адаптаваныя скарочаныя варыянты.

Хрысціянскія святары і манахі станавіліся дарадцамі пры князях, а так як Кіеўская метраполія была часткай Канстанцінопальскага патрыярхату і кіеўскія мітрапаліты прызначаліся і прысылаліся з Канстанцінопаля, то прысланыя грэкі альбо балгары і спрыялі развіццю ідэй, прыўнесеных з Візантыі, аб узмацненні княжай улады і аб'яднанні земляў. Гэтыя ідэі будаваліся на падмурку ідэалогіі цэзарапапізму (caesar — імператар і papa — папа, айцец), што азначае, што галава свецкай улады - імператар (цэзар), з'яўляецца адначасова і галавой хрысціянскай царквы, а значыцца валодае неабмежаванай ніякімі зямнымі інстытуцыямі ўладай.

У цэнтры царкоўна-палітычнай ідэалогіі на ўсходнеславянскіх землях знаходзілася ідэя боскага паходжання дзяржаўнай улады. Сутнасць яе пераказана ў працы Л.Ціхамірава «Манархічная дзяржаўнасць» наступным чынам: праваслаўная царква прынесла на Русь з праваслаўнай Візантыі ідэю вялікага князя, як Богам пастаўленага ўладыкі, правіцеля і вярхоўнага суддзі падуладных народаў; царква ўмацавала адзінства народнай самасвядомасці, злучыўшы народы адзінствам веры; яна перанесла на Русь дзяржаўныя чыны і законы візантыйскага царства, перасадзіўшы і выгадаваўшы на рускай зямлі ідэю візантыйскага адзінаўладдзя. «Ты,- казалі царкоўныя іерархі Уладзіміру,- ёсць улада, пастаўленая Богам». «Ты пастаўлены ад Бога на пакаранне ліхім і на ўзнагароду добрым» [6, с. 22].

Побач з ідэяй боскага паходжання ўлады распаўсюджвалася ідэя богападобнасці яе зямных носьбітаў, іх абагаўлення. Наконт гэтага летапісец адзначае наступнае: «Естеством бо земным подобен есть всякому человеку цесарь, властию же сана яко Бог» [6, с. 22].

Адначасова з папярэднімі ідэямі царквой праводзілася ідэя павагі да ўлады. Пра гэта сведчаць наступныя настаўленні, змешчаныя ў пісьмовых помніках XII ст.: «Бога бойтесь, а князя чтите». Альбо: «Буди боязлив пред царем, готов к повелению его». У павучэнні ХШ ст. «Слова святых айцоў як жыць сялянам» гаворыцца: «Найпаче же своему князю приязнь имей, а не мысли зла нань» [6, с. 23].

З гэтых ідэй рабіліся наступныя высновы. Па-першае, калі ўлада даруецца богам, то дабівацца яе гвалтоўнымі сродкамі нельга. Па-другое, богаўстаноўленасцю ўлады прадвызначаецца і яе якасць. Добрыя ўладары насылаюцца Богам як узнагарода дабрачынным людзям, дрэнныя ж прадвызначаюцца небам у якасці пакарання за грахі. У «Зборніку» XI ст. выказана наступная думка: «Егда узриш недостойно кого или зла царя, или князя, или епископа, не чудися, ни Божия Промысла потязай, но разумей и веруй, яко противу беззаконием нашим тацем томителем предаемся» [6, с. 23].

І нарэшце, яшчэ адна ідэя з арсенала царкоўна-палітычнай ідэалогіі таго часу - ідэя адказнасці свецкай улады перад Богам. У прадмове да «Рускай Праўды» гаворыцца: «Давый бо вам власть Бог истяжет скоро ваши дела і помыслы іспытает» [6, с. 23].

Аднак нягледзячы на прывабнасць ідэй цэзарэпапізму для княжацкай улады, яны ўкараняліся вельмі марудна. Эканамічныя прычыны не дазвалялі князю атрымаць неабмежаванае валадаранне над абшчынна-вечавымі інстытутамі. Працяглае суіснаванне паганства і хрысціянства, неабходнасць кампрамісу дзеля грамадскай стабільнасці княстваў спрыялі развіццю такой рысы ментальнасці беларусаў як талерантнасць, і сталі першым прыкладам каштоўнаснага дысанансу ў беларускай свядомасці. Ня гледзячы на аўтарытарныя памкненні праваслаўнага духавенства, абшчынны лад забяспечваў існаванне дуалізму дзяржаўнай улады князь - веча на усходнеславянскіх землях да сяр.XIII ст. (на землях Расіі сітуацыя змянілася ў выніку мангольскай заваёвы), а на землях Беларусі да Крэўскай уніі 1386г.

Адзначым, што з канца X ст., у адрозненне ад Візантыі, на ўсходнеславянскіх землях пачаў складацца саюз княжацкай і царкоўнай улады. У гэтым саюзе прымат належаў да княжацкай улады, перш за ўсе таму, што праваслаўная царква знаходзілася ў эканамічнай залежнасці ад князёў, а таксама з-за неабходнасці падтрымкі ў паліканфесійнай сітуацыі. Княжацкая ўлада часам не саромелася паказваць гэта. Яна спрабавала трактаваць свяшчэннаслужыцеляў як сваіх слуг. Адсюль пазбаўленне непажаданых епіскапаў кафедраў і г.д., а ў будучым традыцыя дамінавання свецкай улады над духовай.

## 3. Зараджэнне палітыка-прававой думкі на старажытнабеларускіх землях (Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі)

Адносіны паміж людзьмі і пакаленнямі як паміж настаўнікамі і вучнямі — адна з найважнейшых прыкмет хрысціянскай і, верагодна, часткова

папярэдняй біблейска-юдзейскай цывілізацыяў. Паняцці *настаўнік, вучань, вучэнне і вучыць* у старазапаветных кнігах Бібліі прысутнічаюць каля 35 разоў, а ў новазапаветных кнігах — каля 300 разоў!

Настаўнікамі былі духоўна вопытныя людзі, *старцы і прарокі.* Хвалячыся боскім дарам прароцтва, псалмапевец казаў: «Я стаўся разумнейшы за настаўнікаў маіх, бо разважаю пра сведчанне Твае. Я ведаю болей старцаў, бо загады Твае шаную» (Пс.118: 99-100). Пра небяспеку таго, хто не слухае настаўнікаў, аўтар псалмоў кажа: Ён пакаецца ў цяжкія дні свае і скажа: чаму я не слухаў голасу мудрых людзей, «не прысланяў вуха маё да настаўнікаў маіх» (Пр.5: 12-13). Настаўнікамі былі ўсе святары старазапаветнай царквы.

Настаўнікамі і асветнікамі выступалі святары і ў усходнеславянскіх княствах. Старажытныя княствы былі вельмі нетрывалымі палітычнымі утварэннямі. Па меры умацавання ўлады князёў на месцах расла эканамічная і палітычная адасобленасць паасобных цэнтраў, узмацнялася іх імкненне да самастойнасці. Нават узаемная выгада ад кантралявання гандлёвага шляху не стрымлівала міжусобіцы, а наадварот з’яўлялася дадатковай прычынай для войнаў.

У гэтых умовах захаванню палітычнай і духоўнай супольнасці ўсходнеславянскіх зямель (у складзе адзінай дзяржавы) спрыяла дзейнасць праваслаўнай царквы і кніжных людзей: летапісцаў, рэлігійных прапаведнікаў. Карыстаючыся бясспрэчным маральным аўтарытэтам, яны спрабавалі ўплываць на патрыятычныя пачуцці, самасвядомасць, маральнасць насельніцтва Кіеўскай Русі, на ўсведамленне імі прыналежнасці да адзінай супольнасці.

Менавіта ў гэтых умовах асабліва актуальнае значэнне набываюць творы, якія асуджалі заганы грамадскага жыцця, злоўжыванні палітычнай уладай, ганьбавалі ўсобіцы князёў, заклікалі іх да палітычнага адзінства. Дзякуючы пісьму, яны хутка выходзілі за межы паасобных рэгіёнаў, княстваў, распаўсюджваліся на ўсёй тэрыторыі Кіеўскай Русі, набывалі важкі грамадскі рэзананс. На старажытнабеларускіх землях падобныя ідэі (і перш за ўсё заклікі да захавання ўсходнеславянскага палітычнага і духоўнага адзінства) знайшлі адлюстраванне ў XI-XII ст. у духоўнай спадчыне такіх выдатных мысліцеляў-асветнікаў перыяду Кіеўскай Русі, як Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч.

***Ефрасіння Полацкая (каля 1106-1173 гг.).*** Па ўсёй Русі праславілася на ніве хрысціянскага асветніцтва ўнучка князя Усяслава Чарадзея, дачка яго малодшага сына Георгія, першая жанчына, прылічаная да святых Ефрасіння Полацкая (свецкае імя Прадслава). Асноўныя моманты яе духоўнага подзвігу апісаны ў «Аповесці жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў гораду Полацку», створанага, верагодна, адразу пасля яе кананізацыі і дайшоўшага да нас у рукапісным зборніку XVI стагоддзя.

Ефрасіння пісала і ўласныя творы. Гэта былі перш за ўсё малітвы і павучэнні рэлігійна-маральнага зместу. На жаль, творы Ефрасіння Полацкай

да нас не дайшлі.

Дзейнасць і погляды яе былі накіраваны перш за ўсё на дасягненне духоўнай дасканаласці людзей. У яе «Жыціі» адзначаецца, што «старых яна вучыла цярпенню і ўстрыманню, юных - душэўнай чысціні і цялеснаму супакаенню, хаджэнню рахманаму, голасу ціхмянаму, слову дабрачыннаму, ядзенню і піццю маўкліваму; пры старэйшых маўчаць, мудрых слухаць; да старэйшых пакоры, да роўных і меншых — любові некрывадушнай; мала казаць, а больш разумець» [1, с. 114].

Набыўшы шляхам самаадукацыі вялікую і шматбаковую эрудыцыю ў галіне рэлігійнай і маральна-філасофскай літаратуры, Еўфрасіння Полацкая бярэцца за перапісванне царкоўных кніг. Гэтыя кнігі паклалі пачатак манастырскім бібліятэкам Полацкага княства, што пачалі тады фармавацца. Займалася яна таксама перакладамі рэлігійнай і маральна-філасофскай літаратуры з грэчаскай на царкоўна-славянскую мову. Есць усе падставы меркаваць, што ёю былі закладзены таксама асновы летапісання ў Полацку.

З імем полацкай асветніцы звязана таксама будаўніцтва вучылішчаў і школ на беларускай зямлі, шырокая адукацыя народа, навучанне простых людзей грамаце.

Разам з тым, Еўфрасіння Полацкая своечасова адгукалася на актуальныя праблемы грамадскага, палітычнага і царкоўнага жыцця таго часу. Была прыхільніцай увядзення хрысціянскіх прынцыпаў не толькі ў прыватнае, але і ў дзяржаўнае жыццё. Яна выказвалася за змякчэнне жорсткага княжацкага заканадаўства, за пашырэнне сацыяльных функцый дзяржавы. У прыватнасці, яна падтрымлівала ўвядзенне ў Кіеўскай Русі дзяржаўнай дапамогі і бедным, хворым, старым людзям. Яна сама актыўна займалася дабрачыннасцю.

Падтрымлівала Еўфрасіння і агульнаадукацыйную, культурна-выхаваўчую функцыю дзяржавы, вылучыўшы ідэю пашырэння, дэмакратызацыі адукацыі, стварэння значнай сеткі школ і бібліятэк.

Адным з самых вялікіх няшчасцяў палітычнага жыцця таго часу былі княжацкія міжусобіцы. Арбітрамі ў гэткіх канфліктах звычайна былі найбольш аўтарытэтныя духовыя асобы таго часу, да ліку якіх адносілася і Еўфрасіння Полацкая. У яе «Жыціі» сцвярджаецца, што «не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам, але ўсіх жадала бачыць адзінадушнымі»[1, с. 114; 13, с. 77]. Яна асуджала міжусобіцы вусна і кніжна, асуджала мірным будаўніцтвам манастыроў і развіццём кніжнай справы, стварэннем школы.

Плённая міратворчая дзейнасць Ефрасіння Полацкай, якая эфектыўна тушыла міжусобныя спрэчкі перш за ўсё паміж полацкімі князямі, знайшла адлюстраванне ў царкоўных спевах, створаных у гонар вялікай асветніцы яшчэ ў XII ст.: «Князем сродником друг на друга дерзающе подьяти мечь возбранила еси...». У песні адзначаецца, што Ефрасіння Полацкая — прыхільніца хрысціянскай ідэі міру «словам божым», як мячом двухбакововострым, прымірала варагаваўшыя бакі [6, с. 27]. Адкуль можна меркаваць, што яна, у дадатак да ўсяго, была неблагім дыпламатам і

палітычным прамоўцам.

Кіруючай думкай яе жыцця была думка пра дабрабыт і росквіт роднай зямлі.

***Клімент Смаляціч.*** Клімент Смаляціч. Выдатным асветнікам і царкоўным дзеячам сярэдневяковай Русі быў сучаснік Ефрасінні Полацкай, сын смаленскай галіны протабеларусаў-крывічоў Клімент Смаляціч (памёр пасля 1164 года). Нарадзіўся ён у Смаленску і, верагодна, там атрымаў пачатковую адукацыю. Даследчыкі мяркуюць, што пазней ён вучыўся ў Канстанцінопалі. Нашы летапісы, скупыя на пахвалу пісьменнікам, паведамляюць пра адукаванасць і глыбокія веды Клімента. Паводле Ніканаўскага летапісу ён быў «зело кніжен, и учителен, и философ велий, и много писания написав» [1, с. 32]. Гэтую ж ацэнку паўтарае Іпацьеўскі летапіс паводле якога Клімент «бысть книжник и философ так, якоже в Русской земли не бяшеть» [1, с. 32]. Каля 1148 г. быў прызначаны епіскапскім саборам і кіеўскім князем Ізяславам Мсціславічам мітрапалітам Кіеўскім і ўсёй Русі без санкцыі канстанцінопальскага патрыярха. Аднак пасля дзесяцігадовай барацьбы у 1161 годзе Клімент быў адхілены ад кіраўніцтва мітраполіяй.

Захаваўся адзін твор крывіцкага асветніка — апублікаванае М.Нікольскім (1892) — «Посланіе, написано митрополитомъ рускымъ Фоме прозвитору, истолковано Афанасіем мнихомъ». Аналіз гэтага твору ды іншых крыніцаў сведчыць пра дзве тэндэнцыі філасофіі, характэрныя для праваслаўнай думкі XII - XIII стст. Прыхільнікі артадаксальнай плыні адмаўлялі каштоўнасць антычнай, а па сутнасці ўсёй свецкай навукі і філасофіі для духоўна-рэлігійнага выхавання хрысціянскіх вернікаў. Яны абвінавачвалі Клімента Смаляціча ў сімпатыях да антычнай філасофіі і літаратуры, твораў Гамера, Платона, Арыстоцеля. Другі кірунак узначальвалі адукаваныя асветнікі на чале з Кліментам. Яны выступалі за саюз навукі, філасофіі і багаслоўя. Абараняючыся ад нагавору артадоксаў, Клімент даказваў неабходнасць выдання антычнай літаратурнай і філасофскай традыцыі для больш глыбокага разумення Святога Пісання і хрысціянскага асветніцтва. Асветнік спасылаўся не толькі на хрысціянскіх багасловаў Іаана Дамаскіна, Іаана Экзарха Балгарскага, Федарыта Кірскага, але і на творы Гамера, Платона, Арыстоцеля, каб даказаць заканамернасць і мэтазгоднасць Сусвету [1, с. 32-36].

Шмат думак у Клімента Смаляціча аб месцы чалавека ў сусвеце, аб прыродзе яго ўзаемаадносін з Богам. Ён лічыў, што чалавек валодае найвышэйшым дарам – свабоднай воляй.Але дараваная яму свабода ўчынкаў – гэта адначасова і напамін, што чалавеку, як вянцу тварэння боскага, належыць імкнуцца да маральнага ўдасканалення.

***Кірыла Тураўскі.*** Да ліку буйнейшых прадстаўнікоў палітычнай думкі XII ст. адносіцца і Кірыла Тураўскі (каля 1130-1182) - выдатны пісьменнік, прапаведнік, царкоўна-палітычны дзеяч. Дзякуючы ўсебаковай адукацыі, вялікаму таленту прамоўцы, прыкладным паводзінам, Кірыла набыў вялікі аўтарытэт у родным горадзе, заняў епіскапскую катэдру ў Тураве, на якой ён

і заставаўся амаль да канца сваіх дзён. Да нашых дзён дайшла значная частка творчай спадчыны Кірылы Тураўскага. Бясспрэчна ягонымі лічацца 8 слоў-павучэнняў, 3 прытчы, каля 30 малітваў і некалькі канонаў.

Як і для большасці духоўных лідэраў таго перыяду гісторыі, для Кірылы Тураўскага была характэрна маралізатарская накіраванасць творчасці. Асноўную сваю ўвагу ён надаваў клопатам аб узрастанню духовага ўзроўню і маральнай дасканаласці сваіх суайчыннікаў, безупынна выкрываў іх заганы (падман, ілжывасць, абжорства, дармаедства, гвалтаўніцтва і г.д.).

Але Кірыла Тураўскі быў не толькі абстрактным маралізатарам, «ён быў у сваім рэлігійна-асветніцкім вучыцельстве на самым лязе міжусобіцаў, якія раздзіралі яго радзіму» [13, с. 88]. Ён горача падтрымліваў незалежнасць свайго княства, яго саюз з Кіевам, і супрацьстаяў спробам узвышэння Уладзіміра-Суздальскай зямлі. Так, ён актыўна выступаў з асуджэннем ерасі епіскапа Фёдарца, якога падтрымліваў у сваіх антыкіеўскіх намерах князь Андрэй Багалюбскі. Менавіта гэтым падзеям прысвечана яго аповесць-прытча пад падвойнай назвай «Прытча пра чалавечую душу і цела», альбо «Прытча пра сляпога і кульгавага».

Сутнасць прытчы ў наступным. Адзін гаспадар пасадзіў вінаграднік, абгарадзіў яго высокай сцяной і наўмысна даручыў вартаваць яго двум далёкім ад фізічнай дасканаласці вартаўнікам: сляпому і кульгаваму (дакладней, бязногаму). Ён меркаваў, што ў выніку істотных фізічных недахопаў яны не змогуць трапіць у вінаграднік і незаслужана карыстацца яго пладамі. У той жа час, вартаўнікі павінны пасняхова выконваць свае абавязкі: бязногі зможа своечасова ўбачыць злодзея, а сляпы пачуць яго крокі і, такім чынам, папярэдзіць злачынства. Аднак вартаўнікі, далёкія і ад маральнай дасканаласці, вырашылі перахітрыць свайго гаспадара: бязногі сеў верхам на сляпога і падказваў яму дарогу ў патрэбным кірунку. Так яны самавольна трапілі ў вінаграднік і пачалі раскрадаць ўраджай. Але ў рэшце рэшт жорстка паплаціліся за гэта.

У гэтай прытчы гаспадар вінаградніка сімвалізуе Бога, вінаграднік - зямлю і «свет цэлы», кульгавы - цела чалавека, сляпы - яго душу, агароджа вакол саду - законы і запаведзі Божыя, а вароты, якія вядуць у сад - гэта шлях да справядлівага жыцця, пабудаванага па адпаведных законах, шлях да дасканалай сацыяльнай супольнасці. Мараль прытчы ў тым, што толькі не парушаючы законаў (пісаных і няпісаных), а таксама маральных запаветаў, можна дасягнуць дасканалай супольнасці людзей.

«Сляпая» душа і «кульгавае» цела - гэта не толькі сімвал недасканаласці чалавека, але і грамадства. І калі людзі не будуць паводзіць сябе ў адпаведнасці з устаноўленымі законамі, будуць жыць насуперак маральным і прававым нормам, яны ніколі не змогуць дасягнуць справядлівага грамадскага ладу, наладзіць добрыя адносіны, карыстацца здабыткамі грамадзянскай супольнасці. А ў дадатак, за свае амаральныя і проціпраўныя ўчынкі будуць сурова пакараны.

Прытча мела не толькі агульна-маралізатарскі характар, у ёй Кірыла Тураўскі выказваў грамадскі пратэст паводзінам уладзіміра-суздальскага

князя Андрэя Багалюбскага, выведзенага ў памфлеце ў вобразе «кульгавага» (князь сапраўды кульгаў), а таксама дзеянням прыхільніка яго палітычных поглядаў растоўскага біскупа Фёдарца за іх вераломныя метады палітычнай дзейнасці. У прыватнасці, Андрэй Багалюбскі, жадаючы ўзвысіць сталіцу свайго княства - горад Уладзімір і паслабіць уплыў Кіева ў 1169 г. зруйнаваў апошні. У той жа час і з тымі ж мэтамі Багалюбскі паспрабаваў раскалоць старажытнарускую царкву на дзве мітраполіі - кіеўскую і ўладзімірскую.

Кірыла Тураўскі рэзка асуджаў амаральныя метады ў палітыцы. Ён лічыў, што палітычныя мэты не павінны дасягацца ашуканствам і злачынствам. Нельга беспакарана тварыць зло, рана ці позна яно будзе пакарана.

Шырокі спектр этычных і грамадска-палітычных праблем адлюстроўваюць казанні, альбо «Словы» Кірылы Тураўскага. Яны пісаліся з нагоды розных рэлігійных свят і прызначаліся для казання ў царкве пад час набажэнства, ва ўрачыстых абставінах, у атмасферы прыўзнятых чалавечых настрояў і эфектыўна ўздзейнічалі на свядомасць слухачоў, набывалі вялікі грамадскі рэзананс.

Творы Кірылы Тураўскага яшчэ пры яго жыцці карысталіся вялікай папулярнасцю. У XII-XVI ст. яны шырока распаўсюджваліся ў спісах сярод жыхароў усходнеславянскіх зямель. Іх уключалі ў зборнікі разам з творамі найбольш вядомых усходніх айцоў царквы, у прыватнасці, Іаана Златавуста. Вельмі часта нашы далёкія продкі называлі Кірылу Тураўскага «другім Златавустам» [6, с. 30].

## 4. Палітычныя ідэі старажытнарускіх летапісаў

Нягледзячы на тое, што твораў рэлігійнай літаратуры дайшло з часоў валадарання Кіева больш, чым твораў літаратуры свецкай, але яе самым яркім кветам сталі перш за ўсё творы свецкія. І ўзвышаюцца над усім мацерыком літаратуры Кіеўскай Русі «Аповесць мінулых гадоў» і «Слова пра паход Ігаравы».

Асноўнай прычынай, якая абумовіла такое іх узвышэнне ў літаратуры Кіеўскай Русі, стала выказванне ў іх ідэі гістарычнага самасцвярджэння Кіеўскай Русі як дзяржавы, як асобнага гістарычна-культурнага, плямённа-роднаснага адзінства, патрыятычная ідэя адкрыцця сябе ў свеце, палітычная ідэя як магутнасці.

Ідэі самасцвярджэння і палітычнай незалежнасці актуалізаваліся з-за палітыкі Візантыйскай імперыі, якая разглядала хрысціянізацыю Кіеўскай Русі як крок у рэалізацыі сваіх імперскіх амбіцый, афіцыйнай палітычнай дактрыны «Візантыя - Другі Рым». Згодна з апошняй меркавалася стварэнне адзінай усяленскай праваслаўнай дзяржавы з цэнтрам у Візантыі. Усе ахрышчаныя (роўна як і заваяваныя) Візантыяй народы павінны былі знаходзіцца ў залежнасці ад Візантыйскай імперыі.

Зразумела, што імперская дактрына Візантыі не знаходзіла падтрымкі сярод перадавых мысляроў Кіеўскай Русі. У гэты перыяд на

усходнеславянскіх землях выпрацоўваюцца ідэі незалежнасці дзяржавы і царквы ад Візантыі пры захаванні вернасці праваслаўю. Асабліва яркае адлюстраванне ідэя самастойнасці і суверэннасці Кіеўскай Русі знаходзіць у старажытнарускіх летапісах і, перш за ўсе, у выдатным летапісным зводзе «Аповесць мінулых гадоў».

Па меркаванню большасці даследчыкаў, гэты выдатны помнік старажытнарускага летапісання быў створаны ў пачатку XII ст. манахам Кіева-Пячорскага кляштару Нестарам, які выкарыстоўваў здабыткі не захаваўшыхся да нашых дзён летапісных зводаў Іаана і Нікана XI ст. У першапачатковым выглядзе праца Нестара таксама не захавалася. Яна дайшла да нас дзякуючы шматлікім рэдакцыям і рукапісным спісам, сярод іх найбольш старажытныя: Лаўрэнцьеўскі (1377г.), Іпацьеўскі (XV ст.) і Радзівілаўскі (XV ст.).

Асноўная ідэя зместу летапісу – абгрунтаванне ідэй незалежнасці Кіеўскай Русі. Дзеля гэтага Нестар цалкам абвяргае канцэпцыю набыцця дзяржаўнасці славянамі ад Візантыі, якой абгрунтоўваліся імперскія прэтэнзіі апошняй. Летапісец закладвае падмурак нарманскай тэорыі паходжання дзяржаўнасці, улады і законаў ва ўсходніх славян, звязваючы звязваючы іх з запрашэннем на Русь трох братоў-нарманаў: Рурыка, Сіневуса і Трувара. Гэта запрашэнне паходзіла ад усходніх славян, сярод якіх былі і крывічы. Стомленыя міжусобнымі войнамі славяне адправілі пасольства да варагаў і запрасілі іх «княжить и володеть» імі «по правде» (гэта значыць па закону). Зямля славян, сказалі яны, «вялікая і багатая, а вось парадку ў ей няма» [1, с. 141].

Падобная трактоўка паходжання Кіеўскай Русі перш за ўсе абгрунтоўвала ідэю незалежнасці ўсходнеславянскай дзяржавы ад Візантыйскай імперыі.

У «Аповесці мінулых гадоў» знайшлі адлюстраванне і міжнародныя праблемы таго часу. Летапісец адзначае, што ў сярэдзіне XI-пачатку XII ст. Кіеўская Русь падвяргалася шматлікім агрэсіўным нападам з боку суседзяў-качэўнікаў. У той самы час, калі вораг пастаянна парушаў межы, урываўся на яе тэрыторыю, дзяржаву аслаблялі міжусобіцы. Летапісец асуджае ўсобіцы, прызывае князёў да яднання, абароны дзяржаўных межаў, клопату пра будучыню Кіеўскай Русі, якую ён параўноўвае з зямлёй абранай. Так, у «Аповесці» указваецца на найменне Акоўскага лесу як адзінага лесу-бацькі трох сясцёр-рэк Дзвіны, Дняпра і Волгі, якія з аднаго месца расцякаюцца ва ўсе бакі свету, да дальніх мораў – Чорнага (Понт море), Балтыйскага (Варяжьское), Каспійскага (Хвалисьское). На Русь прыходзяць тры браты – Рурык, Сіневус і Трувор, тры браты заснавалі Кіеў – Кій, Шчок і Харыў, тры моцных княства, тры Сафіі… Адзінства і траічнасць геаграфіі, дзяржаўнасці, генеалогіі як сімвалы боскай еднасці ў Тройцы. Дзеля абароны роднай святой зямлі і павінны былі прымірыцца і аб’яднаць высілкі усходнеславянскія князі.

У «Аповесці мінулых гадоў» захаваліся таксама каштоўныя звесткі пра Полацк і Полацкую зямлю, пра першых полацкіх князёў - Рагвалода і яго

дачку Рагнеду, Брачыслава і яго сына Усяслава Чарадзея.

Страта кантролю над паўночным і паўдневым канцамі шляху «з варагаў ў грэкі», культурныя асаблівасці як вынік інтэграцыі з розным даславянскім насельніцтвам, аб’ектыўна вялі да распаду Кіеўскай Русі на асобныя, часта варагаваўшыя паміж сабой княствы. З другой паловы XI ст. у летапісах, былінах, вуснай народнай творчасці пачынае гучаць трывога за лёс Кіеўскай дзяржавы. Заклік да яднання ўсходнеславянскіх князёў, да барацьбы за незалежнасць ад качэўнікаў знайшлі яркае адлюстраванне ў «Слове пра паход Ігаравы».

Ён створаны невядомым аўтарам у канцы XII ст. адразу пасля няўдалага паходу Ноўгарад-Северскага князя Ігара Святаслававіча на полаўцаў у 1185 г. Паход, які скончыўся паражэннем і паланеннем князя полаўцамі, паслужыў аўтару падставай для цяжкага роздуму над лёсам Кіеўскай Русі. Прычыны сацыяльна-палітычных няўдач аўтар бачыць у раздробленасці, княжацкіх міжусобіцах, адсутнасці згоды і адзінства паміж князямі, няспынных нападках знешніх ворагаў. Асуджаючы своекарыслівую палітыку князёў, аўтар заклікае іх спыніць сваркі, служыць справе ўмацавання і абароны ўсходнеславянскіх зямель, аднаўленню палітычнага аўтарытэту Кіева, заклікае князёў да згоды. Такім чынам, галоўная ідэя «Слова пра паход Ігаравы» - заклік усходнеславянскіх князеў да яднання.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005. – 1015 с.
2. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага/ Ю.Бардах/ Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
3. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж.Берман/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.
4. Вернадский, Г.В. Киевская Русь. / Г.В.Вернадский/Пер. с англ. Е. П. Беренштейна и др. Издательство: Тверь:ЛЕАН, 2004г. - 448 с.
5. Власов, Ю.Н. Государство и право Киевской Руси: становление политико-правовых отношений (VI-XIII века)./ Ю.Н.Власов. – М.: Юрайт, 1999, - 312с.
6. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
7. Данилова, Л.В. Крестьянский опыт природопользования в историческом центре средневековой Руси/ Л.В.Данилова// Традиционный опыт природопользования в России. – М.,1998. – с.57-76.

8. Данилова, Л.В. Сельская община в средневековой Руси / Л.В.Данилова /РАН; Ин-т Рос. Истории. - М.: Наука, 1994. - 318с.

9. Еремян, В.В. Государственный строй Древней Руси как сочетание полисной демократии и княжеской власти / В.В.Еремян// Право и политика. – 2004. - №2. – с.85-126.

10. Еремян, В.В. Некоторые особенности возникновения древнерусской государственности: от общины родовой к общине территориальной. Часть 1/ В.В.Еремян // Право и политика. – 2002. - №7. – с.91-126.

11. Еремян, В.В. Некоторые особенности возникновения древнерусской государственности: от общины родовой к общине территориальной. Часть 2// Право и политика. – 2002. - №8. – с.116-127.

12. Земцов, Б.Н. Общественный строй Киевской Руси IX-XII вв. / Б.Н.Земцов// История государства и права. – 2004. - №5. – с.44-47.

13. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура: падручнік / А.А.Лойка. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 319 с.

14. Мельникова, Е.А. К типологии предгосударственных и раннегосударственных образований в Северной и Северо-восточной Европе (постановка проблемы)/ Е.А.Мельникова //Древнейшие государства Восточной Европы. Материалы и исследования. 1992-1993. – М.: Наука, 1995. – 219с.

15. Нижник, Н.С. Регулирование брачно-семейных отношений на Руси в условиях язычества/ Н.С.Нижник// История государства и права. – 2003. - №2, - с.31-33.

16. Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: монография/ Я.Г.Риер. - Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. - 154с.

17. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII стагоддзя/ Г.Сагановіч. – Мінск, «Энцыклапедыкс», 2001. – 412с.

18. Фроянов, И.Я. К истории зарождения Русского государства/ И.Я.Фроянов //Из истории Византии и византиноведения. Межвуз.сб./Под ред. Г.Л. Курбатова. – Л., 1991. - с.57-93.

19. Чертков, А.Н. Древнерусская Федерация/ А.Н.Чертков //Журнал Российского права. – 2000. - №2, – с.162-173.

20. Шмурло, Е.Ф. Курс русской истории. — [Т. 1]: Возникновение и образование Русского государства (862-1462): учеб. пособие для высш. и сред. спец. учеб. Заведений/ Е.Ф.Шмурло. - СПб: Алетейя, 1999. - 541 с.

21. Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права беларусі: вучэб.дапам. у 2ч. Ч.1/ Я.А.Юхо. - Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 352с.

## ТЭМА 3.
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ XIV-XV СТ.

### 1. Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі ў XIV-XV ст.

У выніку значных змен у грамадскім, эканамічным, прававым, культурным жыцці ў XI-XII стст. у Заходняй Еўропе, якія звязваюцца з Папскай рэвалюцыяй 1050-1150 гг. [10, с. 164], было створана першая дзяржава ў сучасным яе разуменні - каталіцкая царква, першая сучасная заходняя сістэма права - кананічнае права [3, с. 119-120].

Кананічнае права было пабудавана на іерархічных пачатках (іерархія крыніц і норм) і абапіралася на сукупнасць прынцыпаў. Яго асноўнымі функцыямі былі: 1) кантроль цэнтральнай улады над шматлікім насельніцтвам з разнастайнымі групавымі інтарэсамі; 2) падтрыманне асобнай карпаратыўнай самасвядомасці духавенства і дабаўленне новага, юрыдычнага, вымярэнні да яго класавай свядомасці; 3) рэгуляванне адносін паміж канкуруючымі царкоўнымі і свецкімі ўладамі; 4) магчымасць для свецкіх улад мэтанакіравана і праграмна ажыццявіць заяўленую мэту - забяспечыць мір і справядлівасць у межах сваёй юрысдыкцыі і 5) магчымасць для царквы мэтанакіравана і праграмна ажыццявіць у жыццё сваю заяўленую мэту - перарабіць свет да лепшага [10, с. 174]. Па яго ўзору былі пабудаваныя свецкія саслоўныя сістэмы права - каралеўскае права, феадальнае права, манарыяльное права, гарадское права, гандлёвае і цэхавое права.

У аснове заходняга саслоўнага права ляжала адзінае разуменне справядлівасці, як асновы юрыдычнага правапарадку. У Сярэднявеччы справядлівым у юрыдычным сэнсе з'яўлялася тое, што адпавядае закону і замацоўвае і апраўдвае ўладныя адносіны ў грамадстве, а таксама спрыяе развіццю гаспадарчай і культурнай дзейнасці. Аднак у дадзеным выпадку дадаецца новы важны сэнс - справядлівыя такія адносіны, якія прыводзяць да пагаднення існуючых сацыяльных пазіцый, дазваляюць суіснаваць розным сацыяльным суб’ектам.

Паступова фармуецца і прынцыпова новае разуменне справядлівасці, заснаванае на хрысціянскім вучэнні, якое часткова супярэчыць першаму. Справядлівасць патрабуе, каб за кожны грэх (злачынства) было заплачана помстай і пакутай, якія былі бы адэкватныя грахоўнаму ўчынку і парушанаму закону. «Гэтая думка знайшла адлюстраванне не толькі ў крымінальным праве, але і ва ўсіх галінах кананічнага права пачынаючы з XII ст., і яна знаходзіла ўсё большае адлюстраванне ў розных галінах свецкіх прававых сістэм, якія пачалі развівацца адначасова з ім. Было сказанае, што дамовы павінны выконвацца, а калі не, то варта плаціць за іх парушэнне. Грамадзянскія правапарушэнні павінны кампенсавацца платай, эквівалентнай нанесенай шкодзе» [11, с. 135].

Такое разуменне справядлівасці, адзінства прынцыпаў, на аснове якіх будаваліся саслоўныя прававыя сістэмы, і функцый, якія вызначалі іх змест, абумовілі пераемнае развіццё права заходнееўрапейскай цывілізацыі з XI па XV-XVI стст., да перыяду Пратэстанцкай рэвалюцыі.

Славянскія землі ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе не прыналежалі на той момант да заходнееўрапейскага кірунку еўрапейскай цывілізацыі. У той час, калі ў Заходняй Еўропе ў XI-XII стст. здзяйсняўся пераход да развітога феадальнага грамадства і саслоўнай дзяржавы, у славянскія дружынныя дзяржавы толькі пачалі пранікаць феадальныя адносіны.

Развіццё працэсаў феадалізацыі шмат у чым было звязана з заходнім уплывам. Праз палітычныя і асабістыя кантакты, прыняцце каталіцтва, нямецкую каланізацыю і экспансію, усведамленне неабходнасці пераходу ад дружыннага войска да рыцарскага, якое павінна было складацца з ваяроў-рыцараў, аселых на зямлю, элементы саслоўнага ладу укараняліся ў заходнеславянскіх дзяржавах. У іх з XI-XII стст. узмацняюцца індывідуальныя правы сялян на надзелы, а шляхта, асабліва з XIII ст., пачынае атрымоўваць ад князёў зямлю і імунітэтныя прывілеі, прынятыя ў Заходняй Еўропе [2, с. 39].

У XIV ст. Польшча ўжо ўяўляла сабой саслоўную манархічную дзяржаву заходнееўрапейскага ўзору, з адасабленнем дзяржавы (Кароны Польскай) ад асобы валадара.

У Вялікім княстве Літоўскім працэс станаўлення развітога саслоўнага грамадства і феадальнай дзяржавы і правы праходзіў па вышей разгледжанай схеме пачынаючы з XIV стагоддзя і выклікаў характэрныя асаблівасці ў развіцці права. Калі ў Заходняй Еўропе феадальнае права фармавалася знізу, у форме звычаяў, індывідуальных падараванняў, затым у форме прыватных абагульненняў звычаёвага права, як, напрыклад, «Саксонскае зерцало» Эйке фон Рэпгофа, і толькі затым зліліся з больш моцным і дынамічным каралеўскім (агульнадзяржаўным) правам, то ў Вялікім княстве феадальнае і княжае права былі ад пачатку непадзельны. У актах вялікага князя нормы, якія традыцыйна адносяцца да еўрапейскага сярэднявечнага княжага права - пытанні забеспячэння міру (нормы аб адказнасці за найболей небяспечныя правапарушэнні), кіравання (стварэнне дзяржаўных органаў у цэнтры і на месцах) і юрысдыкцыі (юрысдыкцыя князя і прызначаных ім мясцовых службовых асобаў), спалучаліся з нормамі, якія прадстаўляюць саслоўныя прывілеі ўсяму класу феадалаў.

Вялікае княства Літоўскае, асноўную частку якога складалі беларускія землі, было геаграфічна і культурна (сінтэз праваслаўя і паганства) адасобленым да XIV ст. Да моманту заключэння Крэўскай уніі яно з'яўлялася грамадствам з ранняй дзяржаўнасцю, а ўлада князя абапіралася на патрыманіяльную канцэпцыю.

У адсутнасць традыцый адчужэння земляў у прыватнае валоданне ўсё кіруючае саслоўе, якое складала княжую раду, жыло не з прыбытку ад земляў з сялянамі, што яму належалі, а за кошт дзяржаўных прыбыткаў, якія збіраліся з тых жа сялян у дзяржаўную (княжую) казну. Таму сяляне

заставаліся асабіста вольнымі, спадчыннымі трымальнікамі земляў у абшчынах [8, с. 62].

Як і ў выпадку з заходнімі славянамі некалькімі стагоддзямі раней, міжнародныя фактары абумовілі паскарэнне працэсаў феадалізацыі, змену тыпу дзяржавы і правы. Неабходнасць супрацьстаяць нямецкай і мангольскай агрэсіі, супернічаць з Маскоўскім княствам у аб'яднанні славянскіх зямель на Ўсходзе выклікалі заключэнне ўніі паміж Вялікім княствам і Польшчай у 1385 г. Сам акт Крэўскай уніі, па меркаванні Ю. Бардаха, яшчэ ўтрымоўвае сведчанні аб дамінаванні патрыманіяльнай тэорыі ў ВКЛ [1, с. 35]. Аднак з гэтага моманту пачынаецца, у чым варта пагадзіцца з Г.Лаўмянскім і М.Доўнар-Запольскім, паскораная эвалюцыя грамадства княства ў напрамку развітога саслоўнага ладу.

Пачынаючы ад Крэўскай уніі, ва ўмовах неабходнасці ваеннай і эканамічнай канкурэнцыі з памежнымі краінамі, дзяржава перабудоўваецца па ўзору развітых феадальных грамадстваў Заходняй Еўропы. Абмінаючы перыяд персанальных прывілеяў, вялікі князь пачынае выдаваць агульназемскія прывілеі, з дапамогай якіх ён паскорана фармуе стан шляхты, надзяляючы іх землямі на ўмовах васальнай залежнасці, запрыгоньвае былых вольных абшчыннікаў, а граматамі на магдэбургскае права садзейнічае развіццю гарадоў і спрыяе ўзнікненню стану гараджан.

Хуткасць сацыяльных трансфармацый, забяспечаная навязваннем яго зверху, першапачаткова выклікала адчужэнне як сярод чальцоў дынастыі і мясцовых князёў, так і сярод простага люду. Сітуацыя пагаршалася і супярэчнасцямі, якія існавалі паміж жамойцкай і рускай часткамі Вялікага княства, асабліва пасля прыняцця першай каталіцтва. Аднак да сярэдзіны XVI ст. ВКЛ набыла хоць і з мясцовымі асаблівасцямі рысы саслоўнай дзяржавы.

Крыніцамі права былі спачатку старажытнарускае права (Руская праўда), мясцовыя звычаі і судовая практыка, а потым (у канцы XIII ст.) узнікла пісанае права ў форме лістоў, грамат, велікакняжацкіх прывілеяў. У 1468 г. з'явіўся першы кодэкс крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права ВКЛ - «Статут Казіміра» (Судзебнік 1468 г.), напісаны на беларускай мове.

У XIV—XV ст. у межах этнічнай тэрыторыі Беларусі пачалося фарміраванне беларускай народнасці. Адначасова фарміравалася беларуская культура, інтэгральнай часткай якой была беларуская мова - дзяржаўная мова Вялікага княства Літоўскага.

## ***2. Прыняцце каталіцызму, знаёмства з заходнееўрапейскай царкоўна-палітычнай ідэалогіяй папства (папацэзарызму)***

Важным фактарам, які стымуляваў развіццё палітычнай і прававой думкі Беларусі і Літвы ў XIV-XV ст., стала прыняцце каталіцызму.

Першыя знаёмствы ўсходніх славян з заходнім (лацінскім) хрысціянскім абрадам адбыліся яшчэ да афіцыйнай даты хрышчэння Русі. У Кіеўскую Русь

заходняе хрысціянства прыходзіла дзякуючы вікінгам, нямецкім, польскім прапаведнікам. Як кажа «Сага а хрышчэнні» знакаміты Торвальд Вандроўнік заснаваў у Полацку каля 1000 года храм Св.Яна Хрысціцеля і кляштар пры ім. На беларускіх землях прапаведавалі і Бруно Кверфутскі (1009 г.), біскуп Рэйнберн (1009-1010 гг.) і інш. У 1186 г. полацкі князь Уладзімір дазволіў прапаведаваць сярод ліваў святару Мэйнарду, а заснаваная ў пач.XIII ст. Рыжская мітрапалічая кафедра да 1255 года ўжо мела ў Полацкіх уладаннях 2 епархіі: Рускае біскупства ў Полацку і Селонскае ў залежнай ад Полацка Селонскай зямлі.

Аднак першай спробай пашырыць уплыў каталіцтва на беларускіх і літоўскіх землях у палітычных мэтах была зроблена ў 1251 г. Вялікім князем Міндаўгам. Аднак ніякіх пазітыўных уплываў на агрэсіўную дзейнасць ордэна мечаносцаў гэта не аказала. Таму да канца XIV ст., нягледзячы на ў асноўным талерантную палітыку да хрысціянскіх прапаведнікаў з Заходу, назіраліся толькі асобныя выпадкі прыняцця каталіцкай веры вышэйшымі дзяржаўнымі асобамі і службоўцамі. Напрыклад, у «Хроніцы Быхаўца» гаворыцца, што ў 1364 г. у Кракаве вядомы магнат ВКЛ «Пётр Гаштольд принял веру римскую и до Литвы принес».

У 1385 г. у мэтах аб'яднання сіл для барацьбы з агрэсіяй нямецкіх рыцарскіх ордэнаў крыжаносцаў і мечаносцаў паміж ВКЛ і Польшчай была заключана дынастычная Крэўская унія. Вялікага князь Ягайла ўступаў у шлюб з польскай каралевай Ядвігай і абвяшчаўся польскім каралём. Разам з падданымі ён абавязваўся прыняць каталіцтва і далучыць землі ВКЛ да Польшчы. Такім чынам каталіцтва рабілася дзяржаўнай рэлігіяй ВКЛ.

Пасля Крэўскай уніі (1385) на землях ВКЛ значна пашырылі актыўную місіянерскую дзейнасць шматлікія каталіцкія манаскія супольнасці: дамінікане, францыскане, бернардзіны, кармеліты і інш. Пры падтрымцы дзяржавы і феадалаў пачалі будавацца касцёлы і кляштары (манастыры), пры якіх ствараліся бібліятэкі і адкрываліся школы. Побач са «Свяшчэнным пісаннем» чыталіся і вывучаліся ўрыўкі з прац айцоў заходняй царквы Амвросія Медыяланскага, Іераніма Стрыдонскага, Аўгусціна Аўрэлія, Фамы Аквінскага, а таксама іх погляды на суадносіны царквы і дзяржавы. Навучанне і набажэнства вялося на лацінскай мове.

З прыняццем каталіцтва на беларускіх і літоўскіх землях пачынае распаўсюджвацца царкоўна-палітычная ідэалогія папства, якая атрымала назву папацэзарызму. Яе асновы былі закладзены ў выніку грыгарыянскай рэформы (Папскай рэвалюцыі) XI-XII стст. На першым этапе рэформы перш за ўсе развярнулася барацьба з сіманіяй (практыкай куплі-продажу царкоўных пасадаў) і жанатым духавенствам. Папы Стэфан IX, Мікалай II і Аляксандр II зрабілі крокі па прадухіленні ўплыву імператара на абранне біскупа Рыма, а таксама па забароне раздачы свецкімі феадаламі царкоўных уладанняў і маёмасці, ліквідацыю цэркваў, што знаходзіліся ва ўласнасці феадалаў.

Ідэолагамі рэформы сталі Папа Аляксандр II, кардыналы Гумберт Сільва-Кандідскі і Гільдэбранд (будучы Папа Рыгор VII). Менавіта пры

апошнім ідэалогія папацэзарызму атрымала сваё закончанае афармленне. Ён забараніў пад пагрозай адлучэння ад царквы прымаць сакраманты з рук жанатых святароў, а таксама тых, хто набыў сан за грошы. Ён таксама забараніў свецім асобам, у тым ліку імператару, ажыццяўляць прызначэнні на царкоўныя пасады (інвестытуру). Канцэпцыя ўлады Рымскага Папы як найвышэйшага маральнага арбітра хрысціянскага свету знайшла сваё адлюстраванне ў праграмным дакуменце Рыгора VII «Дыктаты Папы» (1075). Акрамя іншага ў дакуменце абвяшчалася:

«1. Рымская царква заснавана адным толькі Богам.

2. Рымскі біскуп адзін па праву завецца ўсяленскім.

3. Ён адзін мае права скідваць і аднаўляць біскупаў...

7. Яму аднаму дазволена ствараць новыя законы ў адпаведнасці з патрэбамі часу...

9. Аднаму лішь Папе ўсе князі павінны цалаваць ногі...

11. Ён адзін мажа скідваць імператараў…

27. Ён можа вызваліць падданых несправядлівых людзей ад прысягі на вернасць…» [3, с. 101-102].

З «Дыктатаў папы» вынікала, што свецкая ўлада павінна была падпарадкоўвацца царкоўнай (папскай). Свецкія ўладары ўспрымаліся як абраннікі божыя, але выбранне адбываецца толькі за пасрэдніцтвам першасвяшчэнніка - Папы, што знаходзіла адлюстраванне ў акце благаславення і памазання абранніка (імператара, караля і г.д.) на дзяржаўнае кіраванне. У выпадку непадпарадкавання прадстаўніка вярхоўнай свецкай улады царкоўнай (Папе) апошні мог вызваліць веруючых любой каталіцкай дзяржавы ад прысягі свайму манарху і прызнаць за народам права на непаслушэнства.

Згодна з прынцыпамі царкоўна-палітычнай ідэалогіі папацэзарызму, намеснікам бога на зямлі разглядаўся ўжо прадстаўнік не свецкай (як у цэзарапапізме), а царкоўнай улады. Такім чынам, паміж папацэзарызмам і цэзарапапізмам існавала істотная розніца, і з’яўленне царкоўна-палітычнай ідэалогіі каталіцызму на беларускіх і літоўскіх землях не прайшло бясследна для палітыка-прававой думкі ВКЛ.

Аднак трэба ўлічваць, што каталіцтва прыйшло на Беларусь з Польшчы, а польская каталіцкая царква знаходзілася доўгі час пад уплывам нямецкай. У Германіі грыгарыянская рэформа укаранілася не ў такіх радыкальных формах як абвяшчалася ў «Дыктатах Папы». У Германіі біскупы прызначаліся ў выніку кампрамісу між імператарам і Папай («падвоеная інвестытура»), і нямецкая царква не была настолькі незалежнай ад свецкай улады, вышэйшай за яе, як гэтага бы хацелася Рыму. Адпаведна і ў ВКЛ ідэі папацэзарызму прыйшлі ў стане, прымальным для традыцый свецкіх уладаў.

Знаёмства з папацэзарызмам паклала пачатак працэсу паступовага пераадольвання палітычнай думкай ВКЛ аднабаковай арыентацыі на грэка-візантыйскія палітычныя традыцыі. Шляхам пашырэння і ўмацавання шматбаковых духоўных сувязей з краінамі Заходней Еўропы палітычная думка ВКЛ пачала дапаўняцца і ўзбагачацца здабыткамі заходнееўрапейскай

палітычнай культуры. З'яўленне папацэзарызму паклала пачатак дэсакралізацыі свецкай улады, гэта значыць, пазбаўленню боскіх атрыбутаў яе зямных носьбітаў.

## *3. Палітычныя ідэі сярэднявечных ерасяў у ВКЛ*

У сярэднявечным грамадстве заўсёды праяўлялася незадаволенасць часткі веруючых існуючымі сацыяльнымі адносінамі, панаваннем праваслаўнай і каталіцкай царквы ў грамадскім жыцці, афіцыйным рэлігійна-тэалагічным светапоглядам. Гэты сацыяльны пратэст знайшоў сваё адлюстраванне ў ерэтычных ідэях і рухах (ад лат. Haeresis асобае веравучэнне), якія пашыраліся, ў тым ліку, і на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

На пачатку XV ст. шырокае распаўсюджванне атрымала ў ВКЛ ерэтычнае вучэнне прафесара Пражскага ўніверсітэта, чэшскага гуманіста Яна Гуса (1371-1415). Ён выкрываў каталіцкае духавенства, асуджаў багацце каталіцкай царквы, выступаў супраць куплі і продажу царкоўных пасад (сіманіі), прапаноўваў частковую секулярызацыю царкоўнай маёмасці, патрабаваў рэфармавання царквы ў адпаведнасці з ідэаламі ранніх хрысціян, выказаўся таксама за непадпарадкаванне ўладам, калі яны не выконваюць «закона божага» [5, с. 41].

Гусіцкі рух у ВКЛ падтрымаў вялікі князь Вітаўт, які выношваў ідэю разрыву дынастычнай уніі з Польшчай і ў той час быў зацікаўлены ў аслабленні ў дзяржаве пазіцыі каталіцкай царквы, паколькі апошняя актыўна падтрымлівала Крэўскую унію. У прыхільніках гусіцкага руху Вітаўт бачыў сваіх саюзнікаў.

На пачатку 1413 г. Вітаўт ажыццявіў паездку па гарадах Беларусі разам з бліжэйшым паплечнікам Яна Гуса - Еранімам Пражскім (каля 1380-1416), выпускніком Пражскага універсітэта, еўрапейскі вядомым вучоным. У прыватнасці, у красавіку 1413 г. яны наведалі Віцебск. І.Пражскі прабыў ў Віцебску два месяцы і на працягу гэтага часу энергічна прапагандаваў тут вучэнне Яна Гуса. У сваіх пропаведзях і на дыспутах з каталіцкімі святарамі ён выступаў супраць продажу індульгенцый, выкрываў злоўжыванні каталіцкага духавенства, патрабаваў істотнага рэфармавання царквы. Гэтыя пропаведзі, якія збіралі натоўпы людзей, знайшлі шмат прыхільнікаў сярод жыхароў Віцебска. Так, паводле пісьма кракаўскага біскупа, Еранім Пражскі быў у ВКЛ нядоўга, але выклікаў такое хваляванне сярод духавенства і народа, якога не ведалі ў гэтых краях.

Жорсткае пакаранне Яна Гуса (спалены на кастры 6 ліпеня 1415 г у нямецкім горадзе Канстанцы), а таксама яго паплечніка Ераніма Пражскага (спаленага 30 мая 1416 г. у тым жа горадзе) паклалі ў Чэхіі пачатак масаваму ўзброенаму выступленню супраць каталіцкай царквы і феадальнай эксплуатацыі, вядомаму пад назвай гусіцкага руху. На дапамогу гусітам у 1423 г. з ВКЛ было паслана пяцітысячнае апалчэнне, у склад якога ўваходзілі галоўным чынам прыхільнікі гусізму – шляхта, мяшчане і г.д.

Аднак у апошнія гады княжання Вітаўта, а таксама пасля яго смерці

адносіны дзяржавы да вучэння Яна Гуса пачалі мяняцца, і ў 1436 г. для барацьбы з прыхільнікамі ідэалогіі гусізму ў ВКЛ была ўведзена інквізіцыя.

## *4. Рэлігійна-палітычныя супярэчнасці і іх адлюстраванне ў палітычнай і прававой думцы ( XIV-XV стст.). Царкоўна-палітычная дзейнасць і грамадска-палітычныя погляды Р.Цамблака*

Дзесьці з сярэдзіны XIV ст. пачынаецца сур'ёзнае палітычнае супрацьстаянне паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам. Абедзве дзяржавы прэтэндуюць на ролю збіральніка «рускіх» зямель. Важную ролю ў барацьбе пачынае граць месца знаходжанне мітрапалічага пасаду. Кожны з бакоў прыкладаў вялікія намаганні каб займець цэнтр усходнеславянскага праваслаўя на сваёй тэрыторыі. У 1355 г. гэтага дамагліся маскоўскія князі.

Асноўнай мэтай рэлігійнай палітыкі вялікіх князёў ВКЛ становіцца стварэнне сваёй асобнай мітраполіі. Таму калі ў 1406 г. памёр мітрапаліт Кіпрыян (1336 – 1406 гг.), які задавальняў абодва бакі, Вітаўт прапанаваў на пасаду мітрапаліта полацкага біскупа Феадосія. Аднак візантыйскі імператар і патрыярх падтрымалі Маскву, і мітрапалітам стаў грэк Фоцій, які месцам свайго жыхарства абраў Маскву. Тады Вітаўт вырашыў стварыць аўтакефальную (незалежную) праваслаўную царкву ВКЛ і паставіць на чале яе свайго мітрапаліта.

Прыхільніка сваіх планаў ён знайшоў у асобе Рыгора Цамблака (1365-1419), балгарына, усебакова адукаванага чалавека, якога акупацыя яго радзімы ператварыла ў палітычнага выгнанніка. Менавіта яго кандыдатура здалася Вітаўту найбольш прыдатнай на пасаду літоўскага мітрапаліта. Паводле Густынскага летапісу на саборы праваслаўных біскупаў у Навагрудку Вітаўт, бачачы, «што святая Сафія, стольная царква мітрапаліта, не мае гаспадара, як асірацелая ўдава, сваёй красы пазбаўленая, і ва ўсёй Кіеўскай мітраполіі няма парадку, а мітрапаліты, прыйшоўшы з Масквы, толькі пра тое клапоцяцца, каб, што каштоўнае ў Сафіі знайшоўшы сабе ўзяць, а таксама даніну ў святароў і іншых хрысціян сабраўшы, у маскоўскую зямлю з сабою вынесці» [9, с. 27], загадаў абраць свайго мітрапаліта. 15 лістапада 1415 г. на саборы Рыгор Цамблак, са спасылкай на прэцэдэнт – абранне Клімента Смаляціча, быў ўзведзены ў сан мітрапаліта без згоды канстанцінопальскага патрыярха, за што імя яго было аддана праклёну як канстанцінопальскім патрыярхам, так і мітрапалітам Фоціем, які знаходзіўся ў Маскве.

Але Р.Цамблак пайшоў на гэта, таму што цалкам падтрымліваў палітычныя планы Вітаўта, яго імкненне да ператварэння ВКЛ ў дзяржаву, якая знаходзілася б у поўнай незалежнасці ад Польшчы. Р.Цамблак марыў аб стварэнні ў гэтай дзяржаве моцнай і аўтарытэтнай праваслаўнай царквы, прызнанні праваслаўя дзяржаўнай рэлігіяй ВКЛ і нават марыў аб пераходзе Вітаўта ў праваслаўе. Апрача таго, ён звязваў з Вітаўтам надзею на актывізацыю вызваленчай барацьбы славянскіх народаў з татара-мангольскай і турэцкай няволяй.

Пасля абрання Р.Цамблак накіраваўся ў Кіеў на мітраполію. Пасля нападу на Кіеў нагайскай арды ён перанёс мітрапаліцкую кафедру з Кіева ў Вільню, а сваёй рэзідэнцыяй абраў Наваградак.

Супярэчнасці з Масквой, патэнцыйная небяспека бірэлігійнасці асноўнага насельніцтва краіны натуральна прыводзілі вялікіх князёў да ідэі ўніі паміж каталіцтвам і праваслаўем. Яшчэ ў 1396 г. Ягайла размаўляў аб неабходнасці ўніі з мітрапалітам маскоўскім Кіпрыянам.

У пачатку 1418 г. па жаданню Ягайлы і Вітаўта Рыгор Цамблак на чале прадстаўнічай дэлегацыі праваслаўных біскупаў і святароў (усяго каля 30 асоб) выехаў з ВКЛ у Заходнюю Еўропу на XVI Усяленскі сабор каталіцкай царквы. Сабор праходзіў у Германіі ў горадзе Канстанцы (адсюль і яго назва Канстанцкі). Мэтай візіту было дамагчыся больш-менш шчыльнага хаўрусу паміж цэрквамі. У сваіх прамовах на саборы Цамблак заклікаў да аднаўлення былога адзінства хрысціянаў. Ён прапаноўваў сабраць спецыяльны сабор аб веры і ў свабоднай дыскусіі вырашыць усе спрэчныя пытанні. Вынікам павінен быў стаць раўнапраўны саюз паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. Аднак план Цамблака не быў ухвалены ні Папам, ні большасцю праваслаўных біскупаў. Ён вярнуўся ў Вільню і, па некаторых звестках памер у 1419 г.

У гэты час пачала мяняцца тактыка Вітаўта ў дасягненні сваіх палітычных мэтаў. Зразумеўшы, відаць, што разарваць у адзіноце дынастычную унію з Польшчай немагчыма, Вітаўт уступіў у саюз з заклятым ворагам Ягайлы імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмундам І (кіраваў з 1410 па 1437 г.). Апошні абяцаў Вітаўту хадайнічаць за яго перад Рымскім Папай, каб той прыслаў Вітаўту каралеўскую карону. Дзеля гэтага Вітаўту прыйшлося змяніць царкоўную палітыку, памяняць свае адносіны да каталіцызму. Ён пачаў узмацняць падтрымку каталіцкага духавенства. Палепшыліся і адносіны з Маскоўскім князем Васілём. Памірыўся Вітаўт і з мітрапалітам Фоціем.

Рыгор Цамблак карыстаўся вялікай павагай ва ўсходніх славян. Пра гэта сведчыць «Ніканаўскі летапіс». Сапраўды, Р.Цамблак пакінуў багатую духоўную спадчыну (звыш 40 твораў). Яны часта перапісваліся і шырока распаўсюджваліся на землях усходніх славян, карысталіся сярод іх жыхароў вялікай павагай. Паказальна, што ў XV і XVI ст. творы Р. Цамблака ўносіліся ў зборнікі царкоўных павучэнняў побач з творамі ўсходніх айцоў царквы [5, с. 46].

За час знаходжання ў ВКЛ (у тым ліку і на пасадзе мітрапаліта) Р.Цамблак напісаў каля дзесяці твораў, сярод якіх шэраг царкоўных пропаведзяў («На ўшэсце», «На успение», «На адсячэнне галавы Іаана Хрысціцеля», «На ўздвіжанне крыжа»), а таксама некалькі слоў — «Пахвальнае слова патрыярху Яўфімію», «Надмагільнае слова мітрапаліту Кіпрыяну» і іншыя, у якіх знайшлі адлюстраванне злабадзённыя грамадска-палітычныя праблемы таго часу.

Напрыклад, у «Похвальным слове патрыярху Яўфімію», прысвечаным свайму духоўнаму настаўніку - балгарскому патрыярху Яўфімію

Тырнаўскаму (1327-1401), які мужна загінуў у турэцкай няволі аўтар звяртаецца да аналізу нацыянальнай трагедыі балгарскага народа - заваяванню Балгарыі туркамі, пазбаўленню балгар дзяржаўнай незалежнасці. У «Слове» аўтар заклікае да барацьбы з турэцкай няволяй, якая прынесла на балгарскую зямлю велізарнае гора і пакуты. Р.Цамблак абгрунтоўвае ў «Слове» ідэю славянскага адзінства, выказвае надзею на лепшае будучыню славян. «Слова» мела значэнне не толькі для балгар. Яно актывізавала барацьбу ўсходніх славян з татара-мангольскай няволяй [5, с. 46].

У «Надмагільным слове мітрапаліту Кіпрыяну», прысвечаным памяці свайго дзядзькі, мітрапаліта кіеўскага і маскоўскага Кіпрыяна (1336-1406), Р.Цамблак аналізуе шматбаковую грамадскую актыўнасць гэтага выдатнага царкоўна-палітычнага дзеяча, выключна высока ацэньвае яго заслугі на ніве асветы, падкрэслівае асабліва ўласцівае мітрапаліту ўмельства «учение в зрячих душах вселяти». Р.Цамблак заклікае сучаснікаў да распаўсюджвання ведаў («книжной мудрости»), пашырэння асветы [5, с. 47].

Нягледзячы на смерці Вітаўта і Рыгора Цамблака, ідэя ўніі захавала сваю прывабнасць для рэлігійных і дзяржаўных дзеячаў ВКЛ. 5 ліпеня 1439 г. на Ферара-Фларэнційскім саборы кіеўскі і маскоўскі мітрапаліт Ісідар падпісаў акт аб стварэнні адзінай хрысціянскай царквы. Яго дзейнасць была ўхвалена ў Вільні, але адпрэчана Масквой, дзе яго саслалі ў Чудаў манастыр.

У 1458 г. у ВКЛ зноў аднавілася асобная праваслаўная мітраполія, якую ўзначаліў вучань Ісідора Рыгор Балгарын. Яна праіснавала да 1685 г., калі кіеўскі мітрапаліт пачаў прызначацца маскоўскім патрыярхам.

У канцы XIV-пачатку XV стст. з ідэяй уніі выступалі наступнікі Рыгора Балгарына мітрапаліты Місаіл у 1476 г., Іосіф у канцы XV ст. Але ў абодвух выпадках былі вызначаны асноўныя дагматычныя супярэчнасці паміж цэрквамі, якія на гэтым этапе сталі перашкодай да пагаднення.

Рэлігійна-палітычныя праблемы ў ВКЛ прывялі ўлады дзяржавы да разумення неабходнасці іх вырашэння пераважна сродкамі перамоваў, кампрамісу, права. Гэта стала падмуркам ў фармаванні дзяржаўнай палітыкі, заснаванай на талерантнасці і пошуку згоды.

## ***5. Палітычныя ідэі беларуска-літоўскіх летапісаў***

Беларускія і літоўскія землі ў XII-XIII стст. Становяцца арэнай для крывавых войнаў. З Захаду пагражалі паходы нямецкіх крыжакоў, з усходу – татара-мангольскае нашэсце, унутраным ворагам стала міжусобная барацьба усходнеславянскіх князёў.

Агульнае паходжанне (славяна-балцкі субстрат), моцныя эканамічныя сувязі і знешняя пагроза спрычыніліся да аб’яднання беларускіх і літоўскіх зямель у адзінае валадарства – Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае з цэнтрам у Наваградку (цэнтр летапіснай Літвы). Аб’яднанне распачаў Міндоўг (1230-1263 гг., яно было працягнута Віценем і Гедымінам, а завершана Альгердам і Вітаўтам.

«У палітычным плане адбывалася паўсюднае падзенні княжацкіх сталоў

Рурыкавічаў і пераход ўлады да літоўскіх дынастыяў. Насельніцтва проста выракалася, выпіхвала Рурыкавічаў, якія даўно сталі сымбалем краху і ганьбы, слабасці і бессэнсоўнай жорсткасці, пэўнага адзінства, так, але адзінства наскрозь благога, фальшывага, адзінства заўсёдных войнаў і крыві і пры гэтым поўнага бяссілля і нават рабалепства перад знешнім ворагам. З іншага боку, гэтая свабода (ад манголаў) служыла магутным аб’яднальным чыннікам, які рэальна згуртоўваў землі Паўночна-Заходняй Русі задоўга да ўстанаўлення іхнага дынастычнага адзінства пад «гербом Калюмнаў» (дынастычны герб Гедымінавічаў)» [7].

У сувязі з завяршэннем аб’яднаўчых працэсаў і палітычнай цэнтралізацыі пануючымі ў палітычнай думцы становяцца ідэі адзінства і магутнасці краіны, узвышэння яе палітычнага прэстыжу. Гэтыя ідэі з’явіліся вызначальнымі ў летапісах XV ст., якія былі напісаны з новых агульнадзяржаўных пазіцый. Да гэтых летапісаў адносяцца «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх»,«Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.», «Хроніка Быхаўца».

***«Летапісец вялікіх князёў літоўскіх».*** Першым, найбольш значным помнікам беларускага летапісання лічыцца «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх». Ён напісаны невядомым аўтарам на старабеларускай мове у канцы XIV - пачатку XV ст. «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» можна разглядаць як першую спробу палітычнай гісторыі ВКЛ. У ім апісваюцца сапраўдныя гістарычныя падзеі XIV - пачатку XV ст.

У першай частцы «Летапісу» адлюстравана барацьба за палітычную ўладу паміж нашчадкамі Гедыміна - Ягайлам, унукам Гедыміна, які пасля смерці свайго бацькі Альгерда ў 1377 г. стаў Вялікім князем літоўскім, і яго дзядзькам Кейстутам, які жадаў бачыць на велікакняжацкім троне свайго сына Вітаўта.

Нягледзячы на знешні аб’ектывізм апавядання, сімпатыі аўтара цалкам на баку Кейстута і яго сына Вітаўта, якія намаляваны ім як сумленныя і высакародныя рыцары ў супрацьвагу здрадліваму, няўдзячнаму і бязлітаснаму Ягайлу. Каб узяць верх над сваім магутным і небяспечным сапернікам, Ягайла ўступіў у змову з крыжакамі і запрасіў іх на дапамогу. Ягайла не быў упэўнены ў сваёй перамозе і пайшоў на хітрасць. Ён запрасіў Кейстута і Вітаўта на перамовы, каб мірным шляхам закончыць дынастычную спрэчку. Кейстут і Вітаўт паверылі Ягайлу і прыехалі да яго. Але па загаду Ягайлы бацька і сын былі схоплены, закаваны ў ланцугі і адведзены ў Крэўскі замак. Старога князя - Кейстута адразу пазбавілі жыцця, а Вітаўту ўдалося выратавацца. Ён пераапрануўся ў жаночае адзенне і ўцёк з-пад стражы.

Летапісец, глыбока веруючы чалавек, разглядае палітычную ўладу як боскую з’яву. Ён выступае супраць гвалтоўных метадаў авалодання ёю, выказваецца супраць выкарыстання ў палітыцы амаральных сродкаў, асуджае бязлітаснасць, каварства, падман і г.д. Негатыўна адносіцца летапісец і да міжусобіцаў і спрэчак паміж князямі, якія вядуць да аслаблення дзяржавы [5, с. 48].

Другая частка «Летапісца» прысвечана княжанню Вітаўта. З агульнадзяржаўных пазіцый аўтар апісвае дзеянні Вітаўта ў напрамку цэнтралізацыі княства: паходы на Віцебск, Смаленск, Украіну, пазбаўленне ўлады непакорлівых мясцовых князёў, далучэнне да Вялікага княства мяжуючых з ім рускіх і ўкраінскіх зямель, узмацненне адзінства дзяржавы. Аўтар «Летапісца» ухваляе барацьбу Вітаўта за аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель у адзінай дзяржаве, яго эфектыўную цэнтралізатарскую палітыку.

Заключная частка «Летапісца...» апавядае пра ролю ліцвінскіх князёў абароне Падолля ад мангола-татар, аб іх укладзе ў будаўніцтва гарадоў, мураваных вежаў, замкаў і палацаў у Падоллі. «Аповесць пра Падолле» напісана з мэтай абгрунтавання правоў Літвы на гэтыя землі ў супрацьвагу экспансіі Польшчы, якая ў 1430 г. захапіла Заходняе Падолле [4, с. 28].

**«Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.».** Яшчэ адным помнікам грамадска-палітычнай думкі Беларусі першай паловы XV ст. з’яўляецца «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.». Храналагічна летапіс ахоплівае падзеі ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XV ст. Яго назва звязана 1446 г. таму, што менавіта гэтым годам датуецца ў ім апошні запіс. Помнік створаны каля 1430 г. на падставе старажытнарускіх і беларускіх гістарычных крыніц, напісаны ён на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. На сённяшні дзень лічацца, што большасць твораў, з якіх складзены Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г., напісаны ў Смаленску і што натхняльнікам гэтай справы быў епіскап (пазней мітрапаліт) Герасім, патрыёт ВКЛ і прыхільнік захавання яго цэласнасці [6].

Галоўныя палітычныя ідэі «Летапісу», па-першае, абгрунтаванне гістарычнай заканамернасці і неабходнасці ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, палітычнага аб'яднання беларускіх, літоўскіх і ўкраінскіх зямель у адзінай дзяржаве, і, па-другое, асэнсаванне і раскрыццё палітычнай ролі ВКЛ ва Усходняй Еўропе.

Сярод іншых частак «Летапісу» асабліва вылучаецца арыгінальны помнік старажытнай беларускай літаратуры - «Пахвала вялікаму князю Вітаўту». Летапісец усхваляе аб'ядн аўчую цэнтралізатарскую палітыку Вітаўта, накіраваную на стварэнне самастойнай дзяржавы – ВКЛ. Гісторыя ВКЛ разглядаецца як заканамерны і арганічны працяг гісторыі ўсіх усходніх славян, адзначаецца яе выдатная роля ў гісторыі Еўропы. Аўтар ганарыцца палітычнай магутнасцю і высокім міжнародным аўтарытэтам князя. Ён адзначае, што кіраўнікі шмат якіх краін «честь велику и дары многи и дани приношаху ему (Вітаўту)» і імкнуліся з ім «во велицей любви живуще» [4, с. 28].

Цікавыя думкі выказаны ў частцы летапіса які называецца «Смаленская хроніка». У ім апавядаецца пра грамадзянскую вайну ў ВКЛ паміж князямі Свідрыгайлай і Жыгімонтам Кейстутавічам 1432-1436 гг., пра паўстанне «чорных людзей» у Смаленску 1440 г. Аўтар асуджае Свідрыгайлу, бо распачатая ім грамадзянская вайна падрывала еднасць дзяржавы і грамадскі спакой. Акрамя таго ён ужываў жорсткія і амаральныя метады дасягнення

сваіх мэтаў. Паўстанне смалян таксама асуджаецца як сепаратысцкае, накіраванае на пашырэнне феадальнай раздробленасці. Пры гэтым аўтар спачувае ахвярам паўстання.

**«Хроніка Быхаўца».** Цікавым помнікам агульнадзяржаўнага беларуска-літоўскага летапісання, а таксама грамадска-палітычнай думкі Сярэднявечча Беларусі і Літвы з’яўляецца так званая «Хроніка Быхаўца». Яна атрымала назву ад прозвішча свайго ўладальніка - ваўкавыскага памешчыка Аляксандра Быхаўца, у бібліятэцы якога была знойдзена на пачатку XIX ст. Напісана на беларускай мове лацінкай.

«Хроніка Быхаўца» прысвечана палітычнай гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI ст. (заканчваецца апісаннем падзей 1506 г.). Найбольш падрабязна пададзены падзеі з гісторыі дзяржаўнага жыцця ВКЛ перыяду княжэння Вітаўта (1392-1430 гг.), а таксама наследнікаў Ягайлы - яго сына Казіміра Ягелончыка (Вялікі князь літоўскі з 1440 па 1492 гг.), а таксама яго ўнука Аляксандра Казіміравіча (1492-1501 гг.).

Галоўную ролю ў гісторыі ВКЛ аўтар хронікі адводзіць Вялікім князям літоўскім (Міндаўгу, Войшалку, Вітаўту і г.д.) як носьбітам велікакняжацкай улады, творцам унутранай і знешняй палітыкі, накіраванай на стварэнне магутнай і незалежнай дзяржавы.

Можна адзначыць, што цэнтральнай ідэяй Хронікі – гонар за гераічную спадчыну айчыны. Апісваючы ў рамантычным стылі шматлікія бітвы і паходы (бітву з крыжакамі пад Грунвальдам у 1410 г., татарамі пад Клецкам у 1506 г. і інш.), аўтар стараецца зацікавіць сучаснікаў гераізмам сваіх продкаў, абудзіць у свядомасці суайчыннікаў патрыятычныя пачуцці.

Новыя гістарыяграфічныя канцэпцыі ў Маскоўскай дзяржаве і Кароне Польскай, якія прэтэндавалі на землі ВКЛ, патрабавалі годнага адказу. Так, паводле польскага храніста Яна Длугаша легендарны «Рус», продак русінаў, быў адным з нашчадкаў Леха. Таму нашчадкі Руса трактаваліся ім як частка польскага народа. Адпаведна экспансіянісцкая ўсходняя палітыка Кароны ў дачыненні да Галіцка-Валынскай Русі ды імкненне да інкарпарацыі ВКЛ выглядала ўзнаўленнем старажытнай сувязі паміж часткамі адзінага калісьці народа. У сваю чаргу, у маскоўскіх зборах сцвярджалася, што адзінымі легітымнымі пераемнікамі першай Кіеўскай дзяржавы ёсць маскоўскія ўладары, а літоўскія князі былі заўсёды залежнымі ад іх ды трымаюць «чужыя», маскоўскія, вотчыны [6].

Менавіта дзеля абвяржэння гэтай канцэпцыі была створана легенда пра Палемона, які быў «рымскім князем», сваяком Нерона, але з-за жорсткасці імператара ўзначаліў уцёкі 500 сем’яў знатных рымлян, прывеў іх на землі будучага ВКЛ і стаў продкам князёў, якія панавалі ў Жамойці, Літве і Полацку. Прыбліжаныя Палемона далі пачатак высакароднай ліцвінскай шляхце. Фактычна «рымская» легенда набывае выразна антыпольскую скіраванасць, падмацоўвае тэзу пра прамую перадачу ўлады ў Літву з імперскага Рыма і такім чынам падкрэслівае «ад старыны» больш высокі статус ліцвінскіх манархаў і нобіляў у параўнанні з польскай арыстакратыяй.

Падкрэсліванне самастойнасці Літвы і перамог над татарамі ў часы

нашэсця Батыя былі скіраваныя і супраць Маскоўскае дзяржавы, бо залежнасць ад Арды на стагоддзі выключыла яе ўладароў - даннікаў хана з кола раўнапраўных суверэнаў.

Такім чынам, беларуска-літоўскія летапісы і хронікі маюць вялікае культурна-гістарычнае значэнне як найкаштоўнейшыя крыніцы па гісторыі грамадска-палітычнай думкі Сярэднявечча, як адлюстраванне фарміравання беларускай народнасці і яе імкнення да стварэння самастойнай дзяржавы, да захавання яе незалежнасці як галоўнай палітычнай каштоўнасці.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
2. Бардах, Ю., Линодорский, Б, Пиетрчак М. История государства и права Польши /Пер. С польск. – М.: “Юрид.лит.”, 1980. – 560с.
3. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.
4. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
5. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
6. Марзалюк, І. Наша «кіеўская» й «літоўская» спадчына / І.Марзалюк // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступу: 20.09.2007.
7. Нікалаеў,М. Пачаткі кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага / М.Нікалаеў // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступу: 20.09.2007.
8. Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: Монография. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. – 154с.
9. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 111с.
10. Розин, В.М. Генезіс права: методологический и культурологический анализ. – М.: NOTA BENE Медиа Трейд Компани, 2003. – 336с.
11. Розин, В.М. Становление права в культуре средних веков // Право и политика. – 2003. - №9. – с.126-136.

# ТЭМА 4.
# ПАЛІТЫЧНЫЯ І ПРАВАВЫЯ ПОГЛЯДЫ БЕЛАРУСКІХ ГУМАНІСТАЎ (Ф.СКАРЫНА, М.ГУСОЎСКІ, М.ЛІТВІН, Л.САПЕГА)

## *1. Перадумовы і асаблівасці фармавання палітычнай і прававой думкі эпохі Рэнесансу на Беларусі*

Беларускае Адраджэнне выступае як натуральны працяг агульнаеўрапейскіх рэнесансавых прынцыпаў і тэндэнцый. Але разам з тым адраджэнская палітыка-прававая думка Беларусі мае шмат асаблівасцяў.

Спецыфіка Адраджэння ў ВКЛ абумоўлена цэлым шэрагам фактараў. Перш за ўсе, сам адраджэнскі светапогляд быў прышлым, яго носьбітамі сталі выхадцы з Княства, якія атрымалі адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах, а таксама тыя заходнееўрапейцы, якія былі запрошаны ці па сваёй ініцыятыве прыехалі на тэрыторыю ВКЛ. Ідэі Адраджэння былі вымушаны сутыкнуцца з рэчаіснасцю Княства і змяніцца, прыстасоўваючыся да яе. Менавіта таму, абмяркоўваючы тыя ж праблемы, што і на Захадзе, тутэйшыя мысляры прапаноўвалі своеасаблівыя адказы.

Справа ў тым, што Вялікае княства ў пачатку XVI ст. толькі ўвайшло ў шэраг дзяржаў Заходняй цывілізацыі. Хуткая мадэрнізацыя сацыяльных інстытутаў на заходні феадальна-саслоўны лад, якая пачалася пасля Крэўскай уніі і працягвалася на працягу ўсяго XV ст., толькі дасягнула сваёй мэты – фармавання феадальнай дзяржавы і саслоўнага грамадства.

Мадэрнізацыя грамадства прывяла да шэрагу асаблівасцяў беларускага права. Па-першае, асноўнай крыніцай усіх саслоўных прававых сістэм і ў матэрыяльным і фармальным сэнсах стала дзяржаўная ўлада і яе прававыя акты.

Па-другое, штучнае паскарэнне пабудовы развітога феадальнага грамадства прывяло да яго доўгага ўкаранення ў XV-першай палове XVI стагоддзях, доўгаму афармленню карпаратыўных прававых сістэм, іх прынцыпаў, функцый. Так, фарміраванне шляхоцкага саслоўя было скончана толькі да сярэдзіны XVI ст., калі на Бельскам сойме ВКЛ у 1564 г. магнаты пад ціскам шляхты далі згоду на стварэнне земскіх саслоўных судоў, у якіх кандыдатаў на пасады суддзяў прызначалі шляхецкія соймікі. Адначасова была праведзена новая адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Новыя паветы, створаныя ў 1565 - 1566 гг., былі не толькі адзінкамі судовай, адміністрацыйнай, ваеннай арганізацыі, але і саслоўнай арганізацыі шляхты, бо кожны павет меў свой павятовы соймік. Скончыла працэс эмансіпацыі шляхты берасцейская папраўка Статуту 1566 г., якая прадставіла свабоду адчужэння спадчынных маёнткаў без згоды сваякоў і дзяржавы.

Пасля Крэўскай уніі, з працэсам фармавання феадальных адносін, пачынаецца паскоранае занявольванне сялян. Па Прывілею Казіміра 1447 г. разам з перададзенымі у трыманне землямі, дзе пражывалі сяляне-абшчыннікі, Вялікі князь перадае ў карысць феадала частка або большасць павіннасцяў сялян гэтай зямлі. Скарачэнне колькасці вольных сялян

адбывалася ўсё XVI ст. у накірунку з захаду краіны на ўсход.

Станаўленне гарадскога саслоўя таксама адбывалася не адначасова. Пасля зняволення Крэўскай уніі вялікі князь выдае прывілеі на самакіраванне па магдэбургскім праве ў 1387 г. Вільні, а ў 1390 і 1392 гг. - Бярэсьце і Гародне. Пры гэтым, як адзначае Ю.Бардах, немалаважным тут быў элемент прэстыжу [1, с. 148]. Гарадское насельніцтва на той момант яшчэ не было сфармавана як саслоўе, усведамляючае свае эканамічныя і прававыя інтарэсы. Колькасна яно было невялікае [9, с. 160].

Толькі з актывізацыяй занявольвання сялян у сяр.XV ст. пачаўся рост насельніцтва гарадоў. Тады жа ўзрасла зацікаўленасць княжай улады ў павелічэнні прыбытку ад гандлю, прыцягненні новых жыхароў, што і выклікала ў канцы XV ст. хвалю надавання гарадам магдэбургскага права: у 1441 г. яго атрымаў Слуцак, у 1498 - Полацак, 1499 - Менск і інш. [6, с. 136]. Пры гэтым перавод на магдэбургскае права быў хутчэй не вынікам змагання гараджан за свае правы, колькі спосабам, з дапамогай якога цэнтральная ўлада імкнулася забяспечыць эканамічны ўздым краіны.

У такіх умовах, ідэі Рэнесансу, уласцівыя перыяду пачатку распаду феадальнага ладу, які адбываўся ў Заходняй Еўропе, прыйшлі ў толькі сфармаванае саслоўнае грамадства. Аб'ектыўна яны маглі быць успрынятыя толькі элітай дзяржавы, якая імкнулася адпавядаць заходнееўрапейскім культурным тэндэнцыям.

Адсутнасць дастатковых унутраных перадумоў для ўспрымання ідэй Адраджэння прывялі іх да спецыфічнай мадыфікацыі. Аналіз канкрэтнага гісторыка-прававога матэрыялу сведчыць аб тым, што гуманістычна-рэфармацыйныя ідэі не атрымалі ў Беларусі паслядоўнай буржуазнай інтэрпрэтацыі, а асвойваліся кампрамісна, узгадняліся з толькі што укаранёнымі феадальнымі ўяўленнямі аб дзяржаве і праве. Асаблівасцю эпохі Адраджэння ў ВКЛ з'яўлялася меншая, чым у Заходняй Еўропе, кантрастнасць паміж рэнесансавымі і сярэднявечна-хрысціянскімі формамі і метадамі мыслення, адносная размытасць межаў паміж імі. Таму на думку сучаснага беларускага філосафа У.Конана дзеля вызначэння базавай ідэйнай асновы рэнесансавай палітыка-прававой думкі Беларусі XVI ст. тэрмін «хрысціянска-рэнесансавы гуманізм», які адлюстроўвае пераемнасць дзвюх эпох [3, с. 38].

Сітуацыя ўскладнялася і тым, што на беларускіх землях перакрыжоўваліся два магутныя ідэалагічныя патокі – праваслаўнага Усходу і каталіцкага Захаду.

У адрозненні ад Захаду, у Беларусі прынцып індывідуальнай свабоды чалавека ў грамадска-палітычнай і прававой думцы не атрымаў усебаковага развіцця. Найбольш тыповаю з'яваю беларускай рэнесансавай думкі была распрацоўка ідэі «агульнага дабра» - самаахвярнай дзейнасці асобы на карысць дзяржавы, айчыны.

Цэнтральнае месца чалавека ў філасофіі Рэнесансу ў прававой сферы абумовіла распаўсюджванне ідэй аб прыярытэце права і законаў, адмову ад успрымання рымскага правапарадку ў якасці ўніверсальнага, разуменне

свяшчэннасці і непарушнасці дамоў і маёмасных правоў, азначэнне злачынства як парушэння закона і дзяржаўнай волі і пакаранні як сродка застрашвання насельніцтва.

Перш за ўсё, быў успрыняты прынцып прыярытэту правапарадку, прычым прыярытэту пісанага правапарадку. Ф.Скарына, А.Валан і большасць мысляроў эпохі Адраджэння адзначалі важнасць права для дзяржавы, бо «яго недасканаласць, супярэчнасць натуральнаму закону выклікаюць канфлікты, бунты і нават міжусобныя войны» [3, с. 51]. У першым Статуце 1529 г. утрымліваюцца ўказанні аб адзінстве права і прыярытэце пісанага права - «иж усе падданыя нашы, так вбогие, яка і багатыя,… роўна а одностайным тым пісаным правам мають сужоны быти» [14]. Дадзеную норму замацоўваюць і астатнія Статуты. Аднак згаданыя прынцыпы спалучаліся з існаваннем некалькіх саслоўных прававых сістэм і іх крыніц. Такім чынам, у Статутах толькі пачынаўся працэс станаўлення адзінай агульнадзяржаўнай прававой сістэмы.

Акрамя таго, нарастае разуменне спецыфічных рыс права ў кожнай дзяржаве, з'яўляюцца патрабаванні да яго адпаведнасці асаблівасцям месца, часу, звычаяў.

Рэнесансны прынцып роўнасці перад законам і судом таксама зведаў мадыфікацыю. Нараўне з яго абвяшчэннем у Статутах, само права розных саслоўяў заставалася розным, утрымлівала розныя прывілеі і абавязанні. Але ўсё ж ў Статуце 1588 г. уводзілася норма, якая прадугледжвала смяротнае пакаранне для шляхціца за забойства простага чалавека, забаранялася аддаваць у «няволю» вольных людзей, і назоў «чэлядзь нявольная» замянілі на «чэлядзь дваровая» [3, с. 62].

Пачынаючы з Судзебніка 1468 г. адбываецца ўспрыманне новых ідэй справядлівасці і іх выраза ў паняцці злачынства і пакарання. У Судзебніку на першы план высоўваецца супрацьпраўнасць учынка - злачынец здзейсніў «проступку», «над правам сягнул». Зварот у Статуце 1529 г. да старога паняцця «крыўды» - шкоды ў адносінах да прыватнай асобы - толькі паказвае паступовасць і пераемнасць развіцця ідэй, бо ў Статуце 1588 г. ужо выразна робіцца акцэнт на супрацьпраўнасці злачынства, яго грамадскай небяспецы. Адначасова ў статутах узрастала роля пакарання як застрашвання, «строкгость паспалітага права» [7, с. 181].

Такім чынам, палітычная і прававая думка Адраджэння на землях Беларусі мела спецыфічныя асаблівасці. Само ж Адраджэнне мэтазгодна падзяліць на тры храналагічныя перыяды. Паводле прапанаванай А.Лойкам перыядызацыі, першы «скарынінскі», перыяд прыпадае на 10-40-я гады XVI ст. Другі, звязаны з Рэфармацыяй (дзейнасць С.Буднага, А.Волана, В.Цяпінскага), адносіцца да 50-70-х гадоў XVI ст. Трэці перыяд звязаны з дзейнасцю Льва Сапегі (80-90-я гады XVI ст.).

## <u>*2. Палітычныя і прававыя погляды Ф.Скарыны*</u>

Францыск Скарына (1490-1551) - выдатны прадстаўнік нацыянальнай палітычнай і прававой думкі эпохі Адраджэння. Яго творчасць з'ўляецца

яскравым прыкладам спецыфічных рысаў Адраджэння на землях Вялікага княства Літоўскага, спробай здзейсніць сінтэз хрысціянскай багаслоўскай традыцыі з антычнай і заходнееўрапейскай рэнесанснай філасофскай культурай.

Галоўнай крыніцай для вывучэння светапогляду Ф.Скарыны, у тым ліку палітычных і прававых ідэй, з'яўляецца яго прадмова да перакладу «Другога закона» - заключнага раздзелу «Пяцікніжжа» Маісея, а таксама прадмовы і пасляслоўі да астатніх выдадзеных ім біблейскіх кніг.

Эпоха Адраджэння, якая стала перыядам нараджэння еўрапейскіх народнасцей, у тым ліку беларускай (станаўленне беларускай народнасці XIV-XVI стст.), замест ідэяў сусветнай хрысціянскай імперыі на першае месца высунула ідэі патрыятызму. Светапогляд Ф.Скарыны таксама прасякнуты моцнымі нацыянальна-патрыятычнымі ідэямі, якія ён выказваў у такіх знакамітых паэтычных словах: *«Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, - тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають».* У прадмове да кнігі «Юдзіф» ён заклікаў суайчыннікаў, каб «всякого тружания и скарбов для посполитого доброго и для отчизны своей не лютовали» [5, с. 146].

Значнае месца ў прадмовах і пасляслоўях Ф.Скарына адводзіць палітычным праблемам. Для абазначэння дзяржавы Ф.Скарына ўжывае ў сваіх працах узыходзячыя да антычнай палітычнай думкі такія тэрміны, як «посполитое доброе», «отчина своя», «собрание людское» і іншыя. Яны павінны былі азначаць арганізацыю насельніцтва, якое займае акрэсленую тэрыторыю і падпарадкоўваецца адной уладзе, мэтай якой з'яўляецца дасягненне ўсеагульнай карысці, дабрабыту і згоды. У прадмове да Біблii Ф.Скарына тлумачыць, што «незгода и наибольшие царства разрушаеть», а «справа всякого собрания людского і всякого града, еже верою, соединением ласки и згодою посполитое доброе помножено бываеть».

Палітычным ідэалам Ф.Скарыны з'яўляецца асветная, гуманная і моцная манархія. Узорам для добрага ўладара павінны выступаць Саламон, Пталамей Філадельф, Салона, Лікург і іншыя старажытнаўсходнія і антычныя цары і заканадаўцы. Правіцель, лічыць Ф.Скарына, павінен быць дабрачынным, мудрым, адукаваным, дабрадзейным, справядлівым, чулым да сваіх падданых. Ён абавязаны кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за справядлівым выкананнем правасуддзя. Акрамя таго, ён мусіць быць дужым, умець у неабходным выпадку абараніць свой народ. Але ўсё ж, Ф.Скарына аддаваў перавагу асвечанаму і міралюбіваму гаспадару. Яго ідэалам у гэтым сэнсе быў егіпецкі цар Пталамей Філадэльф, які меў «более нежели четырьдесять тысещей» кніг і быў «милосник навуки и мудрости», а таксама цар Саламон, так як «был мир и покой по вся времена царства его» [10, с. 58].

У адпаведнасці з рэаліямі тагачаснага грамадства, Ф.Скарына не

адмаўляў існавання ў ім маёмаснай няроўнасці, лічыў нармальным яго станавую структуру, аднак пры гэтым ён заклікаў да сацыяльна-палітычнай згоды, лічыў, што ўзаемаадносіны паміж «богатыми» і «убогими» павінны складвацца на аснове «братолюбия», «друголюбия», «незлобия». Грамадства павінна грунтавацца на міры і згодзе неаднаразова падкрэсліваў гуманіст.

Некаторыя даследчыкі, аналізую творчую спадчыну Ф.Скарыны, прыйшлі да высновы аб прыхільнасці яго да ідэяў уніі паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Гэтая праблема, пачынаючы з Крэўскай уніі, прыцягвала думкі дзяржаўных асобаў і грамадскіх дзеячаў ВКЛ. Каментуючы новазапаветныя тэксты Ф.Скарына неаднаразова ўказваў на неабходнасць паяднання хрысціян, бо яны маюць аднаго настаўніка – Ісуса Хрыста, які адзіны можа быць названы сапраўдным першасвятаром царквы [3, с. 43-44].

Асаблівую цікавасць выклікаюць думкі беларускага гуманіста аб праве, яго структуры. Адмаўляючы сярэднявечныя ўніверсалісцкія ідэі, ён адзначае, што пісаны закон павінен быць «почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный подле прирождения, подлуг обычаев земли, часу и месту пригожий, явный, не имея в собе закритости, не к пожитку единого человека, но к посполитому доброму написаний». У гэтых думках змешчаны цэлы комплекс пазітыўных прававых прынцыпаў, заснаваных на тэорыі натуральнага права. Іншымі словамі, аўтар адмаўляецца ад прызнання рымскага права сусветным ідэалам, ад спробаў пабудаваць нязменную прававую сістэму, а ўказвае на рэлятыўнасць свецкага заканадаўства, неабходнасць яго адпаведнасці звычаям, часу і месцу, указвае на яго мэту - быць годным для выканання, быць карысным для насельніцтва.

Значную цікавасць уяўляюць погляды Ф.Скарыны на класіфікацыю права, найбольш поўна выкладзеныя ў прадмове да кнігі «Другі закон Маісееў». Працягваючы вучэнне антычных мысліцеляў Арыстоцеля, стоікаў, Цыцэрона, хрысціянскіх аўтараў Аўгусціна, Фамы Аквінскага, Ф.Скарына падзяляе натуральна-прававыя погляды на прыроду права. Ён падзяляе апошняе на права натуральнае і пісанае. Натуральнае права («прироженое») закладзена ў самой істоце чалавека. Яно аднолькавае для ўсіх людзей, уласціва кожнаму чалавеку і не залежыць ад месца і часу. «Сей закон прироженый написан ест в серци единого кажного человека». Сэнс яго ў наступным: «То чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам нехощеши от иных имети» [4, с. 58].

Мысліцель адзначае, што праведнаму чалавеку іншых законаў не патрэбна, бо яго законам з'яўляецца сумленне і пачуццё асабістай адказнасці. Заканадаўства ж пісанае патрэбна для людзей злых, няправедных, каб з дапамогай страха пакарання прымусіць іх жыць добрасумленна. Для падмацавання сваёй тэзы Ф.Скарына спасылаецца на словы апостала Паўла з «Першага паслання да Цімафея»: «… закон патрэбен не для праведніка, але для беззаконных і непакорлівых, бязбожных і грэшнікаў…» [10, с. 55].

Пісанае права Ф.Скарына падзяляў на боскае (змешчана ў кнігах Старога і Новага Запавету), царкоўнае (кананічнае - «правила светых отец на сборех

пописаные») і земскае. Крыніцай апошняга гуманіст лічыць суверэнную волю народа, яго «кажный с своими старейшими ухвалили... яко им наилепей видело быти».

Земскае права Ф.Скарына падзяляе на: паспалітае права (яно ўключала ў сябе нормы грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага права), міжнароднае, дзяржаўнае («царскае»), ваеннае («рицерское»), гарадское («местьскае»), марское, гандлёвае («купецькое») права. Такі падзел права у значнай ступені спрыяў як развіццю прававой тэорыі, так і практыцы кадыфікацыі. Супастаўленне прававых ідэй Ф.Скарыны са зместам Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 г. дазволіла асобным даследчыкам, (напрыклад, прафесару Я.А. Юхо) прыйсці да высновы, што Скарына мог удзельнічаць у распрацоўцы гэтага зводу законаў.

У адпаведнасці з распаўсюджанымі ў эпоху Рэнесансу ідэямі, Ф.Скарына называў у якасці мэт крымінальнага пакарання - застрашванне злачынцы і адначасова папярэджанне іншым асобам, здольным да злачынства. У параўнанні з мінулай эпохай, калі злачынства разглядалася ў катэгорыях прыватнага права і інтарэсу, гэта быў значны крок да забеспячэння правапарадку і бяспецы ў краіне.

Як адзін з лепшых прадстаўнікоў гуманізму эпохі Адраджэння, Ф.Скарына з’яўляўся прыхільнікам ідэі міру паміж народамі («вечнага міру»), абвешчанай такімі выдатнымі сучаснікамі, як Дантэ, Піка дэла Мірандола, Эразм Ратэрдамскі, Себасцьян Франк. Ён страсна жадаў, каб «понеже был мир и пакой по все времена» [4, с. 59]. Гэтая ідэя Ф.Скарыны актуальная і сёння.

### ***3. Палітычныя і прававыя погляды М.Гусоўскага***

Да ліку беларускіх гуманістаў XVI ст. адносіцца Мікола Гусоўскі (каля 1480-1533) - выдатны паэт-гуманіст эпохі Адраджэння.

Станаўленне светапогляду М.Гусоўскага праходзіла ў Заходняй Еўропе, у Італіі – сэрцы заходнееўрапейскага Рэнесансу. З 1518 па 1523 гг. М.Гусоўскі знаходзіўся ў Рыме ў складзе беларуска-польскай дыпламатычнай місіі і меў магчымасць цесна сутыкацца з акружэннем рымскага папы Льва Х, які быў прыхільнікам гуманістычных ідэй, велікасвецкага ладу жыцця. Менавіта для яго быў напісаны у Рыме галоўны твор М.Гусоўскага «Песня пра зубра» (Поўная назва «Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго»).

Паэма складаецца з дзвюх частак. У першай частцы даецца апісанне зубра, гэта значыць яго знешняга выгляду, паводзін у розных сітуацыях, стане ведаў аб ім. У другой частцы расказваецца аб небяспечным і цяжкім паляванні на гэтага звера. У паэме выкладзена прадуманая рэнесансная канцэпцыя гарманічных адносін чалавека, прыроды і грамадства. Бясспрэчная пастаноўка М.Гусоўскім праблемы аховы навакольнага асяроддзя, ашчадных адносін да скарбаў прыроды, рацыянальнага, гаспадарскага выкарыстання прыродных багаццяў. Так, паэт ганарыцца тым, што з часоў Вітаўта statкі зуброў у Вялікім княстве Літоўскім «ахоўвае

строгая грамата князя», якая аберагае іх ад вынішчэння. І сапраўды, па Статуту ВКЛ 1588 г. за забойства зубра браканьер павінен быў заплаціць на карысць дзяржаве штраф у памеры 12 грошай (сума па тых часах значная).

Захапленне Папы паляваннем паэт-дыпламат выкарыстаў для інфармавання Усяленскага пасаду аб сваёй радзіме, яе велічы, развіцці, праблемах. У паэме М.Гусоўскі выказаў Льву Х як свае палітычныя погляды, так і палітычную праграму беларуска-польскай дыпламатычнай місіі. У творы паэт паспрабаваў прыцягнуць увагу заходнееўрапескіх народаў да вырашэння найбольш небяспечных міжнародных праблемаў.

Свае палітычныя думкі М.Гусоўскі выкладае у выглядзе невялікіх адступленняў ад галоўнага сюжэта паэмы «Песня пра зубра», у паэмах «Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпні месяцы», «Жыццё і подзвігі св.Гіяцынта».

У паэме «Песня пра зубра» аўтар удзяляе шмат увагі характэрнай для рэнесансавай палітычнай думкі тэме ідэальнага ўладара. Менавіта ў той час выхадзяць у свет і працы Т.Мора, А.Гевары, Н.Макіявелі і інш. Не старажытны цар ці законатворца, як у Ф.Скарыны, а гаспадар сваёй краіны – Вялікі князь Вітаўт - паказаны паэтам як прыклад для ўсёй Еўропы.

Апісваючы княжанне Вітаўта, М.Гусоўскі закранае ў сваім творы перш за ўсё крытэрыі ацэнкі палітычнай дзейнасці ідэальнага манарха. Гэта ў першую чаргу экспансіяністцкая знешняя палітыка, пашырэнне межаў дзяржавы. У часы праўлення Вітаўта тэрыторыя ВКЛ дасягнула самых вялікіх памераў. У прыватнасці, на поўдні ён пашырыў уладанні княства да чарнаморскага ўзбярэжжа. На ўсходзе граніцы княства распасціраліся да вярхоўяў Акі і Мажайска. На поўначы ён аказваў уплыў на палітыку Ноўгарада і Пскова. М.Гусоўскі з гонарам піша аб Вітаўце, які «сілу радзіме надаў, княства вялікім зрабіў».

Галоўнай мэтай дзейнасці Вітаўта было стварэнне моцнай, баяздольнай арміі, ваенная арганізацыя і ваенная навука:

*.............................................у годы княжэння*
*Грознага Вітаўта ўсюды на землях дзяржавы.*
*Кожны дзядзінец пры замках, груды між балотаў –*
*Гэта пляцы і пляцы для вайсковых заняткаў.*
*Мірны перыяд між войнамі быў перадышкай,*
*Каб адпачыць, падвучыцца і, страты пакрыўшы,*
*Рушыць у новы паход* [4, с. 63].

Аб’ектыўна выдзяляючы пашырэнне межаў краіны і як крытэр ідэальнага ўладара, паэт, выказваючы асабістую думку, выступае супраць вайны як з’явы: «Войны! Злачынная справа вайны выклікае гнеў мой, і слёзы, і боль» [10, с. 59-60].

Наступным крытэрам ідэальнага манарха з’яўляецца справядлівасць. У гады княжання Вітаўта людзі прытрымліваліся законаў, вяршыўся жорсткі, але справядлівы велікакняжацкі суд:

*Ён справядлівасць любіў, шанаваў яе нормы святыя,*
*Не дазваляў, каб махляр дзесьці абходзіў закон.*

*Як ужо ў суд выклікаў, то большая колькасць віноўных*
*Самі губілі сябе, толькі б не йсці да яго.*
*Людзі з нячыстай душой пятлю панадзейней шукалі,*
*Шанцаў не меў ліхадзей неяк ад кары ўцячы.*

Вялікі князь сурова караў ілжэсведкаў, суддзяў-хабарнікаў:

*Жорстка ўладар катаваў ілжывых, падкупленых сведкаў*
*З тым, каб ніхто надалей суддзям хлусіць не пасмеў.*
*Хмуры, азмрочаны, ён выслухоўваў клятваадступцаў,*
*Вельмі баяўся ілжэц рот для няпраўды раскрыць.*
*Рэшткі знявечаных цел, абгарнутых звярынаю шкурай,*
*Кідалі вучаным псам, каб разарвалі нашчэнт.*
*Вітаўт без жалю караў і суддзяў, да хабару ласых,*
*Скора, як некага з іх ён выкрываў хоць бы раз.*
*Кажуць, суддзю аднаго раздзерлі на часткі, бо хцівец*
*Права за тым прызнаваў, хто яму хабары нёс.*
*Той лёгкадум пагарджаў суровым эдыктам для суддзяў,*
*Вось і расцялі яго дзеля навукі другім.*
*Знікла, прапала тады саслоўе людзей прагавітых,*
*Дык і за гэтакі плён Вітаўту слава навек* [4, с. 63].

Умацаванне дзяржаўнай улады служыла з'яўленню высокага міжнароднага аўтарытэта дзяржавы, перад якім схіляліся нават такія моцныя краіны-суседкі, як Крымскае ханства, Маскоўскае княства, Атаманская імперыя:

Ва ўяўленні М.Гусоўскага ідэальны ўладар не толькі мужны ваяр ці суровы суддзя, але і добры хрысціянін. У паэме Вітаўт паўстае як хрысціянскі правіцель, які не толькі сам спавядаў хрысціянскія прынцыпы, але і клапаціўся аб чысціні хрысціянскай веры, яе ўмацаванні і пашырэнні. Зразумела, што паэт наўмысна абмінае сапраўдную складаную рэлігійную палітыку вялікага князя, які веру выкарыстоўваў толькі як сродак у дасягненні сваіх палітычных мэтаў, мяняў сваё веравызнанне ў залежнасці ад палітычных абставін. Для Папы і заходнееўрапейскіх чытачоў князь Вітаўт у паэме паўстае як верны сын Каталіцкай царквы, які шмат зрабіў для пашырэння заходняга хрысціянства ў сваім валадарстве.

*Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы*
*Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,*
*І называюць той век залатым. Разбяромся:*
*Мне так здаецца, што гэтай шаноўнаю назвай*

*Век той названы па простай прычыне: дзяржаўца*
*Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна*
*Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы.*
*Ён быў набожны, і першы з народамі княства*
*Сам ахрысціўся, прызнаўшы, што з верай паганскай*
*Повязі ўсе парывае, а ідалаў веры*
*ён загадаў пазбіраць і паніш чыць, і цэрквы*
*Богу адзінаму скрозь будаваў, і надзелы*
*Служкам духоўным адвальваў з угоддзяў не скупа*
[4, с. 64].

Але «залаты» век скончыўся, бо пасля смерці Вітаўта многае з яго вялікай спадчыны было страчана. Яго пераемнікі не здолелі працягваць яго пераможную палітыку, аказаліся не падрыхтаванымі да працягу яго вялікай справы. Паэт нават не ўпамінае шэрагу імёнаў Вялікіх князёў літоўскіх, што кіравалі пасля Вітаўта.

Толькі сучасны для М.Гусоўскага гаспадар - Жыгімонце I Стары, атрымаў некалькі дыпламатычных хвалебных словаў ад паэта. У паэме «Жыццё і подзвігі св.Гіяцынта» аўтар надае вялікаму князю хвалу за тое, што ён мужна абараняе краіну і сцеражэ дабрабыт народа, «одаряет подданых равным уделом и правым судом», з гонарам прытрымліваецца «нябеснага закону» і г.д.

У сучаснай яму краіне паэт ясна бачыць сур’ёзныя крызісныя з’явы, якія аслабляюць дзяржаву, вядуць яе да заняпаду. У першыню ў палітычнай думке ВКЛ пачынае гучаць страх за будучыню валадарства, апісваюцца яго праблемы. Перш за ўсё гэта беззаконне, свавольства вышэйшых слаёў грамадства. М.Гусоўскі апісвае першыя праявы той будучай «шляхецкай дэмакратыі», якая ў будучыні раз’яднае краіну, прывядзе ў заняпад яе дзяржаўны лад.

*Мы — шчэ натоўп, грамада непісьменная, цемра.*
*Князь і баяры — усе, каму льга заступіцца,*
*Глухі для нас і не горай, чым жорсткі татарын,*
*Душаць пятлёй галасы абурэння ў народзе.*
*Плаха і кат-выканаўца - вось доля любога,*
*Хто пастаяць за закон і за бога азваўся* [4, с. 64].

Раз’яднанасць народа, палітычных груповак асабліва небяспечны ва ўмовах знешняй пагрозы для дзяржавы. Некалі моцная і магутная краіна зараз вымушана бараніць свае межы ад захопнікаў.

Зацятае змаганне з Маскоўскім княствам, цывілізацыйнае супрацьстаянне з Крымскім ханствам і Турцыяй вымушае дзяржаву трымаць у напружанні свае ваенныя сілы, руйнуе дабрабыт жыхароў. М.Гусоўскі падкрэслівае, што, прымаючы ўдары з усходу на сябе, ВКЛ засланяе грудзямі

хрысціянскія народы Еўропы.

*Мы на пярэднім краі хрысціянства заставай*
*Орды варожыя грудзі на грудзі прымаем.*

М.Гусоўскі імкнецца прыцягнуць у вагу Папы да незлічоных пакут жыхароў Польшчы і ВКЛ, просіць яго дапамогі ў спыненні вераломных нападаў крыжакоў на заходнія межы краіны.

Паэт-дыпламат выразна бачыць пагрозу, што навісла над усёй хрысціянскай цывілізацыяй. Моцная і ваяўнічая Асманская імперыя пагражае ўсей Заходняй Еўропе, але толькі ВКЛ і Польшча, сцякаючы крывёю, адбіваюць яе напады. Астатнія народы Еўропы выступаюць пабочнымі назіральнікамі, вядуць між сабой кровапралітныя, міжусобныя войны, аслабляючы адзін аднаго. Паэт асуджае братазабойчыя войны еўрапейскіх дзяржаў паміж сабой, іх агрэсіўную знешнюю палітыку ў адносінах адна да адной.

Адзінству хрысціянскага свету пагражае рэфармацыйны рух. Гусоўскі адмоўна ставіцца да дзейнасці Лютара, які пазбавіў храмы хараства, забараніў маліцца святым і Дзеве Марыі, адпрэчыў інстытут святарства і, тым самым расхістаў найстаражытнейшыя ўстоі рэлігіі. Паэт крытыкуе Рэфармацыю, абвінавачвае яе ў намеры скасаваць не толькі духовую, але і свецкую ўладу., узбудзіць у грамадстве ўсеагульную нянавісць і варожасць, развязаць грамадзянскую вайну. М.Гусоўскі празорліва бачыў, што Рэфармацыя, якая пачалася як антыкаталіцкі рух, паступова прывядзе Еўропу да сацыяльна-палітычнага крызісу, выкліча істотныя змены.

Адмаўляючы вайну між хрысціянамі, паэт-гуманіст прызнае неабходнасць справядлівых, абарончых войнаў. Менавіта таму ён заклікае хрысціянскія дзяржавы Еўропы аб’яднаць свае намаганні, каб процістаяць турэцкай агрэсіі. У канцы паэмы М.Гусоўскі звяртаецца да Дзевы Марыі з малітвай, у якой заклікае кіраўнікоў Еўропы спыніць міжусобіцы і накіраваць свае сілы супраць агульнага ворага, выканаць свой хрысціянскі доўг:

*Нашым князям, што ў сваіх міжусобіцах розум*
*Нашай крывёй замуцілі, падай на пахмелле*
*Мысляў і ўчынкаў цвярозасць, вярні раўнавагу*
*Мудрых дзяржаўцаў, напомні пра іх абавязкі.*

Паэт выказвае надзею на аб'яднаўчую, каардынуючую палітыку змяніўшага на папскім прастоле Льва X - Адрыяна VI, які зможа стварыць кааліцыю еўрапейскіх дзяржаў, што будзе процістаяць агрэсіі Турцыі:

*Папскі прастол Адрыяна і свет хрысціянства*
*Заклікам боскім згуртуй, апалчы супраць турак* [4, с. 67].

На вялікі жаль у пачатку XVI ст. еўрапейскія гасудары не прыслухаліся да прарочых заклікаў М.Гусоўскага, не здолелі стварыць лігі еўрапейскіх хрысціянскіх дзяржаў, накіраваную супраць Турцыі. Тым не менш, ідэя, сфармуляваная М.Гусоўскім, стала адной з цэнтральных у еўрапейскай палітычнай думцы XVI-XVII ст., пра што сведчаць працы С.Ажэхоўскага, А.Пасевіна і іншых. Толькі калі пагроза дакацілася да цэнтральнаеўрапейскіх

краін быў створаны Антытурэцкі саюз. У вырашальнай бітве пад Венай (12 верасня 1683 г.), аб'яднаныя сілы еўрапейскіх дзяржаў пад на чале з каралём Рэчы Паспалітай Янам ІІІ Сабескім нагалаву разграмілі ўзброеныя сілы Турцыі, пасля чаго яна ўжо не думала аб інтэрвенцыі ў Еўропу.

### *4. Палітычныя і прававыя погляды М.Літвіна*

К сярэдзіне XVI ст. адбылося пашырэнне крызісных з'яваў у грамадскім і дзяржаўным ладзе ВКЛ. З гэтага часу апісанне праблемаў і пошук шляхоў выхаду з крызісу становіцца адной з галоўных тэмаў у палітычнай і прававой думкі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У сярэдзіне XVI ст. яна была выразна пастаўлена ў творы выдатнага мысліцеля-гуманіста Міхалона Літвіна «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцянаў».

Твор М.Літвіна мае шэраг асаблівасцяў, якія адрозніваюць яго ад папярэднікаў. Па-першае, твор мае яскрава выражаны інструментальны характар. Ён прысвечаны Жыгімонту ІІ Аўгусту, які у 1548 г. уступіў на трон ВКЛ і Польскага каралеўства. З новым манархам аўтар звязвае свае надзеі на правядзенне шэрагу важных, неабходных і неадкладных дзяржаўных рэформ. Змест твора М.Літвіна накіраваны перш за ўсё на тое, каб падахвоціць Жыгімонта ІІ Аўгуста да правядзення палітычных рэформ, да ўнясення пэўных змен у заканадаўства, рэфармавання дзяржаўнага кіравання, судаўладкавання, існуючых сацыяльных адносін.

Другім адрозненнем становіцца своеасаблівае стаўленне аўтара да традыцыі. Большасць насельніцтва ВКЛ успрымае «норавы і звычаі» як несумнеўную каштоўнасць. Прынцып «старины не рухать» з'яўляецца яскравым выражэннем адносін жыхароў краіны да ўселякіх зменаў, вынікам адмоўнай рэакцыі народа на шматлікія змены якія адбываліся ў часы Хрышчэння Русі, Крэўскай уніі і г.д.

У адрозненне ад большасці М.Літвін патрабуе ацэнкі традыцый з дапамогай крытэраў разумнасці, справядлівасці. Тыя звычаі, якія не адпавядаюць гэтым патрабаванням павінны быць адменены. Замест іх аўтар прапануе запазычыць досвед іншых народаў, нават не хрысціянскіх.

Трэцяя асаблівасць заключаецца ў тым, што аўтар ацэньвае становішча краіны з свецкіх пазіцый. Будучы чалавекам веруючым, ён абапіраецца на традыцыйную для тагачаснай Беларусі неклерыкальную свядомасць. Поліканфесійнасць краіны, адносная слабасць уплыву цэркваў на дзяржаву не дазваляла перамагчы якой-небудзь з тэалагічных канцэпцый (праваслаўнай ці каталіцкай), насычала свядомасць этычным зместам хрысціянскага вучэння і спрыяла існаванню незалежных метадалагічных падыходаў. Менавіта таму, у сваім творы М.Літвін выказвае думку аб дэтэрмінізме і ўзаемасувязі сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных адносін у грамадстве.

У сваім творы аўтар выкарыстоўвае распаўсюджаны ў часы Рэнесансу літаратурны прыём, параўноўваючы існы ў ВКЛ грамадскі і дзяржаўны лад з норавамі і звычаямі іншых народаў. Ідэалізацыя жыцця апошніх павінна была стаць пабуджальным матывам для рэфарматарскай дзейнасці ў Айчыне.

Як палымяны патрыёт мысліцель выступіў з рэзкай крытыкай грамадскага і дзяржаўнага ладу ВКЛ, судовых устаноў, існуючага права, часам не зусім абгрунтавана прыводзячы ў якасці асновы для пераймання парадкі Маскоўскай дзяржавы і Крымскага ханства.

Перш за ўсё, ён абураецца недахопамі ў грамадскім ладзе ВКЛ, які, на яго думку служыў інтарэсам прывілеяваных алігархічных груп. Вельмі шкодным ён лічыў імкненні сваіх суграмадзян да раскошы, багацця, марнатраўства. Прычым не само багацце з'яўляецца злом, а тое як яно пераразмяркоўваецца. Нельга каб бедныя «паміралі з голаду і холаду» [10, с. 63]. У якасці прыкладу для пераймання ён прыводзіць жыццё татараў, у якіх няма нерухомасці, няма перавагаў у вопратцы і маёмасці, «а таму ўсе жывуць … без крайняй нястачы» [10, с. 60].

У параўнанні з татарамі практыка ВКЛ, калі шляхта вызваляліся амаль ад усялякіх падаткаў, а ўвесь цяжар па ўтрыманню дзяржаўнага апарату ўскладаўся на плечы сялян і гараджан, была недарэчнай і нерацыянальнай. «А было б значна лепей, - заўважаў М. Літвін, - каб той, у каго больш зямлі і плаціў бы болей» [4, с. 70].

Мысліцель-гуманіст глыбока спачувае пакутам феадальна-залежных сялян, а халопства наогул прапануе ліквідаваць. «Мы злоўжываем нашай уладай над імі, - пісаў М. Літвін, - страшэнна мучым іх, нявечым, часам забіваючы іх без суда па найменшаму падазрэнню» [4, с. 70].

Эканамічныя заганы краіны цесна звязаны з палітычнымі. Вышэйшае саслоўе злоўжывае сваім прывілеяваным становішчам. Усе пасады ў структуры дзяржаўнай улады, як вышэйшыя, так і ніжэйшыя, сканцэнтраваны ў руках магнатаў. У дзяржаве склалася такое становішча, пры якім «адзін чалавек займае дзесяць пасад, а іншыя аддалены ад дзяржаўных спраў» [4, с. 70]. М.Літвін лічыць неабходным зрабіць кіраванне прафесійным, нават прызначаць на адну пасаду некалькі чалавек, увесці абавязковае інфармаванне службоўцамі насельніцтва аб выніках сваёй працы.

Несправядлівасць назіраецца і ў судаводстве. Перш за ўсе, шкоду краіне прыносіць плата за правасуддзе, бо прыводзіць да беспакаранасці злачынцаў з-за адсутнасці грошай у пацярпелых. «Нават язычніцкія законы забараняюць браць узнагароду за правасуддзе. У нас жа гэты звычай з'явіўся нядаўна з-за імкнення магнатаў прыстасаваць законы да сваёй карысці». Практыка платы за правасуддзе садзейнічае развіццю хабарніцтва. «За адну пячатку да паперы, якую патрабуюць да судовай справы і якая каштуе адзін грош, пісар патрабуе чатыры» [4, с. 70].

Існаванне шматлікіх саслоўных судоў, дзе суддзямі выступаюць прыватныя асобы прыводзіць да непрафесіяналізму судовай улады, да злоўжыванняў, парушэнню правоў, несправядлівасці. Найвялікшая справядлівасць адбываецца ў манарыяльных судах - судах феадалаў над сялянамі, у якіх апошнія ніколі не знойдуць справядлівасці. Нават за забойства шляхцічам селяніна, першы будзе вымушаны толькі выплаціць кампенсацыя сваякам забітага, калі яны ўсе ж змогуць дамагчыся правасуддзя.

У татараў і масквіцянаў «права суда над усімі падданымі баронаў і шляхты, як у грамадзянскіх, так і ў крымінальных справах, належыць не прыватнай асобе, а прызначанаму грамадскаму чыноўніку, прычым цвярозаму і такому, які жыве разам з усімі». Дзеля грамадскай справядлівасці патрэбна каб правасуддзе адбывалася публічна, у прысутнасці іншых асобаў, адваката. «Нашы ж вырашаюць справы і аднаасобна, і п’янствуючы, выгнаўшы пасрэднікаў і сведак, і могуць рабіць, што захочуць» [10, с. 64].

Для вырашэння праблемы М.Літвін прызывае да забеспячэння роўнасці саслоўяў перад законам, прапануе ўвесці ў княстве агульнасаслоўныя суды, а права вынясення смяротных прысудаў ускласці толькі на цэнтральныя суды, рэфармаваць адміністрацыйную сістэму ВКЛ, рэарганізаваць велікакняжацкую канцылярыю, судаводства і судаўладкаванне, павысіць абароназдольнасць краіны і г.д.

Толькі ў сферы судаводства некаторыя праблемы, узнятыя ў трактаце Міхалона Літвіна, былі вырашаны ў часе правядзення судовай рэформы 1564 г., прыняцця II і III Статутаў ВКЛ, стварэння Трыбунала ВКЛ.

### ***5. Палітычныя і прававыя погляды Льва Сапегі***

Л.І.Сапега (1557-1633) паходзіў са знатнага магнацка-княжацкага роду, другога па магутнасці ў ВКЛ пасля Радзівілаў. Ён нарадзіўся 4 красавіка 1557 г. непадалёку ад Віцебска (маёнтак Астроўна), першапачатковую адукацыю атрымаў пры двары Мікалая Радзівіла Чорнага. Потым на працягу некалькіх гадоў слухаў лекцыі на юрыдычным факультэце Лейпцыгскага універсітэта.

Пасля вяртання на радзіму Л.Сапега займаў самыя важкія дзяржаўныя пасады у ВКЛ. У 1581-1585 гг. - ён пісар вялікі літоўскі, у 1585-1589 гг.- падканцлер літоўскі, у 1589-1623 гг. - канцлер вялікі літоўскі і з 1623 г. - гетман Вялікага княства Літоўскага.

Л.Сапегу належыць заслуга ў рэфармаванні судаўладкавання ВКЛ, стварэння ў 1581 г. Трыбунала Вялікага княства Літоўскага - саслоўнага шляхецкага суду другой і апошняй інстанцыі, які праіснаваў да канца XVIII ст. Ён прымаў удзел у рабоце камісіі па стварэнню Статута ВКЛ 1588г., спрычыніўся да яго прыняцця і выдання. Л.Сапега атрымаў ад караля выключнае права на выданне Статута «пісьмом беларускім і польскім друкаваці і ў паветы рассылаці».

Статут ВКЛ 1588 г. юрыдычна замацаваў адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім пасля Люблінскай уніі. Ён адлюстраваў значную дзяржаўна-палітычную самастойнасць княства, адасобленасць яго тэрыторыі, дзяржаўных установаў, арміі, заканадаўства, суду, казны, дзяржаўнай беларускай мовы ад Каралеўства Польскага, што было дасягнута дзякуючы ўсебаковым намаганням Льва Сапегі. У «Звароце» да ўсіх саслоўяў ВКЛ, змешчаным у якасці прадмовы да Статута, Л.Сапега з гонарам адзначаў: «...Не обчым (не чужым) якім языком, але сваім уласным (беларускім) права пісаныя маем».

Галоўнымі крыніцамі для вывучэння палітычных і прававых поглядаў Л.Сапегі з’яўляюцца: «Прысвячэнне» выдання Статута каралю польскаму і

вялікаму князю літоўскаму - Жыгімонту III Вазе; «Зварот» да ўсіх саслоўяў (грамадзян) Вялікага княства Літоўскага; сам Статут 1588 г., на змест якога глыбока паўплывалі і адлюстраваліся ў ім палітыка-прававыя погляды Л. Сапегі; эпісталярная спадчына Л.Сапегі (перш за ўсе «Ліст Л.Сапегі да Іязафата Кунцэвіча» напісаны ў 1622 г.); а таксама самастойная праца «Выклад трыбунальскіх правоў» (1616 г.).

У сваіх творах Л.Сапега выкладае сваё разуменне прававой дзяржавы. Трэба адзначыць, што яго погляды на дзяржаву і права знаходзяцца пад уплывам гуманістычных традыцый эпохі Адраджэння з іх паважлівым вывучэннем спадчыны антычных аўтараў, перш за ўсё Арыстоцеля і Цыцэрона. Леў Сапега выступае як прыхільнік моцнай, унітарнай і цэнтралізаванай краіны, але ў адрозненне ад прыхільнікаў абсалютызму, ён лічыць, што цэнтралізацыя і адзінства краіны могуць быць гарантаваны не шляхам узмацнення аднаасобнай улады, а шляхам устанаўлення трывалага дзяржаўнага правапарадку.

Падставай права Л.Сапега, як рэнесансны мысліцель-гуманіст, лічыць натуру чалавека, той розум і прадбачлівасць, якімі Бог адарыў чалавека. Розум з’яўляецца крыніцай і маральных, і прававых азначэнняў, прычым апошнія вынікаюць з першых. Аднак, працягвае канцлер, не ўсіх прырода надзяліла пачуццём маральна-прыгожага, таму і дадзена Богам «святое права», каб служыць цуглямі і стрымліваць нахабнікаў [5, с. 94]. Сапега ўказваў на цесную сувязь паміж мараллю і правам, мяркуючы, што шчаслівае грамадства – гэта прававое грамадства [11, с. 51-52].

Валадарства закона Л.Сапега цесна звязвае з катэгорыяй свабоды. «Мудрацы ўсіх вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку нічога не можа быць даражэй за свабоду» [5, с. 94]. Сутнасць свабоды складаюць неадчужальныя правы чалавека - уласнасці і асабістай недатыкальнасці. «А для прыстойнага чалавека няма большай асалоды,- пісаў Л.Сапега,- як жыць у сваёй айчыне ў поўнай бяспецы, ні з кім не біцца і не сварыцца і каб ніхто яго не зняславіў ці пакалечыў або паквапіўся на яго дабро» [5, с. 94].

Менавіта для абароны грамадзянскіх свабодаў і існуе права. «Галоўнай мэтай законаў ва ўсім свеце, - лічыў Л.Сапега,- з’яўляецца падтрыманне ў грамадстве такога становішча, каб кожны мог захоўваць у непарушнасці добрае імя, здароўе і маёмасць і не цярпець з боку іншых ніякай шкоды. У гэтым і заключаецца наша свабода, якой мы ганарымся перад іншымі хрысціянскімі народамі» [5, с. 95]. Паводле думак Л.Сапегі права, па-першае, абараняе жыхароў краіны ад злоўжыванняў з боку манарха, прадухіляе яго пераараджэнне ў тырана. Па-другое, закон накіраваны супраць злачынцаў, свавольнікаў, ён забяспечвае дзяржаве ўнутраны парадак і спакой.

Л.Сапега любіў паўтараць і ўжываць у сваіх творах крылаты афарызм Цыцэрона: «Мы павінны з’яўляцца рабамі законаў для таго, каб мець магчымасць карыстацца свабодай». Гэта катэгарычны імператыў грамадства. Толькі павага да права дасць магчымасць быць сапраўды свабоднымі. «А пра тое ён, вялікі і паважаны філосаф грэчаскі Арыстоцель сказаў,- спасылаўся

Л.Сапега на аўтарытэт другога выдатнага мысліцеля антычнасці, - што там,... дзе права альбо статут пануе, там сам бог усім кіруе» [4, с. 101-102].

Аднак для забеспячэння законнасці недастаткова толькі добрых законаў. Неабходна каб кожны чалавек вывучаў законы сваёй краіны, ведаў свае правы і абавязкі, разумеў межы сваёй свабоды. «Кожнаму прыстойнаму чалавеку належыць іх ведаць, і будучы дасведчаным у іх, стрымліваць сябе ў сваіх учынках, дзейнічаць у адпаведнасці з пісаным законам і нікога не крыўдзіць, а калі б сам кім быў пакрыўджаны, ведаў, дзе абарону і лекі ад крыўды сваёй шукаць» [5, с. 95]. Больш таго, як і рымскі сенатар, які не ведаючы законаў, браўся судзіць сабе падобнага, «кожны жыхар заслугоўвае ганьбавання, калі сваімі вольнасцямі пахваляецца, а карыстацца законам і разумець яго як асабістую засцярогу не жадае» [5, с. 95].

Леў Сапега ідэйна абгрунтаваў падыход дзяржавы да вырашэння рэлігійнага пытання ў ВКЛ. З свецкіх дзяржаўных пазіцый ён выступае за рэлігійную талерантнасць. Будучы прыхільнікам уніі, ён лічыў, што кожны мае права сам рабіць свой рэлігійны выбар. Сам Бог «не прымае слуг, якіх яму дастаўляюць сілай», - пісаў ён да ўніяцкага біскупа Я.Кунцевіча. Леў Сапега адстойваў таксама прынцып незалежнасці і прымату свецкай улады над духоўнай. Не прымаючы спробу Я.Кунцевіча апраўдаць вышэйшымі інтарэсамі царквы гвалт у адносінах да вернікаў, ён патрабаваў, каб той «уладу сваю і абавязкі духоўніка прыстасаваў да волі гаспадарскай і намераў ураду», бо «усе, што не ў згодзе з мірным жыццём і грамадскай карысцю, можа смела разглядацца як злачынства» [3, с. 53].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
2. Бардах, Ю., Линодорский, Б, Пиетрчак М. История государства и права Польши /Пер. С польск. – М.: “Юрид.лит.”, 1980. – 560с.
3. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
4. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
5. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206с.
6. Дзмітрачкоў, П.Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Другая палова XIII-першая палова XVII стст.: вуч. дап. / П.Ф. Дзмітрачкоў. – Магілеў: МДУ ім. А.А.Куляшова, 2003. – 312 с.

7. Доўнар, Т.І. Развіцце асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV-XVI стагоддзях / Т.І. Доўнар. – Мн.: Пропилеи, 2000. – 224 с.
8. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура: падручнік / А.А.Лойка. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 319 с.
9. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. / М.П. Касьцюк [и др.]; АН Беларусі, Ін-т гісторыі. - Мн.: Беларусь, 1994. - Ч.1. – 527 с.
10. Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.
11. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.
12. Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: Монография. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. – 154с.
13. Розин, В.М. Становление права в культуре средних веков // Право и политика. – 2003. - №9. – с.126-136.
14. Статут Великого княжества Литовского 1529 года (Текст, перевод и словарь-комментарий) / Минск. АН БССР; под ред. К.И. Яблонского. – Минск: Изд-во Акад. Наук БССР, 1960. – 253 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vostlit.narod.ru/Texts/Dokumenty/Litva/XVI/1520-40/Statut1529/text1.htm . – Дата доступа: 11.07.2005.

# ТЭМА 5.
# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА ЭПОХІ РЭФАРМАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

## *1. Палітычная і прававая думка пратэстантызму. Яе асаблівасці на беларускіх землях*

У Еўропе з сярэдзіны XV-XVI стст. мела месца Пратэстанцкая рэвалюцыя (Рэфармацыя).

Рэфармацыя (лат. reformation – пераўтварэнне, перабудова) - гэта сацыяльна-палітычны і рэлігійны рух, накіраваны супраць рымска-каталіцкай царквы і яе ролі ў палітычнай сістэме грамадства. Ідэйным падмуркам Рэфармацыі сталі сярэднявечныя ерасі і гуманізм эпохі Адраджэння, які выступаў з крытыкай сярэднявечнага светапогляду і, разам з тым, абгрунтаваў прынцыпы буржуазнага індывідуалізму.

У Заходняй Еўропе Рэфармацыя была выклікана цэлым шэрагам сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў. Так, неабходна адзначыць імкненне заможнай часткі купцоў, жыхароў гарадоў аказваць уплыў на ўнутраную палітыку краіны. Перш за ўсе яны імкнуліся забяспечыць дамінаванне агульнадзяржаўнай палітыкі, заканадаўства ў гандлёвай сферы, пераадоленне феадальнай раздробленасці краіны, гарантавання бяспекі гандлю, скасавання ўнутрыдзяржаўных мытных збораў і г.д. Пры рэалізацыі сваіх памкненняў яны сустрэліся з процідзеяннем феадалаў і царквы, якая асвячала феадальна-саслоўную структуру грамадства. Царква сама была буйнейшым феадалам, таму ў Заходняй Еўропе Рэфармацыю – рух, які імкнуўся абмежаваць уладу царквы, пазбавіць яе маёмасці, знайшоў шырокую падтрымку сярод жыхароў гарадоў, мелкага дваранства.

Каб абгрунтаваць аслабленне Каталіцкай царквы ідэолагі Рэфармацыі стварылі вучэнне аб асабістай адказнасці чалавека перад Богам. Яны лічылі, што для выратавання душы веруючага не патрабуецца пасрэдніцтва каталіцкай царквы, таму што выратаванне адбываецца не вонкавым праяўленнем рэлігійнасці (добрымі справамі), а ўнутранай верай. Рэфармацыйнае вучэнне, такім чынам, адмаўляла неабходнасць існавання царквы як іерархічнага інстытута, шматлікага духавенства як асобнага сацыяльнага слоя.

Будучы гнанымі, пратэстанцкія лідэры актыўна апелявалі да прынцыпаў талерантнасці, аднак пасля перамогі ў шэрагу нямецкіх краінаў яны радыкальна змянілі свае погляды на прынцыпы ўзаемаадносін паміж вернікамі розных канфесій. Дадзеную эвалюцыю можна прасачыць на прыкладзе М.Лютэра, які ў 1528 г. абураўся жорсткім пераследам анабаптыстаў, а ўжо ў 1530 г. дапускаў пакаранне «ерэтыкоў» аж да смяротнай кары [2, с. 81-94]. У 1540-1550-я гг. ён выдае шэраг прац супраць іудзеяў, прасякнутых духам крайняга фанатызму, далучаецца да прыхільнікаў ідэі «справядлівай вайны» супраць мусульман. М.Лютэр

фактычна адмовіўся ад ранейшых перакананняў адносна спецыфікі духоўнай і свецкай супольнасцяў і заклікаў дзяржаўныя улады да дэпартацыі прадстаўнікоў іншых хрысціянскіх канфесій.

Адыход ад прынцыпаў цярпімасці меў месца і ў кальвінізме. Ж.Кальвін у 1554 г. вылучае некалькі тэзісаў на карысць светапогляднай неталерантнасці:

– цярпімасць адносна памылкі ў справах веры раўназначна прызнанню таго, што ў ёй могуць быць засяроджаны элементы ісціны, што немагчыма;

– цярпімасць дэстабілізуе асновы рэлігіі, ставіць пад сумненне яе аўтарытэт;

– бяспека рэлігіі і гонар Бога патрабуюць радыкальнага ўціску «ерасі». Каталіцкая царква, на яго погляд, памыляецца не ў тым, што лічыць слушнай ідэю пакарання «ерэтыкоў», а ў тым, што карае як ерэтыкоў «прававерных» [1, с. 189-190].

Для паслаблення Каталіцкай царквы ідэолагі Рэфармацыі патрабавалі секулярызацыі (адчужэння) царкоўнай маёмасці, перш за ўсе, зямельнай уласнасці каталіцкай царквы на карысць дзяржавы і прыватных асоб, ліквідацыі каталіцкіх кляштараў, адмены царкоўнай дзесяціны, пышнага каталіцкага культу. Яны дамагаліся стварэння таннай царквы, пазбаўленай уплыву на дзяржаву, пасады якой былі б выбарнымі і якая б знаходзілася пад кантролем свецкай улады.

Каталіцкая царква акрамя Святога пісьма лічыць крыніцай веры св.Традыцыю – звычаі Касьцёла, вучэнне святых і Айцоў Царквы, заканадаўчыя акты, прынятыя на царкоўных саборах (каноны), папскія дэкрэты і пасланні. Менавіта Традыцыя дазваляла Папству адстойваць свой прымат над свецкай уладай. Каб пазбавіць Царкву мажлівасці выкарыстоўваць звычай як падмурак яе ўлады ідэолагі Рэфармацыі абвясцілі Свяшчэннае пісанне (Біблію) - адзінай крыніцай веры і адмаўлялі значэнне Св.Падання.

Рэфармацыя закранула асновы светапогляду той эпохі, выклікала істотныя змены ў праве і спадарожнічала зменам у эканамічнай падструктуры грамадства. У вобласці права Рэнесанс і Рэфармацыя дэкларавалі наступныя ідэі: прымат свецкага правапарадку над царкоўным, прыярытэт права і законаў, гарантый і правоў асобы на жыццё і ўласнасць, свяшчэннасць і непарушнасць дамоваў і маёмасных правоў. У справядлівасці акцэнт быў перанесены з вартасці Бога, пры якім кожнае правапарушэнне яму крыўда і патрабуе пакаяння, на закон, усталяваны Богам (і боскае, і натуральнае права). Парушэнне адпаведна патрабавала ў першую чаргу пакарання як сродка аднавіць закон і правапарадак, а затым ужо раскаяння [3, с. 44-46, 586; 5, с. 38].

У Заходняй і Цэнтральнай Еўропе пратэстантызм выклікаў рэвалюцыю ў грамадскай свядомасці, і яго ідэі ўкараніліся ў выніку доўгіх войнаў і сацыяльных пераўтварэнняў. Спачатку мела месца распаўсюджванне лютэранства ў XVI ст., якое забяспечыла пераразмеркаванне юрысдыкцыі і ўлады на карысць дзяржавы ў асобе абсалютнага манарха і афармленне яго

як вярхоўнага свецкага заканадаўца. У XVII ст. атрымаў распаўсюджванне кальвінісцкі кангрэгацыяналізм, які сваімі ідэямі аб здольнасці ўсіх хрысціян, а не толькі кіраўнікоў да выпраўлення міру і прыярытэце мясцовай абшчыны на чале з выбарным святаром і старэйшынамі над любымі палітычнымі ўладамі, заклаў падмурак ангельскага і амерыканскага заканадаўства грамадскіх правоў і свабодаў, адлюстраваных у канстытуцыях абедзвюх краін: свабоды слова і друку, свабоды адпраўлення рэлігіі, адсутнасці прымусу пры дачы невыгодных для сябе паказанняў і інш. Ён забяспечыў аснову такіх паўстаўшых у Новы час паняццяў, як грамадская дамова і ўрад са згоды кіраваных.

Прававыя і грамадскія ідэі пратэстантызму (аслабленне ўлады царквы, секулярызацыя, ідэі абсалютызму, а потым і выбарнасці ўладаў) ўспрынялі ўсе дзяржавы Еўропы, у тым ліку і тыя, што адмовіліся ад яго рэлігійнай дактрыны.

У Вялікае княства Літоўскае ідэі Рэфармацыі пачалі пранікаць з XV ст., калі Вітаўт падтрымліваў міжнародныя сувязі з гусітамі. У пачатку XVI ст. на Беларусі атрымалі распаўсюджванне ідэі Рэнесансу і пратэстантызму (рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ галоўным чынам у формах лютэранства, кальвінізму і арыянства (антытрынітарызму)). Аднак позні прыход феадальных адносін, неразвітасць гарадоў і буржуазных адносін не дазволілі гуманістычна-рэфармацыйным ідэям зрабіць пераварот у сацыяльнай структуры грамадства. Яны засвойваліся кампрамісна, узгадняліся з феадальнымі сярэднявечнымі ўяўленнямі аб дзяржаве, грамадстве і праве [5, с. 37].

У найбольшай ступені сінтэз традыцыйных феадальных і інавацыйных рэфармацыйных ідэй выявілася ў дзяржаўна-прававой сферы. Перш за ўсё, быў успрыняты прынцып прыярытэту правапарадку, прычым прыярытэту пісанага правапарадку.

Узнікшыя ў рамках лютэранства ідэі аб абсалюце свецкай улады ў асобе манарха, таксама падзяляліся найбольш выбітнымі духоўнымі дзеячамі той эпохі - Ф.Скарынай, М.Гусоўскім, А.Валанам, С.Будным, П.Скаргой, але не ўкараніліся ў ВКЛ, і само лютэранства атрымала сваё распаўсюджванне ў асноўным у асяроддзі іншаземцаў.

Кальвінізм, наадварот, быў успрыняты магнатамі і шляхтай. Такая элітарнасць успрымання пратэстантызму прывяла да таго, што ідэі абмежавання ўлады манарха, удзела ў кіраванні дзяржавы народа, шырокага самакіравання на месцах распаўсюдзіліся толькі на прывілеяванае шляхоцкае саслоўе. У XVI ст. яны абмежавалі ўладу манарха прадстаўнічым органам Соймам, на месцах ствараліся земскія соймікі, была сфармаваная асобная ад адміністрацыі судовая сістэма земскіх шляхецкіх судоў на чале з Трыбуналам ВКЛ, якая дзейнічала на прынцыпах выбарнасці і нязменнасці суддзяў. Большасць асабістых і грамадзянскіх правоў, у тым ліку права ўласнасці на зямлю, распаўсюджваліся ў асноўным на шляхту.

Элітарнасць пратэстантызму ў ВКЛ прывяла да наступлення эпохі спачатку шляхецкай дэмакратыі, а потым і магнацкай алігархіі. Палітычныя

ідэі кальвінізму, нават пасля перамогі Контррэфармацыі сталі падмуркам элітарнай «сармацкай» ідэалогіі, якая ў выніку прывяла да стагнацыі дзяржаўнага апарату Рэчы Паспалітай, заняпаду краіны. Фармальна досыць шырокія канстытуцыйныя паўнамоцтвы караля: склікаць Вальный сойм, вызначаць тэрмін яго паседжанняў, прызначаць службовых асоб на дзяржаўныя пасты і інш. - з-за ўсеўладдзя шляхты, анархіі фактычна не рэалізоўваліся ім самастойна. «Liberum veto», у сваю чаргу, паралізавала дзейнасць Вальнага сойма.

## ***2. Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютэранства. А.Кульва.***

Пачатак Рэфармацыі на беларускіх землях звязаны з распаўсюджваннем тут лютэранскіх ідэй. Лютэранства пачало пранікаць на землі Вялікага княства Літоўскага ў 20-я гады XVI ст. з Усходняй Прусіі і Лівоніі (сучасная Латвія).

Стаўленне лютэран да свецкай улады было заснавана на ўяўленні, што чалавек жыве ў двух сферах: у сферы «евангелля» (рэлігійная сфера, стаўленне да царства нябеснага) і ў сферы «закона» (царства зямное, дзяржава). Калі б добрых людзей, сапраўдных хрысціян было больш, то не было бы неабходнасці ні ў каралях, ні ў князях, ні ў мячы, ні ў законе. Аднак добрых людзей меншасць, таму Бог і заснаваў два валадарства - духоўнае (для сапраўдных вернікаў) і свецкае (якое стрымлівае злых, прымушае іх захоўваць знешні мір і спакой).

Сапраўдны хрысціянін не патрабуе ні права, ні мяча, але ён павінен клапаціцца аб іншых людзях. Для забеспячэння бяспекі і спакою ён павінен плаціць падаткі, пачытаць начальства, служыць, рабіць усё, што ідзе на карысць свецкай улады. «Калі ты бачыш, - сцвярджаў Лютэр, - што бракуе катаў, вартаўнікоў, суддзяў, гаспадароў і кіраўнікоў, а ты лічыш сябе здольным (да гэтага занятку), то прапануй свае паслугі і займіся гэтым, каб не грэбавалі ўладамі, без якіх нельга абысціся…» [8, с. 218]. Хрысціянін толькі не павінен выкарыстоўваць уладу дзеля ўласнай карысці. «Вартаўнікі, каты, адвакаты і іншая набрыдзь», лічыў Лютэр, могуць быць хрысціянамі, паколькі ўлада і меч - служба боская, і таму «яны павінны быць тымі, хто бы адшукваў, вінаваціў, катаваў і забіваў злых, абараняў, прабачаў добрых, адказваў за іх і ратаваў іх» [8, с. 218].

Выкарыстоўваючы словы апосталаў Пятра і Паўла аб паходжанні улады ад Богам, Лютэр апраўдваў свецкую ўладу ва ўсіх яе непрывабных праявах. Акты дзяржаўнага насілля ў тым выпадку, калі яны садзейнічаюць грамадскай карысці, не асуджаюцца, нягледзячы на іх супярэчнасць з новазапаветнай этыкай. У той жа час насілле, накіраванае супраць свецкай улады, М. Лютэр адназначна адмаўляе [9, с. 133, 145, 159-160]. Ён лічыў, што Бог загадаў падпарадкоўвацца любой свецкай улады, якая адзіна не можа дыктаваць законы душам. «Усё звязанае з верай - вольная справа, і да гэтага ніхто не можа прымушацца» [8, с. 219]. Ва ўсім астатнім свецкая ўлада павінна быць абсалютна незалежнай ад царквы.

Змагаючыся з Каталіцкай царквой і феадальным ладам, гаражане, якія прынялі лютэранства, перадалі ўсю ўладу рукі сваіх саюзнікаў, свецкіх князёў і каралёў. Грамадзянская вайна католікаў і прыхільнікаў Лютэра на тэрыторыі Нямеччыны скончылася Аўгсбургскім рэлігійным мірам (1555 г.), згодна якому лютэранства станавілася роўным каталіцтву па прынцыпу: «Чыя дзяржава, таго і вера» («Cujus regio, ejus religio»). Гэта азначала, што свецкі ўладар краіны сам вызначае веру сваіх падданых.

**А.Кульва.** Лютэранскія ідэі з’явіліся на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага з Нямеччыны. Іх праваднікамі былі студэнты з ВКЛ, якія навучаліся ў нямецкіх універсітэтах, асабліва ў Лейпцыгскім. Першым значным прадстаўніком лютэранства на Беларусі быў Аўраам Кульва (каля 1510-1545 гг.), які атрымаў адукацыю і навуковую ступень доктара тэалогіі ў Германіі. У 1539 г. ён прыбыў у Вільню і пачаў выкладаць ў заснаванай лютэранскай школе. З-за пагрозы арышта ён пакінуў Вільню і выехаў у Крулявец (Кенігсберг), лютэранскае княства, дзе ў 1544 г. атрымаў месца прафесара тэалогіі ў адкрытым у тым жа годзе пратэстанцкім Кенігсбергскім універсітэце.

Універсітэт у Круляўцу быў створаны спецыяльна для распаўсюджвання лютэранства на землях Вялікага княства Літоўскага і Польшчы. Ва універсітэце было заснавана некалькі кафедраў на польскай, літоўскай і беларускай мовах, а таксама ўстаноўлена некалькі стыпендый для выхадцаў з Беларусі, Літвы і Польшчы, друкавалася пратэстанцкая літаратура.

Лютэранства не аказала якога-небудзь значнага ўплыву на насельніцтва Беларусі і Літвы і распаўсюдзілася ў асноўным сярод іншаземных гандляроў. У адрозненні ад Цэнтральнай Еўропы у ВКЛ гарады не былі настолькі ўплывовымі каб пачаць адыгрываць самастойную ролю ў дзяржаўнай палітыкі. Яны не сталі апорай у спробах каралёў Рэчы Паспалітай дамагчыся абсалютызацыі ўлады. Веравызнанне жыхароў гарадоў шмат у чым залежала ад уплыву магнатаў. Апошнія ж не падзялялі ідэі станаўлення абсалютызму, а былі прыхільнікамі рэспубліканскіх ідэй, прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі. Таму найбольшае распаўсюджванне сярод прыхільнікаў Рэфармацыі атрымаў кальвінізм з яго ідэяй абмежавання ўлады манарха выбарнымі інстытутамі.

## ***3. Палітычныя і прававыя погляды прадстаўнікоў кальвінізму (Мікалай Радзівіл Чорны, А.Волан)***

**М.Радзівіл Чорны.** Галоўным ініцыятарам распаўсюджвання кальвінізму на Беларусі і ў Літве быў канцлер ВКЛ, ваявода віленскі Мікалай Радзівіл Чорны (1515-1565 гг.). М.Радзівіл Чорны быў прыхільнікам саюзніцкіх адносін паміж ВКЛ і Польшчай, аднак рашуча выступаў супраць «федэрацыі» з ёю, пазбаўлення незалежнасці ВКЛ. Ён казаў: «Палякі ліпнуць да Літвы, як пчолы да кветак, каб сабраўшы мёд, выкінуць іх» [6, с. 78]. Менавіта таму ён разглядаў пратэстантызм як сродак, які дазволіць аслабіць каталіцкія, а значыць і польскія ўплывы ў ВКЛ.

У 1553 г. ён прыняў кальвінізм пад час навучання за мяжой.

Вярнуўшыся на радзіму, значную частку сваіх сродкаў і палітычнага ўплыву выкарыстаў на тое, каб садзейнічаць распаўсюджванню кальвінізму на беларускіх і літоўскіх землях. Па яго ініцыятыве тут будаваліся кальвінісцкія храмы, ствараліся кальвінісцкія абшчыны (дзеля гэтага зачынена 187 каталіцкіх касцёлаў і экспрапрыіраваны ўвесь іх зямельны фонд). Для працы ў гэтых абшчынах у якасці прапаведнікаў запрашаліся атрымаўшыя адукацыю ў заходнееўрапейскіх універсітэтах перакананыя прыхільнікі кальвінісцкіх ідэй. Сярод іх: Марцін Чаховіц (Вільня), Сымон Будны (Клецк), Лаўрэнцій Крышкоўскі (Несвіж), Сымон Зацыўс (Брэст) і г.д. Па яго ініцыятыве быў зроблены пераклад і выдадзены ў 1563 г. у Брэсце поўны тэкст Біблії. «Брэсцкая, альбо Радзівілаўская Біблія» - выдатны помнік рэнесанснага кнігадрукавання.

Пры храмах адчыняліся кальвінісцкім школы, у якіх выкладаліся асновы кальвінісцкага веравызнання. Для забеспячэння абшчын і школ неабходнай навучальнай і богаслужэбнай літаратурай, М.Радзівіл Чорны засноўваў друкарні. Першая друкарня на тэрыторыі сучаснай Беларусі была адкрыта ў Брэсце ў 1553 г. Следам за М.Радзівілам Чорным пайшлі яго сваякі і аднадумцы Вішнявецкія, Патоцкія, Сапегі, Валовічы і іншыя, якія, прыняўшы кальвінізм, таксама будавалі ў сваіх уладаннях кальвінісцкія храмы, запрашалі кальвінісцкіх прапаведнікаў, выдавалі пратэстанцкую літаратуру. Каля 1560 г. кальвінісцкі рух на тэрыторыі Беларусі і Літвы аформіўся ў стройную арганізацыю.

На чале рэлігійнай супольнасці (збору) стаяў прапаведнік (міністр, пастар). Кантроль за жыццём супольнасці ажыццяўлялі сеньёры, якія выбіраліся з ліку веруючых - магнатаў, шляхты, гараджан. Большасць збораў знаходзілася ва ўладаннях феадалаў і ўтрымліваліся за іх кошт. Патрон адыгрываў вельмі важную ролю у жыцці збору, што з'яўляецца яскравым прыкладам шляхецкага падмурку кальвінізму у ВКЛ, у адрозненне ад гарадскога ў Заходняй Еўропе..

Як ідэолаг кальвінізму, М.Радзівіл Чорны выказваў рэзкія антыкаталіцкія і антыпапскія ідэі. Ён заяўляў: «Не папы і біскупы, а каралі і князі павінны быць апекунамі царквы». М.Радзівіл Чорны выступаў супраць канцэнтрацыі абсалютнай свецкай улады ў руках манарха. Ён быў прыхільнікам перанясення рэспубліканскіх і дэмакратычных прынцыпаў уладкавання кальвінісцкіх абшчын на дзяржаву. Ён разглядаў кальвінізм як тэарэтычную аснову рэфармавання дзяржаўнага ладу ВКЛ і Польшчы ў напрамку шляхецкай дэмакратыі, якая ў канечным выніку ўсталявалася тут у другой палове XVIст.

**А.Волан.** Найбольш поўна палітычныя і прававыя аспекты дактрыны кальвінізму ў ВКЛ выклаў у сваіх творах Андрэй Волан (1530-1610 гг.). Вышэйшую адукацыю ён атрымаў у пратэстанцкіх універсітэтах Франкфурта-на-Одэры і Круляўца. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў у якасці сакратара велікакняжацкай канцылярыі пры каралях Жыгімонце II Аўгусце, Стэфане Баторыі і Жыгімонце III Вазе. З 1568 г. А.Волан з'яўляўся пастаянным паслом Сойма.

Найбольш поўна палітычныя і прававыя погляды А.Волана выкладзены ў працах «Пра палітычную, альбо грамадзянскую свабоду» (1572 г.), «Прамова да Сенату...або аб тым, якім павінна быць праўленне дабрачыннага караля» (1572 г.), «Пра шчаслівае жыццё, або найвышэйшае чалавечае дабро» (1596 г.), «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» (1608 г.). Разам з С.Будным, М.Стрыйкоўскім і інш. Волан удзельнічаў у выданні трактата Ф.Маджэўскага «Аб выпраўленні грамадства і дзяржавы» (1577 г.).

Палітыка-прававое вучэнне А.Волана заснавана на катэгорыі «свабоды» - «найцудоўнейшай з усіх дабротаў» [10, с. 80]. Рэалізацыя свабоды апісваецца аўтарам у адпаведнасці з тагачасным варыянтам канцэпцыі натуральнага права. Чалавек будзе свабодным калі забяспечваецца яго правы на жыццё і на ўласнасць [11, с. 56]. Свабода патэнцыяльна прыналежыць кожнаму чалавеку, бо нададзена яму ад прыроды. Аднак у сілу сваіх біялагічных адрозненняў людзі не здольны ў аднолькавай ступені зрэалізаваць свае правы на свабоднае жыццё і забяспечыць свой дабрабыт. Да таго ж, першародны грэх змяніў сутнасць чалавека, ён зрабіўся схільны да зайздрасці, насілля, уладалюбства, што ў выніку і прывяло да страты свабоды, да нявол, да парушэння натуральных правоў. Як і Арыстоцель, А.Волан лічыў сацыяльную і маёмасную няроўнасць натуральнай і справядлівай, а няроўнасць, якая ставіць пад пагрозу права чалавека на жыццё і ўласнасць, - несправядлівай.

Забяспечыць рэалізацыю свабоды ў грамадстве павінен закон, які аўтар звязвае з розумам, што закладзены ў прыродзе, з розумам Бога. І калі чалавек не здольны кіравацца розумам, а толькі афектамі, то закон накіруе дзейнасць чалавека па разумнаму і маральна-прыгожаму шляху. Без закону «не можа існаваць ніякае цывільнае грамадства, ніякі мір і спакой паміж людзьмі» [10, с. 83].

Сапраўдны закон павінен быць маральным і неразумным, забяспечваць рэалізацыю натуральных правоў чалавека, у адваротным выпадку ён – заганны, усталёўвае «злоснае самавольства». Але справядлівасць закона залежыць не толькі ад тых, хто яго прымае, але і ад тых, хто ажыццяўляе правасуддзе. А.Волан патрабуе пры вынясенне судовых рашэнняў улічваць усе акалічнасці справы, бо калі строга прытрымлівацца літары закона без увагі на канкрэтныя абставіны, то можна парушыць прынцыпы справядлівасці. Ён лічыць, што калі за крадзеж учынены чалавекам, які памірае з голаду, яго прыгаварыць у адпаведнасці з законам да смяротнага пакарання, то гэтае судовае рашэнне будзе не законным, а супрацьзаконным, бо яно не адпавядае катэгорыям дабра і справядлівасці. Акрамя таго, сцвярджае А.Волан, усялякая няяснасць і нявызначанасць у законе павінна служыць падставай для змякчэння адказнасці.

Вельмі важнай праблемай мысляр лічыць адпаведнасць службоўцаў сваім пасадам, бо ў адваротным выпадку ніякія добрыя законы не будуць рэалізоўвацца. Да дзяржаўнай дзейнасці павінны дапускацца тыя, хто дасканала ведае філасофію - «настаўніцу ў справах кіравання», ведае законы, умее адрозніваць дабро і справядлівасць, валодае цвёрдасцю дзяржаўнай

асобы, то бок паддасца ні маленню, ні запалохванню.

А.Волана жорстка крытыкуе стан справаў у Рэчы Паспалітай, дзе, на яго думку, выбарнасць непрафесійных суддзяў прыводзіць на судовыя пасады людзей без спецыяльнай адукацыі, не кампетэнтных, якія кіруюцца пры вырашэнні спрэчак не законам, «а на падставе бяздумнага і сляпога пачуццёвага парыву» [10, с. 84]. У якасці прыкладу ён прапануе ўзяць судовыя сістэмы Іспаніі, Францыі, Венецыі.

У сваіх працах А.Волан разглядаў дзяржаву як гістарычную з'яву. Прааналізаваўшы творы Арыстоцеля і Платона, ён прыйшоў да высновы, што ўсе тры формы кіравання (манархія, арыстакратыя і дэмакратыя-палітыя) з'яўляюцца карыснымі для грамадзян пакуль існуюць устойліва. А так як спрадвеку ў Рэчы Паспалітай склалася і існуе манархія, то яе неабходна разглядаць у якасці найлепшай для гэтай краіны. Адзінай умовай павінна быць, каб кіраванне манарха абапіралася на законы. Галоўнай мэтай дзяржаўнай улады павінна быць захаванне згоды і парадку у краіне, забеспячэнне грамадскага дабрабыту.

Дзяржаўная ўлада, заканадаўчая ініцыятыва павінны належыць шляхце, аднак ні Паны-рада, ні Сойм не маюць права моцна абмяжоўваць уладу караля. Адносіны да саслоўнай структуры грамадства з'яўляюцца яскравым прыкладам спалучэння ў творчасці А.Волана, ідэяў двух эпох Новага часу і Сярэднявечча. Гэтая кампраміснасць наогул была характэрна для перыяду Рэфармацыі на Беларусі. А.Волан выдзяляе ў статусе жыхара ВКЛ дзве часткі: агульначалавечае і саслоўнае. У сферы натуральных правоў, забеспячэння і абароны жыцця чалавека і яго маёмасці, ён патрабуе роўнасці ўсіх насельнікаў Вялікага княства. Ён крытыкуе залежнасць памеру пакарання ад сацыяльнага статусу злачынцы і пацярпеўшага, патрабуе роўнага доступу да свабоды, у гэтым вузкім значэнне слова.

У палітычнай і маёмаснай сферы ён наадварот разглядае саслоўі як натуральную з'яву, абгрунтоўвае яе разумнасць і справядлівасць [4, с. 70]. А.Волан, бадай, першым у палітычнай думцы Беларусі і Літвы пачаў разглядаць саслоўі сучаснага яму феадальнага грамадства як свайго роду сацыяльных партнёраў, якія ўносяць карысны і грамадска неабходны уклад у агульную справу - жыццё дзяржавы. А.Волан падзяляў сучаснае яму грамадства на тры саслоўі - шляхту, мяшчан і сялян. Парушаць саслоўны парадак лічыў крайне небяспечным.

Канцэпцыя А.Волана, такім чынам, з'яўляецца спробай сінтэзу традыцыйных саслоўных, пратэстанцкіх, антычных і раннебуржуазных поглядаў.

## ***4. Раскол кальвініскага руху, з'яўленне антытрынітарызму ў ВКЛ. Два напрамкі антытрынітарызму***

**Антытрынітарыі**. У сярэдзіне 60-х гадоў XVI ст. (каля 1563-1565) ў кальвінісцкім руху адбыўся раскол. З шэрагаў кальвіністаў вылучыўся больш радыкальны напрамак пратэстантызму, прыхільнікі якога атрымалі адразу некалькі назваў: арыянаў, антытрынітарыяў, польскіх і літоўскіх братоў,

соцынііян, унітарыяў.

Рух і вучэнне антытрынітарыяў бярэ пачатак у 2-3 ст.ст., калі толькі ўсталёўваліся асноўныя дагматы хрысціянства. Рэлігійную аснову вучэння выклаў прэсвітэр Арый (?—336) з Александрыі, які лічыў Хрыста не Бога-чалавекам, адзінасутным з Богам-айцом, а проста чалавекам (Езусам з Назарэту). Езус, на думку арыян, толькі вызначыў шлях да выратавання. Адмаўленне боскасці Хрыста, непрызнанне яго адзінасутнасці з Богам-айцом, непрызнанні асобнай субстанцыі Святога Духа вяло да адмаўлення выратавальнай ролі заснаванай на яго вучэнні хрысціянскай царквы. У 381 г. на Сусветным царкоўным саборы ў Канстанцінопалі вучэнне Арыя было прызнана ерэтычным.

У эпоху Рэфармацыі, у перыяд барацьбы пратэстантызму супраць каталіцкай царквы прыхільнікі Рэфармацыі зноў пачалі адраджаць вучэнне Арыя ў Заходняй Еўропе, за што іх назвалі арыянамі. Паколькі арыяне адмаўлялі догмат аб Святой Тройцы, аб адзінасутнасці трох іпастасяў Бога, іх называлі таксама антытрынітарыямі.

Ідэі антытрынітарызму прынеслі на Беларусь заходнееўрапейскія аўтары. У Польшы і ВКЛ рух атрымаў саманазву польскіх і літоўскіх братоў.

Адзін з заходнееўрапейскіх прапаведнікаў антытрынітарызму - Фаўст Соцын (1536-1609 гг.), у 1551 г. перасяліўся ў Польшчу і паклаў пачатак аднаму з найбольш пашыраных накірункаў антытрынітарызму, яго прыхільнікаў у Польшчы і ВКЛ пачалі называць таксама соцыніянамі.

Пасля забароны антытрынітарызму ў Рэчы Паспалітай у сяр.XVII ст., яго прыхільнікі знайшлі прыстанішча ў Нідэрландах, Англіі, ЗША, дзе атрымалі назву - унітарыі (прызнаюць прынцып адзінасутнасці Бога).

**Два напрамкі антытрынітарнага руху.** Апрача тэалагічных, прыхільнікі адроджанага ў ВКЛ арыянскага вучэння актыўна абмяркоўвалі дзве групы грамадска-палітычных праблем.

Першая была звязана з адносінамі да уласнасці: ці можа арыянская шляхта валодаць маёнткамі (вялікай маёмасцю наогул), мець прыгонных сялян, карыстацца вынікамі іх працы, устанаўліваць для сваіх прыгонных паншчыну і г.д.

Другая група была звязана з адносінамі да дзяржавы: пытанні характару інстытутаў дзяржаўнай улады, адносін да іх веруючых, асабістых правоў і грамадскіх абавязкаў, аддзяленне свецкай улады ад царкоўнай, рэлігійнай талерантнасці і інш.

У залежнасці ад адказаў на гэтыя пытанні ў арыянстве вылучаліся два напрамкі.

### *5. Палітычныя і прававыя погляды правага крыла аптытрынітарыяў (С.Будны, В.Цяпінскі).*

Палітычныя і прававыя погляды правага крыла аптытрынітарыяў адлюстроўвалі погляды сярэдняй шляхты і заможных гараджан. Сцвярджалі, па-першае, што арыянская шляхта можа валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян, карыстацца вынікамі іх працы, толькі адносіны паміж

шляхтай і прыгоннымі не павінны выходзіць за рамкі хрысціянскай маралі. Што тычыцца іх адносін да дзяржавы, то яны сцвярджалі, што арыяне павінен плаціць падаткі, можа займаць дзяржаўныя пасады, выконваць воінскі абавязак і нават прымаць удзел у вайне, калі яна носіць справядлівы (абарончы) характар.

**С.Будны.** Найбольш вядомым тэарэтыкам правага крыла антытрынітарыяў быў Сымон Будны (каля 1530-1593 гг.). Ён закончыў Кракаўскі універсітэт са ступенню бакалаўра філасофіі, а затым працягваў вучобу ў адным з заходнееўрапейскіх універсітэтаў, дзе глыбока далучыўся да рэфармацыйнага руху. Пасля вяртання на радзіму далучыўся да кальвіністаў, пераклаў на беларускую мову і выдаў у свет пратэстанцкі «Катэхізіс». У сярэдзіне 60-х гадоў XVI ст. С.Будны далучыўся да больш радыкальнай плыні рэфармацыі - антытрынітарызму.

Палітыка-прававыя погляды С.Буднага выкладзены ў яго творах «Катэхізіс» (1562 г.) і «Аб свецкай уладзе» (1583 г.). У адрозненне ад прадстаўнікоў левай, радыкальнай плыні арыянства, С.Будны не быў праціўнікам прыватнай уласнасці. Ён пагаджаўся з тым, каб «кожны чалавек маёмасць сваю меў у моцы сваёй» [6, с. 85]. Ён ухваляў існуючую саслоўную сацыяльную сістэму, права шляхты валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян і чэлядзь нявольную. Абгрунтаванне прыгону ён знаходзіў у патрыярхальнай тэорыі грамадства, згодная якой гаспадары выконваюць бацькоўскія функцыі ў адносінах да падначаленых. Падпарадкаванне падданых свайму пану павінна быць безумоўным. Яно не залежыць ад асабістых якасцяў апошняга. Аўтар рашуча асуджае спробы паўстання супраць прыгону, адмоўна ставіцца да Сялянскай вайны ў тагачаснай Германіі, апраўдвае карныя дзеянні феадалаў у адносінах да паўстанцаў [7, с. 13]. Адзіным выняткам, абгрунтаваннем паўстання, С.Будны, працягваючы вучэнне яшчэ Фамы Аквінскага, лічыць рэлігійны прыгнёт [10, с. 71].

Асуджаючы непакорнасць падданых, С.Будны напамінае сваім прыхільнікам пра тое, што «хрысціянскі гаспадар павінен сачыць за тым, каб людзі бедныя і сіроты не цярпелі ад галечы і не паміралі ад голаду і холаду» [6, с. 85]. Мысліцель асуджаў крайнасці феадальнага ладу, найбольш жорсткія праявы прыгонніцтва, лічыў, што паслухмяных і працавітых халопаў варта адпускаць на волю. Ён выказваўся за суіснаванне і супрацоўніцтва розных сацыяльных саслоўяў. С.Будны лічыў, што кожнае саслоўе павінна выконваць пэўныя, вызначаныя яму гістарычным развіццём сацыяльныя функцыі.

С.Будны пазітыўна адносіўся да сучасных яму дзяржаўнага ладу і дзяржаўных інстытутаў Рэчы Паспалітай, крытыкаваў антыдзяржаўныя тэорыя левага крыла атытрынітарыяў. Ён лічыў, што дзяржаўная ўлада мае боскае паходжанне і ёй неабходна падпарадкоўвацца. «Улада - рэч добрая, неабходная і карысная,- пісаў ён. - Трэба задавальняцца тым прадстаўніком улады, якога бог даў гэтай краіне» [5, с. 53]. Таму сапраўдны хрысціянін, на думку С.Буднага, не павінен ухіляцца ад палітычнай дзейнасці, а наадварот, прымаць у ёй актыўны ўдзел: займаць любыя дзяржаўныя пасады, звяртацца

ў суд, весці судовыя працэсы, і нават выконваць абавязкі суддзі, паколькі ўсё гэта не супярэчыць евангельскаму вучэнню.

С.Будны не ідэалізаваў дзеянні ўлады, бачыў шмат парушэнняў закона і слова Божага яе прадстаўнікамі. Аднак, ён быў перакананы, што асобныя несправядлівасці не вынікаюць з сутнасці самой улады, у іх вінаваты асобныя дзяржаўцы, якіх трэба караць за іх злачынствы. С.Будны падкрэсліваў толькі, што ваяводы, старасты і суддзі «павінны быць богабаязненымі, справядлівымі, праўдзівымі і чэснымі». «Суддзі,- пісаў С.Будны,- павінны судзіць справядліва, не перакручваць законы, не павінны глядзець на твары, не браць хабару, таму што падарункі асляпляюць вочы мудрых і скажаюць словы справядлівых» [6, с. 85].

Палітычным ідэалам С.Буднага была манархія, абмежаваная саслоўным прадстаўніцтвам і законамі. Разважаючы аб асобе ідэальнага манарха, С.Будны ў сваім творы «Аб свецкай уладзе» параўноўвае хрысціянскага адукаванага гаспадара з манархам язычніцкім, жорсткім тыранам і дэспатам. Калі галоўнай мэтай першага з’яўляецца агульнае дабро, у кіраванні ён абапіраецца на евангельскае вучэнне, то язычніцкі гасудар зыходзіць з прынцыпу «да будзе мая воля», абапіраецца на страх і насілле. Хрысціянскі манарх павінен абараняць удоваў і сіротаў, пільна кантраляваць выкананне правасуддзя, быць справядлівым, добрым, мудрым, усебакова адукаваным, шмат чытаць, штудзіраваць язычніцкія кнігі, асабліва гістарычныя, каб ведаць мінулае. Ён павінен акружыць сябе людзьмі разумнымі і вучонымі, якія добра ведаюць законы.

Для дасягнення пазітыўных зменаў у Рэчы Паспалітай С.Будны лічыў неабходным правесці своечасовыя сацыяльна-палітычныя рэформы. Менавіта таму ён прымаў удзел у выданні забароненага палітычнага трактату польскага гуманіста эпохі Адраджэння Анджэя Фрыча Маджэўскага (1503-1572 гг.) «Пра выпраўленне Рэчы Паспалітай» (1577 г.), салідарызуючыся тым самым з ідэямі апошняга аб роўнасці саслоўяў перад законам, аб узмацненні цэнтральнай улады, аб змякчэнні крайнасцей прыгонніцтва, аб неабходнасці шырокай дэмакратызацыі асветы, свабоднай ад кантролю царквы і г.д.

С.Будны шмат увагі ўдзяліў праблеме вайны і міру. У адрозненне ад прыхільнікаў левага крыла антытрынітарызму, якія выступалі супраць удзелу сапраўдных хрысціян у войнах, ён у сваіх творах падтрымаў традыцыю падзелу войнаў на справядлівыя і несправядлівыя. Справядлівымі С.Будны прызнаваў войны, якія вядуцца дзеля абароны Айчыны. Сапраўдны хрысціянін павінен прымаць удзел у такой вайне.

Але часам вайна бывае несправядлівая, калі «тыран або мучыцель какой гордый... чужыя гарады, княствы або землі забіраеть» [10, с. 74]. Ад удзелу ў такой вайне «верны», сапраўдны хрысціянін павінен ухіліцца.

**В.Цяпінскі-Амельяновіч.** Паплечнікам С.Буднага, прыхільнікам поглядаў правых антытрынітарыяў быў В.Цяпінскі з Полаччыны. Сістэматычнай адукацыі, як аб гэтым можна меркаваць па словах самога В.Цяпінскага, ён не атрымаў. Каля 1580 г. В. Цяпінскі ў радавым маёнтку

Цяпіне стварыў «убогую друкарню» і на ўласныя сродкі «з зычливости к моей отчизне» выдаў у ёй «Евангелле» на беларускай мове са сваёй прадмовай.

У прадмове В.Цяпінскі падвергнуў рэзкай крытыцы духавенства, якое не клапацілася пра развіццё навукі і асветы народа. Ён выказаўся за адкрыццё школ на беларускай мове, даступных простаму народу, у якіх бы «детки смыслы (здольнасці) свои неяко готовали». Таму і свае выданне ён прызначаў для агульнаадукацыйных мэт, для «подвигненья» беларускай народнасці.

Акрамя агульных з С.Будным поглядаў, В.Цяпінскі выказваў ідэю адзінства і дружбы славянскіх народаў, іх значнай ролі ў гісторыі чалавецтва. Выказваючыся супраць зняважлівых адносін феадалаў да роднай мовы, культуры, ён падкрэсліваў, што гатовы «разам з Радзімай загінуць», або калі шляхта апамятаецца, «разам з ёй уваскрэснуць» [5, с. 55; 6, с. 89].

### ***6. Палітычныя і прававыя погляды левага крыла антытрынітарыяў (П.Гезка, М.Чаховіц, Л. Крышкоўскі)***

Вучэнне радыкальнага крыла антытрынітарыяў адлюстроўвала погляды гарадской і вясковай беднаты, таму іх ідэалогію часам называюць плебейскім анархізмам. Яны лічылі, што асабістая свабода можа быць рэалізавана толькі пры дасягненні сацыяльнай роўнасці людзей, а не толькі прававой, палітычнай і рэлігійнай, як лічыла памяркоўнае крыло. Патрабаванне сацыяльнай роўнасці радыкалы абгрунтоўвалі спасылкамі на беднасць раннехрысціянскіх супольнасцяў. Яны сцвярджалі, што паколькі ў першых хрысціянскіх абшчынах было «ўсё агульнае», то сапраўдны хрысціянін не павінен мець уласнасці. Левыя антытрынітарыі патрабавалі, каб арыянская шляхта адмовілася ад сваіх маёнткаў, даравала сялянам асабістую свабоду і зарабляла на жыццё працай уласных рук. У грамадстве павінна быць знішчана феадальная эксплуатацыя, саслоўныя і маёмасныя адрозненні, а так як на варце існых парадкаў стаіць дзяржава і закон, то і ўсе палітычныя і прававыя інстытуты павінны быць скасаваны.

Ажыццяўленне зменаў, на думку левых антытрынітарыяў, павінна ажыццявіцца мірнымі сродкамі. Асноўным сродкам яны лічылі тактыку татальнага маральнага байкоту наяўных феадальных і саслоўных парадкаў, няўдзелу ў органах дзяржаўнай улады, ігнаравання дзейнічаючага права і судовых устаноў, адмаўленне ад уласнасці і прывілеяў. У той жа час яны катэгарычна адмаўляліся ад усялякіх супрацьпраўных і антыдзяржаўных дзеянняў, падкрэслівалі свае лаяльныя адносіны да існуючага дзяржаўнага ладу. Паколькі ўлада мае боскае паходжанне, то як сапраўдныя хрысціяне, яны плацілі падаткі («кесарава кесару, а божае богу»).

**П.Гезка.** Першым прадстаўніком ідэй радыкальнага антытрынітарызму у ВКЛ быў выпускнік Кракаўскага універсітэта, былы прафесар Падуанскага ўніверсітэту Пётр Гёзка (або Пётр з Ганёндзы). Сваё вучэнне ён выклаў у шэрагу прац, напісаных на лацінскай і польскай мовах: «Супраць боскасці Ісуса Хрыста» (1557 г.), «Аб раннехрысціянскай царкве» (1564 г.) і інш.

Спасылаючыся на Свяшчэннае пісанне Пётр Гёзка пісаў, што «христианину не подобает занимать государственные должности, быть королём, князем, гетманом, воеводой, старостой, судьёй, подсудком, наместником, войтом, бургомистром, сотником, солдатом… не подобает владеть собственностью и нести военную службу, пользоваться законами…, не подобает присягать, а также применять смертную казнь» [10, с. 76]. Launched Ператварэнне свету павінна здзейсніцца Богам і адданымі яму людзьмі. І чалавек самастойна і вольна павінен зрабіць гэткі выбар.

**М.Чаховіц.** Адным з першых вучняў П.Гезкі быў Марцін Чаховіц (1532-1613 гг.), былы студэнт Лейпцыгскага універсітэта. У 1575 г. ён выдаў сачыненне «Хрысціянскія гутаркі».

У сваім творы апісваў рэальная існаванне двух светаў – Антыхрыста і Хрыста. Першае валадарства праяўляецца праз дзейнасць існуючай феадальнай дзяржавы і саслоўнага грамадства. Да яго адносяцца ўсе, хто валодае падданымі, выкарыстоўвае шляхецкія прывілеі, прымае ўдзел у ажыццяўленні дзяржаўнага кіравання, судаводства, удзельнічае ў войнах і г.д. Да валадарства Хрыста адносяцца сапраўдныя хрысціяне, усе тыя, хто адпрэчвае, не прызнае бязбожны свет з яго няроўнасцю і несправядлівасцямі.

Адпрэчваючы існуючыя дзяржаўныя і сацыяльныя парадкі, Марцін Чаховіц не заклікае да іх насільнага звяржэння. Ён прызывае слухацца ўладу, бо «усялякая ўлада ад Бога». Выкарыстоўваючы прыклады з Бібліі, ён заклікае ацэньваць усе загады ўладаў на адпаведнасць слову Божаму, і калі яны накіраваны супраць Бога, то хрысціяне павінны адмовіцца ад іх выканання і лепш загінуць, чым адыйсці ад вучэння Хрыста.

Дыспутуючы з С.Будным і памяркоўнымі антытрынітарыямі, Марцін Чаховіц лічыў, што ўлада па сваёй сутнасці несправядліва, бо адлюстроўвае інтарэсы феадалаў, а не людзей бедных.

Па жыццёвых абставінах Марцін Чаховіц быў вымушаны пасяліцца ў Куявіі ў Польшчы ў маёнтку свайго аднадумца Яна Немаеўскага - заможнага шляхціца, суддзі і соймавага пасла. Разам з ім яны задумалі стварыць арыянскую абшчыну, жыццё якой хацелі пабудаваць на ідэалах ранніх хрысціян. Каля 1570 г. Я.Немаеўскі і група мясцовых шляхціцаў пад духоўным уплывам М.Чаховіца прадала свае маёнткі, даравала волю сялянам, раздала свае грошы бедным і адмовілася ад усіх дзяржаўных пасад. Яны спадзяваліся, што іх прыклад паслужыць пашырэнню радыкальнага арыянскага руху. Аднак гэты гучны і неардынарны ўчынак куяўскай шляхты не знайшоў падтрымкі сярод грамадства.

**Л.Крышкоўскі.** Да ліку значных ідэолагаў левага крыла антытрынітарыяў належаў Лаўрэнцій Крышкоўскі. У 1562 г. Л.Крышкоўскі разам з М.Кавячынскім дапамагаў С.Буднаму ў выданні пратэстанцкага «Катэхізіса». Каля 1563 г. Л.Крышкоўскі перайшоў на пазіцыі арыянства і у наступным 1564 г. пераклаў (пры дапамозе С.Буднага) з лацінскай на польскую мову і выдаў у Нясвіжы са сваёй прадмовай працу аднаго з ранніх апалагетаў хрысціянства Юсціна Філосафа (100 - 166 гг.) «Размова з Трыфанам іўдзеянінам аб ісціне хрысціянскага закону». Ва ўмовах Беларусі і

Літвы другой паловы XVI ст. гэта кніга была вельмі карысная для выкладання ідэй ранняга хрысціянства.

У «Прадмове» да кнігі Л.Крышкоўскім выступіў супраць прыватнай уласнасці, якую лічыў прычынай усіх сацыяльных бед, а таксама супраць сучаснай яму дзяржавы як апарату прымусу. «Веруючы,- пісаў ён у прадмове,- не павінен жадаць ні багацця, ні дзяржаўных пасад, ні ўлады» [6, с. 92]. Л.Крышкоўскі асуджаў прыгонніцтва, паразітызм шляхты і каталіцкага духавенства. Ён выказваў тыя ж думкі, што праводзілі ў сваіх творах духоўныя лідэры заходнееўрапейскай Рэфармацыі: «Ніхто не можа быць упэўнены ў выратаванні душы, калі не будзе зарабляць хлеб уласнымі рукамі». Л.Крышкоўскі заклікаў веруючых да грамадска карыснай працы. «Саромецца працаваць нельга»,- павучаў ён. «Няхай ніхто не глядзіць на нас як на беднякоў альбо жабракоў за тое, што мы працуем рукамі, працаваць не сорамна» [6, с. 92].

Л.Крышкоўскі заклікаў арыянаў не ўдзельнічаць у якіх бы то ні было войнах: «Бог стварыў жалеза для таго, каб каваць з яго не мячы і коп'і, а косы, сякеры і лемяшы» [6, с. 92].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Ogonowski, Z. Z zagadnień tolerancji w Polsce XVII wieku / Z. Ogonowski. – Warszawa: PWN, 1958. – 349 s.
2. Völker, K. Toleranz und Intoleranz im Zeitalter der Reformation / K. Völker. – Leipzig: J.C. Hinrichs`sche Buchhandlung, 1912. – 279 s.
3. Берман Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.
4. Вішнеўская, І. Андрэй Волан – вялікі беларускі мысліцель эпохі Адраджэння і Рэфармацыі / І.Вішнеўская // Юстыцыя Беларусі. – 2007. - №9. – с.70-71.
5. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: Дапамож. Для студэнтаў вышэйш.навуч.установ/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272с.
6. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
7. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206с.
8. История политических и правовых учений: учебник / О.Э. Лейст [и др.]; под ред. О.Э. Лейста. – М.: Изд-во Зерцало, 2000. – 688 с.
9. Лютер, М. О светской власти / М. Лютер // Избранные произведения / М. Лютер; сост.-ред. А.П. Андрюшкин; пер. и коммент. К.С. Комарова [и др.]. – М.-СПб.: Андреев и согласие, 1994. – С. 131-163.

10. Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.
11. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.

# ТЭМА 6.
# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА ПЕРЫЯДУ КОНТРРЭФАРМАЦЫІ І БРЭСЦКАЙ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

## *1. Палітычныя і прававыя ідэі Контррэфармацыі*

Контррэфармацыя - гэта рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў 2-й пал.XVI-XVII ст., узначалены Папствам і накіраваны супраць ідэй і вынікаў Рэфармацыі. Контррэфармацыя мела на мэце аднаўленне пазіцый, страчаных каталіцкай царквой у еўрапейскіх краінах у выніку Рэфармацыі. Дактрыну і царкоўную палітыку Контррэфармацыі, праграму барацьбы з Рэфармацыяй выпрацаваў Трыдэнцкі сабор - Усяленскі сабор каталіцкай царквы. На саборы быў адхілены кампраміс з пратэстантамі, пацверджаны безумоўны аўтарытэт Пап у справах веры, замацавана набажэнства выключна на лацінскай мове, уведзена жорсткая царкоўная цэнзура. Усялякае адступленне ад пастаноў Сабора разглядалася як ерась і падлягала ганенням.

Галоўнай зброяй у барацьбе каталіцкай царквы з Рэфармацыяй стала місіянерская дзейнасць у краінах, дзе вялася барацьба з пратэстантызмам. Для яе забеспячэння быў адчынены шэраг навучальных устаноў. Місіянерскую дзейнасць ажыццяўлялі каталіцкія манаскія ордэны. Галоўнай апорай Контррэфармацыі стаў створаны ў 1534 г. ордэн езуітаў.

У ВКЛ пачаткам Контррэфармацыі лічыцца 1569 г., калі ў Вільню прыйшло 13 першых езуітаў. Яе асаблівасцю ў ВКЛ было тое, што яна была накіравана не толькі супраць Рэфармацыі, але і праваслаўя. Да сяр. XVII ст. Контррэфармацыя перамагла на землях Рэчы Паспалітай. Асноўнымі прычынамі распаўсюджання контррэфармацыйнай ідэалогіі ў ВКЛ і яе перамогі былі як унутраныя і знешнія абставіны існавання краіны ў сярэдзіне XVI ст., так і асабістыя чалавечыя фактары.

Да ўнутраных фактараў трэба аднесці незадаволенасць большасці шляхты радыкальным напрамкам рэфармацыйнага руху (асабліва антытрынітарызмам), які ствараў небяспеку шляхецкім прывілеям, феадальнай маёмасці і наогул дзяржаве. У 1647 г. пастановай Сеймавага суду былі закрыты ўсе друкарні і школы антытрынітарыяў, у 1648 г. яны выведзены з пад апекі Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. (на іх перасталі распаўсюджвацца прынцыпы рэлігійнай талеранцыі), і ў 1658 г. Сейм прыгаварыў іх да выгнання з Рэчы Паспалітай.

Важнейшымі знешнімі фактарамі перамогі каталіцтва сталі паслабленне ВКЛ ў выніку Лівонскай вайны і заключэнне Люблінскай ўнія 1569 г. з каталіцкай Польшчай, якая прывяла да стварэння агульнай дзяржавы. Гэтая падзея, у сваю чаргу, спрыяла пашырэнню каталіцкага ўплыву, тым больш, што прыхільнікамі Контррэфармацыі і езуітаў былі каралі Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый і Жыгімонт Ваза.

У 1564 г. езуіты распачалі сваю дзейнасць у Польшчы, а ў 1569 і (пасля Люблінскай уніі) - у ВКЛ. У 1579 г. пры падтрымцы С.Баторыя ў Вільні была адкрыта Віленская езуіцкая акадэмія - каталіцкі ўніверсітэт, які ва ўсіх

прывілеях ураўноўваўся з Кракаўскім універсітэтам. З дня свайго заснавання Віленская акадэмія стала тэарэтычным цэнтрам ідэй Контррэфармацыі ў Беларусі і Літве. У гады праўлення Баторыя, дзякуючы яго падтрымцы, у шэрагу гарадоў Беларусі (у тым ліку і ў Полацку ў 1580 г.) пачалося будаўніцтва сістэмы езуіцкіх сярэдніх вучэбных устаноў - калегіумаў.

Падчас праўлення Жыгімонт III Ваза (1587-1632) езуіцкія калегіўмы з'явіліся ў Оршы, Брэсце, Гародні, Пінску, Віцебску, Наваградку, Мінску, Магілёве, Мсціслаўлі, Бабруйску, Слуцку, Слоніме і іншых гарадах. У хуткім часе большая частка сярэдніх навучальных устаноў Беларусі належала езуітам. Еўрапейскі ўзровень адукацыі, які прадстаўлялі езуіцкія навучальныя ўстановы (а Фрэнсіс Бэкан называў іх лепшымі ў свеце [6, с. 117]), прыцягваў цікавасць не толькі каталіцкай часткі насельніцтва. Магнаты, шляхта, жыхары гарадоў пратэстанцкага і праваслаўнага веравызнання таксама аддавалі дзяцей у каталіцкія навучальныя ўстановы. Такім чынам, дзякуючы адукацыі ідэі Контррэфармацыі пашыраліся сярод эліты грамадства, а потым і сярод простага народа.

## ***2. Палітыка-прававыя погляды лідэраў Контррэфармацыі на Беларусі (П.Скарга)***

**П.Скарга.** Найбольш вядомым і ўплывовым лідэрам Контррэфармацыі быў Пётр Скарга (1536-1612), вядомы каталіцкі тэолаг, рэлігійны пісьменнік-палеміст, аратар, царкоўна-палітычны дзеяч канца XVI - пачатку XVII ст.

Вышэйшую адукацыю П.Скарга атрымаў у Кракаўскай акадэміі (1552-1555 гг.). У 1569 г. у Рыме ён ўступіў у члены «Грамадства Ісуса», а з 1574 г. распачаў актыўную грамадскую дзейнасць на тэрыторыі ВКЛ. П.Скарга стаў першым рэктарам адкрытай у 1579 г. у Вільні Віленскай езуіцкай акадэміі. У 1580 г. ён заснаваў першы ў межах сучаснай Беларусі езуіцкі калегіум у Полацку.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці П.Скаргі па ўмацаванню пазіцый каталіцтва былі: яго выкладчыцкая дзейнасць, напісанне палемічных прац, удзел у дыспутах з пратэстанцкімі і праваслаўнымі тэолагамі Беларусі і Літвы, персанальная духоўная праца з прадстаўнікамі магнацкіх фамілій, прыняўшых кальвінізм, каб вярнуць іх у лона каталіцкай царквы. У 1584 г. П.Скарга пераехаў з Вільні ў Кракаў, дзе ён стаў прыдворным прапаведнікам караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы і заставаўся на гэтай пасадзе на працягу 24 год, амаль да самай смерці ў 1612 г.

Палітыка-прававыя погляды П.Скаргі змешчаны ў творах «Соймавыя казанні», «Аб адзінстве Касцёла Божага», «Берасцейскі сінод», «На трэны і лямант Феафіла Арфалога» і інш. Найбольш вядомым творам стаз зборнік «Соймавыя казанні», які складаўся з прамоваў мысліцеля перад дэпутатамі Сойму Рэчы Паспалітай. палітычнай элітай дзяржавы. У зборніку П.Скарга яскрава выявіў найбольш істотныя заганы грамадскага і дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і перш за ўсё - слабасць каралеўскай улады.

П.Скарга быў прыхільнікам моцнай каралеўскай улады, якая павінна быць абмежавана правам і Радай. «Мы жадаем не такую манархію, як у турак

і татар, - пісаў П.Скарга, - якая трымаецца на беззаконні, але такую, якая апіраецца на справядлівае права і мудрую Раду» [7, с. 110]. Абмежаванне каралеўскай улады законамі і Радай неабходна для таго, каб не даць ёй магчымасці вырадзіцца ў тыранію. «Статуты патрэбны кожнай дзяржаве, як вочы целу»,- пісаў П.Скарга. Ён параўноўваў права з паходняй, якая павінна вызначаць падарожнаму дарогу ў цемры, і адначасова пагражаць яму, каб не скрочваў з яе. Як і Леў Сапега, ён таксама цытаваў у сваіх казаннях крылатыя словы Цыцэрона: «Каб быць вольнымі, мы павінны з'яўляцца рабамі законаў» [7, с. 110].

Нягледзячы на абмежаванні, каралеўская ўлада павінна быць моцнай, бо толькі моцная ўлада атрымае здольнасць супрацьстаяць шляхецкай анархіі, якая бачылася яму асноўнай прычынай заняпаду дзяржавы. Свабодныя выбары караля аслаблялі цэнтральную ўладу ў краіне, падрывалі суверэнітэт дзяржавы, садзейнічалі ўмацаванню ў яе жыцці ролі магнатаў, якія з дапамогай паслухмянай ім шляхты сканцэнтравалі ў сваіх руках вышэйшыя адміністрацыйныя і вайсковыя пасады. Валодаючы да таго ж вялікім латыфундыямі, яны ператварыліся ў сапраўдных гаспадароў краіны, своеасаблівых уладальнікаў «дзяржаў» у дзяржаве. «Вы пазбавіцеся не толькі караля з крыві вашай і права яго выбіраць, але і дзяржавы і айчыны,» - прарочыў ён магнатам і шляхце [2, с. 66].

Па пытанню ўзаемадзеяння свецкай і духовай улад, П.Скарга падтрымліваў ідэі папацэзарызму. Ён лічыў, што свецкая ўлада павінна падпарадкоўвацца духоўнаму кіраўніцтву з боку каталіцкай царквы, таму што ў дачыненні да дзяржаўных інтарэсаў – часовых, залежных ад пэўных абставін, інтарэсы царквы з'яўляюцца вечнымі і нязменнымі.

У «Соймавых казаннях» П.Скарга ўказаў таксама і на іншыя недахопы грамадскага і дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, такія, як класавы эгаізм шляхты, забыццё ёю доўга перад Айчынай, несправядлівасць заканадаўства, палярызацыя грамадства, празмернае багацце адных і беднасць другіх. Верацярпімасць да ерэтыкоў (рэфарматаў) і вераадступнікаў, ён наогул лічыў «выступленнем супраць усіх боскіх і чалавечых правоў, дзяржаўнага права, супраць натуральнага розуму і хрысціянскага высакародства, вытокам атэізму» [2, с. 66].

Адной з галоўных тэмаў творчасці П.Скаргі было паяднанне хрысціян. У 1577 г. у Вільні ён выдаў кнігу «Аб адзінстве царквы божай...», дзе заклікаў да ўз'яднання каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, як адзінага шляху да спакою і згоды ў краіне.

П.Скарга прызываў праваслаўныя ўсходнеславянскія народы да царкоўнай уніі з Рымам і ўказваў на тыя выгады, якія яны атрымаюць ад духоўнага саюзу з каталікамі. У прыватнасці, з заключэннем рэлігійнага саюзу, на думку П.Скаргі, будуць створаны неабходныя ўмовы для развіцця навукі, асветы народа. Гэта прывядзе да пераадолення адасобленасці, якая падзяляе праваслаўных і католікаў. Дзякуючы царкоўнай уніі, дзяржава ўмацуе сваю маналітнасць, набудзе значную палітычную магутнасць, неабходную для барацьбы са знешнімі ворагамі [3, с. 111].

П.Скарга рэальна ацэньваў немагчымасць заключэння сусветнай уніі, бо бачыў, адсутнасць ў усходніх і маскоўскага патрыярхаў жадання нават абмяркоўваць гэтую тэму, антызаходнюю скіраванасць маскоўскага праваслаўя. Рэгіянальную ж ўнію ў межах Рэчы Паспалітай ён лічыў магчымай. Для яе дастаткова толькі, каб кіеўскія мітрапаліты прымалі благаславенне ад Рымскага Папы, а не ад Канстанцінопальскага Патрыярха, каб ва ўсіх артыкулах веры ўніяты пагадзіліся з рымска-каталіцкай царквой і прызналі вярхоўную ўладу Рыма. Царкоўныя ж абрады ва ўніятаў могуць заставацца такімі, «… якія існуюць ад святых продкаў і якія не пярэчаць слову Божаму і святой веры...» [2, с. 67].

П.Скарга пастаянна заклікаў кіруючыя колы Рэчы Паспалітай да тэрміновых рэформ, да змен у грамадска-палітычным жыцці. Ён папярэджваў, што прамаруджванне будзе мець трагічныя вынікі.. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.) П.Скарга стаў разглядацца як сапраўдны прарок.

## ***3. Прычыны заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г.***

У канцы XVI ст. у межах Рэчы Паспалітай была заключана рэгіянальная царкоўная ўнія паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Умовы і прычыны заключэння ўніі, парадак яе заключэння, яе наступствы доўгі час былі адным з найактуальнейшых пытанняў у гісторыі палітычнай думкі Беларусі.

Прычынамі заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. былі наступнымі:

1. Ідэя пагаднення паміж хрысціянамі існуе з першаапостальскіх часоў. Яшчэ на пачатку V ст. н.э. св. Аўгусцін Блажэнны, адзін з айцоў царквы, папярэджваў, указваючы на разнастайнасць абрадаў хрысціянскага культу, што палажэнні, пра якія нічога пэўнага не пастанавіла Святое пісанне, не павінны быць прычынамі спрэчак, калі яны не паўстаюць ні супраць веры, ні супраць добрых нораваў [11, с. 40]. Асаблівую актуальнасць тэма аб'яднання хрысціянаў атрымала пасля падзелу Царквы 1054 г. на праваслаўе і каталіцтва. З тых часоў імкненне да паяднання дыспутуецца прадстаўнікамі хрысціянскіх канфесій, здзяйсняюцца спробы рэгіянальных уній, аднак ўсеагульнага паяднання не адбываецца.

2. Пасля заключэння Крэўскай уніі, уладары Вялікага княства і Польшчы прыкладалі шмат высілкаў да ўмацавання рэлігійнай еднасці сваіх падданых, падымалі пытанне аб царкоўнай уніі. Пасля аб'яднаня ў Рэч Паспалітую ў 1569 г. гэтае імкненне атрымала дадатковы імпульс. Царкоўная ўнія разглядалася як лагічны працяг урадавай інтэграцыйнай палітыкі [8, с. 39]. Менавіта таму ідэю ўніі актыўна падтрымлівалі і каралеўская ўлада ў асобе Жыгімонта III Вазы, і прадстаўнікі ўрадавых колаў ВКЛ на чале з канцлерам Л.Сапегам, якія бачылі у ёй сродак захавання адзінства і магутнасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай.

3. Ідэя ўніі актыўна прапагандавалася прадстаўнікамі Контррэфармацыі: Папай, прадстаўнікамі Каталіцкай царквы, Ордэнам езуітаў. Дзякуючы ўплыву на магнатаў, шляхту, грамадства ВКЛ праз сістэму адукацыйных

установаў, езуіты распаўсюджвалі ідэю аб'яднання.

4. Дзяржаўныя і царкоўныя дзеячы ВКЛ з даўніх часоў змагаліся за царкоўную, а значыць і дзяржаўную незалежнасць княства. Праваслаўная царква ВКЛ, на той час, была падначалена Канстанцінопальскаму патрыярху. Аднак той, пасля захопу Канстанцінопаля туркамі, страціў свой аўтарытэт, плаціў даніну турэцкаму султану – ворагу Рэчы Паспалітай. Каб атрымаць грошы, ён і іншыя ўсходнія патрыярхі ездзілі па праваслаўных краінах па «міласціну» [1, с. 28; 5, с. 167] і адначасова ўмешваліся ў царкоўнае жыццё мясцовых епархій. Перш за ўсё яны падрывалі аўтарытэт мясцовых біскупаў, выдаючы царкоўным брацтвам і інш. рэлігійным арганізацыям стаўрапігію – незалежнасць ад юрысдыкцыі кіеўскага мітрапаліта і біскупоў, тым самым абмяжоўваючы ўладу апошніх. А ўлічваючы тое, што асноўную грашовую падтрымку грэкі атрымлівалі ў Маскве, дзе ў 1589 г. было заснавана патрыяршаства, якое імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў на праваслаўную царкву Рэчы Паспалітай [10, с. 8], то сваю палітыку іерархі ўсходніх цэркваў часта праводзілі на карысць маскоўскага праваслаўя.

Імкненне Маскоўскага патрыярхату падначаліць сабе праваслаўную царкву Рэчы паспалітай таксама не адпавядалі інтарэсам дзяржаўных і царкоўных службовых асобаў, настроям вернікаў, пасля працяглай і жорсткай Лівонскай вайны Масква ўспрымалася як бязлітасны вораг.

Альтэрнатывай замежным уплывам на праваслаўную царкву, многія палітычныя і царкоўныя дзеячы бачылі ў стварэнні самастойнай царкоўнай іерархіі пры фармальным падначаленні Рыму.

5. Праваслаўныя іерархі ВКЛ праз унію жадалі вырашыць унутраныя праблемы праваслаўнай царквы ў ВКЛ, якая знаходзілася ў цяжкім крызісным становішчы. Так, з-за прыходу Рэфармацыі ў ВКЛ распачаўся масавы пераход праваслаўных вернікаў да пратэстантаў. З іншага боку, разам з палітычнымі і рэлігійнымі ўцекачамі з Масквы сярод праваслаўных ВКЛ пачалі распаўсюджвацца ерасі «несцяжацелей» і прыхільнікаў Феадосія Касога.

Маральны і адукацыйны ўзровень праваслаўнага святарства быў вельмі нізкі, што прызнавалі самі абаронцы праваслаўя [1, с. 24-25]. Большасць праваслаўных святароў не магла на роўных канкурыраваць у барацьбе за вернікаў з каталікамі і пратэстантамі, удзельнічаць у рэлігійных дыспутах.

У той жа час праваслаўныя іерархі бачылі, што Каталіцкі касцёл у ВКЛ і Польшчы ўдала вырашыў свае праблемы і нават перайшоў у контррэфармацыйны наступ. Вырашыць свае праблемы яны спадзяваліся праз дзяржаўную падтрымку, якую абяцалі ўлады пры ўмове далучэння да ўніі, і адукацыйную падтрымку каталіцтва.

6. Акрамя таго, праваслаўныя спадзяваліся атрымаць месцы ў Сенаце Рэчы Паспалітай на раўне з каталікамі, дамагчыся захавання недатыкальнасці сваіх зямельных уладанняў ды маёмасці, што гарантавалася каралём пры ўмове заключэння ўніі.

Усе гэтыя прычыны абумовілі неабходнасць заключэння царкоўнай уніі на землях Рэчы Паспалітай.

## *4. Палітыка-прававыя погляды прыхільнікаў і праціўнікаў Берасцейскай царкоўнай уніі (І.Пацей, К.Астрожскі)*

Ідэя заключэння ўніі паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі захапіла большасць палітычных і царкоўных дзеячаў ВКЛ. Калі саму ідэю ўніі падтрымлівалі амаль усе, то пытанні канкрэтных умоваў і парадку заключэння ўніі заставаліся спрэчнымі. Найбольш вядомымі ўдзельнікамі дыскусіі ў стане праваслаўнай царквы па пытанню ўмоваў уніі былі ўладзіміра-брэсцкі праваслаўны біскуп Іпацій Пацей і князь Канстанцін Канстанцінавіч Астрожскі, галоўны фундатар і патрон праваслаўнай царквы ў ВКЛ (патрон больш за 1000 цэркваў; патранат заключаўся ў заснаванні цэркваў, фінансаванні і апецы над цэрквамі і актыўным удзеле ў царкоўны справах).

Дзякуючы свайму велізарнаму багаццю, сану ваяводы і сенатара, а таксама сувязям пры двары каралёў Рэчы Паспалітай К.Астрожскі істотна ўплываў на грамадска-палітычнае жыццё дзяржавы свайго часу. На сродкі К.Астрожскага ў Астрозе каля 1578 г. была створана друкарня і запрошаны для працы ў ёй рускі першадрукар Іван Фёдараў. Менавіта ў Астрозе ў 1578-1581 гг. апошнім былі выдадзены «Азбука» (1578 г.), «Новы Запавет» з «Псалтыром» (1580 г.), «Кніжка - збор найпатрэбнейшых рэчаў» (1580 г.) і нарэшце ў наступным 1581 г. славутая «Астрожская Біблія», якая на доўгія часы стала ўзорам для многіх падобных выданняў.

У 1580 г. па ініцыятыве князя ў Астрозе была заснавана вядомая Акадэмія - вышэйшая праваслаўная навучальная ўстанова. Яе першым рэктарам быў Герасім Сматрыцкі, бацька выдатнага ўсходнеславянскага мысліцеля і асветніка Мялеція Сматрыцкага (1575-1633 гг.). Па колькасці дысцыплін і ўзроўню іх выкладання, а таксама па складу прафесараў Астрожская акадэмія амаль не ўступала Віленскай. Яна рыхтавала настаўнікаў для брацкіх праваслаўных школ ВКЛ.

Праваслаўныя дзеячы, якія гуртаваліся вакол асобы князя і сам К.Астрожскі першапачаткова падтрымлівалі ідэю ўніі. Аднак яны выступалі за заключэнне сусветнай уніі, якая б была абвешчана ўсяленскім саборам са згоды і ўхвалення ўсходніх патрыярхаў. Перадумовамі заключэння ўніі, якія К.Астрожскі сфармуляваў у «Лісце да М.Рагозы» павінны былі стаць: недатыкальнасць бажніцаў і маёмасці праваслаўнай царквы ў ВКЛ, ураўненне ў правах праваслаўнага і каталіцкага духавенства, атрыманне мітрапалітам кіеўскім і праваслаўнымі біскупамі месцаў у Сенаце, абранне іх пасламі Сойму, спыненне католікамі захадаў па схіленню ў сваю веру праваслаўных вернікаў. Акрамя таго праваслаўная царква павінна была захаваць свае ранейшыя абрады і набажэнствы, а ўнія павінна была прывесці да пашырэння школ, удасканалення падрыхтоўкі адукаваных святароў [2, с. 68]. Да таго ж К.Астрожскі імкнуўся далучыць да аб’яднання хрысціянаў і пратэстантаў.

І.Пацей спачатку ўваходзіў у кола прыхільнікаў К.Астрожскага. Аднак

ён рэальна ўяўляў узаемадачыненні паміж Рэччу Паспалітай, Рымам, Турцыяй і Масквой. Ён цудоўна разумеў розніцу ў ментальнасці праваслаўя ў Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржаве. У сваіх лістах К.Астрожскаму ён спрабаваў пераканаць апошняга ў марнасці яго спадзяванняў на згоду з Масквой, якая ніколі не пойдзе на заключэнне ўніі, а паслы ад ВКЛ хутчэй за ўсё апынуцца «пад кнутамі альбо на пласе» [2, с. 69]. Аб'яднанне з усходнімі цэрквамі ён таксама лічыў не рэальным пакуль Канстанцінопальскі патрыярх цалкам залежыць ад турэцкага султана.

І.Пацей не пагаджаўся і на ўнію з пратэстантамі, тэалагічную дактрыну якіх ён лічыў цалкам аблуднай.

Узважыўшы ўсе акалічнасці І.Пацей выступіў за заключэнне рэгіянальнай уніі, за пераход усходняй царквы ВКЛ пад уладу Папы Рымскага. Аднадумцамі біскупа стала большасць праваслаўных іерархаў ВКЛ.

У снежні 1594 г. І.Пацей і біскуп луцкі К.Тарлецкі ад імя праваслаўных іерархаў склалі акт, у якім між іншым гаварылася: «Мы намерыліся, з божай дапамогай, злучыцца, як было і раней, з братамі нашымі рымлянамі, пад адным пастырам, і даем перад Госпадам Богам абет, што ўсім сэрцам будзем старацца, кожны паасобку, аб прывядзенні як духавенства, так і ўсяго народа да гэтага злучэння». Гэты акт, апрача І.Пацея і К.Тарлецкага падпісалі мітрапаліт літоўскі Міхаіл Рагоза, арцыбіскуп полацкі і віцебскі Рыгор Загорскі, біскуп пінскі і тураўскі Лявонцій Пельчыцкі, біскуп холмскі і бельскі Дыянісій Збруйскі, архімандрыт кобрынскі Іона Гогаль. Не падпісалі акт толькі два праваслаўныя біскупы: львоўскі Гедэон Балабан і перамышльскі Міхаіл Капысценскі [3, с. 114].

У сярэдзіне 1595 г. праваслаўныя біскупы склалі і падпісалі яшчэ два дакументы: «Артикулы (умовы) уніі», якія прадставілі адначасова каралю Рэчы Паспалітай і рымскаму папе Кліменту XIII, а таксама «Саборнае пасланне да папы» з просьбай пагадзіцца на ўнію з праваслаўнымі. У «Артыкулах» яны патрабавалі ад свецкай і духоўнай улад забеспячэння наступных умоваў:

- захаванне нязменнымі ўсіх святаў, абрадаў, цырымоній і звычаяў Усходняй царквы;
- прызначэнне на пасад святароў толькі «русінаў усходняга абраду»;
- захаванне старадаўняга звычаю выбару епіскапаў клірам;
- прадстаўленне месцаў у Сенаце для мітрапаліта і біскупаў;
- забарону свяшчэннадзейнічаць духавенству, не згоднаму на ўнію;
- забарону пераходу ўніятаў у лацінскі абрад;
- вяртанне царкоўнай маёмасці..;
- забеспячэння рэальнай улады епіскапаў, а не патронаў над цэрквамі;
- і інш. [11, с. 46].

У «Саборным пасланні да папы» таксама выказвалася жаданне каб папа пагадзіўся «...заставіць усіх нас пры веры і ўсіх цырымоніях і абрадах усходняй царквы, ні ў чым іх не парушаючы і зацвердзіў гэта для нас за сябе

і за сваіх пераемнікаў» [3, с. 114].

У студзені 1596 г. папа зацвердзіў акт уніі. На падставе ўказу караля мітрапаліт Міхаіл Рагоза прызначыў царкоўны сабор у Брэсце на 6 кастрычніка 1596 г., дзе і была зацверджана царкоўная ўнію паміж праваслаўнай і каталіцкай царквой Рэчы Паспалітай. Пасля гэтага кароль сваім універсалам ад 15 кастрычніка 1596 г. зацвердзіў рашэнні Брэсцкага царкоўнага сабора. Пасля сабора ўніяцтва юрыдычна стала дзяржаўнай рэлігіяй, а праваслаўе апынулася па-за законам.

І.Пацей пакінуў пасля сябе вялікую творчую спадчыну. Найбольш вядомы выдадзеная ім ананімна кніга «Унія, альбо выклад преднейших артикулов к зъедночению греков з костелом римским» (1595 г.), яго выдатныя творы: «Антырызіс» (1600 г.), «Адказ на ліст Клірыка Астрожскага», «Ліст да князя Канстанціна Астрожскага» (1598 гг.), «Размовы берасцяніна з братчыкамі» і інш.

Праваслаўныя, якія адмоўна аднесліся да Берасцейскай уніі, аб’ядналіся вакол князя К.Астрожскага. Апошні фактычна ўзначаліў антыўніяцкую апазіцыю. Нейкі час ён нават не выключаў барацьбы супраць уніі са зброяй у руках. Даведаўшыся пра планы паездкі І.Пацея і К.Тарлецкага ў Рым, К.Астрожскі надрукаваў свае пасланне да праваслаўных Рэчы Паспалітай, у якім заклікаў іх усімі сіламі процідзейнічаць увядзенню ўніі. Ён пісаў: «У сапраўдны час нашы пастыры - мітрапаліты з біскупамі ператварыліся ў ваўкоў Яны патаемна дагаварыліся паміж сабой адарваць тутэйшых хрысціян і павесці іх з сабой на пагібель. Хачу разам з Вамі стаяць супраць ворагаў нашага выратавання» [3, с. 118]. Пасланне было надрукавана ў Астрожскай друкарні і шырока распаўсюджана сярод праваслаўных.

Разам з экзархам Нікіфарам - пасланнікам канстанцінопальскага патрыярха - К.Астрожскі узначаліў паседжанні праваслаўных, якія таксама пачаліся ў Брэсце 6 кастрычніка 1596 г., асобна ад уніятаў. Ён не прыняў уніі, не адмовіўся ад барацьбы супраць яе, але быў праціўнікам крайніх мер, нават тады, калі дзяржаўная ўлада пачала ўжываць у якасці аргументаў гвалт і фальсіфікацыю.

Больш таго, як шчыра занепакоены лесам дзяржавы палітык, ён стрымліваў прыхільнікаў праваслаўя ад гвалтоўных сродкаў барацьбы з уніятамі. У прыватнасці, у 1600 г. ён пісаў львоўскаму брацтву: «Даю вам раду, каб вы былі цярплівыя і чакалі часу калі бог схіліць сэрца яго каралеўскай вялікасці да таго, каб кожнаму была дадзена магчымасць заставацца пры правах сваіх» [3, с. 118].

## ***5. Палітычныя і прававыя ідэі ў антыўніяцкай літаратуры (М.Сматрыцкі, А.Філіповіч)***

У выніку заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі насельніцтва Рэчы Паспалітай на падставе канфесійнай прыналежнасці падзялілася на шэраг рэлігійна-палітычных груповак. Найбольш шматлікую і ўплывовую групоўку складалі каталікі (да іх ліку належалі і ўніяты). Значна меншую па колькасці і па грамадскаму значэнню групоўку складалі вернікі пратэстанцкіх

накірункаў і праваслаўныя. Іх усіх называлі адным словам - дысідэнты.

Праблема ўзаемаадносін католікаў і некатолікаў, іх ролі ў грамадска-палітычным жыцці з цягам часу стала адной з важнейшых у дзяржаве, асабліва ў XVIII ст. У рэшце рэшт яна адыграла фатальную ролю ў лёсе дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай.

**М.Сматрыцкі.** М.Сматрыцкі (1578 – 1633 гг.) атрымаў адукацыю ў Астрожскай акадэміі. Далей ён працягваў адукацыю на філасофскім факультэце Віленскай езуіцкай акадэміі, якую скончыў у 1600 г. Пасля гэтага некалькі год займаўся педагагічнай дзейнасцю, падарожнічаў па Германіі, слухаў лекцыі ва Вроцлаўскім, Лейпцыгскім, Нюрнбергскім і Віттэнбергскім універсітэтах. У час знаходжання ў Германіі атрымаў ступень доктара медыцыны. Прабыўшы два гады за мяжой, Сматрыцкі вярнуўся на радзіму і стаў настаўнікам брацкай школы пры Троіцкім праваслаўным кляштары.

На гэтым адрэзку свайго жыцця М.Сматрыцкі падтрымліваў антыўніяцкія ідэі. У шэрагу палемічных трактатаў («Антыграфі, або адказ на з’едлівае сачыненне», «Трэнас, альбо лямант Усходняй царквы», «Верыфікацыя невінаватасці», «Абарона верыфікацыі», «Суплікацыя…» і інш.) ён выступае абаронцам праваслаўя.

Найбольш вядомы твор М.Сматрыцкага антыуніяцкага перыяду «Трэнас, альбо лямант усходняй царквы». У ім у алегарычнай форме Сматрыцкі адлюстраваў цяжкае становішча праваслаўнай царквы у Рэчы Паспалітай пасля Брэсцкай царкоўнай уніі. Гэтае становішча ён падаў у форме традыцыйнага народнага галашэння, якое зыходзіла ад праваслаўнай царквы, якую ён параўноўваў з маці. Маці-царква звярталася да сваіх няўдзячных дзяцей з горкімі папрокамі і малітвай:

«Гора мне беднай! Гора мне няшчаснай! Гора мне пазбаўленай убранства і выстаўленай на агульнае ганьбаванне! Рукі мае ў аковах, ярмо на шыі, ланцугі на нагах, меч двухбаковавостры над галавой... Дзень і ноч плачу я і слёзы як ручаі, цякуць па шчоках маіх і няма каму суцешыць мяне ў горы маім: усе мяне пакінулі, усе мною пагарджаюць... Не ведаю, куды мне падацца, перад кім схіліць сваю галаву, у каго шукаць абароны». Прыгнечаная сорамам ад свайго ўніжанага становішча маці-царква шле непаслядоўным вернікам праклён : «Гора ўсім, хто мною пагрэбаваў...» [3, с. 123; 4, с. 147].

У сваіх творах М.Сматрыцкі абвінавачвае царкоўную ўнію ў тым, што яна падзяліла народ, прынесла міжусобіцы, разбурыла цэласнасць і адзінства краіны. Абапіраючыся на старажытныя прывілеі, ён даказвае, што праваслаўнае насельніцтва супрацьпраўна пазбавілі яго правоў, што гэтыя правы нелегітымна перададзены ўніятам. «Гэтай уніяцкай Русі, - гаворыцца ў «Суплікацыі..» («Скарге..») М.Сматрыцкага, - не ведаюць нашы законы і не ведаюць польскія каралі, таму не ўспамінаюць пра яе ў прывілеях, якія дадзены рускаму народу» [7, с. 104]. У сваіх творах ён упэўнівае Сойм і караля Рэчы паспалітай, што праваслаўная партыя змагаецца за свае правы выключна мірнымі сродкамі, і абвінавачвае ўніятаў у прымусе і гвалтах.

У 1617 г. Сматрыцкі пад імем Мялеція пастрыгся ў манахі. З 1620 г. - ён

праваслаўны арцыбіскуп полацкі, біскуп віцебскі і мсціслаўскі. Пасля расправы віцебскіх праваслаўных гараджан над полацкім уніяцкім арцыбіскупам Я.Кунцэвічам (1623 г.), не жадаючы пацярпець ад рэпрэсій, якія распачаў урад, і «адчуваючы долю асабістай віны за усплеск рэлігійных пачуццяў веруючых» [3, с. 122], ён вырашыў здзейсніць падарожжа да «святых мясцін» - краін Блізкага Ўсходу. За час гэтага далёкага падарожжа, якое працягвалася каля двух гадоў, у рэлігійна-палітычных перакананнях М.Сматрыцкага адбыўся пералом. Пасля вяртання на радзіму ён парваў з праваслаўнай царквой, прыняў унію.

Змену поглядаў М.Сматрыцкі тлумачыў жаданнем садзейнічаць усталяванню стабільнасці ў дзяржаве. З прыняццем уніі, пісаў ён, «шляхецкае саслоўе атрымае доступ да земскіх устаноў і сенату, мяшчане будуць засядаць у ратушы», а народ «выцярэ свае слезы і атрымае незлічоную колькасць розных благ» [3, с. 122]. У творах, напісаных з пазіцый уніяцкай царквы («Апалогія...», «Разважанне пра шэсць розніц паміж Усходняй і Заходняй царквамі», «Пратэстацыя» і інш.) Сматрыцкі адмовіўся ад сваіх антыуніяцкіх ідэй, асудзіў свае ранейшыя працы як ерэтычныя, а таксама выступіў супраць праваслаўных пісьменнікаў-палемістаў С.Зізанія, Хрыстафора Філалета.

У канцы XVI ст. у свядомасці жыхароў ВКЛ ужо падзяляліся грамадства і ўлада. Грамадства валодае шэрагам натуральных правоў, якія ўлада павінна забяспечваць. Гэтая ідэя падводзіць некаторых аўтараў да здагадкі аб дагаворнай аснове дзяржавы.

На думку М.Сматрыцкага, грамадства складаецца з трох саслоўяў – князёў, слуг і святароў. Паміж імі існуе грамадская дамова аб размеркаванні абавязкаў і ўзаемаадносін. Уладары павінны справядліва і літасціва валадарыць, слугі добрасумленна працаваць, плаціць падаткі, а святары – служыць Богу і людзям, быць праведнымі і сціплымі. Дамова фіксуецца ў дзяржаўным заканадаўстве, і яе выкананне прыводзіць да «грамадскага дабра», а парушэнне пагражае існаванню дзяржавы.

«Свабода» разумеецца М.Сматрыцкім як магчымасць выбіраць пажаданы лад жыцця, яле яна павінна адпавядаць дзейснаму заканадаўству [2, с. 73].

Сматрыцкі прызнаваў традыцыйны ў той час падзел права на свецкае, кананічнае (царкоўнае) і натуральнае. Свецкае і кананічнае права павінна засноўвацца не толькі на законах і канонах, але і на старадаўніх звычаях народаў. Такім чынам, Сматрыцкі надаваў асаблівае значэнне так званаму звычаёваму («непісанаму») праву, нормы якога складаліся ў таго ці іншага народа на працягу яго гісторыі. Існаванне дзяржавы не магчымае, калі існуе супярэчнасць паміж звычаёвым правам і заканадаўствам.

**А.Філіповіч.** Афанасій Філіповіч (1597-1648 гг.) - вядомы беларускі грамадскі і царкоўна-палітычны дзеяч першай паловы XVII ст. - нарадзіўся ён на Брэстчыне ў сям'і рамесніка, атрымаў добрую на той час адукацыю, працаваў настаўнікам. З 1620 г. знаходзіўся пры двары канцлера ВКЛ Льва Сапегі. У 1627 г. Філіповіч пастрыгся ў манахі і распачаў рэлігійна-

асветніцкую дзейнасць. Ён - аўтар твораў «Гісторыя падарожжа ў Маскву», «Супліка першая», «Тлумачальная запіска», «Навіны», «Фундамент бязуладдзя касьцёла рымскага», «Супліка трэцяя», «Падрыхтоўванне да суда», «Парады каралю», якія аб’яднаны ў адзін звод пад назвай «Дыярыўш» («Дзённіка»).

А.Філіповіч катэгарычна выступае супраць уніі. Пры гэтым сваё адмаўленне ўніяцтва ён абгрунтоўвае ў асноўным палітычнымі і прававымі прычынамі. Галоўная яго тэза – унія парушыла стабільнасць у краіне, выклікала незадавальненні, міжусобіцы. Унія выклікала грамадзянскую вайну з казакамі, якая падрывае моц дзяржавы. Праблема ўніі не рэлігійная, а палітычная, таму кароль палітычным рашэннем павінен скасаваць унію, забараніць дзейнасць езуітаў, вынішчыць усю некаталіцкую і неправаслаўную літаратуру, склікаць царкоўны сабор для прымірэння Усходняй і Заходняй цэркваў [3, с. 106-107].

Паленіст выступае супраць верацярпімасці, прызывае пакінуць у дзяржаве толькі каталіцкую і праваслаўную цэрквы. Сабор паміж імі павінен прывесці да прымірэння не на падставе верацярпімасці, а на падставе «веры единой правдивой» [3, с. 106-107].

У сваім змаганні за правы праваслаўных А.Філіповіч першым выказаў ідэю замежнага ўмяшальніцтва ў справы Рэчы Паспалітай. У 1637 - 1638 гг. ён ездзіў у Маскву да рускага цара, прасіў яго выступіць у абарону правоў праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны.

А.Філіповіч - прыхільнік абсалютнай манархіі. Кароль у яго разуменні павінен быць галавой як заканадаўчай, так і выканаўчай улады. Дзейнасць Сената і духоўнай улады абмяжоўваецца дарадчымі функцыямі. Яны павінны выконваць волю караля, забяспечваць пры дапамозе дзяржаўнага апарату рэалізацыю яго рашэнняў. Падобная структура ўлады, на думку Філіповіча, пакладзе канец як шляхецкай анархіі і свавольству, так і дапаможа рацыянальна арганізаваць грамадскае жыццё [3, с. 125].

У 1648 г. за тайныя зносіны з казакамі Багдана Хмяльніцкага ён быў расстраляны брэсцкім ваяводам Масальскім.

### ***6. Пачатак вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў Беларусі і Літве. Палітычныя і прававыя погляды А.Алізароўскага***

У 1641 г. быў створаны і ў 1644 г. пачаў дзейнічаць у складзе Віленскай езуіцкай Акадэміі юрыдычны факультэт. Яго заснавальнікам і фундатарам быў сын славутага Льва Сапегі - Казімір Леў Сапега (1609-1656 гг.), падканцлер Вялікага княства Літоўскага. Кароль польскі і Вялікі князь літоўскі Уладзіслаў IV Ваза (1632-1648 гг.) у сваім прывілеі пацвердзіў усе правы, дадзеныя раней Акадэміі, а таксама пажадаў, каб у ёй «публічна выкладаліся курсы кананічнага і цывільнага права і каб тым, хто праявіць сябе належным чынам падрыхтаваным па гэтых навуках, прысуджаліся ўсе навуковыя ступені, якія прысуджаюцца ў другіх акадэміях і ўніверсітэтах» [3, с. 126].

На працу ў якасці выкладчыкаў юрыдычнага факультэта былі запрошаны

знаныя дактары права з заходнееўрапейскіх універсітэтаў. Сярод іх быў адзін беларус па паходжанню, ураджэнец Віцебшчыны, прафесар кананічнага права А.Алізароўскі (1610-1659 гг.). Сярэднюю адукацыю ён атрымаў у езуіцкіх калегіумах Нясвіжа, Полацка, Познані, потым удасканальваў веды ў вышэйшых навучальных установах Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Італіі. У 1644 г. у універсітэце Інгольштата ён атрымаў ступень доктара права. На радзіме А.Алізароўскі ўзначаліў спачатку кафедру кананічнага, а потым цывільнага права. Выкладчыцкая дзейнасць А.Алізароўскага ў Вільні працягвалася да 1655 г.

Галоўнай працай А.Алізароўскага быў твор на лацінскай мове «Аб палітычнай супольнасці людзей» (1651 г.). Даследчыкі адзначаюць, што нягледзячы на празмернае цытаванне іншых аўтараў (цытаты больш як 250 прадстаўнікоў палітычнай думкі), аўтар ажыццявіў арыгінальнае даследаванне грамадскага і палітычнага ладу Рэчы Паспалітай сяр.XVII ст. [7, с. 111]. Пазбягаючы канфлікту з тэалогіяй, ён выкладае цалкам свецкае вучэнне аб грамадстве, дзяржаве, праве. Галоўным адрозненнем гэтых двух сфер, палітыкі і тэалогіі, ён лічыць практычную карыснасць і дзейснасць палітыкі. Свой твор А.Алізароўскі падзяліў на уводзіны і тры часткі - «Гаспадарка», «Грамадства», «Дзяржава».

У першай частцы разглядаюцца праблемы шлюбу, сям’і, а таксама адносіны паміж панамі і прыгоннымі. Аналізуючы сямейна-шлюбныя адносіны, А.Алізароўскі закранае пытанні выхавання. Ён выказвае ідэю неабходнасці навучання шляхецкай моладзі рамёствам. Каб пераканаць шляхту ў неабходнасці авалодання грамадзянскімі прафесіямі, А.Алізароўскі спасылаецца на кнігу выдатнага англійскага гуманіста XVI ст. Т.Мора «Утопія». (У дзяржаве ўтапійцаў кожная сям’я, як вядома, спецыялізавалася ў адным відзе якога-небудзь рамяства). А.Алізароўскі таксама паказвае выгады, якімі карыстаюцца асобныя еўрапейскія краіны ад росквіту рамёстваў [3, с. 127].

У гэтай частцы А.Алізароўскі разглядае таксама становішча сялян у Рэчы Паспалітай. Запрыгоньванне сялян А.Алізароўскі разглядае як гвалт шляхты над сялянамі, які супярэчыць натуральнаму праву і наносіць шкоду грамадству. Ён выказваецца за такія адносіны паміж панамі і прыгоннымі, пры якіх селянін за атрыманую ад пана зямлю плаціў бы апошняму толькі грашовы падатак (чынш) і меў бы права мяняць месца жыхарства ў адпаведнасці са сваімі жаданнямі [3, с. 127].

У другой частцы А.Алізароўскі палемізуе з аўтарамі, якія сцвярджалі, што толькі прадстаўнікі шляхты павінны карыстацца грамадзянскімі правамі. На яго думку, сапраўднае шляхецтва складаецца з маральнасці, адукаванасці, духоўнай высакароднасці, сумленнага выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў. Грамадзянскімі ж правамі павінны валодаць прадстаўнікі ўсіх саслоўяў, акрамя рабоў і іншаземцаў. Усе жыхары краіны ў роўнай ступені павінны валодаць грамадзянскімі і палітычнымі правамі, мець магчымасць пераходу з аднаго саслоўя ў другое, быць роўнымі перад законам.

У трэцяй частцы кнігі А.Алізароўскі аналізуе паходжанне і сутнасць

дзяржавы, формы дзяржаўнага кіравання. У падмурку дзяржавы ляжыць агульнае імкненне людзей да стварэння палітычных саюзаў-супольнасцей дзеля рэалізацыі прынцыпу ўсеагульнай карысці. Ён прапануе наступнае азначэнне дзяржавы - «створаны з мноства паселішчаў саюз і аб’яднанне людзей, якія звязаны правам, што ўвайшлі ў згоду ў імя добрага і шчаслівага жыцця» [2, с. 76]. Адносіны падпарадкавання, на думку А.Алізароўскага, узнікаюць у ўзаемаадносінах людзей яшчэ на ўзроўні сям’і, панскага фальварка, паселішча. Гэта адносіны між бацькам і дзецьмі, падданымі і панам і г.д.

А.Алізароўскі прааналізаваў розныя формы дзяржаўнага кіравання (манархія, тыранія, арыстакратыя, дэмакратыя), вылучыў іх станоўчыя і адмоўныя бакі. А.Алізароўскі прыйшоў да высновы, што дасканаласць і моц дзяржавы залежаць ад найбольш рацыянальна выбранай формы дзяржаўнага кіравання. Выступаючы супраць звычаю абрання караля, які ў тыя часы усталяваўся ў Рэчы Паспалітай, А.Алізароўскі выказваецца на карысць спадчыннай манархіі. Ён лічыць, што манарх не павінен быць іншаземцам.

У падмурку канцэпцыі права прафесара А.Алізароўскага ляжаць яго ўяўленні аб «натуральным праве». Натуральнае права ён адрознівае ад «боскага», апошняе носіць самастойны характар і «забараняе несправядлівасць, прыгнёт бедных і ўсялякія крыўды» [7, с. 112]. Натуральнае ж права вынікае з сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей і іх прыроднай сутнасці. З апошняй, якая прысутная ўсяму жывому, вынікаюць такія правы чалавека, як права самаабароны, права распараджацца сабою, імкненне да супрацоўніцтва з іншымі і г.д.

Розум чалавека цесна звязаны з прыродай, яны разам з’яўляюцца ўзаемаабумоўленымі зыходнымі перадумовамі права [7, с. 113]. Натуральнае права фарміруецца на падставе розума і прыроды, яно папярэднічае праву пазітыўнаму, або «праву народаў», «грамадзянскаму праву». Пазітыўнае права павінна адпавядаць праву натуральнаму, калі яно адыходзіць ад натуральнай справядлівасці, якую А.Алізароўскі атаясамляе з натуральным правам, яно не можа лічыцца правам. Розум выступае тым сродкам, які дазваляе вызначыцца з адпаведнасцю розных крыніц пазітыўнага права натуральнай справядлівасці. «Толькі той звычай атрымлівае моц права, які згаджаецца з розумам, бацькам усіх правоў» [2, с. 77; 7, с. 112]

Такім чынам, згодна А.Алізароўскаму, закон павінен быць справядлівым, адпавядаць законам прыроды і найвышэйшаму розуму, быць ясным для разумення. «Каб ажыццяўлялася іх прызначэнне, якім з’яўляецца дабрачыннасць дзяржаваў, законы недастаткова запісаць на паперы і ў кнігах, іх трэба выконваць на практыцы» [4, с. 10].

З паняццямі закона і права ў творчасці А.Алізароўскага цесна звязаны катэгорыі свабоды і роўнасці. Свабода ў аўтара выступае ў трох відах: як прававая, філасофская і палітычная. Прававая свабода адпавядае здольнасці людзей распараджацца сваім жыццём згодна асабістага разумення і ў адпаведнасці з законам, філасофская – азначае ўладу розума над эмоцыямі і пачуццямі, а палітычная – увасабляецца ў панаванні права, закона, а не

аднаасобнай волі манарха. Роўнасць жа гэта аднолькавае для ўсіх права на годнае месца ў грамадстве і абарону закона [2, с. 78; 7, с. 113].

Творчасць А.Алізароўскага, такім чынам, з’яўляецца яскравым прыкладам распаўсюджання ў сяр.XVII ст. у межах Рэчы Паспалітай прыйшоўшых з Заходняй Еўропы палітыка-прававых канцэпцый Новага часу. Ідэі А.Алізароўскага не адпавядалі феадальна-прыгонніцкаму ладу дзяржавы, значна апярэджвалі развіццё правасвядомасці большасці жыхароў краіны.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бохан, Ю. Да пытання аб ідэалагічных перадумовах Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 года / Ю.Бохан // З гісторыі ўніяцтва на Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай царкоўнай уніі) / Інстытут гісторыі АН Беларусі; Пад рэд. М.В.Біча і П.А.Лойкі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – с.22-40.
2. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272с.
3. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
4. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206с.
5. Грыцкевіч, А. Уніяцкія тэндэнцыі і ўніяцкая царква на Беларусі ў XV-XVIII стагоддзях / А.Грыцкевіч // Хрысціянская думка. – 1993. - №1. – с.163-172.
6. Жлутка, А. Наступнікі айца Ігнацыя / А.Жлутка // Хрысціянская думка. – 1993. - №2. – с.99-123.
7. Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.
8. Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (Філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 111с.
9. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.
10. Саверчанка, І. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі / І.Саверчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 67 с.
11. Шаставец, У. Брэсцкая унія: перадгісторыя, падрыхтоўка і заключэнне / У.Шаставец // З гісторыі ўніяцтва на Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай царкоўнай уніі) / Інстытут гісторыі АН Беларусі; Пад рэд. М.В.Біча і П.А.Лойкі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – с.40-54.

# ТЭМА 7.
# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА
# ПЕРЫЯДУ КРЫЗІСУ ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКІХ АДНОСІН
# У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (СЯР. XVII-СЯР. XVIII СТСТ.)

## *1. Ідэалогія сарматызму – афіцыйная ідэалогія Рэчы Паспалітай*

З канца XVI ст. Рэч Паспалітая паступова пачынае прыходзіць у заняпад. Шматлікія войны, у якіх амаль без перапынку ўдзельнічала дзяржава, прывялі да эканамічнага заняпаду яе эканоміку. Вайсковыя аперацыі, якія асабліва з 1648 г. праходзілі на тэрыторыі краіны, руйнавалі гарады, рамёствы, гандаль, сельскую гаспадарку.

Эканамічны заняпад суправаджаўся палітычным крызісам. У Рэчы Паспалітай спачатку наступіла эпоха шляхецкай дэмакратыі, а затым магнацкай алігархіі. Шматлікія войны, забяспечылі дамінуючую вайсковую і палітычную ролю шляхты і магнатства ў краіне. Выгодная вонкавая рынкавая кан'юнктура у выглядзе высокіх коштаў на збожжа, забяспечыла іх эканамічнаю магутнасць, замацавала прыгонніцкія адносіны. У выніку фармальна досыць шырокія канстытуцыйныя паўнамоцтвы караля: склікаць Вальны сойм, вызначаць тэрмін яго паседжанняў, прызначаць службовых асоб на дзяржаўныя пасады і інш. - з-за ўсеўладдзя шляхты, анархіі фактычна не рэалізоўваліся ім самастойна. «Liberum veto», у сваю чаргу, паралізавала і дзейнасць Сейма, бо большасць яго паседжанняў зрывалася.

Кіраванне перайшло да мясцовых органаў, якія знаходзіліся пад уплывам розных магнацкіх груповак. Рэч Паспалітая пачала распадацца на шэраг самастойных рэгіёнаў, якія дзейнічалі паасобку, разрознена і запаўнялі ўнутрыпалітычнае жыццё дзяржавы міжусобіцамі і сутыкненнямі.

Маруднае развіццё буржуазных адносін у эканоміцы, сінтэз сярэднявечных уяўленняў з элементамі пратэстанцкай ідэалогіі ў выніку прывялі да распрацоўкі і распаўсюджання сармацкай ідэалогіі, якая ў XVII ст. стала пануючай у Рэчы Паспалітай.

Сарматызм, як шляхецкая ідэалогія Рэчы Паспалітай, грунтавалася на сярэднявечнай тэорыі пра сарматаў як продкаў усходнеславянскіх і суседніх з імі народаў. З канца XV ст. пад Сарматыяй разумеліся ўсе землі, падуладныя дынастыі Ягеллонаў. Л.Корвін у «Касмаграфіі» (1496 г.) да Еўрапейскай Сарматыі адносіў Палонію (Польшчу), Мазовію, Прусію і Літву. Ян з Стаўбніцы ва «Уводзінах да касмаграфіі Пталемея» (1512 г.) да Еўрапейскай Сарматыі залічваў Палонію, Мазовію, Прусію, Літву, Жамойць, Курляндыю, Лівонію [7, с. 552]. Фактычна ўсе гэтыя землі ўваходзілі ў сферу геапалітычных інтарэсаў Рэчы Паспалітай.

Легенды пра сарматаў як агульных продкаў сталі ідэалагічным абгрунтаваннем дзяржаўнай уніі Польшчы і ВКЛ, а пасля 1596 г. – існавання шматнацыянальнай і шматканфесійнай Рэчы Паспалітай. Да тэорыі Сарматыі М.Страйноўскі ў сваім творы «Хроніка польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі» (1582 г.) спрабаваў дапасаваць легенду пра старажытнарымскае

паходжанне шляхты ВКЛ. Ён сцвярджаў, што Палямон з паслядоўнікамі заспеў на Літве мясцовае сармацкае насельніцтва, у якім асіміляваўся. Такім чынам, палякі і літвіны нібыта ў асноўным паходзяць ад сарматаў. Адзінства паходжання падкрэслівала роўнасць і аднароднасць шляхецкага стану Рэчы Паспалітай [7, с. 552].

У Рэчы Паспалітай з дапамогай гістарычных і літаратурных твораў, мемуараў, трактатаў пачаў складвацца культ шляхецкага стану. Высокія заслугі шляхты расхвальваліся часцей за ўсё на прыкладах дзейнасці канкрэтных магнатаў (Радзівілаў, Сапегаў, Хадкевічаў і інш.). Апошніх апісвалі як узоры патрыятызму, храбрасці, дзяржаўнай мудрасці, бескарыслівасці і г.д. Падкрэсліваліся заслугі шляхты ў барацьбе з «нявернымі» (туркамі, татарамі), «схізматыкамі» (маскавітамі), ерэтыкамі-пратэстантамі (шведамі), што нібыта працягвала традыцыю перамог сарматаў над рымлянамі.

Паступова сарматызм пачаў уключаць у сябе палітычныя «тэорыю шляхецтва» і «экзекуцыйную праграму». Тэорыя шляхецтва будавалася як на «натуральным», так і «звышнатуральным» падмурках. У адпаведнасці з першым, вызначальнае значэнне мела канцэпцыя «прыроджанай высакароднасці», згодна з якой высокая сацыяльная карыснасць шляхецтва вынікае са значнасці крыві, «высакароднасці» паходжання. Сфарміраваўся прынцып: чым больш высакародныя продкі – тым лепш [6, с. 90].

З перамогай Контррэфармацыі распаўсюджваецца і ідэя богаабранасці шляхты. Бог стварыў шляхту, а шляхта ў сваю чаргу павінна быць рэўнаснай абаронцай рэлігіі і духавенства.

Пашырэнне ўплыву шляхты прывяло да пашырэння поглядаў на дагаворную прыроду адносін паміж шляхтай і каралеўскай уладай. Шляхецкія свабоды трактаваліся як спрадвечныя. Экзекуцыйная праграма патрабавала вяртання шляхце тых адвечных правоў, якія быццам бы незаконна адабрала каралеўская ўлада.

Вайсковае і палітычнае дамінаванне шляхты прывяло да супрацьпастаўлення шляхецкага саслоўя іншым станам грамадства. Статус сялян і гараджанаў трактаваўся як непалітычны, ім поўнасцю адмаўлялася ў праве на ўдзел у фарміраванні органаў кіравання. Распаўсюджваецца пастулат «нацыя – гэта шляхта» [6, с. 90].

Ня гледзячы на фактычны пераход у XVII ст. улады Рэчы Паспалітай да магнацкай алігархіі, у сферы ідэалогіі і заканадаўства прынцып роўнасці шляхты не пахіснуўся. У 1589 г. уводзіцца прынцып аднагалосся пры прыняцці сеймавых пастаноў («liberum veto»). У першыню Сейм быў сарваны ў 1652 г. упіцкім дэпутатам В.Сіцынскім., а з 1654 па 1764 гг. з 55 Сеймаў сарвана 48. Спецыяльнымі рашэннямі шэрагу Сеймаў неаднаразова забаранялася надзяляць шляхту тытуламі, званнямі, ордэнамі (за выключэннем княжацкіх тытулаў агавораных у акце Люблінскай уніі).

Сярод пануючага класу склалася перакананне аб дасканаласці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Яна лічылася прыкладам найлепшай формы кіравання – змешанай (паводле канцэпцыі Арыстоцеля), якая гарантуе

сапраўдны росквіт свабоды. Любыя змяненні большая частка шляхты адмаўляла, лічыла шкоднымі. Такія адносіны да дзяржаўнага кіравання выклікалі закасцянеласць кіравання, пашырэнне крызісных з'яў.

У духоўным жыцці сармацкая ідэалогія патрабавала замацавання выключнага становішча Каталіцкай царквы. Не дапускаліся спробы адысці ад яе вучэння і догмаў схаластычнай навукі. У гэты перыяд латынь зноў вярнула сабе страчаныя пазіцыі і стала мовай навучання і набажэнства.

Адзінства паходжання шляхты Рэчы Паспалітай прывяло да пашырэння ўплыву польскай культуры на землях ВКЛ. Польскасць у ВКЛ становіцца палітычным сінонімам шляхетнасці. У 1696 г. Сойм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову, згодна з якой дзяржаўныя дакументы ў ВКЛ павінны былі пісацца толькі на польскай альбо лацінскай мовах.

Альтэрнатыўныя дамінуючай сармацкай ідэалогіі погляды ў Рэчы паспалітай не ўспрымаліся. Асобы, якія іх выказвалі, праследаваліся. Шмат хто з іх быў вымушаны выехаць за межы краіны і працаваць у іншых дзяржавах.

### ***<u>2. Грамадска-палітычныя погляды К.Лышчынскага</u>***

З радыкальным адмаўленнем канцэпцыі сарматызму, пануючага рэлігійнага светапогляду выступіў Казімір Лышчынскі, адзін з першых прадстаўнікоў атэізму і ўтапічнага сацыялізму ў Беларусі.

К.Лышчынскі нарадзіўся 4 сакавіка 1634 г. у маёнтку Лышчыцы Брэсцкага павета ў шляхецкай сям'і. Адукацыю ён атрымаў у езуіцкіх навучальных установах Берасця, Кракава, Каліша, Львова. Затым пад уплывам бацькоў Казімір уступіў у ордэн езуітаў. Некалькі год ён выкладаў у Берасцейскім езуіцкім калегіуме, займаў пасаду памочніка яе рэктара. Пазней, расчараваўшыся, ён пакідае выкладчыцкую працу і вырашае заняцца юрыдычнай практыкай. К.Лышчынскі неаднаразова выбіраўся дэпутатам Сейму Рэчы Паспалітай, сакратаром і суддзёй Літоўскага Трыбунала. З 1662 г. ён працаваў у якасці падсудка Брэсцкага земскага суда.

У сваім маёнтку К.Лышчынскі адкрыў школу, выкладанне ў якой было скіравана на вывучэнне прыродазнаўчых дысцыплін.

Свае погляды ён выклаў у працы «Аб неіснаванні бога». У 1687 г. сусед Лышчынчкага Ян Бжоска, які спадзяваўся на значную матэрыяльную ўзнагароду, украў у мысліцеля рукапіс яго працы, пераслаў яе віленскаму епіскапу Бжастоўскаму, а той, у сваю чаргу, убачыўшы ў творы філосафа «радыкальныя думкі», са згоды караля загадаў арыштаваць К.Лышчынскага і пасадзіць у віленскую турму. Справа К.Лышчынскага была перададзена на разгляд Варшаўскага сойму. Працэс па абвінавачванню К.Лышчынскага пачаўся 11 лютага 1689 г. і працягваўся некалькі тыдняў [3, с. 134].

Следства па справе паказала поўную несумяшчальнасць вучэння мысліцеля з пануючай сістэмай поглядаў. Пракурор (інстыгатар) Вялікага княства Літоўскага С.Куровіч заявіў, што «гэтае злачынства патрабуе пакарання, якое перавышае пакаранні за ўсе іншыя ліхадзействы, апісаныя ў хрысціянскім законе», і патрабаваў самай суровай расправы з мысліцелем.

Прычынай жорсткага прысуду былі радыкальныя погляды К.Лышчынскага, якімі пачаў «заражаць гэтай навукай, як ядавітай атрутай, бязвінны розум маладых людзей і людзей сталага ўзросту» [3, с. 134].

28 сакавіка 1689 г. сойм большасцю галасоў прысудзіў К.Лышчынскага да пакарання смерцю. Асуджанаму адсеклі галаву, цела спалілі на кастры, попел змясцілі ў снарад і стрэлам з гарматы рассеялі ў паветры. Рукапісны трактат быў спалены на кастры разам з аўтарам.

Крыніцамі вывучэння поглядаў К.Лышчынскага з’яўляюцца нешматлікія ўрыўкі з трактату «Аб неіснаванні бога», якія былі знойдзены ў 1957 г., матэрыялы судовай справы, абвінаваўчая прамова інвестыгатара, данос Яна Бжоскага «Маніфест аб атэізме Лышчынскага».

На падмурку гэтых крыніц можна зрабіць выснову, што К.Лышчынскі быў прыхільнікам атэістычнага, матэрыялістычнага погляду на існаванне свету, законы яго развіцця. «Я абвінавачваю яго ў тым, - заяўляў інвестыгатар С.Куровіч, - што ён асмеліўся на 265 аркушах… прыпісаць уладу і праўленне зямлёй і небам натуры (прыродзе)» [5, с. 130].

К.Лышчынскі лічыў, што «люди – творцы и создатели богов, и бог является не действительной сущностью, а [творением] разума и к тому же химерическим... Религия установлена людьми неверующими, чтобы им воздавали почести… Лжемудрецы обманывают простой народ, опутывая его лживой верой в бога…» [4, с. 71]. Такім чынам, К.Лышчынскі выступаў супраць існавання веры ў Бога, супраць існавання рэлігіі, інстытутаў царквы. Такія думкі ў краіне з пераважна палымяна веруючым насельніцтвам не маглі не выклікаць грамадскага незадавальнення, жорсткай рэакцыі дзяржаўных інстытутаў.

Грамадска-палітычныя погляды К.Лышчынскага былі вельмі блізкі да ідэяў ранняга ўтапічнага сацыялізму. У «Маніфесце… » Бжоскі, пераказваючы змест поглядаў мысліцеля, піша: «Парадак кіравання ва ўсім свеце, устаноўлены самім богам, у выглядзе розных класаў, каралеўстваў і манархій ён змяшаў па прыкладу гарамантаў,... жадаючы мець свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без гаспадароў, храм без святара, капітолій без суддзі»[2, с. 80; 3, с. 137].

У тыя часы ва ўмовах голаду, нястачы і прыгнечанага становішча большай часткі насельніцтва, для беднага люду і абаронцаў яго інтарэсаў, кшталту А.Гевары, Т.Мора, Т.Кампанелы, К.Лышчынскага, вельмі прывабнай і натуральнай была мара аб усеагульным роўным забеспячэнні, якое бачылася магчымым толькі пры абмежаванні свабоды і памераў спажывання. К.Лышчынскі паказвае сваё знаёмства са зместам твораў знакамітых утапістаў таго часу, напрыклад «Горадам Сонца» Т.Кампанэлы. У сваім трактаце ён нават спасылаецца на жыццё гарамантаў – неіснуючага народа, грамадскі лад якога апісаны ў рэнесанснай утопіі XVI ст. Антоніо дэ Гевары «Настаўлення хрысціянскага манарха».

У «Настаўленні» асуджаліся феадальнае самавольства, дэспатызм, тыранія, войны, сапсаваныя норавы, дрэннае выхаванне, цемрашальства, гультайства і г.д. Шмат дакораў было выказана ў адрас сучаснай аўтару

бюракратычнай палітычнай сістэмы: злоўжываннях чыноўнікаў, несправядлівым судаводстве, заблытаным заканадаўстве, якое пастаянна змянялася і г.д. Прычынай усіх незлічоных сацыяльных парокаў Гевара лічыў існаванне прыватнай уласнасці. Ён прыхільнік «залатога века», калі ў «грамадстве ўсё было агульнае», панавала роўнасць і справядлівасць. Аднак вярнуцца да тых далёкіх часоў, лічыць аўтар, прынцыпова немагчыма. Таму ў сучасных умовах дасягнуць шчаслівага жыцця можна толькі ўстанавіўшы маёмасную роўнасць, раўнамернае размеркаванне даходаў, абмежаванне права атрымання спадчыны, адмаўленне ад назапашвання і г.д. [3, с. 137-138].

У традыцыях свайго часу А.Гевара малюе ідэальнае грамадства на прыкладзе неіснуючай маленькай горнай краіны, дзе ў міры і згодзе жыве мудры і працавіты народ. Шчаслівае існаванне заснавана на падмурку семі простых законаў. «Першы патрабуе не прымаць новых законаў, таму што гэта вядзе да забыцця старых. Другі тычыцца свабоды сумлення. Трэці закон прадпісвае ўсім насіць адзінае, з аднолькавай тканіны і аднаго крою адзенне. Разнастайнасць у адзенні, лічылі гараманты, вядзе да сварак і вар'яцтва сярод людзей. Ён таксама патрабуе абавязковай працы для ўсіх, памяркоўнае спажыванне. Чацвёрты закон абмяжоўвае колькасць дзяцей: не адна жанчына не магла стаць маці больш чым тры разы, паколькі вялікія сем'і змушаюць бацькоў празмерна клапаціцца аб ежы, назапашванні, а гэта вядзе да розных сацыяльных заган. Пяты ўстанаўліваў суровае пакаранне для хлусоў. Калі высвятлялася, што чалавек сказаў няпраўду, яму адразу адсякалі галаву, нават калі ён не зрабіў ніякай іншай правіннасці. «Дастаткова аднаго ілжэца, каб сапсаваць увесь народ», - казалі гараманты. Шосты гаворыць, што «ўсе атрымліваюць аднолькавую спадчыну, таму што з-за прагі да маёмасці ў дзяржаве паўстае варожасць». І нарэшце, апошні сёмы закон абмяжоўваў жыцце чалавека. «Ні адна жанчына не можа жыць больш 40, а мужчына - 50 гадоў». Калі яны дасягнуць гэтага ўзросту, іх прыносяць у ахвяру багам»[3, с. 138].

Для таго часу, калі значная частка насельніцтва жыла ў галечы, часта галадала, для бедных людзей таталітарны лад гарамантаў казаўся не здзяйсняльнай марай, напоўненай дабрабытам і спакоем. Дзеля мінімальнага задавальнення патрэб чалавека філосафы-утапісты гатовы былі абмежаваць яго свабоду. Дабрабыт гарамантаў дасягаўся за кошт стабілізацыі грамадскага жыцця, якое дасягалася праз рэгулявання росту насельніцтва, жорсткую рэгламентацыю яго жыцця і забеспячэння маёмаснай роўнасці жыхароў.

Зыходзячы з гэтага, К.Лышчынскага можна разглядаць як аднаго з першых прадстаўнікоў утапічнага сацыялізму на Беларусі.

### ***3. Палітычныя і прававыя погляды С.Полацкага***

Пануючая ідэалогія сарматызму адмаўляла існаванне альтэрнатыўных поглядаў, якія ўспрымаліся як шкодныя, бо патрабавалі зменаў у

«ідэальным» дзяржаўным або грамадскім ладзе Рэчы Паспалітай. Творчыя асобы, які прыналежалі да некаталіцкіх канфесій, асобы, якія з’яўляліся прыхільнікамі іншых формаў кіравання для рэалізацыі сваіх ідэй змушаны былі пакідаць радзіму, шукаць прытулку ў другіх краінах, дзе былі больш спрыяльныя ўмовы для творчасці. Сярод тых, хто пакінуў Беларусь у гэты перыяд, былі А.Белаблоцкі, І.Капіевіч, Сімяон Полацкі.

С.Полацкі (сапраўднае прозвішча Пятроўскі-Сітніяновіч) нарадзіўся ў снежні 1629 г. у Полацку. Тут жа атрымаў першапачатковую адукацыю. Уступіў у ўніяцкі ордэн св.Васілія Вялікага. У далейшым вучыўся ў Кіева-Магілянскай калегіі і езуіцкай акадэміі ў Вільні. У 1656 г. Перайшоў у праваслаўе, прыняў манаства і пачаў выкладаць у брацкай школе пры Полацкім Багаяўленскім кляштары. С.Полацкі пашырыў кола прадметаў для вывучэння, арганізаваў тэатр, п’есы для якога пісаў сам.

У Рэчы Паспалітай прадстаўнікі Кіева-Магілянскай калегіі адстойвалі ідэі адкрытасці да дыялогу культураў, станоўча ставіліся да сінтэзу духоўных каштоўнасцей пры захаванні тыпалагічных асаблівасцей грэка-славянскай і рымска-каталіцкай разнавіднасцей хрысціянскай цывілізацыі. І калі ў 1664 г. па запрашэнні цара Аляксея Міхайлавіча С.Полацкі перасяліўся ў Маскву, то ён, як чалавек з еўрапейскай адукацыяй, разгарнуў актыўную асветніцкую дзейнасць. У Маскве С.Полацкі стаў на чале групы «лацціннікаў», якія арыентаваліся на ўспрыманне заходнееўрапейскай культурнай традыцыі. «Лаціннікі» былі вымушаны змагацца з так званымі грэкафіламі, якія дамагаліся адмовы ад вывучэння навук, якія не маюць дачынення да багаслоўя, панавання царквы над асветай, адмаўлялі культурныя стасункі з Захадам.

У Маскве С.Полацкі арганізаваў «лацінскую» школу пры Заіконаспаскім манастыры, заснаваў незалежную ад патрыяршай цэнзуры Верхнюю друкарню (на абсталяванні перавезеным з Оршы), быў першым прыдворным паэтам расійскіх цароў, займаўся выхаваннем царскіх дзяцей, сярод якіх быў будучы імператар Расіі Пётр І. Вучоны надрукаваў і выдаў шэраг кніг асветніцкага характару. Сярод іх - «Буквар» (1679 г.) і «Псалтыр рыфматворны» (1680 г.). У Маскве ім былі напісаны філасофскія і багаслоўскія трактаты, пропаведзі, гутаркі, настаўленні, драмы, камедыі. Аснову літаратурнай спадчыны С.Полацкага складаюць два зборнікі: «Вертаград мнагацветны» і «Рыфмалогіен, ці Вершаслоў» (выдадзеныя пасмяротна ў 1681 г.).

Незадоўга да смерці па даручэнні цара Фёдара Аляксеевіча С.Полацкі склаў статут Акадэміі - першай вышэйшай навучальнай установы Расіі, якую меркавалася адкрыць у Маскве. Пасля смерці асветніка ў 1690 г. на царкоўным саборы грэкафілы абвясцілі яго погляды ератычнымі.

Грамадскую, палітычную і культурна-асветніцкую дзейнасць С.Полацкага, падзяляюць на два перыяды: беларускі (полацкі) і маскоўскі.

Да першага перыяду адносяцца творы, напісаныя С.Полацкім да ад’езду ў Маскву. Галоўная тэма твораў маральна-рэлігійнае ўдасканаленне чалавека. Так, С.Полацкі выкрывае і асуджае такія ганебныя заганы чалавека як

п'янства, гультайства, распусту і г.д., прапаведвае высокія агульначалавечыя нормы маралі. Асабліва выразна гэта праявілася ў такіх вершах, як «На гультая», «На п'яніцу», «На грэшніка», а таксама ў «Віншаванні імянін... Амфінагену Крыжаноўскаму». Апошні прысвечаны канкрэтнай гістарычнай асобе - вандроўнаму манаху, які пагнаўся за спакусамі свецкага жыцця і забыўся пра свае галоўныя святарскія абавязкі [3, с. 141].

Ідэі маральнага ўдасканальвання грамадства знаходзяць места і ў наступны перыяд творчай дзейнасці С.Полацкага. Каб ажыццявіць свой ідэал гарманічна развітай і карыснай грамадству асобы, С.Полацкі прапагандаваў любоў да працы, асуджаў невуцтва і дэспатызм, пісаў пра грамадзянскі абавязак і справядлівасць, сумленнасць і мужнасць, пастаянна вучыў дабрачыннасці. Так, у вершы «Труд» ён пісаў:

*«Праздный да не яст», - апостал сказаше,*
*иже от Христа правде учен бяше.*
*Подобает же вон я изгонити,*
*да научат ся в трудах быти* [4, с. 109].

Паэт заклікаў выхоўваць дабрачыннасць, высокія маральныя якасці асабістым прыкладам, высакароднымі, дастойнымі чалавека ўчынкамі:

*Мнози к добротам инех увещают,*
*Сами же оных ни мало творяют.*
*Сии подобны суть звоном звонящим*
*В церковь зовущим, самим не входящим* [3, с. 143].

Аб тым, якое вялікае значэнне надаваў С.Полацкі выхаванню карыснай грамадству і дзяржаве асобы, сведчыць, у прыватнасці, назва аднаго з філасофска-паэтычных зборнікаў «Вертаград мнагацветны». У тыя часы на Русі «вертаградамі» называлі медыцынскія рукапісныя энцыклапедыі, у якіх апісвалася лячэбнае ўжыванне раслінных, жывёльных і мінеральных рэчываў. У літаральным сэнсе, слова «вертаград» азначала «сад», «кветнік», дзе растуць лекавыя травы». Называючы свой твор «Вертаградам», С.Полацкі падкрэсліваў, што галоўнае прызначэнне яго павучэнняў - выхоўваць чалавека-грамадзяніна, носьбіта высокіх норм маралі [3, с. 143-144].

Пад час «Патопу» у Рэчы Паспалітай, С.Полацкі пачынае сімпатызаваць Расіі. Вершам «Метры» ён вітае ўзяцце рускімі войскамі на чале з царом Аляксеем Міхайлавічам «отчистого грода» Полацка 5 чэрвеня 1656 г., прысвячае шэраг іншых вершаў перамогам рускіх у вайне з Рэччу Паспалітай, выкрывае захопніцкія дзеянні, варагаваўшага і з Рэччу Паспалітай, і з Расіяй шведскага караля Карла X Густава.

Пасля пераезду ў Расію С.Полацкі становіцца адным з першых прыхільнікаў і ідэолагаў асветнага абсалютызму ў Расіі. У гісторыі рускай палітычнай і прававой думкі ён адным з першых даў найбольш змястоўнае тэарэтычнае абгрунтаванне неабходнасці ўстанаўлення ў Расіі асветнай манархіі як формы дзяржаўнага кіравання.

Мэта такой дзяржавы - усталяванне ў грамадстве «вечнага міру», дасягненне «ўсеагульнага дабрабыту», ліквідацыя расколу і мяцяжоў,

заахвочванне гандлю, распаўсюджванне асветы, у якой ён бачыў універсальны сродак выкаранення ўсіх сацыяльных хвароб і бед. С.Полацкі лічыў, што асвета павінна стаць асновай усебаковага росквіту Расіі:

*...Россия славу разширяет*
*Не мечем токмо, но и скоротечным*
*Типом, через книги сущим многовечным* [3, с. 142].

Зыходзячы з гэтага, Полацкі імкнуўся падахвоціць правячыя колы Расіі будаваць школы, павялічваць колькасць настаўнікаў, выхоўваць айчынных вучоных. Таму і сам амаль усе жыццё вёў актыўную педагагічную дзейнасць, удасканальваў метады і прыёмы педагогікі, паляпшаў праграмы, складаў падручнікі.

Шмат ўвагі С.Полацкі надаваў распрацоўцы праблемы асветнага манарха. Перш за ўсе, ён павінен быць адукаваным, заўсёды імкнуцца да набыцця новых ведаў, як шляхам размоў з мудрымі людзьмі, так і чытаннем кніг, знаёмствам з палітычнай і прававой практыкай іншых краін і народаў, каб запазычваць іх вопыт у паспяховым і эфектыўным рэфармаванні грамадства:

*Мало есть правды царю мудру быти*
*И подчинённых мудрости лишити…*
*Вели и рабом мудрости искати,*
*И того тебе будут работати…*
*От искусных муж ищи совета*
*И от разумных вопроси ответа.*
*Милостив Були, и скор оставляти,*
*Косен казнити, а гатов слушати…* [1, с. 245]

Манарх павінен выкарыстоўваць вярхоўную ўладу не ў асабістых мэтах, а на карысць усяго грамадства. Зыходзячы з палітычнага вучэння Арыстоцеля, С.Полацкі красамоўна паказвае адрозненне асветнага манарха ад тырана:

*Кто есть царь и кто тиран, хощеши ли знати,*
*Аристотеля книги потщися читати.*
*Он разнствие обою сие полагает:*
*царь подданым прибытка ищет и желает,*
*Тиран паки прижитий всяко ищет себе,*
*о гражданстей ни мало печален потребе* [3, с. 142].

Дзейнасць манарха грунтуецца на законах, перад якімі павінны быць усе роўнымі, не выключаючы з над іх дзеяння самога цара. Паважаць закон павінны ўсе, паколькі падпарадкаванне яму ўмацоўвае дзяржаву.

С.Полацкі заўсёды ўзвышаў аўтарытэт царскай асобы, параўноўваў яе з сонцам. Ён першы ўвёў у рускую палітычную літаратуру формулу «цар-сонца» - характэрны, неабходны атрыбут абсалютнай манархіі.

Вялікае значэнне ў функцыянаванні асвечанай манархіі С.Полацкі надаваў ажыццяўленню правасуддзя. Яно павінна аднаўляць справядлівасць

у грамадстве. Ён марыў аб роўным судзе для ўсіх, у якім будуць судзіць не гледзячы на твары:

*На лица зрети господь возбраняет*
*равно судить всяк чин завещает* [3, с. 143].

Ужо сучаснікі па заслугах ацанілі шматбаковую дзейнасць і духоўную спадчыну Сімеона Полацкага. У прыватнасці, Сільвестр Мядзьведзеў у эпітафіі, напісанай на смерць С.Полацкага па жаданню цара Фёдара Аляксеевіча, характарызаваў яго як «мужа дабравернага, царкве и дзяржаве патрэбнага» [1, с. 233, 247].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Арлоў, У. Таямніцы Полацкай гісторыі / У.Арлоў. – Мн.: Полымя, 2000. – 464 с.
2. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.установ/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
3. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.
4. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206 с.
5. Падокшын, С.А. Этычная думка ў культуры Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын; Навук. рэд. А.С.Майхровіч. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 151 с.
6. Падокшын, С.А., Сокал, С.Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI-XVII ст.ст. / С.А.Падокшын, С.Ф.Сокал / Серыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка». – Мн., 2000. – 120 с.
7. Пазднякоў, В. Сарматызм / В.Пазднякоў // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. У 2 т. Т.2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў, [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2006. - с. 552-553.

# ТЭМА 8.
# ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ АСВЕТЫ

## *1. Галоўныя ідэі палітычнай і прававой думкі эпохі Асветы на Беларусі*

Эпоха Асветы была адлюстраваннем тых сацыяльных змен, якія ў другой палове XVIII ст. прывялі да сутнаснай змены ўсіх падсістэм грамадства. Быў ажыццёўлены пераход ад абсалютызму, які спалучаў ў сабе супярэчлівасць элементаў саслоўнага феадальнага ладу, асабліва ў вобласці дзяржаўнага кіравання, і элементаў буржуазнага ладу.

«Індывідуалізм, рацыяналізм, нацыяналізм - гэтае трыадзінае боства дэмакратыі - знайшлі юрыдычны выраз ва ўзнясенні ролі заканадаўчага органа і наступным скарачэнні законатворчай ролі судовых органаў; у вызваленні дзеянняў індывіда ад кантролю грамадства, асабліва ў эканамічнай сферы; у патрабаванні кадыфікацыі крымінальнага і грамадзянскага права; у спробе зрабіць прадказальнымі прававыя наступствы індывідуальных дзеянняў (перш за ўсё ў эканамічнай сферы)» [1, с. 46-47].

Валюнтарысцкае разуменне ролі чалавека ў гісторыі ў першыню ўзнікшае ў філасофіі Рэнесансу заклала тэндэнцыі выцяснення ў прававой думцы боскага закона законамі чалавека і прыроды. У эпоху Асветы ажыццяўляецца пераход ад панавання тэалагічных натуральна-прававых канцэпцый да свецкіх, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне. У адрозненне ад Сярэднявечнай трыяды (пазітыўнага, натуральнага і боскага права) асветнікі перайшлі да дуалізму пазітыўнага і натуральнага права. Натуральнае права брала свой пачатак у прыродным упарадкаванні свету, яно ўспрымалася розумам і супрацьпастаўлялася дзейснаму ў то час праву дзяржавы. Рэфарматары патрабавалі пераўтварэнні існых прававых сістэм зыходзячы з прынцыпаў натуральнага права. У выніку імі былі зробленыя пэўныя прапановы па мадыфікацыі розных галін права - ад міжнароднага і дзяржаўнага права да крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага.

У аснову прававых рэформаў быў пакладзены прапанаваны Хрысціянам Вольфам геаметрычны метад, які дазваляў з прынцыпаў натуральнага права, як з аксіём, ажыццяўляць пабудову ўсёабдымных кадыфікацый, напрыклад, Прускага земскага ўкладання 1794 г.

Відавочным наступствам ідэалогіі натуральнага права было тое, што людзі вырашылі, што з дапамогай законаў яны могуць змяніць грамадства. А таксама, што ідэальная кадыфікацыя, складзеная на аснове рацыянальнага аналізу жыцця і метадаў натуральнага права, можа быць створаная настолькі дасканалай, што суддзя зможа ўбачыць у ёй любое неабходнае яму палажэнне. Падобная праватворчасць рабіла не актуальным неабходнасць улічваць гістарычныя традыцыі народа пры ўдасканаленні права, што ў будучым, прывяло да стварэння кодэксаў і законаў далёкіх ад запатрабаванняў грамадства.

У шэрагу дзяржаў пераўтварэння ў адпаведнасці з духам Асветніцтва адбыліся ў выніку рэвалюцый - Амерыканская і Французская, астатнія краіны ажыццявілі паступовыя эвалюцыйныя змены, успрыняўшы іх ідэі.

На Беларусі парасткі асветніцтва паўсталі яшчэ ў творчасці і дзейнасці такіх дзеячаў сярэдзіны XVII - пачатку XVIII стст. як Адам Алізароўскі, І.Капіевіч і інш. У іх творчасці знаходзілі месца ідэі натуральнага права і грамадскай дамовы. Аднак ў той перыяд грамадства Рэчы Паспалітай, спустошанай шматлікімі войнамі і ўнутранымі ўсобіцамі, не ўспрымала прапановы эканамічных і палітычных зменаў. Стабілізацыя міжнародных сувязяў у сярэдзіне XVIII ст. паскорыла эканамічнае адраджэнне дзяржавы, спрыяла развіццю капіталістычных адносін. Менавіта ў гэты час адбываецца пранікненне ў Рэч Паспалітую з Заходняй Еўропы, у першую чаргу з Францыі, асветніцкай ідэалогіі.

Пад уплывам асветніцкай ідэалогіі ў Вялікім княстве Літоўскім пашыраюцца антыпрыгонніцкія, расце колькасць прыхільнікаў рэфармавання грамадства на новых буржуазна-дэмакратычных асновах. Пра гэты час відны прадстаўнік палітычнай і прававой думкі XIX ст., вядомы юрыст У.Д.Спасовіч пісаў наступнае: «З Францыі веяў тады на ўсю Еўропу сухі і рэзкі вецер рацыяналізму. Папулярная філасофія французскіх энцыклапедыстаў, якая дзейнічала прыладамі разумнага сэнсу ў імя неад’емных правоў асобы, прыйшлася якраз у самую пару грамадству Рэчы Паспалітай XVIII ст. і дапамагла яму паглядзець на свой быт крытычна, акрэсліць і сфармуляваць свае няясныя імкненні да лепшага парадку рэчаў. Усе перадавыя людзі таго часу - рацыяналісты, прыхільнікі Вальтэра і Русо, любіцелі французскай культуры. Яны прасякнуты ёю да самых касцей, і таму з пагардай адносяцца да старадаўніх устаноў Рэчы Паспалітай, да яе «варварства», з пагардай тым больш зразумелай, што яны ўсведамлялі ў сабе схільнасць да бязлітаснай барацьбы з усімі параджэннямі сярэдніх вякоў» [4, с. 150].

Ідэі асветніцтва ў першую чаргу ўспрымаліся прадстаўнікамі перадавой часткі шляхты. Узначаліў рух прыхільнікаў сацыяльна-палітычных рэформ у сярэдзіне XVIII ст. у Рэчы Паспалітай паланізаваны беларускі магнацкі род Чартарыйскіх. У 1764 г. Чартарыйскім пры дапамозе Расіі ўдалося правесці на каралеўскі трон звязанага з імі Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1732-1798 гг.) - прыхільніка асветніцкіх ідэй. Пасля абрання на каралеўскі трон С.А.Панятоўскага ў Рэчы Паспалітай пачаліся значныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя рэформы, каторыя аднак не паспелі ажыццявіцца ў поўнай сферы. Так, не адбылося канчатковага пераходу да буржуазнага ладу, бо ў канцы XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая перастала існаваць, беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі, і развіццё ўласнай праватворчасці было спынена да пачатку XX ст.

Усё ж рэформы сярэдзіны - канца XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай паспелі закрануць сферу дзяржаўнага кіравання і грамадскага ладу і адлюстраваліся ў канстытуцыйным заканадаўстве. Для ідэй айчынных прадстаўнікоў асветніцкай думкі і для рэформаў, якія адбываліся на іх

аснове, характэрны супярэчлівасць і непаслядоўнасць. У дадзены перыяд у дзяржаве толькі пачынаўся пераход ад феадалізму да капіталізму, таму ў філасофскіх вучэннях назіраецца суседства прынцыпаў схаластыкі і рацыяналізму, а ў сацыяльна-палітычных маюць месцы спробы выкладання планаў рэформаў дзяржаўнага ладу пры захаванні асноў «шляхецкай дэмакратыі».

Акрамя пытанняў рэформы дзяржаўнага і грамадскага ладу, адной з самых вострых праблем палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай XVIII ст. з’яўлялася праблема дысідэнтаў. Слова дысідэнт у тыя часы ужывалася для абазначэння чалавека, які не прытрымліваецца пануючага ў даным грамадстве веравызнання. У Рэчы Паспалітай ім называлі прыхільнікаў праваслаўя, лютэранства, кальвінізму, антытрынітарызму.

Першапачаткова дысідэнты як Вялікага княства Літоўскага, так і Каралеўства Польскага карысталіся аднолькавымі з каталікамі правамі, што знайшло адлюстраванне ў Генрыхавых артыкулах 1573 г., Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. і іншых заканадаўчых актах. Аднак пасля Брэсцкай царкоўнай уніі правы дысідэнтаў Рэчы Паспалітай сталі ўшчамляцца, парушацца, абмяжоўвацца. Дысідэнты вымушаны былі звяртацца за падтрымкай да суседніх аднаверных ім дзяржаў, што выклікала ў Рэчы Паспалітай стаўленне да іх як да «рэнегатаў» і «замежных агентаў», вяло да далейшага абмежавання іх правоў.

Сейм 1661 г. пазбавіў усіх дысідэнтаў права выбірацца ў сейм, а ў 1668 г. забараніў змену каталіцкага веравызнання пад пагрозай канфіскацыі маёмасці і баніцыі (выгнання за мяжу). На Сейме 1733 г. быў прыняты закон, па якому дысідэнтам гарантавалася недатыкальнасць асобы і маёмасці, аднак забаранялася займаць якія-небудзь дзяржаўныя пасады.

Для вяртання палітычных і рэлігійных правоў дысідэнты вялі актыўную палемічную і прававую барацьбу, звярталіся за дыпламатычнай і вайсковай падтрымкай суседніх краін. У ходзе барацьбы за ўраўноўванне ў правах дысідэнтаў з каталікамі вылучыўся шэраг вядомых палітычных мысліцеляў, адным з якіх з’яўляецца магілёўскі біскуп Георгій Каніскі (1717-1795 гг.).

## ***2. Палітычныя і прававыя погляды Георгія Каніскага***

Георгій Каніскі скончыў Кіева-Магілянскую акадэмію, праявіўшы ў гады навучання ў ёй выдатныя здольнасці. Затым выкладаў у акадэміі рыторыку, філасофію, багаслоўе, стаў прафесарам, рэктарам акадэміі. У 1755 г. ён стаў епіскапам магілёўскім, узначаліў Магілёўскую праваслаўную епархію.

Ад пачатку сваёй дзейнасці Каніскі вёў барацьбу супраць палітычнай і рэлігійнай дыскрымінацыі ў адносінах да праваслаўнага насельніцтва Беларусі. Будучы біскупам, ён імкнуўся ўсяляк павышаць агульнаадукацыйны ўзровень праваслаўнага духавенства, абнаўляць цэрквы, адкрываць школы для праваслаўных, друкарні. У 1757 г. ён звяртаецца да праваслаўнага духавенства з заклікам вучыць народ і разглядаць гэтую дзейнасць як галоўную справу пастарскую, бо без вучэння не будзе і веры [2, с. 95].

У 1762 г. ад імя ўсіх дэзунітаў Рэчы Паспалітай ён звярнуўся да Сінода (з'езда епіскапаў Рэчы Паспалітай) са скаргай на парушэнне іх правоў. Гэтае выступленне вылучыла Г.Каніскага ў шэраг бясспрэчных лідэраў праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай сярэдзіны XVIII ст.

27 ліпеня 1765 г. ў Варшаве Г.Каніскі сказаў на лацінскай мове перад новым каралём палымяную прамову ў абарону правоў праваслаўных. «Мы цалкам упэўнены ў тым, - заявіў Каніскі ад імя праваслаўнай меншасці каралю, - што ты вярхоўнай уладаю сваёй, усяміласціва загадаеш вярнуць нам і сумленню нашаму ранейшую свабоду» [4, с. 155].

Прамова Г.Каніскага адпавядала духу веку Асветы і прынесла яму еўрапейскую вядомасць. Яна, як узор абароны верацярпімасці, была перакладзена з лацінскай на многія еўрапейскія мовы і атрымала шырокае распаўсюджанне. Падобныя думкі Г.Каніскі выклаў і наступных творах: «Мемарыял аб крыўдах праваслаўным», «Правы і вольнасці жыхароў грэчаскага веравызнання», «Правы і свабоды дысідэнтаў хрысціянскага веравызнання Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага, што вынікаюць з прынятых сеймамі законаў і Статута ВКЛ, а таксама іншых заканадаўчых актаў, што не выключаюць сумнення, сабраныя і выдадзеныя для ўсеагульнага ведама». Апошні твор быў напісаны перад надзвычайным Сеймам 1767 г., які перад пагрозай грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, прыняў да разгляду пытанне верацярпімасці і ўраўноўвання ў палітычных і рэлігійных правах.

У сваім творы Г.Каніскі у храналагічным парадку выклаў і пракаменціраваў ўсе заканадаўчыя акты, што пацвярджалі ранейшую роўнасць правоў дысідэнтаў і католікаў у Рэчы Паспалітай. У ім пералічваліся факты парушэння хрысціян-некатолікаў. Кніга стала праграмай барацьбы дысідэнтаў за ўраўноўванне іх правоў з каталіцкай большасцю насельніцтва краіны.

Надзвычайны сейм пачаў працу ў Варшаве 5 кастрычніка 1767 г. Праблема дысідэнтаў стала прадметам гарачых і доўгіх сеймавых дэбатаў. Падмацаванае замежнымі штыкамі патрабаванне ўраўняць ў правах дысідэнтаў з католікамі, фактычна ўспрымалася патрыятычнай часткай шляхты, іерархамі каталіцкай царквы, магнатамі як умяшанне ва ўнутраныя справы краіны, абмежаванне суверэнітэту Рэчы Паспалітай, пагрозу «веры, вольнасці, незалежнасці». Яны ўпарта праціваліся ўраўноўванню.

Тады пасол Расіі ў Рэчы Паспалітай М. Рэпнін (1734-1801) з ведама і дазволу караля загадаў ноччу арыштаваць некалькі найбольш актыўных паслоў сейму, якія асабліва ўпарта выступалі супраць прыняцця патрабаванняў дысідэнтаў, і вывезці іх у глыб Расіі. У ліку арыштаваных былі кракаўскі епіскап Каэтан Солтык, кіеўскі епіскап Юзаф Залускі, гетман Вацлаў Ржэвускі і інш. Сілавыя метады дзеянняў рускага дыпламата былі падмацаваны ўведзенымі пад выглядам абароны правоў дысідэнтаў ў пачатку 1767 г. у Рэч Паспалітую рускімі войскамі [4, с. 156].

Арышт дэпутатаў сейму прывёў да ўраўнення праваслаўных хрысціян-некатолікаў з католікамі. Рашэнні сейму замацаваў Варшаўскі дагавор 1768 г.

паміж Расіяй і Польшчай, падпісаны ў 1768 г. Як адзін з найбольш глыбокіх і аўтарытэтных знаўцаў гэтай важнай праблемы, Г.Каніскі быў назначаны членам змешанага суда, створанага пасля заканчэння работы сейму для вырашэння спрэчных пытанняў паміж дысідэнтамі і каталікамі.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе Г.Каніскі, будучы намеснікам, у «Слове да нававыбраных суддзяў» выказваўся ў падтрымку судовых рэформаў праведзеных Расіяй на далучаных беларускіх землях. Ён прызываў суддзяў сумленна выконваць свае абавязкі. Па яго словах, «Бог чакае ад суддзяў… правасуддзя, майстэрства ў законах, пастаяннай руплівасці, абачлівасці і разважлівасці пры разглядзе ўсіх акалічнасцяў, нягледзячы на асобу, не баяцца магутных, ненавідзіць хабарніцтва, не аддаваць перавагу сваяцтву і сяброўству, веру ад праўды бы родных сясцёр не аддзяляць, грымець на льсціўцаў, адносіцца паблажліва толькі да тых, хто каецца, дзеля праўды церпіць і тое, што наступіць ад супраціўнікаў… ідзіце…, кіруючыся сумленнем хрысціянскім, здзейсніце непапраўленае, паскорце завалакічанае, дайце кожнаму праўду і задавальненне, вытрыце слёзы ўдоў і сірот, суцешце бязвінна пакрыўджаных» [5, с. 44-45].

### ***<u>3. Палітычныя і прававыя погляды прыхільнікаў рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай</u>***

Асветніцкія ідэі пачалі выказвацца ў грамадстве яшчэ ў перыяд праўлення Аўгуста III (1733-1763 гг.). Менавіта тады пачалі з'яўляцца патрабаванні рэформы дзяржаўнага і грамадскага ладу Рэчы Паспалітай.

У рознай ступені ў творчасці гісторыкаў К.Галоўкі, Ф.Папроцкага, А.Нарушэвіча, М.Фогеля, публіцыстаў М.Белазора, С.Канарскага, К.Нарбута, юрыстаў А.Загурскага і Т.Астроўского мае месца крытыка саслоўных парадкаў «шляхецкай анархіі», бяспраўя значнай часткі насельніцтва, юрыдычнай непісьменнасці службоўцаў і суддзяў, і прапановы рэфармавання дзяржавы на прынцыпах рацыянальнасці, адукацыі жыхароў, пераўтварэння заканадаўства ў адпаведнасці з ідэямі натуральнага права, замацавання і рэалізацыі натуральных правоў і свабодаў.

**Я.Ябланоўскі.** У 1730 г. Ян Ябланоўскі (1669-1731 гг.) ананімна выдаў у Львове брашуру «Што робіцца без усялякага сораму ў Польшчы, альбо тлумачэнне грахоў для народа нашага прывычных». У ёй змяшчалася крытыка заган дзяржаўнага строю Рэчы Паспалітай, якія грамадства моўчкі зносіла, а менавіта, слабасць каралеўскай улады, казнакрадства, адсутнасць належнага правасуддзя, бязладдзе ў правядзенні сеймаў. Праца Я.Ябланоўскага не змяшчала, аднак, якой-небудзь пазітыўнай праграмы змены існуючага грамадскага і дзяржаўнага ладу [4, с. 151].

Праблемы дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай апісаны і гістарычным даследаванні **Казіміра Галоўкі** «Сеймуючая Еўропа» (1753 г.). У сваім творы гісторык падзяляе ўсе еўрапейскія народы на «свабодныя» і «несвабодныя». Да першых, ён адносіў Рэч паспалітую, Англію, Швецыю, дзе кароль кіруе сумесна з парламентам, а таксама Швейцарскую і Генуэзскую рэспублікі. Да другой групы ён адносіць Іспанію, Францыю,

Расію, дзе народ цалкам залежыць ад волі свайго манарха. Сімпатыі К.Галоўкі на баку «свабодных» народаў. Аднак становішча Рэчы Паспалітай, улада каторай паралізавана шляхецкай анархіяй, прынцыпам «ліберум вета», выклікае ў аўтара вялікую заклапочанасць. Фактычная бяздзейнасць прадстаўнічага органа, папярэджваў К.Галоўка, непазбежна вядзе да развалу краіны [2, с. 87].

**Матэуш Белазор.** М.Белазор, прадстаўнік старажытнага шляхецкага роду з ВКЛ, у сваей працы «Вольны голас у абарону свабоды» (1733 г.) выступіў супраць неабмежаваных шляхецкіх свабодаў, лічыў іх прычынай крызісу дзяржаўнага кіравання ў Рэчы Паспалітай, падмуркам для анархіі, непадпарадкаванню ўладзе і закону. Аднак ён, як прадстаўнік шляхты, прапаноўваў рэформы праводзіць паступова, каб не закрануць гонар шляхецкага імя, шляхецкія свабоды. Нават права «ліберум вето» М.Белазор прапанаваў толькі абмежаваць. Яно павінна было тычыцца толькі закону, які абмяркоўваўся пад час абвяшчэння вета, а не ўсяго Сейму.

Ён папракаў пануючыя класы Рэчы Паспалітай у тым, што з сялянамі яны абыходзяцца як з рабамі. Астатнія «тым толькі розняцца ад нявольнікаў, што не носяць аковаў» [4, с. 151]. М.Белазор патрабаваў асабістай свабоды для сялян з наданнем ім права займацца іншымі заняткамі, а таксама ўвесці дзяржаўную апеку над сялянамі. Апошняя павінна была ўключаць права селяніна складаць на памешчыка скаргі ў дзяржаўныя суды.

**С.Канарскі.** Значна далей М.Белазора ў патрабаванні рэформаў дзяржаўнага ладу пайшоў Станіслаў Канарскі (1700-1763 гг.). Яго асветніцкая дзейнасць складалася з трох напрамкаў: рэфармаванне існуючай сістэмы адукацыі, выдавецкая дзейнасць, а таксама напісанне злабадзённых палітычных твораў [4, с. 152].

С.Канарскі прапанаваў праект стварэння новай сістэмы навучання, у якой замест дамінавання лацінскай мовы і тэалогіі вялікая ўвага надавалася вывучэнню сучасных моў, прыродазнаўчых і дакладных навук, значнае месца адводзілася патрыятычнаму выхаванню. У 1740 г. у Варшаве адкрылася першая ў Рэчы Паспалітай школа, заснаваная на прынцыпах С.Канарскага – Collegium Nobilium, а ў 1754 г. была праведзена рэформа школ ордэна піяраў на прынцыпах, распрацаваных С.Канарскім.

С.Канарскі распачаў выданне крыніц існаваўшага права – Volumina legum (Збор законаў). Першы том, рэдактарам якога быў сам С.Канарскі і да якога ён напісаў прадмову, выйшаў у Варшаве ў 1732 г. На працягу 1732-1739 гг. выйшлі з друку першыя 6 тамоў, а ў 1764 - 1780 гг. надрукаваны наступныя 7 і 8 тамы. У 1889 г. у Кракаве быў надрукаваны 9 том, а ў 1952 г. у Познані - 10. Гэтая праца застаецца асноўнай навуковай крыніцай для вывучэння дзяржаўнага ладу Беларусі, Літвы і Польшчы XVI-XVIII ст.

У палітычнай сферы С.Канарскі быў прыхільнікам усталявання моцнай манархіі ў Рэчы Паспалітай, палымяна крытыкаваў ідэі выключнасці дзяржаўнага ладу краіны, неабмежаваныя шляхецкія вольнасці, права «ліберум вето». Свае ідэі С.Канарскі выклаў у палітычным трактаце «Аб эфектыўным правядзенні нарадаў» (1760 г.). У ім ён перш за ўсё

раскрытыкаваў дзеянне права «ліберум вето», якое рабіла паседжанні Сейму бясплённымі. Так, С.Канарскі пісаў: «Давайце кіраваць дзяржавай (пра гэта ўжо сто разоў гаварылі), як разумныя людзі, як кіруе астатняя частка чалавецтва, не будзем прэтэндаваць на тое, каб здавацца разумнейшымі за іншых людзей. Той довад, што ў Рэчы Паспалітай павінна быць не так, як у іншых краях, здаецца так мала пераканаўчым, што яго нават не трэба браць пад увагу. Таму што Бог і натура стварылі жыхароў Рэчы Паспалітай з таго самага цеста і пры дапамозе той самай формы, што і англічаніна, і швейцарца і бельгійца і г.д. І калі б гэтая хімера аднадумнасці ў нарадах (маецца на ўвазе прынцып «ліберум вето») пры адсутнасці супярэчных была прынятая ў гэтых народаў, безумоўна, там быў бы той жа непарадак, як у нас, тая ж самая жахлівая бездапаможнасць і анархія»[4, с. 152-153]. С.Канарскі прапанаваў, каб законы ў Сейме прымаліся большасцю галасоў.

Прапановы С.Канарскага па адмене прынцыпа «ліберум вето» былі здзейснены толькі пасля прыняцця Канстытуцыі 3 Мая 1791 г.

## ***4. Палітычныя і прававыя погляды фізіякратаў (І.Страйноўскі, І.Храптовіч, П.Бжастоўскі)***

Адным з накірункаў асветніцкай ідэалогіі быў фізіякратызм. У апошняй трэці XVIII ст. ідэі фізіякратызму прыйшлі ў Рэч Паспалітую з Францыі. Як і іншыя прадстаўнікі эпохі Асветы, фізіякраты патрабавалі ўвядзення ў дзеянне законаў, якія грунтуюцца на натуральным праве і забеспячэння высокага ўзроўню адукаванасці грамадзян. Падмуркам натуральнага права яны бачылі аб’ектыўныя законы прыроды і грамадства, каторыя ня могуць быць зменены чалавекам, але павіны ім распазнавацца з мэтай удасканалення грамадскага жыцця.

Фізіякратызм значную ўвагу ўдзяляў даследаванню сацыяльна-эканамічных з’яваў. У адрозненне ад меркантылізму, які галоўнай крыніцай прыбытку лічыў гандаль, фізіякраты сапраўднай крыніцай багацця лічылі зямлю, а сапраўднай прадукцыйнай працай - земляробскую працу. Яны выступалі з рэзкай крытыкай прыгоннага права, лічылі што яно стрымлівае прагрэс у сельскай гаспадарцы, бо не заахвочвае сялян да павышэння эфектыўнасці працы. Фізіякраты ў Рэчы Паспалітай прапаноўвалі розныя праекты адмены прыгонніцтва. Першым крокам да гэтага павінна была стаць замена паншчыны чыншам. Канчатковую мэту аграрнай рэформы выдатны прадстаўнік асветніцкай ідэалогіі ў Рэчы Паспалітай Гуга Калантай выказаў у наступных словах: «Зямля застаецца панам, сялянам - свабода рук» [4, с. 160].

У палітычнай сферы яны падтрымлівалі ідэі ўвядзення канстытуцыйнай манархіі як формы кіравання здольнай пакласці канец магнацкай алігархіі.

**І.Страйноўскі.** У ВКЛ тэарэтыкі фізіякратызму гуртаваліся вакол Галоўнай школы ВКЛ. Сярод іх былі прафесара Ю.К.Багуслаўскі, Д.Пільхоўскі і інш. Яны даказвалі неабходнасць тэрміновых рэформаў дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, паляпшэння становішча прыгонных сялян.

Найбольшую вядомасць сярод іх атрымаў Іеранім Страйноўскі (1752-1816 гг.), прафесар кафедры натуральнага права Галоўнай школы Вялікага княства Літоўскага. Галоўныя свае думкі ён выклаў у даследаванні «Навука натуральнага і палітычнага права, палітычнай эканоміі і права народаў» (1785 г.). І.Страйноўскі прытрымліваўся распаўсюджаную сярод асветнікаў тэорыю дагаворнага паходжання дзяржавы, якая давала тэарэтычную падставу для рэфармавання існуючага палітычнага ладу. Ён выступаў з рэзкай крытыкай панаваўшай у Рэчы Паспалітай магнацкай алігархіі. Да натуральных правоў І.Страйноўскі адносіў права на жыццё, набыццё і карыстанне зямнымі дабротамі. Падкрэсліваў, што менавіта з натуральных правоў вынікаюць сацыяльныя правы грамадзян, і перш за ўсе права на асабістую свабоду, права на ўзаемную дапамогу і права на прыватную ўласнасць.

**М.Карповіч**. Відным прадстаўніком антыпрыгонніцкіх ідэй з’яўляўся і Міхаіл Карповіч (1744-1803 гг.), прафесар дагматычнай тэалогіі Галоўнай школы ВКЛ.

М.Карповіч выклаў сваю тэорыю ўзнікнення і развіцця грамадства, паходжання дзяржавы і права. Так, ён лічыў, што «спачатку людзі былі роўнымі, займаліся збіральніцтвам (збіралі плады зямлі). Пазней заняліся паляваннем, потым жывёлагадоўляй і, нарэшце, земляробствам. На этапе жывёлагадоўлі з’явілася прыватная ўласнасць і маёмасная няроўнасць, з’явілася два віды няроўнасці людзей. Адны мелі ўласныя статкі, у другіх іх не было і яны вымушаны былі «прапаноўваць свае паслугі ўласнікам статкаў за вызначаную плату па дагавору». Розныя аб’ектыўныя прычыны (войны, голад і г.д.) яшчэ больш паглыбілі маёмасную няроўнасць. У выніку чаго ўласнікі «абцяжарылі нявольніцтвам тых, хто раней добраахвотна прапаноўваў ім сваю працу». На ступені земляробства паўстала дзяржава. Узнікненне дзяржавы яшчэ больш узмацніла прыгнёт немаёмных. Багатыя «змаглі тады напісаць законы, якія зацвердзілі нявольніцтва земляробаў»»[4, с. 160-161].

М.Карповіч рэзка крытыкаваў прыгонніцкія адносіны, жорсткае абыходжанне паноў з сялянамі, прапаноўваў перавод апошніх на чынш, увядзенне парафіяльных школаў. Вялікую ролю ў рэфармаванні феадальна-прыгоннай сістэмы М.Карповіч адводзіў навуцы і распаўсюджванню асветы.

Ідэі фізіякратызму не проста абмяркоўваліся ў грамадстве, але шэраг уплывовых іх прыхільнікаў ажыццявіў іх рэалізацыю на практыцы. У сваіх маёнтках яны праводзілі рэформы ўзаемадачыненняў з сялянамі, адкрывалі мануфактуры, займаліся пашырэннем асветы ў краі, адчынялі школы, развівалі медыцыну. Да іх ліку перш за ўсё адносяць А.Тызенгаўза і І.Храптовіча, П.Бжастоўскага.

**І.Храптовіч.** Яшчэ адным знаным прыхільнікам фізіякратызму ў ВКЛ быў Іахім Храптовіч, прадстаўнік буйнога магнацкага роду, з 1791 г. міністр замежных спраў Рэчы Паспалітай, з 1793 г. апошні канцлер Вялікага княства Літоўскага.

Свае погляды І.Храптовіч выклаў у кнігах «Аб шматгадовым нацыянальным узнаўленні» і «Аб праве прыроды». У 1802 г. ён пераклаў на польскую мову і выдаў галоўную працу віднага прадстаўніка французскага Асветніцтва XVIII ст. - А.Цюрго «Роздум аб стварэнні і размеркаванні багаццяў» (1766 г.). Галоўная думка выдадзеных ім твораў: бедныя сяляне – бедная краіна, заможныя сяляне – заможная краіна. Асноўная частка дабрабыту краіны складаецца з прадукцыйнай сельскагаспадарчай працы, аднак сялянская праца будзе эфектыўнай, толькі калі яны будуць зацікаўлены ў яе выніках. Таму дзяржава павінна вызваліць сялян ад прыгону, надзяліць іх поўным аб'ёмам грамадзянскіх правоў. Фактычна І.Храптовіч прапаноўваў ператварыць сялян ў вольных арандатараў зямлі.

У сваіх маёнтках у Шчорсах і Вішнёве І.Храптовіч зрабіў першыя крокі ў накірунку прапанаванай ім рэформы. Ён замяніў паншчыну чыншам, і фактычна ператварыў сваіх сялян у прыгонных арандатараў, што ў 3 разы павялічыла яго прыбытак ад маёнткаў.

Разглядаючы земляробства як галоўную крыніцу прыбавачнага прадукту, ён, разам з тым, вялікую ролю ў развіцці грамадства надаваў прамысловасці і гандлю. Таму ў сваіх маёнтках ён будаваў невялікія заводы. Храптовіч заснаваў у Шчорсах адну з першых у Рэчы Паспалітай школу для сялян, у якой выкарыстоўвалася бела-ланкастэрская сістэма ўзаемнага навучання (гэта значыць старэйшыя і больш паспяваючыя вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вялі (праводзілі) заняткі з астатнімі вучнямі). У Шчорсах былі таксама заснаваны славутыя бібліятэка і архіў, пабудавана ўніяцкая царква.

Галоўная праца жыцця І.Храптовіча «Аб натуральным праве» была выдадзена пасмяротна ў 1814 г. У ёй мысліцель разглядаў грамадства як натуральны арганізм, састаўную частку прыроды. Чалавек і яго маральныя прынцыпы залежаць ад натуральнага парадку рэчаў. Таму, што карысна і неабходна чалавеку ў жыцці, цалкам павінна адпавядаць маральным прынцыпам. Для падтрымання парадку ў сумесным жыцці людзі ўстанаўліваюць законы. Ступень справядлівасці закону вызначае яго блізкасць да натуральнага права. Ад натуральнага права залежаць таксама правы і абавязкі членаў грамадства [4, с. 163].

**П.Бжастоўскі.** Далей І.Страйноўскага і І.Храптовіча пайшоў вялікі пісар літоўскі Павел Бжастоўскі (1739-1827 гг.), які ў сваім маёнтку Мерач Віленскага павету (пазней у гонар гаспадара маёнтак атрымаў назву Паўлава) правёў шэраг рэформаў па паляпшэнню становішча сялян. Рэформы былі ўнармаваны статутамі 1769 і 1791 годоў, выдадзенымі П.Бжастоўскім са згоды сялян.

Статутам 1769 году сялянам прадстаўлялася асабістая вольнасць і права пакінуць маёнтак пры ўмове выстаўлення за сябе замены і сплочвання даўгоў. Усіх сялян ён паводле сплочваемых павіннасцяў падзяліў на пеняжнікаў, баяраў, цяглых і кутнікаў. Першыя тры групы атрымалі вечнае карыстанне вялікія гаспадаркі, з якіх неслі павіннасці (адпаведна грашовую, грашова-адработачную і дработачную з данінай). У 1786 годзе амаль ўся

фальварачная (панская) зямля маёнтку перадавалася сялянам, а адработачная павіннасць была заменена на чынш. Была ліквідавана цераспалосіца, сяляне атрымалі права на вольнае карыстанне Мерацкай пушчай, права распараджацца сваёй маёмасцю (часткова зямлёй), займацца рамёствамі.

П.Бжастоўскі ў адрозненне ад іншых фізіякратаў-рэфарматараў пайшоў на прадстаўленне сялянам шырокага самакіравання. Яно было пабудавана на ўзор двухпалатнага парламента. У вышэйшую палату ўваходзілі прызначаныя П.Бжастоўскім адміністратары (губернатар, пісар, цівун і інш.), а таксама выбарныя прадстаўнікі сялянскага самакіравання (цэнзар, падцэнзар, бурмістр, лаўнікі, ляснічыя, дзесятнікі і інш.). Ніжэйшая палата складалася з усіх самастойных гаспадароў маёнтка. Для паседжанняў быў пабудаваны спецыяльны дом. Акрамя таго ў маёнтку П.Бжастоўскі заснаваў выбарны суд, ашчадна-пазыковая каса, фундаваў фельчара з аптэкай, школу для навучання дзяцей. У маёнтку было сфармаванае сялянскае войска – міліцыя, якое было вельмі добра атэставана кіраўніцтвам паўстання 1794 г. і якое двойчы дало адбор расейскім войскам падчас штурму маёнтка ў часы паўстання [6, с. 438].

Пасля паўстання П.Бжастоўскі быў вымушаны прадаць маёнтак, аднак абавязковай умовай продажу было захаванне статутаў і правоў сялян.

Рэформы П.Бжастоўскага сустрэлі варожыя адносіны большасці землеўласнікаў і ўхваляліся передавымі коламі Рэчы Паспалітай.

## *5. Палітычныя і прававыя ідэі ў Канстытуцыі 3 Мая 1791 г.*

У кастрычніку 1788 г. сабраўся чарговы сейм Рэчы Паспалітай, названы пазней Чатырохгадовым. Прагрэсіўная партыя рэфарматараў, на чале якой стаялі Г.Калантай, С.Сташыц і іншыя прыхільнікі асветніцкіх вучэнняў XVIII ст., у выніку вострай барацьбы змагла дасягнуць прыняцця шэрагу заканадаўчых актаў, якія сталі пачаткам рэформ дзяржаўнага і грамадскага ладу Рэчы Паспалітай. Сейм зацвердзіў акт аб Кардынальных правах (студзень 1791 г.), Закон аб сейміках (сакавік 1791 г.), Закон аб гарадах (красавік 1791 г.). Рэформы Чатырохгадовага сейма падсумавала Канстытуцыя, прынятая 3 мая 1791 г. (аўтары праекту Канстытуцыі былі Гуга Калантай і Ігнат Патоцкі).

Наяўнасць моцнай кансерватыўнай партыі, моцны неспрыяльны рэформам міжнародны ўплыў суседніх дзяржаў, непадрыхтаванасць значнай часткі грамадства да зменаў перашкаджалі правядзенню рэформаў, прывялі да непаслядоўнасці зменаў, спалучэння традыцый і інавацый у заканадаўстве.

Канстытуцыя 3 мая 1791 г. спалучала ў сабе прынцыпы як Новага часу, так і Сярэднявечча. Так, у вобласці прававога становішча жыхароў Рэчы Паспалітай абвяшчаўся прынцып усеагульнасці грамадзянства, усе жыхары складалі «народ». Аднак, адзіным артыкулам Канстытуцыі, дзе пад народам разумеліся ўсе грамадзяне, быў арт. 11, які называўся «Народныя ўзброеныя сілы». Усеагульнасць грамадзянства спалучалася з перажыткам феадальнага саслоўнага ладу - з няроўнасцю грамадзян. У першую чаргу гэта датычылася сялянства. Прызнаючы іх ролю у складанні «найбольшых багаццяў краіны»,

аб'яўляючы іх вольнымі грамадзянамі, арт. 4 Канстытуцыі 3 траўня 1791г. не надавала ім права вольнага заключэння дамоваў з памешчыкамі і свабоды сыходу ад іх. Такое права атрымлівалі толькі «новапрыбылыя» сяляне і тыя, «якія спачатку пакінулі радзіму, а зараз вырашылі на яе вярнуцца» [2, с. 100; 3, с. 159]. Астатнім толькі гарантавалася апека дзяржавы ў забеспячэнні ўзаемнасці абавязкаў па дамовах з памешчыкамі і немагчымасць апошнім іх парушыць.

Правы мяшчан і шляхты паступова ўраўноўваліся, але ў поўнай меры зліцця саслоўяў у палітычных правах не адбылося. У адпаведнасці з Канстытуцыяй ад 3 траўня 1791г., Законамі ад 13 траўня 1791г. «Сеймы» і «Сеймовые суды» Пасольская ізба, ніжняя палата, складалася з 204 дэпутатаў, абраных на сейміках, і 24 прадстаўнікоў гарадоў, абраных на акруговых зборах, з правам вырашальнага голасу па пытаннях гарадоў, дарадчым па пытаннях гандлю і прамысловасці [7, с. 379]. Мяшчанам дазвалялася займаць ніжэйшыя пасады ў дзяржаўных установах і судах, працаваць у якасці адвакатаў і, самае галоўнае, набываць маёнткі, населеныя залежнымі сялянамі, што ў выпадку іх кошту звыш 2 тыс. злотых давала права хадайніцтва аб уводзінах у шляхецкае саслоўе. На мяшчан распаўсюджваліся такія ж правы асабістай недатыкальнасці, свабоды слова і друку, як і на шляхту. У адносінах да апошняй уводзіўся замест саслоўнага маёмасны прынцып выбарчага права - абіраць і быць абранымі па Законе «Сеймікі» ад 24 лютага 1791 г. мелі права толькі 18-летнія ўласнікі або ўладальнікі, якія плацілі падаткі ў памеры звыш 1000 злотых.

Канстытуцыя дэкларавала непадзельнасць, сувірэнітэт і незалежнасць краіны, свабоду веравызнанняў пры дамінаванні каталіцкай царквы, вяршэнства закона. У вобласці дзяржаўнага кіравання былі адмененыя найболей архаічныя інстытуты дзяржаўнага права эпохі феадалізму - «ліберум вета», выбарнасць караля, права на стварэнне канфедэрацый, прынцып мясцовага прадстаўніцтва дэпутата Сейму (з гэтага часу ён прадстаўнік народа, а не свайго павету), уводзіліся інстытуты падзелу ўладаў, контрасігнатуры актаў караля, стала дзейнічаючага ўрада. Аднак дадзеныя інстытуты і прынцыпы спалучаліся з неадмененым саслоўным прынцыпам фармавання вышэйшага прадстаўнічага органа, мясцовых органаў улады, што забяспечвала паступовасць рэфармавання, імкненне яго правесці без сацыяльных міжусобіц. Пасля перыяду магнацкай алігархіі ў Рэчы Паспалітай адбылося вяртанне да традыцый моцнага кіраўніка краіны. Кароль, у адпаведнасці з новымі тэорыямі, узначаліў выканаўчую ўладу, надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі, аднак усе прававыя акты караля набывалі сілу закона толькі пасля подпісу адпаведнага міністра.

Заканадаўчая ўлада належала двухпалатнаму сейму, рашэнні якога прымаліся большасцю галасоў. Вызначаўся склад і кампетэнцыя ўрада, які атрымаў назву «Варта закона».

Ярка выявілася кампраміснасць пры арганізацыі судовай улады. Абвяшчаўся прынцып незалежнасці судовай улады, але захоўваліся асобныя саслоўныя суды для шляхты, гараджан і сялян.

Яна замацоўвала прагрэсіўнае палажэнне аб тым, што «усякая ўлада бярэ свой пачатак у волі народа і павінна складацца з трох галін: заканадаўчай, выканаўчай і судовай». Кароль надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі.

У 1792 г. (праз год з нечым пасля прыняцця Канстытуцыі) Расія і Прусія далучыліся да ўнутранай апазіцыі ў Рэчы Паспалітай, вядомай пад назвай Таргавіцкай канфедэрацыі, якая пачала барацьбу супраць ідэй і прыхільнікаў Канстытуцыі. Гэта прывяло да акупацыі краіны войскамі замежных дзяржаў, адмены Канстытуцыі, а потым да другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.).

### ***6. Палітычныя і прававыя погляды кіраўнікоў паўстання 1794 г. - Т.Касцюшкі і Я.Ясінскага***

Акупацыя краіны іншаземнымі войскамі і адмена Канстытуцыі ад 3 мая 1791 г. выклікала хвалю абурэння сярод жыхароў Рэчы Паспалітай, прыліў усеагульнага патрыятызму, жаданне дамагчыся рэальнай незалежнасці і аднаўлення краіны ў былых межах. Патрыёты Рэчы Паспалітай на чале з Т.Касьцюшкам, Г.Калантаем, І.Патоцкім сталі рыхтавацца да паўстання. Кіраўніком паўстання, якое пачалося вясной 1794 г., быў прызначаны Тадэвуш Касцюшка (1746-1817 гг.).

Перад паўстаннем пад час вандроўкі ў Францыю з мэтай знайсці падтрымку будучаму рэвалюцыйнаму ўраду Т.Касцюшка прадставіў ураду Францыі мемарыял з мэтамі паўстання: скасаванне манархіі і верхняй палаты сейму, адхіленне ад улады вышэйшага духавенства, абвяшчэнне выбарчага права для кожнага падаткаплацельшчыка, скасаванне прыгоннага права, абвяшчэнне свабоды і роўнасці для ўсіх грамадзян. Аднак пад час паўстання Касцюшка вымушаны быў лічыцца з рэальнымі суадносінамі палітычных сіл Рэчы Паспалітай, жаданнямі значнай часткі шляхты і зрабіць свае адозвы менш радыкальнымі. 24 сакавіка (1794 г.) у Кракаве быў абнародаваны «Акт паўстання грамадзян, жыхароў Кракаўскага ваяводства» (альбо Маніфест), які заклікаў да ўзброенага паўстання жыхароў з мэтай вызвалення краіны. Лозунгам паўстання сталі словы: «Вольнасць, цэласнасць, незалежнасць». Канстытуцыя ад 3 мая 1791 г., з-за сваёй непаслядоўнасці, не была ідэалам для кіраўнікоў паўстання, таму Акт не закранаў пытання аб яе аднаўленні. Канчатковае вызначэнне дзяржаўнага і грамадскага ладу Акт паўстання адносіў да часу заканчэння рэвалюцыйнай вайны.

Цікавай крыніцай вывучэння поглядаў Касцюшкі з’яўляюцца адозвы да розных слаёў насельніцтва, з якімі ён выступіў у першы дзень паўстання. Так, у адозве «Да арміі» выказвалася думка пра неабходнасць адзінства войска і народа, уздымаўся лозунг «Смерць альбо Перамога!». У адозве «Да святароў» ён выказваў прыхільнасць ідэі свабоды веравызнанняў і аўтакефаліі праваслаўнай царквы ВКЛ з уласным мітрапалітам, падначаленым Канстанцінопальскаму патрыярху. У звароце «Да жанчын» яны заклікаліся актыўна падтрымліваць сваіх братоў, сыноў, мужоў, якія сталі на абарону уласных правоў і свабодаў.

Для таго каб прыцягнуць сялян да ўдзелу ў паўстанні 7 мая 1794 г. у лагеры каля вёскі Паланец Т.Касцюшка выдаў Паланецкі ўніверсал,

накіраваны на паляпшэнне становішча сялян. Універсал абвяшчаў дзяржаўную апеку над сялянамі, прадугледжваў прадстаўленне сялянам асабістай свабоды (пры ўмове іх разліку з панамі і аплаты дзяржаўных падаткаў). Сяляне павінны былі паведамляць камісіі мясцовага кіравання аб сваім новым месцы жыхарства. Спецыяльным артыкулам універсала Т.Касьцюшка папярэджваў аб тым, што парушэнне дадзеных пастановаў памешчыкамі будзе праследавацца па суду і вінаватыя будуць пакараны, як за процідзеянне мэтам паўстання. Сяляне таксама папярэджваліся аб крымінальнай адказнасці за выступлення супраць землеўладальнікаў і прадстаўнікоў рэвалюцыйнага ўраду.

Нягледзячы на абмежаванасць і кампраміснасць, універсал быў выдатным прагрэсіўным актам, першым у гісторыі Рэчы Паспалітай змяншэннем цяжару паншчыны. Гэта сведчыць, што справу незалежнасці дзяржавы Т.Касцюшка звязваў з сялянскімі масамі, найбольш шматлікай сацыяльнай групай грамадства. Аднак заклікі кіраўніка паўстання натыкаліся на недавер сялян і прамы сабатаж памешчыкаў.

Паражэнне паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі і трэці падзел Рэчы Паспалітай паклалі пачатак масавай палітычнай эміграцыі з польскіх, беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель у краіны Заходняй Еўропы, і перш за ўсё ў Францыю. Палітычная эміграцыя адразу пачала арганізаваную ўзброеную барацьбу за адраджэнне страчанай дзяржаўнасці. У 1800 г. Т.Касцюшка надрукаваў у Парыжы брашуру «Ці могуць палякі дамагчыся незалежнасці?», у якой была выкладзена праграма барацьбы за адраджэнне страчанай дзяржаўнасці. Трактат складваўся з прамовы, чатырох частак і заключэння.

У прадмове аўтар папярэджвае сваіх землякоў, каб не спадзяваліся на замежную дапамогу, а калі хочуць «шчасця, гонару і славы… неабходна карыстацца сродкамі і сіламі, якія прырода дала чалавеку… пажадаем толькі - і мы станем свабоднымі, бо шаснаццацімільённы народ не можа быць народжаны для рабства» [8, с. 127]. Неабходна заўважыць, што ў дадзены твор быў накіраваны да ўсіх жыхароў Рэчы Паспалітай, бо на той момант яшчэ толькі пачыналася станаўленне нацый і тэрмін «паляк» выкарыстоўваўся для абазначэння жыхара ўсёй Рэчы Паспалітай.

У першай частцы твора Т.Касцюшка ўказвае, што прычынай паразы стала страта народам сілы духа, веры ў свае сілы. Да гэтага дадалася эгаістычная палітыка шляхты, якая пачала «імкнуцца не да дабрабыту краіны, а да задавальнення ганарыстасці магнацкіх прозвішчаў…» [8, с. 128].

У другой частцы аўтар разглядае пытанні стратэгіі і тактыкі новага паўстання. Ён прапануе павялічыць яго сілы за кошт вызваленчай барацьбы прыгнечаных частак насельніцтва суседніх дзяржаў, што знішчылі Рэч Паспалітую.

У трэцяй частцы трактата Т.Касцюшка разважае над праблемамі рэвалюцыйнай маралі і права. Ён дакарае тэрор, які прымяняўся пад час Вялікай французскай рэвалюцыі, катэгарычна выступае за захаванне правапарадку, асуджае самавольства, парушэнні закона. «Рэвалюцыя

праводзіцца не для таго, каб зняць усякую аброць са свавольства, наадварот, яна ставіць на мэце ўстанавіць парадак, падпарадкаваць закону ўсякія правапарушэнні, прывучыць падпарадкоўвацца ўладам, устаноўленым нацыяй, ахоўваць уласнасць кожнага, якая складае аснову грамадства» [8, с. 129].

Чацвёртая частка прысвечана матэрыяльнаму забеспячэнню будучага паўстання.

Выказаныя ідэі Т.Касцюшкі спрыялі зараджэнню рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху на абшарах былой Рэчы Паспалітай.

**Я.Ясінскі.** Больш радыкальныя ідэі пад час паўстання 174 г. выказваў кіраўнік часовага рэвалюцыйнага ўраду Літвы і Беларусі - Найвышэйшай літоўскай рады, камандуючым мясцовымі войскамі Якуб Ясінскі.

Напярэдадні паўстання Я.Ясінскі ўзначальваў тайную арганізацыю «Віленскіх якабінцаў», якая заклікала народ да адкрытай барацьбы з тыраніяй і феадальным ладам, выкарыстоўваючы вопыт Вялікай французскай рэвалюцыі. Я.Ясінскі лічыў, што чалавек павінен карыстацца павагаю за розум, а не за саслоўную прыналежнасць, патрабаваў роўнасці станаў. Як рэвалюцыянер крытыкаваў шляхецкія звычаі, абураўся непаслядоўнасцю і палавінчатасцю рэформ у Рэчы Паспалітай. Свае радыкальныя ідэі ён выклаў у шэрагу вершаў, напрыклад «Спрэчкі», «Да вяльможаў польскіх аб пастаянстве», «Да народа», невялікай працы «Да Стэфана Баторыя». Усе вершы напісаны з пазіцый вялікага патрыятызму, патрабаванняў свабоды і роўнасці для ўсіх станаў грамадства.

Грамадскім актам незалежнай думкі Я.Ясінскі быў верш «У час абходу польскім дваром жалобы па Людовіку XVI».

*А калі вам вольнасць, гонар, маёнткі забралі,*
*Вы плачаце, што караля галаву за 300 міль адцялі*
*Усе людзі роўныя: ці кароль, ці падданы,*
*Як хто парушыў права, няхай будзе караны.*
*А калі гэта не навучыць іншых манархаў,*
*Як трэба кіраваць,*
*Дык гаворым «няхай загінуць каралі і свет будзе вольны»*
[2, с. 107].

Пад час паўстання ў адозвах Я.Ясінскага з’яўляюцца радыкальныя заклікі: «Хапайце здраднікаў, судзіце і забівайце ўсіх... не спадзявайцеся на меч справядлівасці, часта хісткі і заўсёды спознены»; «паспеў час скінуць мяккасардэчнасць, якой ганарыўся наш край…» [2, с. 107].

Як вядома паўстанне ў Княстве адбывалася ў адрозненне ад Польшчы пад лозунгам «вольнасць, роўнасць, незалежнасць», што азначала патрабаванне па-першае, раўнапраўя абедзвюх частак Рэчы Паспалітай, а па-другое, роўнасці ўсіх станаў насельніцтва.

### *7. Ідэі ўтапічнага сацыялізму (І.Яленскі, С.Зяновіч)*

**І.Яленскі.** У гэты ж час у Беларусі працягваюць з’яўляюцца ідэі ўтапічнага сацыялізму. Яны былі выказаны, у прыватнасці, ураджэнцам

Мінскай губерні Іосіфам Яленскім (1756-1811 гг.), сасланым у 1794 г. за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху ў Салавецкі кляштар. Пасля ссылкі далучыўся да секты скапцоў.

У сваіх рукапісных творах «Пераклад польскага права, усенародна складзенага» (дапоўнены «Прысягай караля»), «Адозва да народа – агульны сабрацця̆ў нашых» і іншых выступаў супраць прыгоннага права, за роўнасць усіх саслоўяў, намаляваў жудасную карціну паднявольнага сялянскага жыцця.

Палітычныя і сацыяльныя погляды І.Яленскага вагаліся паміж ідэямі асветніцтва і старой даніканаўскай Руссю (ідэаламі старавераў).У сваім найбольш знакамітым творы «Благавесць да Ізраіля Расійскага», напісаным у царскай няволі, ён выклаў праграму радыкальнай перабудовы грамадства. Так, ён патрабаваў адмены прыватнай уласнасці, саслоўяў, стварэння агульнанароднай дзяржавы і ўрада, абшчыннага вядзення гаспадаркі, усеагульнай абавязковай працы і адукацыі, справядлівага падзелу матэрыяльных багаццяў. Старыя, інваліды і дзеці, на яго думку, павінны ўтрымлівацца за кошт абшчыны.

І.Яленскі лічыў, што органы дзяржаўнага кіравання, суды і рада старэйшын павінны выбіраюцца агульнанародным галасаваннем. Перавага павінна аддаецца мудрым і дабрадзейным людзям, якія могуць быць нават і бедным па свайму маёмаснаму становішчу. У грамадстве павінны дзейнічаць простыя і ясныя законы, колькасць якіх мусіць быць строга абмежавана, каб кожны грамадзянін іх лёгка памятаў і разумеў. Смяротнае пакаранне павінна быць адмененае, і парушальнікі законаў будуць проста выганяюцца з абшчын [4, с. 171].

І.Яленскі з народных пазіцый крытыкаваў афіцыйную рэлігію, выступаў за раннехрысціянскі лад жыцця.

**С.Зяновіч.** Аб неабходнасці рэформы грамадства ў адпаведнасцю з ідэямі ўтапічнага сацыялізму выказваўся і ўраджэнец Віцебшчыны Сямён Зяновіч. Свае погляды ён выклаў у рукапіснай працы «Сапраўднае тлумачэнне правоў чалавека» (пасля 1795 г.). У творы С.Зяновіч асуджае сацыяльную няроўнасць, прыгнечанне аднаго чалавека другім, выступае з крытыкай расійскага самадзяржаўя як формы дзяржаўнага кіравання.

Недасканалай сацыяльна-палітычнай рэчаіснасці С.Зяновіч проціпастаўляе ідэал свабоднага грамадства, заснаванага на агульнай уласнасці, што вядзе да братэрства і роўнасці людзей [4, с. 171].

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Берман Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.

2. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.установ/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
3. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дап. / А.Ф. Вішнеўскі. – Мн.: Акад. МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319 с.
4. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.
5. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206 с.
6. Пазднякоў, В. Паўлаўская рэспубліка / В.Пазднякоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1999. - Т.5: М - Пуд. – с.438-439.
7. Радаман, А. Сойм / А. Радаман // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 2001. - Т.6. Кн.1: Пузыны – Усая. – с. 375-382.
8. Юхо, Я. Наш нацыянальны герой / Я.Юхо // Сыны і пасынкі Беларусі / С.В.Барыс, С.В.Тарасаў, Г.А.Ланеўскі і інш.; Уклад. Барыс С.В. – Мн.: Полымя, 1996. – с.95-134.

# ТЭМА 9.
# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ ПАЧ.-СЯР.XIX СТ.

## *1. Грамадска-палітычная думка Беларусі ў першай трэці XIX ст.*

### 1.1. Перадумовы фармавання і асноўныя тэмы грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў першай трэці XIX ст.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 гг. і далучэння беларускіх зямель да складу Расійскай імперыі грамадскі і дзяржаўны лад спазнаў значныя змены. Перш за ўсё змяніўся адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел былых зямель Вялікага княства. Назвы ваяводстваў і паветаў былі заменены на назвы губерняў і ўездаў. Уся тэрыторыя Беларусі была падзелена на пяць губерняў - Гродзенскую, Віленскую, Мінскую, Магілеўскую, Віцебскую. Першыя тры называліся літоўскімі губернямі, дзве апошнія - беларускімі.

Шляхта фактычна цалкам згубіла свае палітычныя правы і той уплыў, што яна мела ў Рэчы Паспалітай. Кіраванне цалкам перайшло ў рукі рускай бюракратыі. Змянілася дзяржаўная мова. Ва ўсіх дзяржаўных установах пачалі пісаць і гаварыць на рускай мове. Уведзена была ваенная павіннасць, падаткі, у памерах не меншыя папярэдніх.

Пытанні аб вызваленні сялян, змене грамадскага ладу, прыняцці канстытуцыі не падтрымліваліся царскай уладай. Цалкам непарушнымі захоўваліся феадальныя адносіны. На легальным узроўне пытанні самаўладдзя і прыгонніцтва не маглі нават абмяркоўвацца.

У той жа час, каб не выклікаць новае паўстанне, царскі урад у першай трэці XIX ст. захоўваў пэўную самастойнасць земляў ВКЛ, што значна адрознівала іх ад расійскіх губерняў. Тут працягваў дзейнічаць прыняты яшчэ ў XVI ст. Статут ВКЛ 1588 г., з невялікімі зменамі дзейнічала сістэма судоў, функцыянавала былая сістэма сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У духоўным жыцці, нягледзячы на дзяржаўную падтрымку праваслаўя, працягвалі дамінаваць каталіцкая і ўніяцкая цэрквы.

Фактычная аўтаномнасць зямель былога Вялікага княства падтрымлівалася імператарам Аляксандрам I і па геапалітычных прычынах. Ва ўмовах міжнароднага крызісу і процістаяння Расіі і Францыі, прыбліжэння вайсковага канфлікту паміж імі, прыхільнасць жыхароў былой Рэчы паспалітай, Вялікага княства станавілася важным чыннікам міжнароднай палітыкі. І Францыя, і Расія спрабавалі здабыць падтрымку мясцовай шляхты абяцаючы аднаўленне дзяржаўнасці.

Адпаведна галоўным пытаннем нацыянальнай грамадска-палітычнай думкі стала адраджэнне дзяржаўнасці ВКЛ, пошук шляхоў да нацыянальнай самастойнасці. Абапіраючыся на прыхільнасць уладаў прадстаўнікі шляхты прапаноўвалі розныя праекты ўладкавання дзяржаўнай улады на землях ВКЛ.

Другім значным пытаннем палітычнай думкі Беларусі гэтага перыяду

была рэформа адукацыйнай сістэмы. Улады Расійскай імперыі ля прыцягнення сімпатый мясцовага насельніцтва на свой бок у 1803 г. на базе Галоўнай Віленскай школы стварылі Віленскі ўніверсітэт, а ў 1812 г. у Полацку была адкрыта другая вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі Беларусі - Полацкая езуіцкая акадэмія.

Улічваючы немагчымасць абмяркоўваць пытанні рэформаў дзяржаўнага і грамадскага ладу розныя палітычныя групоўкі пачалі абмяркоўваць пытанні адукацыі. Справа ў тым, што ў тыя часы на землях былога ВКЛ не існавала адзінай сістэмы навучальных устаноў. Значная колькасць школ на беларускіх землях па-ранейшаму працягвала заставацца ў руках розных каталіцкіх ордэнаў - дамініканцаў, францысканцаў, кармелітаў, піараў і г. д. Заняткі ў гэтых школах вяліся па самых разнастайных праграмах.

Пытанне прынцыпаў на якіх павінна адбывацца ўніфікацыя сістэмы, філасофскіх падмуркаў на якіх павінны выхоўвацца будучыя пакаленні і сталі асновай дыскусіі паміж лібераламі і кансерватарамі.

### 1.2. Праект адраджэння самастойнасці ВКЛ М.К.Агінскага

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай патрыятычна настроеная шляхта марыла пра аднаўленне дзяржаўнасці. Папулярнымі былі спадзяванні на новае паўстанне, жаданне сілай дамагчыся аднаўлення незалежнасці. Спадзяванні патрыётаў, мажлівасць сфармаваць з іх вайсковыя адзінкі спрабавалі выкарыстаць у сваім канфлікце Францыя і Расія.

Напалеон Банапарт неаднаразова заяўляў, што Францыя не прызнае падзелаў Рэчы Паспалітай, абяцаў даць ёй незалежнасць. У 1807 г. з тэрыторый далучаных да Прусіі і Аўстрыі ён стварыў Вялікае герцагства Варшаўскае. Умелая гульня на патрыятычных пачуццях прывяла да таго, што большая частка шляхты Рэчы Паспалітай спачувала яго перамогам і чакала яго як вызваліцеля, шмат эмігрантаў-паўстанцаў уступілі ў Польскія легіёны яго Вялікай арміі.

Аляксандр I таксама заяўляў аб жаданні аднавіць Польшчу, даць ёй ліберальную Канстытуцыю па прыкладу Канстытуцыі ад 3 мая 1791 г. Свае прапановы ён абмяркоўваў з адным з прызнаных польскіх лідэраў Адамам Чартарыйскім, сябрам свайго юнацтва. Новая дзяржава павінна была быць звязана з Расіяй дынастычнай сувяззю, брат імператара павінен быў узысці на польскі прастол. Да дзяржавы павінна была быць далучана частка Беларусі, так званыя літоўскія губерні.

Адам Чартарыйскі адхіліў прапанаваны праект цара аб аднаўленні ВКЛ, саслаўшыся на сваю некампетэнтнасць у гэтай справе [5, с. 114]. Аднак шэраг прадстаўнікоў шляхты былога ВКЛ гэтую ідэю падтрымлівалі. Яны расчараваліся ў Напалеоне, які цалкам падначаліў Герцагства Варшаўскае свайму ўплыву, выказвалі спадзеў на адраджэнні ВКЛ і Рэчы Паспалітай пад эгідай Расіі.

У 1811 г. вядомы дзяржаўны дзеяч і кампазітар Міхаіл Клеафас Агінскі

(1765-1833 гг.), выяўляючы настроі пэўных колаў шляхты ВКЛ, падаў Аляксандру I праект утварэння на беларускіх і ўкраінскіх землях Вялікага княства Літоўскага са сталіцай у Вільні ў складзе Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Падольскай, Валынскай губерняў, а таксама Беластоцкай вобласці і Тарнопальскай акругі. Свае погляды М.К.Агінскі выклаў у «Запісцы графа Агінскага пададзенай Аляксандру I 15 мая 1811 г.» і складзеным на яе аснове «Праекце указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў».

У «Запісцы» М.К.Агінскі апісвае спробы Напалеона дамагчыся прыхільнасці жыхароў Рэчы Паспалітай. Ён паказвае, што некаторая частка насельніцтва паддалася яго абяцанням. Дзеянні Францыі ён трактуе як падман польскага патрыятычнага руху, як спробу адно выкарыстоўваць патрыётаў як «гарматнае мяса» падчас развязаных ім войнаў. М.К.Агінскі абвінавачвае Напалеона ў невыкананні абяцанняў, у жаданні падмануць палякаў надзеяй аднаўлення Рэчы паспалітай, якога ён ніколі не дапусціць.

Расіі М.К.Агінскі прапануе перахапіць ініцыятыву ў Францыі, і калі Напалеон стварыў Вялікае герцагства варшаўскае, то расейскі урад павінен аднавіць Вялікае княства Літоўскае. Аўтар «Запіскі» нагадвае пра гісторыю незалежнай Літвы да Люблінскай уніі, пра традыцыі самастойнага існавання Княства ў федэрацыі з Польскай дзяржавай. Ён запэўнівае, што аднаўленне аўтаноміі Княства, добразычлівыя адносіны да яго насельніцтва з боку Расіі, стануць прыкладам для жыхароў астатніх частак Рэчы Паспалітай, і яны адмовяцца ад падтрымкі ілжывых авантур французскага імператара [9, с. 209].

У праекце указа М.К.Агінскі прапануе аднавіць ВКЛ на чале з імператарскім намеснікам з тытулам Высокасці. Непасрэдна кіраваць ВКЛ будзе Літоўская канцылярыя, пад кіраўніцтвам аднаго з дзяржаўных міністраў, прызначанага Імператарам. Рэгуляванне публічных аспектаў жыццядзейнасці ВКЛ (арганізацыя кіраваннем, падаткі, юстыцыі і г.д.) будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з канстытуцыяй - Асноўным статутам ВКЛ. Усе чыноўнікі будуць выключна ўраджэнцамі вялікага княства. Вышэйшым судом будзе Трыбунал у Вільне, а Літоўскі статут (Статут 1588 г.) будзе дзейсным грамадзянскім законам ВКЛ [11, с. 212-213].

Імператар Аляксандр I з прыхільнасцю чытаў прапанаваныя яму «Запіску» і «Праект указу», аднак правячыя колы Расійскай імперыі адмоўна паставіліся да гэтай ідэі. Па-першае, на беларускія землі яны глядзелі як на спадчынныя ўладанні Расіі, «исконно русские» тэрыторыі. Па-другое, яны баяліся аднаўленнем ВКЛ аслабіць Расійскую імперыю і не былі ўпэўнены ў будучай адданасці Расіі гэтых зямель.

Напалеон пастараўся выкарыстаць у сваіх палітычных мэтах гэтую акалічнасць. Імкнучыся прыцягнуць на свой бок беларускую шляхту, ён выказаў намер стварыць на землях былога Вялікага княства Літоўскага нават тры дзяржавы: у цэнтральнай Беларусі (Мінская, Гродзенская, Віленская губерні) - дзяржаву пад назвай Літва са сталіцай у Вільні; на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў - дзяржаву пад назвай Беларусь. Землі ж

этнаграфічнай Літвы (з цэнтрам у Коўна) павінны былі далучыцца да Латвіі і стварыць дзяржаву пад назвай Курляндыя. Частку гэтага праекта Напалеон рэалізаваў. У чэрвені 1812 г. ён стварыў, пасля таго як заняў беларускія землі, Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага, улада якога распаўсюджвалася на Мінскую, Гродзенскую і Віленскую губерні. Але гэтае палітычнае фарміраванне праіснавала нядоўга.

Пасля перамога над Напалеонам да праекта аднаўлення ВКЛ расійскія ўлады ўжо не вярталіся.

## 1.3. Лібералізм і асноўныя праблемы грамадска-палітычнага жыцця

Лібералізм можна вызначыць як ідэалогію і рух, базавай мэтай якога з'яўляецца дасягненне свабоды асобы і сацыяльны прагрэс (імкненне да свабоды сумлення ў пытаннях веравызнання, патрабаванне свабоды асобы ад дзяржаўнай апекі, адмены саслоўных прывілеяў і ўсталяванне палітычных свабодаў - свабоды слова, сходаў і саюзаў; у вобласці эканамічнай прынцып свабоды павінен быў рэалізавацца як патрабаванне свабоды гандлю, працы, барацьба з умяшаннем дзяржавы ў эканоміку і прыватнае жыццё індывідуумаў) [12]. Трэба адзначыць, што характар ліберальнага руху заўсёды залежыць ад канкрэтных гістарычных умоў.

На Беларусі ў пачатку XIX ст. пачаў распаўсюджвацца «рэлігійны лібералізм». Цесная сувязь тагачасных рэлігійных інстытутаў з прыгонным ладам, самаўладдзем выклікала крытыку з боку асветніцкі настроеных прадстаўнікоў шляхты і ўзнікаючай інтэлігенцыі. Не маючы мажлівасць легальна крытыкаваць прыгонніцтва і самаўладдзе, яны пачалі крытыкаваць папства і клір, ордэнскую сістэму выхавання, рэлігійную мараль. Асобныя прадстаўнікі шляхты выказвалі думкі аб магчымасці абмежавання прэтэнзій духавенства, аддзяленне царквы ад дзяржавы і школы - ад царквы.

Крытыку дамінуючага рэлігійнага светапогляду ў першай трэці XIX стагоддзя распачалі на сваіх старонках віленскія перыядычныя выданні «Dzennik Wilenski», «Tygodnik Wilenski», «Wiadomosci Brukowe». Публіцысты адстойвалі перавагу свецкай адукацыі над царкоўнай, неабходнасць жаночай адукацыі, патрабавалі надзялення яўрэяў грамадзянскімі правамі, вызвалення сялян ад прыгону. Грамадскія колы, погляды якіх адлюстроўвалі гэтыя выданні, групаваліся ў першай трэці XIX стагоддзя вакол Віленскага ўніверсітэту, віленскіх навуковага, медыцынскага, дабрачыннага, бібліятэчнага і тыпаграфскага таварыстваў. Менавіта ў гэтым асяроддзі ў канцы XVIII-пачатку XIX стагоддзя пачаўся рост папулярнасці ліберальных каштоўнасцей - свабоды індывідуума, роўнасці ўсіх перад законам, свабоды ад рэлігійных забабонаў.

«Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгралі творы Вальтэра. У 1776 годзе ў Гродне і ў 1793 годзе ў Вільні былі выдадзены некаторыя кнігі Вальтэра, у тым ліку і «Век Людовіка XIV». У Мінску і Навагрудку чыталі творы Вальтэра, апублікаваныя ў часопісах «Monitor», «Zabawy przyjemne i

pozyteczne». «Увесь адукаваны слой грамадства, - пісаў аб гэтым часе У.Спасовіч, - у пачатку XIX стагоддзя складаўся з афранцузіўшыхся вальтэр'янцаў» [12].

Эканамічныя каштоўнасці лібералізму засвойваліся дзякуючы папулярнасці ў Беларусі вучэння фізіякратаў і эканамічным працам выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэту Я.Храптовіча, Г.Страйноўскага, М.Карповіча, І.Еленскага. Л.Нарушэвіч (1733-1796 гг.), Т.Гусаржэўскі (1732-1807 гг.), І.Лелевель (1808-1861 гг.) у сваіх лекцыях і творах прапагандавалі ліберальную ідэю прагрэсу ў гісторыі. Апрача ўздзеяння філасофскіх ідэй XVIII стагоддзя, для ўспрыняцця ліберальных каштоўнасцяў грамадства было падрыхтавана рэформамі канца XVIII ст. у Рэчы Паспалітай.

Памяркоўныя лібералы адмоўна ставіліся да радыкальных вывадаў, якія былі зроблены ў часы французскай рэвалюцыі. Так, у артыкуле, надрукаваным у 1816 годзе ў газеце «Tygodnik Wilenski» адзначалася, што сапраўдныя лібералы не маюць нічога агульнага з тымі, хто «падкапвае троны і нізвяргае алтары»; палітыка можа лічыцца ліберальнай, калі адпавядае маральным мэтам развіцця чалавека, спрыяе яго ўдасканаленню, імкнецца да ажыццяўлення грамадзянскіх свабодаў і гарантуе абарону незалежнасці чалавека. Дзеячы Французскай рэспублікі, па меркаванню аўтара артыкула, не прытрымліваліся ліберальных прынцыпаў, бо парушалі правы чалавека і не паважалі права ўласнасці [12].

Такім чынам, у першай палове XIX стагоддзя прыхільнікі лібералізму ў Беларусі ў сваёй праграме рэформ не пасягалі на самаўладдзе і не патрабавалі канстытуцыі. Іх мэтай была такая рэформа, каб пры самаўладдзі былі б усталяваны пачаткі прававой дзяржавы, рэфармавана сістэма суда, забяспечаны права асобы. Перадумовай будучай рэформы дзяржавы яны лічылі рэформу сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў духу яе дэмакратызацыі і лібералізацыі. Яны вельмі нясмела закраналі праблемы вырашэння сялянскага пытання, аднаўленні страчанай дзяржаўнасці ў той ці іншай форме.

**Іеранім і Валерыян Страйноўскія.** Памяркоўна-патрыятычную і талерантную пазіцыю займаў рэктар Віленскага ўніверсітэта Іеранім Страйноўскі. Яшчэ ў 1785 г. ён напісаў падручнік «Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў», які вытрымаў 5 выданняў, у тым ліку і на рускай мове (1809 г.). І.Страйноўскі падзяляў ідэі фізіякратаў, выступаў за вызваленне сялян.

Ідэі фізіякратызму падзяляў і яго брат, Валерыян Страйноўскі (1759-1834 гг.), які ў 1808 г. выдаў у Вільні кнігу пад назвай «Аб пагадненні памешчыкаў з сялянамі». В.Страйноўскі сцвярджаў, што прыгонны стан супярэчыць натуральнаму праву і стрымлівае прагрэс грамадства. Таму неабходна ліквідаваць асабістую залежнасць сялян ад памешчыкаў. В.Страйноўскі выказаўся за наданне сялянам асабістай свабоды, а таксама права набыцця зямлі, якая павінна заставацца ўласнасцю памешчыкаў. Каб падкрэсліць памяркоўнасць і легальнасць сваіх планаў ён падверг крытыцы «непраўдзівых сяброў сялян», якія выказваюцца за бясплатную раздачу

сялянам памешчыцкай зямлі, прыпамінаючы аб крывавых здарэннях часоў Вялікай французскай рэвалюцыі» [6, с. 182].

**Я.Снядэцкі.** У 1806 г. на пасадзе рэктара Віленскага ўніверсітэта І.Страйноўскага змяніў таленавіты матэматык і астраном, выдатны мысліцель, педагог Ян Снядэцкі (1756-1830 гг.). Далёка за межамі Беларусі і Літвы былі вядомы яго работы ў галіне розных раздзелаў матэматыкі і астраноміі, што дазволіла яму ў 1811 г. стаць членам-карэспандэнтам Санкт-Пецярбургскай Акадэміі навук. Я.Снядэцкі з поспехам займаўся таксама філасофіяй, мовазнаўствам, гісторыяй навукі, літаратурай.

На сваёй пасадзе Я.Снядэцкі спрабаваў ажыццявіць рэформу сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў Беларусі і Літве. Цэласную праграму рэформы сістэмы адукацыі ў духу яе дэмакратызацыі і лібералізацыі ён выклаў перш за ўсе ў манаграфіі «Жыццё і літаратурная дзейнасць Гуга Калантая» (1814 г.). Я.Снядэцкі лічыў, што «вышэйшая ўлада» не павінна займацца дробнымі пытаннямі адукацыі, а ўсю сваю ўвагу павінна звярнуць на склад і становішча настаўнікаў і выкладчыкаў, бо гэта «крыніца, ад якой усё залежыць» [6, с. 180]. Асветнік бачыў дзве галоўныя мэты грамадскай адукацыі і выхавання. Па-першае, падрыхтоўка людзей да дзяржаўнай службы і правільнага вядзення прыватных спраў, і, па-другое, «выяўленне дараванняў і талентаў, фарміраванне іх і выхаванне на карысць народную». Пры гэтым ён лічыў, што таленты належыць шукаць ва ўсіх саслоўях, што «ўся ўвага школы павінна быць звернута на народ» [6, с. 180-181].

Шмат увагі Я.Снядэцкі ўдзяляў маральнаму выхаванню моладзі. «Добрыя норавы, - пісаў ён, - павінны прывівацца маладым не толькі праз навучанне… а таксама праз глыбока ўражальныя вобразы, якія выклікаюць агіду да ўсяго таго, што супярэчыць справядлівасці, ісціне, грамадскаму парадку і годнасці чалавека. У грамадскі парадак уключаюцца таксама і дзяржаўныя законы» [7, с. 178].

Для рэктарскай дзейнасці Я.Снядэцкага быў характэрны клопат аб мясцовым забеспячэнні навуковых кадраў устаноў адукацыі. Гэта традыцыя пераважала аж да апошніх дзён існавання ўніверсітэта. Вядомы беларускі гісторык і публіцыст XIX ст. А.Кіркор (1819-1886 гг.) сведчыў, што «у апошні час існавання ўніверсітэта (у 30-я гады XIX ст.) амаль усе прафесары яго былі ўжо мясцовыя, літоўскія або беларускія ўраджэнцы. Так, з ліку 47 прафесараў 36 было мясцовых» [5, с. 119; 6, с. 182].

**А.Снядэцкі.** Ліберальныя ідэі выказваў і малодшы брат Яна Снядэцкага – прафесар хіміі і медыцыны Анджэй Снядэцкі (1768-1838 гг.). Падтрымліваючы матэрыялістычныя ідэі ў прыродазнаўчых навуках, у сацыяльным жыцці ён выступаў за асвету як за галоўны сродак вырашэння ўсіх сацыяльных супярэчнасцяў і канфліктаў.

А.Снядэцкі крытыкаваў феадальнае грамадства за яго адмоўны ўплыў на фармаванне асобы чалавека. У адрозненне ад Мантэск'е галоўным фактарам яе фармавання ён называў не прыродныя і кліматычныя ўмовы, а сацыяльныя ўмовы жыцця. Разгульны вобраз жыцця шляхты – гулянкі, п'янства, тэатр, прагнасць, пакланенне ніжэйшых станаў – прыводзяць, на яго думку, да

развязнасці, самлюбства, уладалюбства, ганарлівасці і іншых хвароб прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя [5, с. 120]. Прыгнёт, рабства, голад, у сваю чаргу, не дазваляюць і прадстаўнікам ніжэйшых класаў сфармавацца ў гарманічна развітую асобу. Наадварот, іх жыццё – крыніца эпідэмій і захворванняў.

А.Снядэцкі быў рэактарам папулярнай ліберальнай газеты «Вулічныя навіны», якая пачала выходзіць у Вільні ў 1818 г. Газета з'яўлялася друкаваным органам ліберальна-асветніцкага таварыства «шубраўцаў» («гарэза», «свавольнік»), у склад якога ўваходзілі студэнты і прафесары Віленскага ўніверсітэта Я.Шымкевіч, Л.Бароўскі, І.Шыдлоўскі і інш. У статуце таварыства гаварылася, што любоў да Айчыны выражаецца не ў некрытычным ухваленні ўсяго свайго, а ў імкненні выправіць недахопы [5, с. 120].

Шубраўцы крытыкавалі маральныя заганы сучаснага ім грамадства (п'янства, гультайства і г.д.), асуджалі лад жыцця пануючых класаў. Газета са спачуваннем адносілася да простых людзей, прызнавала за сялянамі роўныя правы ў грамадстве. Шубраўцы выказваліся за частковыя сацыяльныя рэформы. У нацыянальным пытанні яны выступалі з пазіцый ліцвінскага патрыятызму, падтрымлівалі ідэю адраджэння Рэчы Паспалітай як канфедэрацыі Польшчы і Літвы.

### 1.4. Палітычныя погляды прадстаўнікоў кансерватызму. Палеміка паміж лібераламі і кансерватарамі

**І.Лабажэўскі.** У адрозненні ад лібералаў прадстаўнікі кансерватыўнай думкі катэгарчына выступалі супраць асветніцкіх ідэй. Усе праблемы Рэчы Паспалітай, яе знікненне яны звязвалі з асветніцкай ідэалогіяй і заснаванымі на ёй рэформамі сяр.-канца XVIII ст. Так, у 1818-1823 гг. Ігнат Лабажэўскі (Лада-Лабажэўскі) (каля 1750-1826 гг.). выдаў у сталіцы Расійскай імперыі тры кнігі на французскай мове, накіраваных супраць асветніцкай думкі XVIII ст. Змест кніг часткова друкаваўся на старонках пецярбуржскай рускамоўнай газеты - «Русский инвалид» Яе рэдактарам быў выпускнік Віленскага ўніверсітэта Міхаіл Маркіяновіч (1780-1830 гг.).

У першай з іх - «Належная павага да каранаванай асобы» (1818 г.) - адказнасць за ўсе беды, якія абрушыліся на Рэч Паспалітую ў канцы XVIII ст., І.Лабажэўскі ўскладае на асветніцкую ідэалогію, сацыяльна-палітычныя рэформы апошняга караля Станіслава Аўгуста. «Небяспечныя прынцыпы новай філасофіі,- заключаў ён,- з'явіліся непасрэднай прычынай упадку Рэчы Паспалітай»[6, с. 184].

У двух другіх сваіх творах - «Палітычныя разважанні хрысціяніна» (1819 г.) і «Алтары і троны» (1823 г.) І.Лабажэўскі выступае ў падтрымку ідэй заходнееўрапейскага кансерватара, прыхільніка сярэднявечнай тэакратыі, Жазэфа дэ Мэстра, з якім яго звязвалі сувязі асабістай дружбы. Прырода чалавека не патрабуе ніякіх радыкальных пераўтварэнняў, заяўляў Лабажэўскі, паколькі васемнаццаць вякоў назад яе грунтоўна рэфармавала

хрысціянства. Найгоршым гатункам чалавечай думкі з'яўляецца беспрынцыповае злучэнне хрысціянства і лібералізму, якое ўсё адмаўляе і нічога не прапануе ўзамен. Асабліва небяспечнымі для грамадства з'яўляюцца погляды Ж-Ж.Русо. Лабажэўскі, як і Жазэф дэ Мэстр, выступае як прыхільнік традыцыяналізму, вораг народаўладства. «Як Бог, стварыўшы свет, захоўвае яго,- пісаў ён,- так і людзі павінны кансерваваць тыя сацыяльныя адносіны і інстытуты, якія стварылі» [6, с. 184].

***Палеміка паміж лібераламі і кансерватарамі***

Калі прыхільнікі асветніцкай ліберальнай думкі на Беларусі гуртаваліся вакол Віленскага ўніверсітэта, то цэнтрам кансерватыўных ідэй была Полацкая езуіцкая акадэмія, прафесары якой адстойвалі тэалагічны светапогляд, кіраваліся ім у сваёй практычнай дзейнасці.

Паміж прафесарамі Віленскага ўніверсітэта і Полацкай езуіцкай акадэміі вялася ідэйная палеміка, якая знайшла сваё адлюстраванне на старонках двух часопісаў - «Віленскага дзённіка» (Вільня) і «Полацкага штомесячніка» (Полацк), а таксама іншых перыядычных выданняў таго часу, і зрабіла вялікі ўплыў на фарміраванне грамадскай думкі.

Фармальным пачаткам спора стала дыскусія наконт літаратурнай каштоўнасці выданай у 1803 г. у Полацку невялікім тыражом эпічнай паэмы выкладчыка Полацкага езуіцкага калегіума Нікадэма Мусніцкага «Палтава».

Паступовa палеміка, якая пачалася з крытыкі «Палтавы», перайшла на іншыя праблемы. У арбіту спрэчкі паміж лібераламі і кансерватарамі ўключаюцца пытанні філасофіі, этыкі, гісторыі, педагогікі і г.д. У прыватнасці, у вялікім артыкуле «Нататкі аб выхаванні моладзі», які друкаваўся ў некалькіх нумарах «Полацкага штомесячніка» у 1818 г. і быў падпісаны ініцыяламі І.Я., крытыкавалася выхаваўчая канцэпцыя беларускіх асветнікаў, якая грунтавалася на педагагічных поглядах Ж.-Ж.Русо і абмяжоўвала да мінімуму ролю каталіцкай царквы ў адукацыі і выхаванні. На думку аўтара пасля з'яўлення на Беларусі педагагічных ідэй Русо, распачаўся крызіс у галіне выхавання і адукацыі. Далей аўтар артыкула робіць выпады супраць працы былога рэктара Віленскага ўніверсітэта Яна Снядэцкага «Літаратурнае жыццё Гуга Калантая» і твора Фелікса Бенткоўскага «Гісторыя польскай літаратуры», у якіх абгрунтоўвалася неабходнасць змяншэння ўплыву каталіцкай царквы на выхаваўчыя працэсы. «Не падлягае сумненню,- адзначае аўтар артыкула,- што рэлігія з'яўляецца апорай дзяржавы і грамадскага жыцця, таксама як і тое, што адказ сучаснага выхавання ад рэлігіі з'яўляецца шкодным для абодвух: дзяржавы і грамадства» [5, с. 152; 6, с. 187-188].

Па рознаму ўдзельнікі дыскусіі глядзелі і на сутнасць гістарычнага працэсу. Лібералы абапіраючыся на аўтарытэт Вальтэра адмаўлялі тэалагічны падыход да гісторыі, а полацкія кансерватары выступалі ў абарону рэлігіі. Яны крытыкавалі падыход лібералаў да тлумачэння ролі інквізіцыі падчас варфаламееўскай ночы, аспрэчвалі ролю ў гісторыі навуковых даследаванняў Каперніка і Галілея. У галіне філасофіі яны

выступалі супраць пашырэння поглядаў Спінозы, Канта, Гегеля.

У адказ на артыкулы полацкіх навукоўцаў Ян Снядэцкі выступіў з лекцыяй «Аб філасофіі», якую ён спачатку прачытаў для вучоных Віленскага ўніверсітэта, а потым надрукаваў у часопісе «Віленскі дзённік». У сваіх разважаннях ён абараняў вучэнні вышэйзгаданых мысліцеляў, прыводзіў цытаты з іх прац. Звяртаючыся да сваіх полацкіх апанентаў, Снядэцкі пісаў, што «грунтоўны тэолаг павінен не кампраметаваць, а аналізаваць погляды выдатных філосафаў» [6, с. 190].

Дыскусія па асноўных праблемах грамадскай думкі абяцала даць плённыя вынікі, аднак нечакана яна была гвалтоўна спынена самадзяржаўем. Вясной 1820 г. царскім указам прафесары і студэнты Полацкай езуіцкай акадэміі ў ліку іншых езуітаў пад канвоем паліцыі былі выпраўлены ў Аўстрыю.

## 1.5. Палітычны рамантызм. Погляды І.М.Даніловіча. Філаматы, філарэты

Адмоўная практыка Вялікай Французскай Рэвалюцыі, увядзенне ў дзеянне кодэксаў далёкіх ад запатрабаванняў грамадства (Прускае земскае ўкладанне) прывяло да ўзнікнення недаверу шмат каго з адукаваных еўрапейцаў да спробаў з дапамогай абстактна-рацыяналістычнага заканадаўства забяспечыць сацыяльнае пераўтварэнне грамадства. У Еўропе пачалі ўзнікаць вучэнні, якія адмаўлялі натуральна-прававыя канцэпцыі эпохі Асветы.

Ужо ў эпоху Асветы закладваліся перадумовы, якія прывялі да паслаблення даверу да рацыяналістычных ідэйных мадэляў. Вучэнне Мантеск'е («Аб духу законаў» 1748 г.), развіваючыся ў рэчышчы натуральна-прававой школы, заклала асновы гістарычнага рэлятывізму. Ён паказваў, што ў свеце існуе мноства розных грамадскіх сістэм з цалкам рознымі законамі і звычкамі. Гэтую з'яву мысліцель тлумачыў розным уздзеяннем клімату ў розных краінах у іх гісторыі.

Іншыя выбітныя вучоныя прапанавалі моцна раскрытыкавалі рацыяналізм. Традыцыяналісты на чале з Э.Бэркам адстойвалі канцэпцыю эвалюцыйнасці развіцця народаў і дзяржаў, а розуму супрацьпаставілі забабоны, як адлюстраванне шматвяковай мудрасці нацыі [2; 3]. Э.Кант, у сваю чаргу, паставіў пад сумнеў мажлівасць пазнання зыходных законаў пабудовы свету чалавечым розумам.

Рэакцыяй на абстрактнае адмаўленне нацыянальных, гістарычных, эвалюцыйных фактараў у развіцці права выступіла эпоха рамантызму. Пад апошнім у літаратуры і мастацтве пачалі разумець творчую плынь, галоўнай характарыстыкай каторай ёсць мастацкае ўвасабленне невядомага, незвычайнага, бясконцага – што акаляе чалавека – з дапамогай ірацыянальных з'яваў, сілы пачуцця [1, с. 7]. Тэарэтыкі рамантызму (асабліва нямецкага) асаблівае значэнне надавалі ўзвышэнню народна-паэтычнай творчасці, верылі ў значэнне «народнага духу», «народнай

свядомасці», што павінны разглядацца ў непарыўнай лучнасці з мовай, культурай, гісторыяй народа. Адной з сваіх задач яны бачылі фармаванне нацыянальнай свядомасці сваіх суграмадзян.

Рамантызм меў праявы ў розных сферах культуры народаў Еўропы. Да рамантыкаў-літаратараў мы адносім Эрнста Тэадора Амадэя Гофмана, Якаба і Вільгельма Грым, Джорджа Байрана, Адама Міцкевіча, Яна Баршчэўскага, Аляксандра Пушкіна, да філосафаў – Фрыдрыха Шляермахера, Фрыдрыха і Аўгуста Шлегелей, да музыкаў – Нікола Паганіні, Эктора Берліёза, Фрэдэрыка Шапэна, Міхаіла Глінку, Міхаіла Клеафаса Агінскага, Станіслава Манюшку, мастакоў-жывапісцаў – Франсіско Гоя, Карла Брулова, Валенціна Ваньковіча і інш.

У сферы права рамантызм знайшоў сваё ўвасабленне ва ўзнікненні і папулярнасці гістарычнай школа права [10, с. 11]. Яе прадстаўнікамі былі Густаў фон Гуго, Фрыдрых фон Савін'і, Г.Ф.Пухта. Асноўнай ідэяй школы было абгрунтаванне незалежнасці сутнасці права ад нейкіх трансцэндэнтных прынцыпаў, якіх асветнікі спрабавалі вывесці з дапамогай розума і логікі. Сутнасць права пераносілася ў мір чалавека з міру Бога або Прыроды, але крыніцай яе была не суб'ектыўная, а калектыўная дзейнасць людзей - «народны дух» [13, с. 127].

У першую чаргу іх цікавіў пытанне эфектыўнасці юрыдычных нормаў, а не іх праўдзівасці або справядлівасці. Норма эфектыўная, калі добраахвотна выконваецца суб'ектамі прававых адносін, а значыць, узгадняецца з «нацыянальным духам», яго выразам і развіццём у гісторыі.

Усведамленне пераемнасці працэсу развіцця права абумовіла разуменне яго як каштоўнасці, выклікала станаўленне і развіццё гістарычна-прававой навукі, рост гістарычных даследаванняў у вобласці права.

Ідэі рамантызму знайшлі адлюстраванне ў творчасці вучоных на тэрыторыі былога Вялікага княства.

**І.Даніловіч.** Напярэдадні і ў час палемікі паміж кансерватарамі і лібераламі ў Віленскім універсітэце сфармавалася новая група маладых прафесараў, з'явіліся першыя публікацыі такіх выхаванцаў універсітэта, як Ж.Анацэвіч, М.Баброўскі, І.Даніловіч, Ю.Ярашэвіч і іншыя. Яны пачалі актыўна распрацоўваць гістарычныя і юрыдычныя праблемы, звязаныя з мінулым Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Найвыдатнейшым сярод гэтых выдатных людзей трэба прызнаць Ігната Мікалаевіча Даніловіча (1787-1843 гг.).

Ён нарадзіўся ў сям'і беларускага ўніяцкага святара. Адукацыю атрымаў у беластоцкай гімназіі і на юрыдычным факультэце Віленскага ўніверсітэта. У 1811 г. І.Даніловіч стаў кандыдатам права, у 1812 г. – магістрам. З 1814 г. ён займаў ва ўніверсітэце спачатку пасаду дацэнта, потым прафесара літоўскага (беларускага) права.

У 1822 г. І.Даніловіч быў прызначаны ў склад камісіі, якая занялася падрыхтоўкай да друку Статута ВКЛ, пошукамі яго друкаваных і рукапісных экземпляраў. Вынікі сваёй працы ён выклаў у артыкуле «Бібліяграфічнае апісанне вядомых нам рукапісных і друкаваных экземпляраў літоўскага

Статута» («Віленскі дзённік», 1823). «З вялікімі цяжкасцямі,- пісаў у артыкуле аб сваёй працы ў камісіі І.Даніловіч,- знайшоў я ў розных мясцінах Беларусі і Літвы 14 выданых і звыш 10 рукапісных версій Статута на польскай, беларускай і лацінскай мовах». Дапамагалі ў гэтай працы І.Даніловічу студэнты ўніверсітэта, якія захапіліся яго планамі і прывозілі яму «цэлыя груды пергаментных і іншых рукапісаў (Статута), галоўным чынам з уніяцкіх цэркваў і кляштараў» [6, с. 192].

У камісіі І.Даніловіч разам з І.Лялевелем выказваўся «за выданне старога беларускага (тэкста) Статута з пазнейшымі варыяцыямі». Дакладней, ён выказваўся за выданне Статутаў ВКЛ «у трох асобных рэдакцыях (1529, 1566 і 1588 гадоў) з далучэннем да іх усіх велікакняжацкіх законаў і прывілеяў»[6, с. 192].

Пасля працэсу па так званай «Віленскай справе», у ходзе якой былі разгромлены тайныя студэнцкія гурткі, І.Даніловіч, якога ўлады абвінавацілі ў інспірацыі студэнцкага руху, быў звольнены з працы і змушаны пакінуць Вільню.

У наступныя гады свайго жыцця І.Даніловіч працаваў прафесарам у Харкаўскім, Кіеўскім і Маскоўскім універсітэтах. У 1830-1835 гг. знаходзіўся ў Пецярбургу ў камісіі М.М.Сперанскага, якая рыхтавала Збор мясцовых законаў для заходніх губерняў.

Галоўным прадметам зацікаўленасці І.Даніловіч было беларускае права. Ён упершыню апісаў усе рукапісныя і друкаваныя экземпляры Статута ВКЛ, а таксама падрыхтаваў першае навуковае выданне Статута ВКЛ 1529 г. (апублікаваны ў 1841 г.). Як асабіста адзначаў І.Даніловіч, ён рыхтаваў да друку Статут ВКЛ 1529 г. «не толькі каб выратаваць гэты важны помнік беларускага заканадаўства ад страты», але і для таго, каб даказаць, што «тагачасная Літва кіравалася беларускімі звычаямі і законамі» [6, с. 192].

У працы «Гістарычны агляд літоўскага заканадаўства» (1837 г.) І.Даніловіч даў характарыстыку гістарычнага развіцця права ў Беларусі і Літве, першы спрабаваў высветліць яго крыніцы і сувязь са старажытнарускім і заходнееўрапейскім заканадаўствам, сцвярджаў самабытны характар беларускага права.

Усё жыццё ён быў прыхільнікам ідэі адраджэння беларуска-літоўскай дзяржавы, мовы Статутаў ВКЛ, чаму прысвяціў усе свае сілы і здольнасці. У сувязі з гэтым адзін з яго біёграфаў з глыбокай павагай, а адначасова і з лёгкай іроніяй слушна заўважыў, указваючы на рэдкасны, асаблівы жыццёвы шлях гэтага чалавека: «Ёсць усе падставы лічыць яго патрыётам-беларусам, грамадзянінам дзяржавы, якая даўно знікла, а таксама чалавекам, які з кахання да помнікаў роднай гісторыі служыў прывіду XV і XVI ст.» [5, с. 123; 6, с. 192-193].

**Філаматы, філарэты.** У 1817г. у Віленскім універсітэце пад уплывам асветніцкіх і гістарычных прац ліберальна настроеных выкладчыкаў паўстала і пачалі дзейнічаць тайныя студэнцкія гурткі «Таварыства філаматаў» (ад грэчаскага – аматары ведаў) і «Таварыства філарэтаў» (аматары дабрачыннасці). Арганізатарамі таварыстваў былі студэнты ўніверсітэта

А.Міцкевіч, Т.Зан, Ю.Яжоўскі, Ф.Малеўскі, Я.Чачот, А.Петрашкевіч.

У ідэйным развіцці філаматаў можна вылучыць два этапы: першы, з 1817 па 1818 г., і другі, з 1819 па 1823 г. Спачатку на першы план філаматы высоўваюць культурна-асветніцкія задачы, мэту навуковага і маральнага ўдасканальвання. Галоўнай мэтай з'яўляецца падрыхтоўка моладзі да рознабаковай дзейнасці на карысць Айчыне. Падрыхтоўка ажыццяўлялася ў навуковым і арганізацыйным кірунку і прадугледжвала глыбокае авалоданне разнастайнымі навукамі, замежнымі мовамі, уласную творчасць.

Фактычна сваёй дзейнасцю філаматы выступалі супраць сучаснай ім сістэмы адукацыі, займаліся саманавукай. У сферы адукацыі яны падтрымлівалі антытэалагічныя падыходы кіраўніцтва Віленскага ўніверсітэту.

Паступова патрыятычныя ідэі пачынаюць займаць галоўнае, дамінуючае месца ў іх светапоглядзе, падпарадкоўваюць сабе маральныя і навуковыя. Палітычныя ідэі з'яўляюцца ў філаматаў у 1819 г. і з гэтага часу пастаянна фігурыруюць у іх перапісцы і творчасці. На другім этапе філаматы пашыраюць свой духоўны ўплыў на блізкія ім па духу тайныя таварыствы. Пад ідэйным уплывам філаматаў знаходзіліся «праменістыя» (ад слова «прамень») і «філарэты», якія дзейнічалі ў Віленскім універсітэце, а таксама тайныя таварыствы ў Свіслацкай гімназіі і Полацкім піярскім вучылішчы. Арганізацыя пачынае мець розныя ўзроўні канспірацыі. Найбольш буйнай часткай былі філарэты, якія працягвалі традыцыі самаадукацыі, служылі сродкам прыцягнення новых сяброў. Уласна філаматы сталі найбольш заканспіраванай часткай арганізацыі, яны абмяркоўвалі палітычныя праблемы грамадства, строілі планы іх вырашэння.

На думку даследчыкаў, у аснову грамадска-палітычных поглядаў філаматаў былі пакладзены два прынцыпы: любоў да свабоды і чалавечай асобы. «Першапачаткова свабода з'яўлялася для іх катэгорыяй неакрэсленай, няпэўнай, невыразнай, уключаючай у сябе ўсю гаму чалавечых пачуццяў, імкненняў, перажыванняў. Свабода філаматаў - гэта перш за ўсё магчымасць безгранічнага ўдасканалення асобы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і, у першую чаргу, у галіне маралі і навукі, гэта магчымасць гарманічнага развіцця асобы ў напрамку да «прамяністасці». Аднак паступова свабода ў філаматаў набывае ўсё больш рэальныя, больш канкрэтныя, больш выразныя формы. Свабода супрацьпастаўляецца ўсякім сацыяльным перашкодам, нормам і правілам, якія прымушаюць асобу да залежнасці і падпарадкавання. У іх разуменні свабода пачынае спалучацца з нянавісцю да дэспатызму і тыраніі, з ідэяй барацьбы супраць гвалту, сацыяльнага прыгнёту, рэлігійнай нецярпімасці. Ідэалам філаматаў становіцца асоба свабодная, моцная, рашучая, якая змагаецца з існуючым сацыяльна-палітычным злом і гіне ў гэтым супрацьстаянні» [6, с. 193-194].

Сацыяльна-палітычныя погляды філаматаў развіваліся ў рэчышчы шляхецкай рэвалюцыйнасці. Яны ставіла сваёй мэтай ліквідацыю феадальна-прыгонніцкіх адносін, вызваленне сялян ад прыгнёту памешчыкаў, звяржэнне самаўладства, увядзенне канстытуцыі, стварэнне ў новым

грамадстве сістэмы народнай адукацыі, якая павінна папярэднічаць дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця. «Народ трэба прасвятліць да такой ступені,- пісаў філамат К.Пясэцкі,- каб ён зразумеў перавагі канстытуцыйнага кіравання і шкоднасць дэспатызму» [6, с. 194].

Асноўным сродкам звяржэння сацыяльна-палітычнага прыгнёту бацькаўшчыны, адраджэння Рэчы Паспалітай філаматы бачылі збройнае паўстанне. Пры гэтым, яны не ўяўлялі дэталяў палітычнага перавароту, не мелі яго дакладнага плану.

Па сваёй свядомасці філаматы з’яўляліся ліцвінамі, патрыётамі ВКЛ, менавіта таму мясцовы, беларускі матэрыял знайшоў шырокае адлюстраванне ў літаратурнай творчасці філаматаў (вершах, баладах, каментарыях да іх і г.д.). У рэчышчы рамантычнага светапогляду, яго захаплення гісторыяй і культурай народа, яны ажыццявілі паглыбленае вывучэння дзяржаўнага і палітычнага ладу Вялікага княства Літоўскага, яго гістарычных, культурных, палітычных і дэмакратычных традыцый. Менавіта філаматы першыя пачалі даследаваць беларускі фальклор, вераванні і звычаі беларусаў, беларускую мову. Для характарыстыкі падобных поглядаў вядомы польскі гісторык М.Хандэльсман (1882-1945 гг.) увёў тэрмін «палітычны рамантызм», які трэба прызнаць удалым [6, с. 194].

У 1823-1824 гг. самадзяржаўе выкрыла і ліквідавала тайныя студэнцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў, а таксама звязаныя з імі вучнёўскія арганізацыі. Быў пазбаўлены пасад шэраг маладых і таленавітых прафесараў: Бароўскі, Галухоўскі, Даніловіч, Лялевель. Наступленне рэакцыі на Віленскі ўніверсітэт значна абядніла духоўнае жыццё Беларусі. Пасля паўстання 1830-31 гадоў, у 1832 г. расійскія ўлады зачынілі Віленскі ўніверсітэт.

## ***2. Палітыка-прававая думка ў другой трэці XIX ст. (1831-1856 гг.)***

### 2.1. Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі ў другой трэці XIX ст.

Да паўстання 1830 - 1831 гг. на тэрыторыі існавала разгалінаваная сетка навучальных устаноў, распаўсюджваліся ліберальныя ідэі. Аднак адукацыя і культура знаходзіліся пад моцным уплывам польскай культуры. Мовай навучання, літаратуры, навуковых прац была польская. Прадстаўнікі ліберальных гурткоў хоць і ўказвалі на самабытнасць Літвы, вывучалі яе гісторыю, права, збіралі беларуска-літоўскі фальклор, аднак лічылі народ, які пражываў у былым ВКЛ адгалінаваннем польскага народа. Вучням у Віленскай навучальнай акрузе мэтанакіравана прышчаплялася польская ідэнтычнасць. У параўнанні з «плебейскай» беларускай культурай, якая апісвалася як культура мужыцкая, простая, польская культура апісвалася як крыніца асветы і свабоды для занядбанага краю [4, с. 115]. Да паўстання 1830 - 1831 гг. царскія ўлады не супрацьстаялі прэтэнзіям палякаў на беларускія землі пры ўмове знешняй падтрымкі імперскага парадку.

Пасля падаўлення паўстання 1830 - 1831 гг. царызм зразумеў усю

небяспеку польскага ўплыву і пачаў адкрыта праводзіць на беларускіх і літоўскіх землях адваротную русіфікатарскую палітыку, мэтай якой было нівеліраванне розніцы, існаваўшай паміж рускімі і беларускімі губернямі, падаўленне нацыянальна-вызваленчага руху і цесна звязанай з ім перадавой грамадска-палітычнай думкі.

Для распрацоўкі і правядзення вялікадзяржаўнай палітыкі ў Беларусі і Літве Мікалай I (1825-1855 гг.) стварыў у Пецярбурзе «Асобны камітэт па заходніх губернях», які распрацоўваў і праводзіў у жыццё меры, накіраваныя на ліквідацыю існаваўшай розніцы паміж рускімі і беларускімі губернямі ў галіне веравызнання, судаводства, судовага ладу, адукацыі і г.д., імкнучыся дасягнуць іх поўнага зліцця з Расіяй.

Погляды на беларускі народ, беларускую культуру, мову былі фактычна перанесены з польскага дыскурсу. Як і польскія ідэолагі, іх расейскія апаненты адмаўлялі беларусам у праве на стварэнне высокай культуры і пабудову мадэрнай нацыі [4, с. 122-123]. Цяпер беларускі народ сталі ўспрымаць як «значную частку народа расейскага», які патрабуе ўмацавання ад «згубных польскага і жыдоўскага ўплываў» [4, с. 123].

Русіфікацыя пачалася са знішчэння прапольскай сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі, якая склалася ў Беларусі і Літве ў канцы XVIII-пачатку XIXст. У 1832 г. быў зачынены царызмам Віленскі ўніверсітэт. На базе двух факультэтаў універсітэта - медыцынскага і тэалагічнага - былі створаны дзве Акадэміі: Віленская медыка-хірургічная Акадэмія і Віленская рымска-каталіцкая духоўная Акадэмія. Яны праіснавалі на працягу дзесяці гадоў, а потым у 1842 г. Віленская медыка-хірургічная Акадэмія была пераведзена ў Кіеў, а Віленская рымска-каталіцкая духоўная Акадэмія - у Пецярбург. Такім чынам, з 40-х гадоў XIX ст. Беларусь і Літва на доўгі час былі пазбаўлены вышэйшых навучальных устаноў, што адмоўна адбівалася на духоўным жыцці грамадства, узроўні палітычнай і прававой думкі.

Наступным крокам па знішчэнню адметнасці краю была адмена ў 1839 г. Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. і далучэнне ўніяцкай царквы Беларусі да Расійскай праваслаўнай царквы. У выніку гэтага акту каля двух мільёнаў беларусаў-уніятаў зрабіліся праваслаўнымі.

На працягу 30-гадоў XIX ст. была скасавана таксама дзейнасць Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г., уведзена ў Беларусі агульнарасійскае заканадаўства. З 1832 г. дзейнасць Статута была скасавана на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў, а ў 1840 г. - на тэрыторыі Віленскай, Гарадзенскай і Мінскай.

Указам ад 18 чэрвеня 1840 г. Мікалай I забараніў выкарыстоўваць у афіцыйных дакументах назвы «Беларусь» і «Літва», «беларускія губерні» і «літоўскія губерні». Замест іх уводзілася назва «Северо-Западный край».

У выніку палітыкі расійскіх уладаў на Літве і Беларусі быў фактычна вынішчаны легальны палітычны супраціў самадзяржаўю. Ліберальныя гурткі былі зачынены. Палітычная думка заставалася толькі кансерватыўная – праўрадавая, або рэвалюцыйная – падпольная.

## 2.2. Кансерватызм 30-50-х гг. (Г.Ржавускі, І.Галавінскі, К.Буйніцкі)

Пасля паражэння паўстання 1830 - 1831 гг. у грамадскай свядомасці дамінавалі кансерватыўныя ідэі. Кансерватызм гэтага часу быў прадстаўлены перш за ўсё «Пецярбургскім гуртком», які жартам называлі «Пентархіяй» (слова грэчаскае, у перакладзе азначае «улада пяці»), таму што яго духоўнае жыццё вызначалі пяць вядомых у той час пісьменнікаў, публіцыстаў, мысліцеляў, ураджэнцаў беларускіх і ўкраінскіх зямель - Г.Ржавускі, І.Пржацлаўскі, І.Галавінскі, І.Шцірмер і М.Грабоўскі. Друкаваным органам кансерватараў стаў «Пецярбургскі штотыднёвік» (1830-1856 гг.), выдаўцом і рэдактарам якога быў выпускнік Віленскага ўніверсітэта, ураджэнец Слонімшчыны, вядомы ў свой час пісьменнік, мысліцель і публіцыст Іосіф Пржацлаўскі (1799-1879 гг.). Сябры гуртку прапагандавалі згодніцкую палітыку ў адносінах да царызму, спадзяваліся на адсутнасць культурных зменаў на тэрыторыі Беларусі пры захаванні феадальна-прыгонніцкіх адносін і самадзяржаўя.

**Г.Ржавускі.** Адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў кансерватыўнай думкі 30-50-х гг. XIX ст. у Беларусі, Літве і Польшчы быў Генрых Ржавускі (1791-1866 гг.). Г.Ржавускі быў паслядоўнікам вядомых прадстаўнікоў заходнееўрапейскага традыцыяналізму Луі дэ Банальда (1754-1840 гг.) і Жазэфа дэ Мэстра (1753-1821). У сваіх творах «Успаміны Севярыны Сапліцы» (1839 г.), «Мешаніна традыцый» (1841 г.), «Маральныя і палітычныя эсэ» (1847 г.), «Інтэлектуальныя падарожжы» (1851 г.) ён выступіў у абарону феадальна-прыгонніцкіх адносін, якія ён лічыў часткай традыцыйных формаў існавання грамадства. Г.Ржавускі выступаў супраць ўсялякіх зменаў ва ўсталяваных сацыяльных адносінах і інстытутах.

Г.Ржавускі бачыў цесную сувязь еўрапейскага нацыянальна-вызваленчага руху з антыфеадальнымі і антыпрыгонніцкімі ідэямі. Саюзнікам у барацьбе з рэвалюцыяй ён бачыў у расійскім самадзяржаўі. Ён лічыў, што захаванне прыгонніцтва на беларускіх, літоўскіх і польскіх землях магчыма толькі ў тым выпадку, калі гэтыя землі будуць заставацца інтэгральнай часткай Расійскай імперыі. Як прыхільнік абсалютызму ён лічыў, што толькі самадзяржаўе можа забяспечыць нармальнае традыцыйнае развіццё гэтых зямель. «Дзякуючы волі Бога сталі мы часткай Расійскай дзяржавы і, як частка славянскага племя, аб'яднаныя пад скіпетрам цара, можам развівацца і ўносіць уклад у агульную скарбніцу»,- пісаў Г.Ржавускі [6, с. 200].

**І.Галавінскі.** У адрозненні ад шляхецка-магнацкага кансерватызму Г.Ржавускага, І.Пржацлаўскага рэктар Пецярбургскай рымска-каталіцкай духоўнай Акадэміі і адначасова магілёўскі арцыбіскуп Ігнат Галавінскі (1807-1885 гг.) з'яўляўся прадстаўніком клерыкальных кансерватыўных ідэй. Ён разглядаў веру як неабходную, інтэгральную частку народнай традыцыі і разам з тым як важную апору захавання феадальна-прыгонніцкіх адносін. Падобныя ж ідэі выкладаў у сваёй працы «Хрысціянская філасофія жыцця ў параўнанні з пантэістычнай філасофіяй нашага часу» (1853 г.) былы выкладчык лацінскай мовы Свіслацкай гімназіі, а потым прафесар спачатку ў

Кіеўскім, а потым Маскоўскім універсітэце Максімільян Якубовіч (1785-1853 гг.) [6, с. 200].

**К.Буйніцкі.** Непасрэдным праваднікам ідэй кансерватызму ў Беларусі і Літве з'яўлялася віленскі часопіс «Рубон» (1842-1849 гг.). Выдаўцом і радактарам часопісу быў гісторык, пісьменнік і публіцыст Казімір Буйніцкі (1788-1878 гг.). На старонках гэтага друкаванага органа праводзіліся славянафільскія і панславісцкія ідэі, крытыкаваліся ліберальны і рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамкі грамадскай думкі» [5, 153; 6, с. 200].

## 2.3. Развіццё рэвалюцыйна-дэмакратычнай думкі на Беларусі ў другой трэці XIX ст.

Пасля паразы паўстання 1830-1831 гг., наступлення рэакцыі грамадства было пазбаўлена надзеі на вырашэнне эканамічных і палітычных праблем у рамках закона шляхам рэформ дзяржаўнага і грамадскага ладу. На змену легальным ліберальным гурткам прыйшлі падпольныя рэвалюцыйна-дэмакратычныя арганізацыі, якія прапанавалі значна больш радыкальныя палітычныя ідэалы для грамадства.

Розніца паміж імі і лібераламі палягала ў адносінах да дэмакратыі (як формы дзяржаўнага ладу). Памяркоўныя лібералы бачылі ў дэмакратыі спосаб вырашэння сацыяльных канфліктаў пры ўдзеле ўсіх грамадзян і дасягненні кампрамісу. Вось чаму для некаторых з іх прымальнымі былі і канстытуцыйная манархія, і дэмакратычная рэспубліка, а важнай задачай з'яўлялася захаванне свабоды індывіда ці меншасці пры дэмакратыі. Рэвалюцыйныя дэмакраты (і гэта яднала іх з сацыялістамі) быў уласцівы свайго роду арганізацыйны фетышызм: удзел усяго народа ў кіраванні дзяржавай здаваўся ім самадастатковым. Пры гэтым дэмакратызм ператвараўся ў «дэмакратычны абсалютызм» [12]. Радыкалы заяўлялі, што гавораць ад імя народа (народных мас) і дзейнічаюць у яго інтарэсах супраць кіруючай эліты, якая карыстаецца народным багаццем. З пункту гледжання радыкалаў стварэнне справядлівага і свабоднага грамадства патрабавала знішчэння існуючага парадку. Вось чаму прыхільнікі радыкалізму ў Беларусі адрозніваліся ад памяркоўных лібералаў не столькі ўяўленнямі аб прынцыпах пабудовы справядлівага грамадства, колькі антыпамешчыцкай накіраванасцю і спробамі знайсці падтрымку ў сялян і рамеснікаў.

**М.Валовіч.** Адным з першых гэтую ідэю выказаў Міхаіл Валовіч (1806 – 1833 гг.) - роданачальнік рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку ў нацыянальнай палітычнай думцы. У палітычным развіцці М.Валовіча вылучаюцца два перыяды. Першы, калі яго светапогляд развіваўся ў рэчышчы шляхецкай рэвалюцыйнасці, ахоплівае гады навучання ў Віленскім універсітэце і працягваецца да ўдзелу ў паўстанні 1830-1831 гг. Другі, калі М.Валовіч паступова пераходзіць на пазіцыі рэвалюцыйнага дэмакратызму і ўтапічнага сацыялізму, пачынаецца ад 1831 г. і працягваецца да канца дзён рэвалюцыянера (1833 г.).

Змена поглядаў адбылася падчас эміграцыі, калі пасля паражэння

паўстання М.Валовіч апынуўся ў Францыі. Там, ён далучыўся да эмігранцкіх палітычных арганізацый левага кірунку - «Нацыянальнага польскага камітэту», «Таварыства Літоўскіх і Рускіх зямель». У 1833 годзе ён уступіў у тайную агульнаеўрапейскую арганізацыю карбанарыяў. Галоўную прычыну паражэння паўстання рэвалюцыйныя дэмакраты бачылі ў тым, што рух 1830-1831 гг. меў вузкую сацыяльную базу, у той час калі галоўнай сілай у вызваленчым руху павінен быў выступіць народ, і перш за ўсё сялянства.

Грамадска-палітычныя погляды М.Валовіча гэтага перыяду характарызуюцца сацыяльным радыкалізмам і дэмакратызмам. Разглядаючы буйную зямельную ўласнасць як галоўную прычыну галечы і прыгнёту сялянскіх мае, ён выступіў за знішчэнне памешчыцкага землеўладання, за вызваленне сялян, надзяленне іх зямлёй без усялякіх выкупаў. Грамадская ўласнасць на зямлю, на думку М.Валовіча, з’яўляецца неабходным варункам свабоды і роўнасці праў усіх людзей. Будучы дзяржаўны лад Беларусі і Літвы - дэмакратычная рэспубліка, якая знаходзіцца ў федэратыўных сувязях з дэмакратычнай Польшчай. Пераход да дэмакратычнага і справядлівага сацыяльнага ладу ажыццяўляецца шляхам дэмакратычнай рэвалюцыі. Апошняя зліваецца з агульнаеўрапейскай, а таксама з сялянскай рэвалюцыяй у Расіі [6, с. 201].

Асноўным формай новага паўстання эмігранты бачылі партызанскі рух народа. Для яго арганізацыі яны накіроўвалі на Беларусь эмісараў. У сакавіку 1838 г. М.Валовіч нелегальна прыбыў на Беларусь, стварыў ім у ваколіцах Слоніма невялікі паўстанцкі атрад, аднак шырокага распаўсюду партызанскія дзеянні не атрымалі. У маі 1838 г. М.Валовіч быў арыштаваны і па прысуду ваенна-палявога суда павешаны ў Гародні.

**Ф.А.Савіч.** Адрадзіць дзейнасць разгромленых студэнцкіх арганізацый «філаматаў» і «філарэтаў» ставілі сабе за мэту сябры створанага ў 1836 г. у асяроддзі віленскіх студэнтаў «Дэмакратычнага таварыства». На чале арганізацыі быў сын ўніяцкага святара з Піншчыны Франц Андрэевіч Савіч (1815-1861 гг.). Дзейнасць таварыства адразу ж прыняла рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак.

Таварыства складалася з студэнтаў Акадэміі, выхадцаў з разначыннага асяроддзя і дробнай шляхты. Погляды членаў тайнага рэвалюцыйнага таварыства фарміраваліся пад уплывам дэмакратычнай літаратуры і ідэй утапічнага сацыялізму. Члены гуртка Ф.Савіча Рапчынскі, Загорскі і Грыцыкевіч імкнуліся пазнаёміцца з рамеснікамі і «заснаваць паміж імі ў дэмакратычным духу таварыства» [12]. «Але пры цесных зносінах з людзьмі, тымі самымі «народнымі масамі», адразу станавілася зразумелым, што толькі адзінкі згодны са знішчэннем існуючага ладу, большасць жа хацела толькі задавальнення пэўных патрэб, г. зн. частковай рэформы, якая не закранала б цэлага» [12].

Не атрымаўшы жаданай прыхільнасці народа сябры арганізацый радыкалізаваліся. Так, Ф. Савіч лічыў, што ўсіх памешчыкаў «трэба павесіць, усіх выразаць» [12]. Ён напісаў статут арганізацыі пад назвай «Прынцыпы дэмакратызму».

Статут абгрунтоўваў неабходнасць барацьбы супраць прыгонніцтва і самадзяржаў'я - ладу, які абараняе няроўнасць і эксплуатацыю чалавека чалавекам, абвяшчаў права кожнага народа на нацыянальную самастойнасць, на самавызначэнне, адстойваў ідэю рэвалюцыйнага саюзу прыгнечаных народаў у барацьбе з царызмам. У вершы, напісаным на беларускай мове, Ф. Савіч заклікаў народы:

*Ліцвін, валынец, падайце ж мне рукі,*
*Так-прысягаем на госпада-Бога,*
*Царам - на згубу, панам-для навукі,*
*Што на той зямлі не паўстане і нога-*
*Ані гэта паганска, ані гэта тыранска,*
*Хоць укараніцца, як сіла шатанска!*[ 6, с. 202].

Найлепшай формай дзяржаўнага ладу абвяшчалася рэспубліка. Шляхам рэалізацыі праграмы з'яўлялася дэмакратычная (сялянская) рэвалюцыя.

У 1837 г. «Дэмакратычнае таварыства» устанавіла сувязь з польскім рэвалюцыянерам Шыманам Канарскім (1808-1839 гг.), які ў 1835 г. нелегальна перайшоў дзяржаўную мяжу Расійскай імперыі і на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны стварыў тайную рэвалюцыйную арганізацыю «Садружнасць польскага народа». Яна налічвала каля 3 000 чалавек. «З'яднанне з Канарскім удзесяцярыла нашы сілы», - успамінаў пазней Ф.Савіч [12].

Аднак фактычна ўдзельнікі арганізацыі ( падлеткі і студэнты) чыталі творы А.Міцкевіча і Ш.Канарскага, марылі аб незалежнасці і рыхтаваліся «выступіць, калі пачнецца агульнаеўрапейская рэвалюцыя» [12].

У 1838 г. непадалёку ад Мінска (на паштовай станцыі Крыжоўка) Ш.Канарскі быў арыштаваны. Пачалося следства па яго справе, у ходзе якога частка членаў «Дэмакратычнае таварыства» была арыштавана. Ф.Савіч быў аддадзены ў салдаты і сасланы на Каўказ. Падчас пабегу ён апынуўся ў раёнах, дзе ўспыхнула эпідэмія халеры, аказваў хворым медыцынскую дапамогу, ад чаго захварэў і памёр.

**Ю.Бакшанскі.** Рэвалюцыяна-дэмакратычныя ідэі выказваў публіцыст і актыўны удзельнік вызвольнага руху Юльян Бакшанскі (1824 – 1863 гг.). За ўдзел у тайных студэнцкіх гуртках і хаванне забароненых кніг яго ў 1842 . саслалі ў Разанскую губерню. Пасля вяртання з ссылкі ў 1846 г. ён напісаў «Адозву да сялян» (1847 г.), у якой заклікаў іх аб'яднацца з мяшчанамі і салдатамі і выступіць супраць памешчыкаў. Ю.Бакшанскі выказваў ідэю аб вырашаючай ролі народных мас у жыцці грамадства. Народнае паўстанне ён разглядае як асноўны сродак вырашэння сацыяльных і нацыянальных праблем.

**Браты Аляксандр і Франц Далеўскія.** Як вядома, у 1845-1848 рэвалюцыйным рухам была ахоплена амаль уся Еўропа. Акрамя рэвалюцый у Францыі, Італіі, Германіі, Аўстрыі, Венгрыі адбыліся народныя выступленні ў Познані, Сілезіі, Галіцыі, Букавіне, Малдавіі, Валахіі, Ірландыі, Грэцыі. Гэтыя падзеі, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «вясны народаў», аказалі значны ўплыў на грамадскі рух у Беларусі. Сацыяльны неспакой ахапіў усе

слаі насельніцтва.

З вясны 1848 года, у сувязі з рэвалюцыйнымі падзеямі ў Еўропе, на тэрыторыі заходніх губерняў пачалі сканцэнтроўвацца войскі і за насельніцтвам быў уведзены строгі паліцэйска-адміністратыўны нагляд. Надзвычайныя ўрадавыя меры па абароне парадку , масавыя перамяшчэнні войска, прызывы ў армію, якія непасрэдна кранулі многія сем'і, звесткі аб падзеях у суседніх краінах і адмене там прыгону параджалі сярод сялян чуткі аб невядомай вайне: хутка прыйдуць на Літву французскія войскі, «але не ваяваць, а вешаць памешчыкаў»; 5 дзяржаў ідуць на Расію, каб даць вольнасць сялянам [12].

Віленскі генерал губернатар Ф. Міркавіч даносіў у сакавіку 1848 года ў 3 аддзяленне: «Звесткі аб падзеях, якія адбываюцца ў Еўропе, скажоныя... разносяцца з хуткасцю... і зараз ... сяляне і памешчыкі толькі і заняты разважаннямі аб тым, што робіцца за мяжой. На жаль, ні ў адным класе жыхароў падзеі не зрабілі таго ўражання, якое б адпавядала пачуццю вернападданніцкай вернасці» [12].

Такая сітуацыя разам з актывізацыяй дзейнасці радыкальных эмігранцкіх колаў прывялі да ажыўлення дзейнасці нелегальнай апазіцыі ў Беларусі, дзе ствараюцца шматлікія нелегальныя гурткі. Так, браты Далеўскія стварылі тайную рэвалюцыйную арганізацыю «Брацкі саюз літоўскай моладзі» (1846-1849 гг.). Асноўнай мэтай арганізацыі было вызваленне народа з пад прыгнёту царызму і аднаўленне незалежнай Рэчы Паспалітай шляхам узброенага паўстання. Іх ідэалогія вызначалася спалучэннем нацыянальнага рамантызму і радыкальнага лібералізму, што было вельмі характэрным у той час для еўрапейскіх ліберальных рухаў. Брацкі саюз літоўскай моладзі ставіў сваёй мэтай не толькі адраджэнне Польшчы, але і абвяшчэнне рэспублікі, вызваленне ад прыгоннага права сялян і надзяленне іх зямлёй, роўнасць усіх грамадзян перад законам незалежна ад поглядаў, веравызнання і нацыянальнасці.

Ня гледзячы на актыўную рэвалюцыйную дзейнасць М.Валовіча, Ф.Савіча, Ю.Бакшанскага, братоў Далеўскіх і іншых, якія першымі ва ўмовах рэакцыі і падаўлення вальнадумства пасля паўстання 1830 г. выказалі ідэі рэвалюцыйнага дэмакратызму на беларускай зямлі, даследчыкі прызнаюць іх грамадска-палітычныя погляды незавершанымі і фрагментарнымі [6, с. 204].

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Баршчэўскі, Л.П. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.П.Баршчэўскі, П.В.Васючэнка, М.А.Тычына. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.
2. Берк, Э. Правление, политика и общество / Э. Берк; пер. с англ., сост., вступ.ст. и коммент. Л. Полякова. – М.: КАНОН-пресс-Ц, Кучково поле, 2001. – 480 с.

3. Берк, Э. Размышления о революции во Франции и заседаниях некоторых обществ в Лондоне, относящихся к этому событию / Э. Берк. - М.: "Рудомино", - 1993. - 144 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.conservator.ru/lib/burke/france.shtml. – Дата доступа: 27.10.2005.
4. Булгакаў, В. Гісторыя беларускага нацыяналізму / В.Булгакаў. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – 326 с.
5. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
6. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.
7. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206 с.
8. Грыцкевіч, А. Памятныя запіскі Міхаіла Клеафаса Агінскага Аляксандру І у 1811 годдзе / А.Грцкевіч // Адраджэнне: гіст. альманах. Вып.1. / Склад. і навук. рэд. А.П.Грыцкевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – с.195-199.
9. Запіска графа Агінскага, пададзеная Аляксандру І 15 мая 1811 года // Адраджэнне: гіст. альманах. Вып.1. / Склад. і навук. рэд. А.П.Грыцкевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – с.200-212.
10.Калинин, С.А. О методологии изложения эволюции сущности права / С.А. Калинин // Право и политика. – 2003. - №11. – С. 4-12.
11.Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў // Адраджэнне: гіст. альманах. Вып.1. / Склад. і навук. рэд. А.П.Грыцкевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – с.212-213.
12.Сакалова, М. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / М.Сакалова. - [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://autary.iig.pl/sakalova/art_ruchi_liberalizm.htm. – Дата доступу: 26.09.2007.
13.Царьков, И.И. Историческая школа права Германии XIX века / И.И. Царьков // Право и политика. – 2000. - №1. – С. 126-134.

# ТЭМА 10.
# ПАЛІТЫКА-ПРАВАВАЯ ДУМКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

## 1. Палітыка-прававая думка напярэдадні і падчас студзеньскага паўстання (1856-1864 гг.)

### *1.1. Адраджэнне лібералізму ў канцы 50-х - пачатку 60-х гг. (А.Кіркор, В.Старжынскі)*

Выкрыццё ў 1849 годзе тайных гурткоў, забарона ў 1849- 1851 гадах часопісаў ліберальнага накірунку, жорсткія паліцэйскія рэпрэсіі новага Віленскага генерал-губернатара А.Бібікава на некалькі гадоў увялі грамадства Беларусі ў стан апатыі і нават маральнага крызісу. Зянон Вішнеўскі, адзін з агентаў 3 аддзялення даносіў у 1851 годзе, што ў Літве і Беларусі пануе «зняменне духу і трывога», грамадская думка «блукае, шукаючы ў аддаленай будучыні якіх-небудзь надзей, звязаных з падзеямі за мяжой - у Германіі ці Францыі і дзейнасцю Дэмакратычнага камітэту ў Лондане», аб «самастойнай, асобнай ад еўрапейскіх рухаў, дзейнасці» не думаюць [7].

На пачатку 50-х гадоў XIX ст. На Беларусі фактычна не існавала не легальных, не нелегальных гурткоў, якія б прапаноўвалі змены ў грамадскі ці дзяржаўны лад Расійскай імперыі.

Адраджэнне лібералізму ў Беларусі і Літве пачалося толькі пасля смерці Мікалая I (1855 г.). Яго царавання скончылася паразай у Крымскай вайне (1853-1856) і разуменнем грамадствам ўсёй глыбіні крызісных з’яваў.

Новы цар - Аляксандр II (1855-1881 гг.) змушаны быў правесці шэраг сацыяльных рэформаў, што спрыялі ўзнікненню ліберальнага напрамку ў грамадскай думцы Расіі, што дакладна зафіксаваў у сваіх працах пасол Францыі ў Расіі Марыс Палеалог (1859-1944 гг.): «З моманту уступлення на прастол Аляксандра II, - пісаў ён, - у рускім грамадстве ўзнікла ліберальная партыя ці, прынамсі, шматлікая група людзей дасведчаных, незалежных, прыхільнікаў заходнееўрапейскіх формаў дзяржаўнага жыцця, якія імкнуліся да таго, каб самадзяржаўе саступіла месца больш сучасным прынцыпам дзяржаўнага ладу» [4, с. 206]. Прадстаўнікі лібералізму арыентаваліся на заходнееўрапейскія ідэі канстытуцыяналізму і парламентарызму, абгрунтоўвалі легальныя шляхі пераўтварэння самадзяржаўнай прыгонніцкай Расіі ў канстытуцыйную манархію.

Адначасова з рускім лібералізмам пачала адраджацца і ліберальная думка на Беларусі. У канцы 50-х па ўсёй імперыі пачалося легальнае абмеркаванне розных варыянтаў будучай зямельнай рэформы. Разам з абмеркаваннем сялянскага пытання пачалося адраджэнне легальных форм грамадскага жыцця.

На землях былога Вялікага княства Літоўскага паўстала тры цэнтры інтэлектуальнага жыцця. У Мінску ўзнік гурток В.Дуніна-Марцынкевіча, у

Віцебску – А.Вярыгі-Дарэўскага, у Вільні – гурток А.Кіркара. Усе тры цэнтры займаліся ў асноўным культурна-асветніцкай дзейнасцю. Так, Мінскі і Віцебскі гурткі засяродзіліся на адкрыцці школак і бібліятэк для простага народа, беларускай літаратуры, беларускага тэатру.

У 1855 г. графу Я.Тышкевічу пасля доўгіх клопатаў удалося атрымаць дазвол ад расійскіх улад на стварэнне ў Вільні музея старажытнасцей і адкрыццё пры ім Археалагічнай камісіі, у склад якой увайшлі найбольш вядомыя прадстаўнікі мясцовай ліберальнай інтэлігенцыі: Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы, Адам Кіркор, Міхал Балінскі, Тэадор Нарбут, Юзаф Ігнацы Крашэўскі і іншыя. Гэта была першая значная легальная грамадская арганізацыя, дзейнасць якой дазвалялася расійскімі ўладамі пасля падаўлення паўстання 1830-1831 гг. і закрыцця Віленскага ўніверсітэта [4, с. 206].

**А.Кіркор.** Актыўнейшым дзеячам музея і камісіі стаў вядомы беларускі гісторык, этнограф і публіцыст XIX ст. Адам Кіркор (1819-1886 гг.). У канцы 50-х гг. А.Кіркор пачаў выдаваць у Вільні ліберальны часопіс «Віленскі партфель». Часопіс праводзіў кампанію па кансалідацыі ліберальнага руху, які пачаўся адкрыццём у 1855 г. Віленскай Археалагічнай камісіі.

Паступова вакол газеты «Виленский вестник» (1841-1864), якую рэдагаваў спачатку А.Э.Адынец (1841-1859 гг.), а потым А.Кіркор (1859-1865 гг.), стварыўся першы беларускі літаратурны гурток, удзельнікамі якога былі А.Адынец, У.Сыракомля, В.Каратынскі і іншыя.

Трэба адзначыць, што вышэй згаданыя аўтары яшчэ не ідэнтыфікавалі сябе як беларусаў. Усе яны былі патрыётамі Вялікага княства Літоўскага (гістарычнай Літвы). Пры гэтым яны яскрава разумелі адрозненне беларускага народа ад польскага і расейскага, вывучалі яго гісторыю, фальклор, шмат намаганняў зрабілі для яго асветы. Так, адзін з блізкіх сяброў А.Кіркора Аляксандр Аскерка (1830-1911 гг.) выдаў для навучання дзяцей беларусаў пачатковай грамаце беларускі «Буквар» - «Элементаж» (Лемантар).

Лібералы актыўна ўключыліся ў абмеркаванне зямельнай рэформы, якая рыхтавалася царскім урадам. Падчас прыезду Аляксандра II у верасні 1858 г. у Вільню, у дваранскім губернскім камітэце якой пачалася актыўная падрыхтоўка да правядзення сялянскай рэформы, яны паспрабавалі прыцягнуць увагу цара нацыянальных, культурных і рэлігійных асаблівасцей краю. Яны падарылі цару альбом, у складанні якога прымалі ўдзел найбольш вядомыя прадстаўнікі мясцовай ліберальнай інтэлігенцыі - Адам Кіркор, Эдвард Адынец, Ігнат Ходзька. Распачынаўся альбом беларускім вершам Вінцэся Каратынскага.

Спадзяванні шляхты і мясцовай інтэлігенцыі на атрыманне ад урада мясцовага самакіравання выразіліся ў перададзеным гродзенскім губернскім прадвадзіцелем дваранства графам Віктарам Старжынскім (1826-1882 гг) Аляксандру II праекце нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларускіх і літоўскіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Праект прадугледжваў стварэнне мясцовай адміністрацыі (самакіравання), вяртанне дзейнасці Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г., які быў адменены Мікалаем I у

1832-1840 гг., адкрыццё ў Вільні вышэйшай навучальнай установы - універсітэта - з юрыдычным, эканамічным і медыцынскім факультэтамі, навучанне на роднай мове карэнных нацыянальнасцей (беларускай, польскай, літоўскай) [4, с. 209].

Прадстаўнікі ліберальнага руху паступова прыйшлі да ідэі культурна-нацыянальнай аўтаноміі Беларусі і Літвы ў складзе Расійскай імперыі. Упершыню гэтая ідэя, паводле ўспамінаў Гейштара, у агульнай форме была выказана ў 1860 г. [4, с. 209]. Дамагчыся сваіх ідэалаў яны спадзяваліся з дапамогай рэформ.

Спробы мірнага дасягнення аўтаноміі прыйшліся не да спадобы прадстаўнікам палітычных груповак Царства Польскага і польскіх эмігранцкіх сілаў.

Узмацненне ліберальнага руху ў Беларусі прывяло да таго, што з цягам часу ён пачаў афармляцца ў ліберальную групоўку «белых», якая праіснавала да 1864 г., да паразы паўстання і звязаных з ім рэпрэсій. Паступова яна паднялася да выпрацоўкі культурнай і нават сацыяльна-палітычнай праграмы. Беларускія лібералы выпрацавалі ідэю, што было значным тэарэтычным і палітычным дасягненнем ліберальнай думкі. Паступова яна пачала набываць больш канкрэтны змест. Прадстаўнікі і таго, і другога ўбачылі ў выступленні «ліцвінаў» нацыянальную здраду. Характэрна, што адна з надрукаваных у Парыжы польскіх работ, накіраваная супраць аўтараў віленскага альбома, насіла зневажальны, абразлівы загаловак - «Адступнікі» [4, с. 208].

Лібералы Беларусі і Літвы разышліся ў поглядах і з прадстаўнікамі рэвалюцыйна-дэмакратычнай думкі, якія былі нацэлены на паўстанне як сродак дасягнення незалежнасці і свабодаў. Апошнія атрымалі назву «чырвоных», а лібералы склалі «белае» крыло апазіцыйнага царскаму ўраду руху.

### *1.2. Ідэалогія рэвалюцыйных дэмакратаў*

**І.Агрызка.** Больш радыкальны праект пераўтварэння грамадства, заснаваны на ажыццяўленні дэмакратычнай рэвалюцыі, прапанавала палітычная групоўка - «чырвоных». «Чырвоныя» працягвалі традыцыі рэвалюцыйных дэмакратаў, аднак некаторая з іх пачалі выкарыстоўваць пры гэтым шэраг сацыялістычных ідэй.

Адначасова з падрыхтоўкай да паўстання рэвалюцыйныя дэмакраты спрабавалі выкарыстаць ліберальнае зацішша 50-х гадоў XIX ст. для прапаганды сваіх поглядаў. Так, пры дапамозе вядомага рускага лібералa Кавеліна ў 1858-1859 гадах у Пецярбурзе рэвалюцыйнымі дэмакратамі І.Агрызкам і Э.Жэлігоўскім выдавалася газета «Слова».

Іасафат Пятровіч Агрызка нарадзіўся ў 1826 г. у Лепельскім павеце Віцебскай губерні ў небагатай шляхецкай сям’і. Скончыў Мінскую губернскую гімназію (1844 г.) і юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта (1849 г.) са ступенню кандыдата права. У маладосці ён разам з

Зыгмунтам Серакоўскім і іншымі ўваходзіў у склад студэнцкага рэвалюцыйнага гуртка. Гурток быў разгромлены ўладамі, аднак некаторым яго членам, у тым ліку і Агрызку, удалося пазбегнуць пакарання.

У 1858 г. І.Агрызка набыў друкарню і дабіўся ад урада дазволу на выданне ў Пецярбургу штодзённай газеты «Слова». Першы нумар «Слова» выйшаў у Пецярбургу 2 студзеня 1859 г. Галоўнымі тэмамі публікацый газеты былі сялянскае пытанне, асвета і міжнародная палітыка. Рэдакцыя газеты падзяляла найбольш радыкальныя праекты зямельнай рэформы. Аналіз матэрыялаў, апублікаваных у газеце, дазваляе зрабіць вывад, што яна паслядоўна выступала за вызваленне сялян і надзяленне іх зямлёй [4, с. 210].

На старонках «Слова» пастаянна абмяркоўвалася праблема асветы народа. У шэрагу артыкулаў яна разглядалася як неад’емная частка сялянскага пытання ў цэлым. «Асвета сялян пасля забеспячэння іх асабістай свабодай і ўласнасцю, павінна стаць галоўнай мэтай клопатаў урада», - адзначала газета [4, с. 210].

Шмат увагі рэдакцыя газеты прысвячала асвятленню ўнутрыпалітычнага жыцця заходнееўрапейскіх краін. З сімпатыяй асвятляючы грамадскі і дзяржаўны лад, палітычныя падзеі у дэмакратычных краінах, у прыватнасці ў Англіі, журналісты прапагандавалі сярод сваіх чытачоў ідэі дэмакратыі, падзелу ўладаў, абароны палітычных правоў чалавека.

21 лютага 1859 г. на другім месяцы выдання газета была забаронена, а выдавец газеты І.Агрызка быў арыштаваны і пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Адседзеўшы месяц у крэпасці, Агрызка (у абарону якога выступіў І.Тургенеў, а таксама іншыя знаныя людзі таго часу) выйшаў на волю, аднак аднавіць выданне «Слова» ўжо не ўдалося.

На волі І.П.Агрызка працягваў сваю выдавецкую дзейнасць. У сваёй друкарні ён наладзіў выпуск літаратуры, цесна звязанай з гісторыяй і культурай Беларусі. У яго друкарні былі надрукаваны больш 100 кніг. Так, І.Агрызка выдаў манументальны 8-томны збор законаў былой Рэчы Паспалітай – Volumina legum, рыхтаваў да друку крытычнае выданне Статута Вялікага Княства Літоўскага.

У 1862 г. у друкарні І.Агрызкі быў надрукаваны першы збор твораў рускага рэвалюцыянера дэмакрата М.А.Дабралюбава ў чатырох тамах, які рыхтаваў да друку і рэдагаваў М.Г.Чарнышэўскі.

14 лістапада 1864 года І.Агрызку арыштавалі. Як аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў паўстання 1863 г. у Беларусі, Літве і Польшчы, яго прысудзілі да пакарання смерцю, якое было заменена дваццаццю гадамі катаргі. Памёр І.Агрызка ў Іркуцку ў 1890 г.

### *1.3. Палітычныя і прававыя погляды Кастуся Каліноўскага*

Эканамічная, тэхнічная і вайсковая адсталасць краіны, неабходнасць пераходу да капіталістычных адносін прымусіла царскі ўрад пайсці на шэраг рэформаў грамадскага ладу і дзяржаўнага кіравання. Самай важкай і доўгачаканай была зямельная рэформа - адмена прыгоннага права ў 1861 г. У

адпаведнасці з рэформай сяляне аб'яўляліся асабіста свабоднымі, але ўся зямля, як і раней, заставалася ва ўласнасці памешчыкаў. Сялянам былі выдзелены невялікія надзелы, за якія яны павінны былі заплаціць выкуп. Да гэтага часу яны заставаліся часоваабавязанымі, павінны былі адбываць паншчыну ці плаціць аброк (чынш). Сума выкупу ў шмат разоў перавышала кошт зямлі, таму фактычна сяляне аплачвалі сваё вызваленне.

Цяжкія ўмовы вызвалення выклікалі хвалю сялянскіх хваляванняў.

У гэты час успыхнула паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі 1863-64 гадоў. Кіруючыя колы паўстання зыходзілі з ранейшай рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі. Галоўнай мэтай паўстання яны лічылі аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 году, асноўную ролю ў дасягненні гэтай мэты адводзілі шляхце. Сяляне павінны былі выконваць дапаможную ролю. Памешчыкам яны абяцалі захаванне маёмасці і аплату за кошт дзяржавы земляў, якія адводзіліся для сялянскіх надзелаў. Сяляне павінны былі іх атрымаць бясплатна, іх ураўноўвалі ў правах з астатнімі грамадзянамі.

На пачатку паўстання кіраванне ім наогул захапіла «белае» крыло, якое раней адмаўляла ўсякія рэвалюцыйныя дзеянні. Памяркоўным і «белым» супрацьстаяла крыло «чырвоных», якія ставілі за мэту перадачу ўсёй зямлі сялянам, арыентаваліся на сялянскую рэвалюцыю, на знішчэнне шляхты як класа. Сялянскія хваляванні яны спрабавалі выкарыстаць дзеля перамогі паўстання.

У Літве і Беларусі лідэрам «чырвоных» быў Канстанцін (Кастусь) Сямёнавіч Каліноўскі (1838-1864 гг.). К.Каліноўскі нарадзіўся 2 лютага 1838 г. у вёсцы Мастаўляны Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні ў мнагадзетнай сям'і беззямельнага шляхціца. Адукацыю атрымаў у Свіслацкай гімназіі, а потым на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта. У час вучобы ён прымае актыўны ўдзел ў дзейнасці нелегальных рэвалюцыйных гурткоў Пецярбурга.

Пасля вяртання на радзіму К.Каліноўскі ўдзельнічаў у стварэнні нелегальнай рэвалюцыйнай арганізацыі, а з кастрычніка 1862 г. ён узначальвае кіруючы орган па падрыхтоўцы паўстання на Беларусі і ў Літве - Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). У ім К.Каліноўскі узначальваў левую рэвалюцыйна-дэмакратычную плынь «чырвоных». К.Каліноўскі імкнуўся захаваць самастойнасць у кіраўніцтве паўстаннем на Беларусі і ў Літве.

У 1862 г., разам з В.Урублеўскім і Ф.Ражанскім, К.Каліноўскі заснаваў нелегальную друкарню і наладзіў выпуск першай беларускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты «Мужыцкая праўда», большасць матэрыялаў для якой напісаў сам пад псеўданімам «Ясъка-гаспадар з-пад Вільні» (выйшла сем нумароў). К.Каліноўскі рэдагаваў і 1-ы нумар газеты «Chorangiew swobody» («Сцяг свабоды»), афіцыйнага органа ЛПК.

На пачатку паўстання «белыя» адхілілі К.Каліноўскага ад кіраўніцтва паўстаннем, і ў канцы сакавіка ён быў накіраваны на пасаду камісара Гродзенскага ваяводства. Калі паўстанне пайшло на спад, у чэрвені 1863 г. К.Каліноўскі вярнуўся ў Вільню і ў жніўні стаў на чале паўстання. Са сваіх аднадумцаў К.Каліноўскі аднавіў паўстанцкую адміністрацыю на месцах,

якая збірала падаткі на карысць новай улады, сачыла за правядзеннем ў жыццё рэвалюцыйных інструкцый і распараджэнняў. Існавалі рэвалюцыйныя суды, жандармерыя, узброеныя сілы.

Аднак пералому дасягнуць ён не змог, і ў верасні 1863 года паўстанне была падаўлена. 9 лютага 1864 года К.Каліноўскага арыштавалі, асудзілі да смяротнага пакарання, і 22 сакавіка ён быў павешаны ў цэнтры Вільні.

Аб поглядах К.Каліноўскага мы можам даведацца з сямі нумароў газеты «Мужыцкая праўда», з некалькі лістоў, у тым ліку «Пісьмаў з-пад шыбеніцы», шэрага рэвалюцыйных актаў: інструкцый, прыказаў.

Галоўнай мэтай К.Каліноўскага, як актыўнага ўдзельніка і аднаго з кіраўнікоў паўстання, было прыцягнуць на свой бок просты народ. Дзеля гэтага ў сваёй публіцыстычнай творчасці ён выкрывае ўсе заганы царскай палітыкі ў Беларусі. Кожны нумар «Мужыцкай праўды» прысвечаны аднаму з накірункаў прыгнёту, здзеку з простага народу. А апошні нумар газеты і «Лісты з пад шыбеніцы», у сваю чаргу, з’яўляюцца абагульненнем палітычнай праграмы К.Каліноўскага.

Так, 1 і 3 нумары «Мужыцкай праўды» прысвечаны найбольш важкаму для сялян пытанню – вызваленню ад прыгону. К.Каліноўскі паказвае, што царскі ўрад не дабраахвотна пайшоў на вызваленне сялян, што ён быў да гэтага прымушаны паразай у Крымскай вайне з французамі, банкруцтвам эканомікі, выступленнямі народу. Аднак замест таго, каб даць людзям доўгачаканую вольнасць царскі ўрад іх падмануў «ў маніхвэсце прыказвае мужыкам служыць да часу паншчыну па-старому, а па-новаму заплаціць больш грошай у казну на пісараў, пасрэднікаў да і чорт іх ведае на што» [6].

У 2 нумары К.Каліноўскі спрабуе растлумачыць народу, адкуль узялася паншчына. Ён малюе ідэалістычную, але зразумелую простаму чалавеку гісторыю ўзнікнення шляхецкага саслоўя, якое ўзнікла вымушана, з-за неабходнасці бараніць родны край ад хцівых чужынцаў. «Кароль наш напісаў такое права: «Гэтыя, што не хочуць ісці бараніці сваей зямлі, няхай абрабляюць поле гэтым, што б’юцца за вольнасць і шчасце ўсіх». І гэтак было доўга: адне баранілі краю, усё хадзілі па войнах, а другія то гаралі, то сеялі, то касілі, то жалі. З гэтуль то і ўзялася гэта паншчына» [6]. Калі ж прыйшоў маскоўскі ўрад, то не прадстаўляючы абароны, ён ліхвярскі прымусіў мужыкоў плаціць падаткі, адбываць паншчыну, выстаўляць рэкрутаў на карысць казны.

Чацвёрты нумар утрымлівае развагі над сутнасцю і функцыямі ўраду. Менавіта ў гэтым нумары «Мужыцкай праўды» прагучала знакамітае выслоўе «Не народ для ўраду, а ўрад для народу». К.Каліноўскі тлумачыць мужыкам, што галоўнымі мэтамі ўраду павінна быць знешняя і ўнутраная бяспека народа. Падаткі павінны ісці на найм войска для абароны ад ворагаў, на суды і паліцыю, якія абароняць ад злачынцаў, на школы, якія будуць вучыць кожнага жыць па праўдзе. Ён абвінавачвае маскоўскі ўрад і асабіста цара ў занядбанні гэтых функцый: «учаць у школах, каб ты знаў чытаці па-маскоўску, а то для таго, каб цябе заўсім перарабіці на маскаля. Суды маскоўскія - гэта воўчая яма, гдзе не разбіраюць, чы за табою праўда, чы не, а

скубуць адно як могуць. Бяспечнасці пад маскалём ніякай няма, хто дужшы, той і глуміць; а войска то не для таго трымаюць, каб аберагаці кажнага ад злых людзей і ад глуму, а для таго, каб не пазволіць народаві і застанаць, калі пазнае сваю няволю, калі згледзіцца, што дзяруць з яго над сілы. Ронд маскоўскі, як той ліхі пан, што, пачаўшы ад камісара аж да цівуна, пазваляе кажнаму народ глуміці, каб адно як найбольш грошай у кішэнь яго дасталася. Ронд маскоўскі, дзецюкі, не так робіць, як рабіці трэба, не думае, каб палегчыць народаві, а вымышляе адно спосабы, як абадраці і заўсім людзей зглуміці» [6]. У якасці станоўчага прыкладу К.Каліноўскі спасылаецца на дзеянні тагачасных урадаў Францыі і Англіі, якія многа зрабілі «каб народ (гэтых краін) быў багаты і шчаслівы» [4, с. 218].

Пяты нумар К.Каліноўскі прысвячае вельмі цяжкай для простага чалавека павіннасці – рэкруцкага набору. Ён зноў ідэалізуе парадкі Рэчы Паспалітай, дзе ў войску служыла толькі шляхта, каб на параўнанні паказаць усю несправядлівасць і цяжкасць вайсковага прызыву ў Расійскай імперыі. «За тое, што мы яму 25 лет на войнах служымо без людской стравы і адзежы, мала таго, што не дае шляхетства, но, сабача юха, не дае нават куска зямлі, каб, мог, хаця цяжка гаруючы, дабіціся да спакойнай смерці. Праслужыўшы 25 лет, да і торбу ўзяўшы, ідзі жабраваці!» [6].

Шосты нумар прысвечаны рэлігійнаму пытанню. К.Каліноўскі выступае за аднаўленні ўніяцтва, успамін аб каторым быў яшчэ жывы ў народзе. Ён абвінавачвае царскі ўрад у парушэнні рэлігійных правоў народа дзеля ўмацавання свайго панавання. «Перакупіўшы многа папоў, вялеў нас у сызму запісаці, ён-то плаціў грошы, каб толька перахадзілі на праваслаўе, і, як гэты антыхрыст, адабраў ад нас нашу справядлівую - уніяцкую веру і пагубіў нас перад Богам навекі; а зрабіў гэта для таго, каб мог нас без канца драці» [6].

Апошні, сёмы нумар «Мужыцкай праўды» пабачыў свет ужо ў час паўстання 1863-64 гг. У гэтым нумары К.Каліноўскі падагульняе ўсе крыўды, якія прынёс беларускаму простаму народу царскі ўрад, і прызывае сялян далучыцца да польскага паўстання, распачаць змаганне з расейскімі войскамі.

Палітычныя погляды К.Каліноўскага развіваліся ў рэчышчы рэвалюцыйна-дэмакратычнагу руху, аднак у іх ужо гучаць элементы сацыялістычных ідэяў. У новым грамадстве ён марыў «раздаць усю пазямельную ўласнасць сялянам». Гэтая ідэя ў розных варыянтах шматразова паўтаралася як самім Каліноўскім, так і тымі, хто добра ведаў яго погляды. К.Каліноўскі так маляваў ідэал сялянскай роўнасці і свабоды: «Чалавек вольны, гэта калі мае кусок сваёй зямлі, за каторую ані чыншу і аброку не плаціць, ані паншчыны не служыць, - калі плаціць малыя падаткі і то не на царскія стайні, псярні, а на патрэбу цэлага народа...» [6]. Рэвалюцыянер марыў стварыць у Беларусі і Літве грамадства «з усеагульным ураўноўваннем правоў і станаў» [6].

Інакш кажучы, К.Каліноўскі выступаў за рашучую адмену ў будучым грамадстве не толькі класавых, але і нацыянальных, рэлігійных і іншых прывілеяў і абмежаванняў з тым, каб зрабіць галоўным крытэрыем ацэнкі

каштоўнасці кожнай чалавечай асобы сумленнае выкананне сваіх абавязкаў, ацэньваць чалавека па яго рэальных справах і якасцях [4, с. 219].

Ажыццяўленне ўсіх сваіх сацыяльных праектаў і планаў К.Каліноўскі звязваў з сялянскай рэвалюцыяй. Ён быў упэўнены, што толькі народная рэвалюцыя здольная прынесці беларусам жаданую палітычную і сацыяльную свабоду. Яго погляды фактычна можна назваць самымі радыкальнымі, непрымірымымі, антысамадзяржаўнымі і антыпамешчыцкімі сярод усіх кіраўнікоў паўстання 1863-64 гг. На думку У.Казьбярука больш радыкальнымі за К.Каліноўскага былі толькі бальшавікі XX ст. [5, с. 11]. Барацьба за вольнасць, на яго думку, павінна была быць бескампраміснай: «не дажыдайся, да з чым можаш ідзі ваяваці за свайго Бога, за сваё права, за сваю хвалу, за сваю бацькаўшчызну. Для цябе ўсё можна: нож, сякера, атрута; гэта твае способы...» [6]. Бескампраміснасць К.Каліноўскага выразілася і ў жорсткіх «якабінскіх» метадаў ажыццяўлення паўстання: «такіх, што за грошы не пабаялісь служыць ворагам нашым, што не хацелі мужыкам зямлі да праўды на свеце да спрэчны былі новай вольнасці да новаму польскаму маніхвэсту, гэтакіх вешаюць, як подлых сабак, селішча іх апусцелі, пайшлі з дымам іх хаты, прапала марна худоба» [6].

Па сведчанню ўдзельніка падаўлення паўстання генерал-маёра В.Ф. Ратча, менавіта К.Каліноўскі першым у Літоўскім правінцыйным камітэце выразна акрэсліў нацыянальнае пытанне [3, с. 166]. Ён не быў беларускім патрыётам, бо беларуская нацыя ў тыя часы яшчэ не сфармавалася. Яго пазіцыю можна акрэсліць як «краёвы» ліцвінскі патрыятызм. Змагаючыся за адраджэнне Рэчы Паспалітай (Польшчы, Польскага Ронду), ён выступаў супраць «зліцця з Польшчаю» і настойваў на тым, каб ужо на пачатковым этапе паўстання адносіны паміж Беларуссю, Літвой і Польшчай будаваліся на аснове раўнапраўя і суверэннасці [3, с. 166]. Разам з тым ён падзяляў ідэю М.Бакуніна і А.Герцэна аб стварэнні ў будучым федэрацыі свабодных славянскіх народаў, пасля таго, як яны заваююць дзяржаўную незалежнасць.

Пасля паразы паўстання ён завяшчаў свайму народу працягваць барацьбу за вольнасць: «Народзе, як толька калі пачуеш, што браты твае з-пад Варшавы б'юцца за праўду й свабоду, тагды і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, за касу, сакеру, цэлай грамадой ідзі ваяваці за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную»[6].

## 2. Палітычная і прававая думка у канцы XIX ст.

### *2.1. Кансерватыўная палітычная думка канца XIX ст.*

Пасля падаўлення паўстання 1863-64 гадоў на беларускіх землях дамінуючай стала падтрыманая і падтрымліваючая ўладу кансерватыўная палітычная думка. Менавіта ў другой палове XIX ст. складваецца і набірае моц ідэалагічная плынь, атрымаўшая назву «заходнерусізму».

Свой пачатак «заходнерусізм» бярэ ў жаданні расейскіх уладаў спыніць паланізатарскую культурную дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Яшчэ напярэдадні паўстання славянафілы ставілі пытанне вызначэння «сапраўдных» межаў Польшчы, вызвалення ад польскага ўплыву «малых народнасцей» [2, с. 139]. Падчас паўстання расейскія газеты «День», «Современная летопись», «Русский инвалид», «Русский вестник» распачалі кампанію па абгрунтаванні расійскай экспансіі «кроўным сваяцтвам» паміж беларусамі і рускімі, метафарай адзінага расейскага народа. «Наша грамадства наўрад ці і прыпамінала да цяперашніх падзеяў, што за Кіевам і Смаленскам жывуць яшчэ мільёны расейцаў, але жывуць у галечы матэрыяльнай і духоўнай, прыгнечаныя і маральна прыніжаныя варожым элементам, кінутыя без кіраўніцтва і падтрымкі роднымі братамі», - пісаў славянафіл Ф.Еленев [2, с. 143].

Пасля падаўлення паўстання на Беларусі склаліся дзве плыні заходнерусізму. Вялікадзяржаўны-шавіністычны напрамак прадстаўляў рэдактар газеты «Вестник Западной России» К.Гаворскі, а ліберальна-памяркоўны заходнерусізм склаўся дзякуючы ідэям гісторыка і публіцыста М.Каяловіча.

Група К.Гаворскага поўнасцю адмаўляла беларускаму народу ў існаванні, а яго этнічныя асаблівасці лічыла вынікам польска-каталіцкай экспансіі, які неабходна неадкладна знішчыць для аднаўлення «сапраўдна рускага характару краю» [3, с. 154]. Сродкам русіфікацыі беларусаў павінны былі стаць рускія народныя школы і праваслаўная царква.

Адначасова з шавіністычнай пазіцыяй у дачыненні да беларускага народа група К.Гаворскага адстойвала сацыяльна-палітычныя парадкі Расійскай імперыі ў духу «Самадзяржаўе. Праваслаўе. Народнасць». Толькі самадзяржаўе на іх думку найбольш адпавядае рускаму народу, выступае яго абаронай. Улада цара носіць надкласавы характар, а рускі народ не знае класавых супярэчнасцей і барацьбы. Яна дазволіць рускаму народу пайсці па некапіталістычнаму шляху развіцця, абароніць правы рабочых.

Народніцкі рух, які прызывае да рэвалюцыя, яны параўноўвалі са «зграяй вар’ятаў, якія страцілі ўсякую любоў да сваёй Айчыны, недавучаных летуценнікаў, лайдакоў» [3, с. 154].

Ліберальна-памяркоўная плынь склалася ў першую чаргу вакол творчасці М.Каяловіча. Яго погляды сістэматызаваны ў працах «Лекцыі па гісторыі Заходняй Русі», «Гісторыя рускай самасвядомасці» і інш. М.Каяловіч прызнаваў існаванне беларускага народа, даволі грунтоўна вывучаў яго гісторыю. Аднак ён лічыў беларускі народ хутчэй аб’ектам, а не суб’ектам гісторыі: «У нас, у Беларусі, … на гістарычную сцэну выходзіць народ, які на працягу доўгага часу здольны быў процістаўляць напору чужых яму стыхій толькі пасіўную сілу, - народ бедны, прыгнечаны, загнаны, здрабнелы фізічна і маральна. Паглядзіце на змучаны твар тутэйшага селяніна, на яго нізкі рост і худое цела, на лахманы, у якія ён апрануты… - паглядзіце, і вам будзе зразумелая тая цемра знявагі, у якой ён апынуўся» [2, с. 145-146].

Прычынай па якой беларускі народ апынуўся у такім занядбаным і прыніжаным стане, М.Каяловіч бачыць у польскім і каталіцкім ўплыве. Ён адмаўляў што-небудзь станоўчае ў культурным або дзяржаўным уплыве Польшчы на Беларусь, не верыў апалячанай шляхце і інтэлігенцыі. Лічыў, што менавіта ўнія з Польшчай разарвала сувязі паміж вышэйшымі і ніжэйшымі слаямі беларускага грамадства.

На думку М.Каяловіча беларускі народ самастойна не вырашыць сваіх праблемаў: «Палітычная незалежнасць Заходняй Расіі немагчымая… Беларусь настолькі бедная, што ня можа дапускаць непатрэбных тэорый і летуценняў» [2, с. 148]. Адзінае выйсце гэта зліццё з Расіяй, тым больш, што на яго думку «ўсе тры народы – беларусы, украінцы і велікарусы – ствараюць адзін рускі народ» [3, с. 157] Аргументамі аб братэрстве, адзінакроўнасці, супольнай веры і гісторыі, М.Каяловіч ідэалагічна апраўдваў асіміляцыю беларусаў.

Дзякуючы палымянай барацьбе польскага і расейскага шавінізму, якія настойліва пераконвалі беларусаў у іх адрозненні адпаведна ад рускага і польскага народаў, станаўленню капіталістычных адносін у 1880-1890-ыя гады пачалося фармаванне беларускай нацыі.

Поспех беларускага адраджэння прымусіў прадстаўнікоў заходнерусізму на пачатку XX ст. змяніць свае погляды. Да найбольш вядомых прадстаўнікоў гэтага кірунку адносіліся браты Л. і І.Саланевічы, І.Бажэлка і інш. Яны прызнавалі існаванне асобнага беларускага народа, стваралі арганізацыі з дапамогай якіх спадзяваліся прыцягнуць на свой бок сялянства і інтэлігенцыю - «Селянін», «Рускае ўскраіннае таварыства», «Беларускае таварыства». Дзеячы гэтых арганізацый абвяшчалі сябе беларусамі, выступалі ад імя беларускага народа, аднак як і папярэднікі лічылі яго «арганічнай часткай» народа рускага. Прызывалі яго пакінуць сваю мову і культуру гісторыі, а засвойваць і вывучаць рускую мову.

Для іх поглядаў характэрны таксама прапановы па юрыдычнаму абмежаванню правоў польскай і габрэйскай меншасці, стварэнню ўмоваў для забеспячэння вядучай ролі мясцовых «истинно русских» людзей.

### *2.2. Палітычныя і прававыя погляды рэвалюцыйных арганізацый*

Сялянская рэформа 1861 г. паскорыла працэс развіцця капіталізму на Беларусі. Рост таварна-грашовых адносін разбураў патрыярхальны лад у вёсцы, спрыяў сацыяльнаму расслаенню сялянства. Адначасова расла колькасць прадпрыемстваў фабрычна-завадской прамысловасці, капіталістычных мануфактур, пашыралася дробнатаварная вытворчасць.

У другой палове XIX ст. фарміруюцца асноўныя класы буржуазнага грамадства - буржуазія і пралетарыят. Складваецца беларуская нацыя.

Развіццё рыначных адносін, прамысловая рэвалюцыя суправаджаліся цяжкім сацыяльна-эканамічным становішчам працоўных, іх палітычным бяспраўем і нацыянальным прыгнётам. Барацьбу за правы сацыяльна абяздоленых слаёў насельніцтва Беларусі пачынаюць весці спачатку

народніцкія, а потым сацыял-дэмакратычныя арганізацыі.

**Рэвалюцыйныя народнікі.** У 70 - пачатку 80-х г. у Расійскай імперыі пашыраюцца сацыялістычныя ідэі. Першапачаткова найбольшую ўвагу і прыхільнасць насельніцтва атрымалі так званыя рэвалюцыйныя народнікі. Заснавальнікамі народніцкай тэорыі з'яўляюцца рускія рэвалюцыянеры-дэмакраты - А.І.Герцэн, М.А.Бакунін, М.Г.Чарнышэўскі.

У падмурку народніцкай ідэалогіі ляжыць успрыманне расійскіх сялян як «стыхійных сацыялістаў», «сацыялістаў па інстынкце». Народнікі лічылі, што існаванне сялянскай абшчыне пабудавана на сацыялістычных каштоўнасцях. Так, у абшчыне адбываецца перыядычны перадзел сялянскай зямлі, дзейнічае самакіраванне, збіраюцца агульныя сходы сялян, сяляне жывуць у адпаведнасці з прынцыпамі салідарнасці. Рэвалюцыянеры спадзяваліся, што сацыялізм сялян дапаможа Расіі ад перыяду феадалізму перайсці да сацыялістычнага грамадства і абмінуць усе заганы і бедствы капіталізму.

Каб забяспечыць такое развіццё краіны неабходна сялянская рэвалюцыя, адпаведна рэвалюцыйная партыя павінна займацца агітацыяй паміж сялян, арганізаваць іх рэвалюцыйныя дзеянні.

Ідэальныя ўяўленні аб сялянстве як асноўнай сіле будучай рэвалюцыі распаўсюдзіліся сярод інтэлігенцыі, студэнцтва. З 1874 г. сотні маладых людзей «пайшлі ў народ» з мэтай прапаганды ідэй сацыялізму сярод сялян. Народніцкі рух Беларусі з'яўляўся складанай часткай агульнарасійскага руху 70-пачатку 80-х гадоў, які існаваў у Расіі. Народніцкія гурткі ў 70-х гадах існавалі ў Мінску, Магілёве, Гродна, Віцебску, Пінску, Горках, Слуцку і іншых гарадах. З народніцкіх гурткоў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, выйшаў шэраг такіх вядомых рэвалюцыянераў, як Мікалай Судзілоўскі, Сяргей Кавалік, Рыгор Ісаеў, Ігнат Грынявіцкі, бомбай якога быў забіты Аляксандр ІІ, Г.Корба-Прыбылева і інш. У пераважнай большасці гэта былі студэнты, якія вучыліся ва ўніверсітэтах Масквы, Санкт-Пецярбурга і іншых гарадоў. Яны распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, вялі рэвалюцыйную прапаганду сярод сялян і рабочых.

Аднак «хаджэнне ў народ» закончылася правалам. Сяляне не ўспрымалі ідэй сацыялізму, а царызм адказаў на гэтую акцыю студэнтаў масавымі рэпрэсіямі. Пасля паражэння народніцкага руху, народніцкія ідэі ляглі ў падмурак праграмы Партыі сацыялістаў рэвалюцыянераў (эсэраў, 1901-1923 гг.), аддзяленні каторай існавалі і ў Беларусі.

**Марксізм.** Інакш на будучую рэвалюцыя глядзелі прыхільнікі марксізму. Шмат былых народнікаў, расчараваўшыся ў ідэях сялянскага сацыялізму, у пачатку 80-х гадоў XIX ст. свае надзеі ўсклалі на работнікаў прамысловасці, пралетарыят. Яны прымаюцца за актыўнае сістэматычнае вывучэнне і прапаганда, прыйшоўшых з Заходняй Еўропы ідэй і твораў К.Маркса і Ф.Энгельса.

На тэрыторыі Расійскай імперыі пачынаюць распаўсюджвацца такія творы як «Маніфест Камуністычнай партыі», «Убоства філасофіі», «Наёмная праца і капітал», «Фрыдрых Энгельс аб Расіі» і іншыя працы, у якіх

абгрунтоўвалася неабходнасць замены капіталізму новым, бяскласавым грамадствам - сацыялізмам у выніку пралетарскай рэвалюцыі і ўстанаўленне ўлады пралетарыяту. Арганізацыя рэвалюцыі цесна звязвалася з неабходнасцю стварэння палітычнай партыі пралетарыяту.

Пачатак распаўсюджванню марксізму ў Расіі паклала група «Вызваленне працы», створаная ў 1883 г. выдатным рускім рэвалюцыянерам Г.В.Пляханавым. Амаль адначасова з ёй марксісцкія групы і гурткі ствараюцца і ў Беларусі. Першыя марксісцкія гурткі былі створаны ў Мінску ў 1884-1885 гг. сярод рабочых друкарні. Прапаганду марксісцкіх ідэй у іх вялі Э.Абрамовіч і І.Гурвіч. Рабочыя вывучалі «Капітал» і іншыя працы К.Маркса. Потым марксісцкія гурткі ствараюцца і ў іншых прамысловых гарадах Беларусі.

На пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі ўжо аддзяленні цэлага шэрагу сацыял-дэмакратычных партый, якія часта ствараліся па нацыянальнай прыналежнасці яе сябраў. У Беларусі дзейнічалі суполкі Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, I з’езд каторай нелегальна адбыўся ў Мінску ў сакавіку 1898 г. Далейшая папулярызацыя марксісцкага вучэння ў Беларусі цесна звязана з газетамі РСДРП «Искра», «Вперед», «Пролетарий», «Новая жизнь».

Частка рабочых Беларусі знаходзілася пад уплывам ідэалогіі Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (1893 г.), Польскай сацыялістычнай партыі (ППС), Сацыялістычнай яўрэйскай рабочай партыі (1905 г.), Усеагульнага яўрэйскага рабочага саюза у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд) (1897 г.), Сацыялістычнай партыі Белай Русі (1904-1905 гг.), Беларускай сацыялістычнай грамады і інш.

### *2.3. Палітычны лібералізм у канцы XIX ст.*

**Ліберальная народнікі.** Пасля крызісу рэвалюцыйнага народніцтва адна частка былых народнікаў пачала пераходзіць на пазіцыі марксізму, а другая - лібералізму.

Ідэолагі ліберальнага народніцтва звязвалі магчымасць прадухілення пралетарызацыі сялян і іншых дробных вытворцаў з захаваннем і падтрымкай сялянскай абшчыны, з развіццём грамадскіх (арцельных) форм гаспадарання, з забеспячэннем вёскі танным крэдытам і г.д.

Ідэі ліберальнага народніцтва на Беларусі актыўна прапагандавала газета «Минский листок», якая выходзіла з 1886 па 1902 г. у Мінску на рускай мове 2-3 разы на тыдзень. У 1902 г. на аснове газеты «Минский листок» была створана газета «Северо-Западный край». Вакол гэтых газет стварыўся гурток ліберальнай інтэлігенцыі. Да каторага адносіліся навукоўцы М.Доўнар-Запольскі, у.Завітневіч, А.Слупскі, публіцысты А.Багдановіч, Д.Бохан, паэт Я.Лучына і інш.

Газета знаходзілася ў памяркоўнай апазіцыі да царызму, прапаноўвала пошук кампрамісу з уладамі, падтрымлівала некаторыя іх дзеянні. Разам з тым, яны заклікалі ўрад праяўляць гнуткасць у барацьбе з рэвалюцыяй,

пазбягаць парушэння правоў грамадзян. Адначасова лібералы асуджалі праявы радыкалізму, пісалі аб «азвярэнні» сялян, якія ажыццяўлялі падпалы, забойствы, аб «нахабстве» рабочых, якія выступалі супраць фабрыкантаў.

Найбольш радыкальным патрабаваннем да ўладаў, якое высунулі лібералы, было скліканне парламента – Земскага Сабору, пераўтварэння Расіі ў канстытуцыйную манархію. Памяркоўная частка абмяжоўвалася патрабаваннямі пашырэння паўнамоцтваў земскіх устаноў і гарадскіх дум.

Галоўнай сілай сацыяльнага прагрэсу беларускія лібералы лічылі «адукаваную частку грамадства» [3, с. 144]. Яны заклікалі інтэлігенцыю дапамагчы народу шляхам стварэння кас узаемадапамогі, сялянскіх банкаў, арганізацыі сялянскіх выстаў, спажывецкіх таварыстваў, адкрыцця бібліятэк, курсаў і майстэрняў, народных тэатраў і г.д.

Асобнае пытанне лібералы ўдзялялі нацыянальнаму пытанні. Так, Д.Бохан у сваім артыкуле «Аб патрыятызме наогул і аб рускім у прыватнасці» патрабаваў адрозніваць патрыятызм ад нацыяналізму, бо апошні з'яўляецца пачуццём, непрыстойным для вялікай нацыі. Ён указваў, што, заклікаючы да патрыятызму і нацыянальнай годнасці сваёй нацыі, рускія нацыяналісты ў сапраўднасці імкнуцца падавіць іншыя нацыянальнасці [3, с. 145].

Шмат увагі ў сваіх публікацыях М.Доўнар-Запольскі, А.Багдановіч, Я.Лучына і іншыя аўтары ўдзялялі пытанням паходжання беларускага народа, яго гісторыі, культуры, літаратуры. Вырашэнне нацыянальнага пытання беларускія лібералы бачылі праз стварэнне федэрацыі, кожная вобласць каторай мела б магчымасці для самастойнага нацыянальнага развіцця.

**Палітычныя і прававыя погляды У.Д.Спасовіча**. Выдатным прадстаўніком ліберальнай палітычнай і прававой думкі канца XIX ст. быў вядомы юрыст беларускага паходжання Уладзімір Спасовіч (1829-1906 гг.).

У.Д.Спасовіч, як і большасць адукаваных людзей, якія паходзілі з тэрыторыі тагачаснай Беларусі, унёс уклад у культурную, палітычную і прававую спадчыну некалькі народаў – рускага, польскага, беларускага. Менавіта пра апошнюю ён пры канцы жыцця пісаў: «Мая радзіма Літва, альбо Белая Русь» [4, с. 229].

Нарадзіўся У.Д.Спасовіч у 1829 г. у Рэчыцы, аднак дзяцінства і юнацтва яго прайшлі ў Мінску, куды пасля нараджэння сына пераехала яго сям'я. Пасля заканчэння гімназіі з залатым медалём У.Д.Спасовіч у 1845 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. У Пецярбургу ён абараніў кандыдацкую («Аб утварэнні Швейцарскага саюза») і магістэрскую («Аб правах нейтральнага флага і нейтральнага грузу») дысертацыі. Па ініцыятыве і пад рэдакцыяй У.Д.Спасовіча ў гэты час была перакладзена з нямецкай мовы і выдадзена ў Пецярбурзе «Энцыклапедыя права» (1861 г.) прафесара Лейпцыгскага ўніверсітэта Х.Аренса. Адначасова сам У.Д.Спасовіч пераклаў з лацінскай мовы на польскую дзве працы сярэдняевечных польскіх гісторыкаў - «Гісторыя Польшчы» Я.Рудоўскага і «Бескаралеўе» С.Ажэльскага. У.Д.Спасовіч удзельнічаў у падрыхтоўцы

выдання ў друкарні І.Агрызкі 8-томнага збору законаў былой Рэчы Паспалітай «Volumina legum».

На гэтым этапе свайго жыцця У.Д.Спасовіч быў прыхільнікам рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў, удзельнічаў у дзейнасці тайных студэнцкіх аб’яднанняў, падтрымліваў сяброўскія адносіны з польскім рэвалюцыянерам З.Серакоўскім. У канцы 50-х ён, аднак, зблiжаецца з вядомым расійскім лібералам К.Д.Кавеліным (1818-1885 гг.), прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэта. Па рэкамендацыі апошняга ён, пасля прадстаўлення дысертацыі «Аб адносінах мужа і жонкі да маёмасці па старажытнаму польскаму праву», у 1857 г. займае пасаду прафесара на кафедры крымінальнага права ў Пецярбургскім універсітэце. Дысертацыя была напісана на падмурку грунтоўнага даследавання палажэнняў Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.

Пад уплывам К.Д.Кавеліна У.Спасовіч пераходзіць на ліберальныя пазіцыі ў палітыцы, становіцца прыхільнікам мірнага рэфармавання самадзяржаўнага сацыяльна-палітычнага ладу Расіі, праціўнікам гвалтоўных рэвалюцыйных дзеянняў. «Я за ўсякі прагрэс, але легальны, за ўсякую эвалюцыю, але не рэвалюцыю, за ўстанаўленне парадку на падставе згоды ўсіх партый на арэне парламенту - без кровапраліцця і забойстваў». Ён быў перакананы, што «толькі праз абнаўленне дзяржаўных устаноў будзе пракладзена дарога да вырашэння ўсіх сацыяльных праблем, да вырашэння спрэчак паміж працай і капіталам, паміж капіталам і ўласнасцю» [3, с. 148; 4, с. 231].

У адпаведнасці з ліберальнай традыцыяй У.Д.Спасовіч дае наступнае вызначэнне дзяржавы: «Дзяржава, ёсць такая перамагаючая на вядомай прасторы паверхні зямнога шара маральная і матэрыяльная сіла, якая людзей на гэтай тэрыторыі аб’яднала, абараніла ад усякага знешняга ворага і ад усякага ўнутранага супастата, правяла над усімі аднолькавы закон мірнага і бясшкоднага сумеснага жыцця» [4, с. 231-232]. Дзяржава павінна забяспечыць гарманічнае і годнае развіццё чалавека, для гэтага яна «назірае, каб людзі жылі па гэтаму закону, падпарадкоўваліся яму, свабодна развіваліся, групаваліся і дасягалі поспехаў, адзін аднаго не гвалцілі і не крыўдзілі» [4, с. 232]. Іншых функцый і абавязкаў дзяржава мець не павінна. Ідэя мінімальных праваахоўчых функцый дзяржавы адрознівала погляды У.Д.Спасовіча ад сацыялістычных канцэпцый, якія патрабавалі дадатковага ўдзелу дзяржавы ў сацыяльным забеспячэнні чалавека.

Нягледзячы на мірныя рэфармісцкія погляды У.Д.Спасовіч у 1861 г. пакінуў універсітэт у знак пратэсту супраць жорсткага задушэння студэнцкага руху. З 1866 г. ён распачаў адвакацкую дзейнасць, пад час якой ён неаднаразова выступаў у якасці абаронцы па палітычных справах. Як бліскучы і красамоўны адвакат У.Д.Спасовіч атрымаў ад сучаснікаў тытулы «караля адвакатуры» і «першага адваката Пецярбургу». Ён стаў першым з плеяды выбітных рускіх адвакатаў, такіх як А.Коні, Ф.Н.Плевако.

У 1863 г. у Пецярбурзе У.Д.Спасовіч выдаў «Падручнік крымінальнага права», які прынёс яму вядомасць у юрыдычных колах Расіі. Падручнік

змяшчаў перадавыя крымінальна-прававыя ідэі, да ўспрыняцця якіх частка грамадства яшчэ не была гатова. У адпаведнасцю з яшчэ невядомымі на той час у Расіі ідэямі сацыялагічнай школы крымінальнага права, У.Д.Спасовіч паказаў цесную сувязь злачынства з сацыяльным асяроддзем, звяртаў увагу не толькі на крымінальную сутнасць злачынства і пакарання, але і на маральную і сацыяльную.

У.Д.Спасовіч быў першым расійскім юрыстам, які звярнуў увагу на антыгуманнасць пануючай тэорыі пакарання. Ён даказваў, што асноўнай мэтай апошняга з'яўляецца не помста ці застрашванне, а бяспека грамадства. У.Д.Спасовіч лічыў, што пры пакаранні трэба ўлічваць усе акалічнасці справы, яно павінна адпавядаць злачыннасці дзеяння, матывам злачынцы, яго асобе. Аўтар падручніка ўказваў, што грамадства часам само стварае ўмовы, садзейнічае здзяйсненню злачынства. Па гэтых прычынах У.Д.Спасовіч катэгарычна выступаў супраць смяротнага пакарання, а таксама да яго «малодшых сясцёр» цялесных пакаранняў.

У.Д.Спасовіч лічыў, што гуманізм павінен праяўляцца не толькі пад час пакарання, але і пад час усяго крымінальнага працэсу, пад час усіх следчых і судовых дзеянняў. У канцы 1863 г. на падставе «Падручніка крымінальнага права» ён атрымаў вучоную ступень доктара крымінальнага права.

Аўтар падручніка прыняў актыўны ўдзел у абмеркаванні судовай рэформы ў Расіі. Ён выступаў на карысць усталявання незалежнага ад адміністрацыі суда, за ўвядзенне спаборнага працэсу, роўнасць правоў адваката і пракурора. Падтрымліваючы стварэнне суда прысяжных, ён настойваў на неабходнасці ўвядзення высокага адукацыйнага цэнзу прысяжных.

У.Д.Спасовіч падвергнуў крытцы фармальную тэорыю доказаў, якая панавала ў судаводстве да 1864 г. Ён лічыў, што прыярытэт павінен аддавацца не паказанням сведкаў, а рэчавым доказам, даследаваным адпаведнымі эспертамі.

Прагрэсіўным быў падыход юрыста да пытання мовы ў судаводстве. У сваім артыкуле «Аб мове ў галіне судаводства» ён выказаўся за тое, каб судовыя чыноўнікі Расійскай імперыі вывучалі мову таго народа, сярод якога яны працуюць [3, с. 150-151].

У.Д.Спасовіч пакінуў пасля сябе багатую рукапісную і друкаваную спадчыну. У адзінаццаці тамах сабраныя працы па крымінальным, грамадзянскім, сямейным, міжнародным праве, крымінальнаму працэсу, філасофіі, этыцы, гісторыі, літаратуры і г.д.» [4, с. 233].

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Баршчэўскі, Л.П. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.П.Баршчэўскі, П.В.Васючэнка, М.А.Тычына. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.

2. Булгакаў, В. Гісторыя беларускага нацыяналізму / В.Булгакаў. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – 326 с.

3. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапаmoж. для студэнтаў вышэйш.навуч.установў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.

4. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.

5. Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX ст. / уклад., прадм. і заўв. У.Казьберука. – Мн.: Мастацкая літаратура, 2001. – 606 с.

6. Каліноўскі, К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / К.Каліноўскі. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://asveta.belinter.net/kalinouski.html; http://bk.knihi.com/kalinouski/kalinouski1.html. – Дата доступу: 08.01.2008.

7. Сакалова, М. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / М.Сакалова. - [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://autary.iig.pl/sakalova/art_ruchi_liberalizm.htm. – Дата доступу: 26.09.2007.

8. Шалькевіч, В. Невядомыя старонкі з жыцця Кастуся Каліноўскага / В.Шалькевіч // Сыны і пасынкі Беларусі / С.В.Барыс, С.В.Тарасаў, Г.А.Ланеўскі і інш.; Уклад. Барыс С.В. – Мн.: Полымя, 1996. – с.165-188.

# ТЭМА 11.
# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСКАГА АДРАДЖЭННЯ У КАНЦЫ XIX - ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XX СТСТ.

## *1. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Палітычныя ідэі Ф.Багушэвіча*

Канец XIX - пачатак XX стст.- перыяд другога беларускага адраджэння. Яго падмурак асноўваецца як на аб’ектыўных, так і суб’ектыўных прычынах.

Да аб’ектыўных належыць развіццё капіталістычных адносін на Беларусі пасля скасавання прыгоннага права ў 1861 г. У пачатку XX ст. на Беларусі было ўжо каля 800 фабрычна-завадскіх прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працавала больш за 25 тысяч рабочых. З 1861 па 1890 гг. на Беларусі пры агульным росце насельніцтва на 70% насельніцтва, ў гарадах ён павялічылася ў два разы [7, с. 223]. Рост гарадскога насельніцтва, прамысловая рэвалюцыя, станаўленне капіталістычных адносін, як вядома, спрыяюць пераадоленню сярэднявечнай адасобленасці насельніцтва, эканамічнай і палітычнай кансалідацыі народнасці ў нацыю.

Суб’ектыўнай прычынай, якая паўплывалі на ўзнікненне беларускай нацыі, стала вынішчэнне царызмам ў ходзе паўстанняў у Польшчы, Літве і Беларусі шляхты - носьбітаў ліцвінскай свядомасці. Ацалелыя патрыёты ВКЛ пераходзілі на бок польскага нацыянальнага руху і, ня гледзячы на спробы павесці за сабой просты народ, станавіліся для яго носьбітамі чужой свядомасці.

І расійскі ўрад і польскія нацыянальныя сілы распачалі безкампрамісную барацьбу, спрабуючы аслабіць уплыў друг друга на беларускі народ, дамагчыся яго асіміляцыі. Аднак іх палымяная барацьба, настойлівыя спробы пераканаць беларусаў у іх адрозненні адпаведна ад польскага і рускага народаў, падштурхнулі развіццё не польскай і не рускай, а беларускай свядомасці ў насельніцтва.

Своеасаблівасці дэмаграфічнага і эканамічнага становішча Беларусі абумовілі адрозненне станаўлення беларускай нацыі ад іншых заходнееўрапейскіх нацый. Галоўнае адрозненне ў тым, што асноўную частку беларускага народа перыяду ўзнікнення нацыя састаўляла сялянства. «Прамысловая і фінансавая буржуазія, якая з’яўлялася на Захадзе застрэльшчыкам нацыянальнага руху, на Беларусі гэтага задання выканаць не магла, з той простай прычыны, што яна з беларускасцю нічога супольнага ня мела, што яна пачувалася да супольнасці з польскім або рускім народам і ўключалася ў рады польскіх нацыяналістаў або рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў» [4, с. 4]. Інтэлігенцыя краю складалася таксама «з памешчыкаў-палякаў, і апалячэўшых, з чыноўнічэнства расейскага і абруселага ды мешчанства часьцю абруселага, часьцю апалячэнага» [4, с. 4].

У выніку, па меркаванню даследчыка М.Гроха, беларуская нацыянальная эліта складалася з прадстаўнікоў ніжэйшай інтэлігенцыі - настаўнікаў ніжэйшых школаў, дзяржаўных клеркаў, фермераў, сярод яе амаль не было

выкладчыкаў сярэдніх і вышэйшых школаў, дзяржаўных чыноўнікаў, асобаў вольных прафесій [5, с. 270]. А ўлічваючы тое, што беларусы складалі толькі да 17 % пралетарыяту, то нацыянальная эліта была цесна звязаная з вёскай, імкнулася абапірацца на сялянства, выражаць іх інтарэсы.

Цесная сувязь нацыянальнай эліты з сялянствам абумовіла і асаблівасці палітычнай і прававой думкі яе прадстаўнікоў. Галоўную задачу, якую яны перад сабой ставілі – гэта асветніцкая дзейнасць накіраваная на абуджэнне і рост нацыянальнай свядомасці сярод вяскоўцаў. Так, фактычна першы прадстаўнік беларускай нацыянальнай эліты Ф.Багушэвіч у адным са сваіх вершаў звярнуўся да інтэлігенцыі з заклікам падаць руку «мазолістай руцэ мужыка і вывесці яго на шырокі шлях» [6, с. 167].

Пры адсутнасці ў беларусаў дзяржаўнасці, самастойных формаў палітычнага і эканамічнага жыцця нацыянальна-кансалідацыйныя і нацыянальна-патрыятычныя функцыі прыняла на сябе культура. У канцы XIX ст. менавіта літаратары і публіцысты фармавалі нацыянальную ідэі, надання ёй вобразнае даступнае да простых людзей выражэнне. Гэтыя пошукі характэрны для грамадскай і літаратурнай дзейнасці Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча і іншых.

Ф.Багушэвіч па праву лічыцца «бацькам беларускага адраджэння», «пачынальнікам мадэрнай беларускай літаратуры», «першым нацыянальным паэтам» [5, с. 187-188]. Свае палітычныя погляды ён выклаў у двух паэтычных зборніках «Дудка беларуская» (1891 г.) і «Смык беларускі» (1894 г.). Прадмовы да гэтых зборнікаў фактычна ствараюць дыскурс беларускага адраджэння, у іх вызначаюцца асноўныя праграмныя тэмы, якія закладваюць падмурак нацыянальнай ідэі, і потым будуць развівацца астатнімі беларускімі дзеячамі.

Галоўнай задачай заснавальніка мадэрнай беларускай нацыі было «вынайсці» беларусаў, то бок паказаць іх існаванне не як нейкага этнаграфічнага матэрыялу прыдатнага толькі на асіміляванне іншымі, але як суб’екта гісторыі з працяглай дзяржаўнай і культурнай традыцыяй, з усвядомленым адрозненнем ад іншых народаў, з сваім велічным мінулым, цяжкай сучаснасцю і перспектывамі на лепшую будучыню.

Перш за ўсё Ф.Багушэвіч выводзіць беларусаў па за межы каланіяльнага наратыву. Калі каланіяльныя даследчыкі і ідэолагі, як польскія так і расейскія, малявалі Беларусь як занядбалы край, найлепшая будучыня якога ў аб’яднанні і знікненні ў масе больш развітога народа, то Ф.Багушэвіч імкнецца прышчапіць беларусам пачуццё гонару за сваю гісторыю. У яго трактоўцы беларускі народ уяўляе сабой асобную культурную адзінку з яе ўласнай гісторыяй і ўнікальнай ідэнтычнасцю. І менавіта культура становіцца для Ф.Багушэвіча адзнакай асаблівасці беларускага народа, дазваляе вызначыць межы яго рассялення. Абапіраючыся на шматлікія беларусазнаўчыя даследаванні расейскіх навукоўцаў, карты, перапісы насельніцтва, слоўнікі, ён называе лік беларусаў у амаль 6 млн. чалавек, што бліскуча пацвярджаецца праз шэсць год пасля выдання «Дудкі беларускай» падчас першага агульнаімперскага перапісу [5, с. 207].

Для Ф.Багушэвіча мова становіцца найважнейшым крытэрам жыцця народа. Без яе этнас не здольны супрацьстаяць уціску чужых культур. У традыцыях еўрапейскага культурнага нацыяналізму Ф.Багушэвіч пытаецца: «Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець». Ён фактычна робіць перафраз сваіх нямецкіх калегаў Э.М.Арнта і Гердэра, будучы ўпэўненым, што пры адсутнасці рэлігійнага і сацыяльнага адзінства беларусаў, нацыянальнай здрады вышэйшых плыняў грамадства, толькі мова можа сведчыць аб фундаментальнай індывідуальнасці беларускай народнасці. Таму і жыве беларускі народ на абшарах «ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілеў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак…» [8, с. 380], пакуль размаўляе на сваёй мове. Адпаведна палітычным лозунгам, лозунгам выжывання беларускага народа становіцца «не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!» [8, с. 380].

Акрамя мовы народ яднае агульная «доля-нядоля» і гісторыя. Нацыя трактуецца Ф.Багушэвічам, ня толькі як супольнасць людзей, што жыве на супольнай тэрыторыі, але і як заснаваная на супольнай долі, ці, кажучы лепш, «як супольнасць, якая вымагае асобнай гісторыі і стварае сваю асобную долю» [5, с. 210]. Доля беларусаў слаўная, як і іх далёкая мінуўшчына.

Ф.Багушэвіч адмаўляе каланіяльнае бачанне гісторыі Беларусі. Праз адкрыццё велічнай беларускай гісторыі ён спрабуе абудзіць гонар у народа. Ён спасылаецца на існаванне старажытных папераў, пісаных «дзвесце і трыста год пісаных на нашай зямлі, пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай» [8, с. 379], тым самым паказвае існаванне доўгай традыцыі беларускай дзяржаўнасці. Апісваючы саюз Беларусі з Літвой, а потым і з Польшчай, аўтар падкрэслівае іх дабравольнасць, самастойнасць народа ў вызначэнні свайго дзяржаўнага і палітычнага жыцця. Ф.Багушэвіч вызначае цэнтральную ролю Беларусі ў беларуска-літоўскай дзяржаве, указвае на міралюбівасць беларускага народа, яго ўдзел толькі ў абарончых войнах. Такім чынам, аўтар супрацьстаіць каланіяльным ідэям, адмаўляе ў легітымнасці далучэнню Беларусі да Расіі, малюе сваю зямлю часткай Еўропы [5, с. 209] .

Велічная гісторыя, выключнасць беларускага народа (спакон веку яго білі, рабавалі, а ён выжыў) даюць аўтару спадзеў на лепшую будучыню Беларусі. Дарэчы, менавіта Ф.Багушэвіч пачынае свядома выкарыстоўваць найменні Беларусі, беларускага народа як нацыянальна-адметныя назвы. Замацоўвае іх у свядомасці тых, хто яшчэ дзесяцігоддзі таму ідэнтыфікаваліся як «мужыкі», «тутэйшыя», «палякі», «ліцьвіны», «русіны» і г.д.

Паказаўшы веліч мінулага, Ф.Багушэвіч павінен быў знайсці словы якімі можна было мабілізаваць народ, абудзіць яго ад спракавечнага сну. У яго творчасці ўпершыню ўзнікаюць матывы, якія потым падхапілі ўсе астатнія адраджэнцы. З аднаго боку аўтар вельмі падобна на каланізацыйныя творы паказвае занядбаласць беларускага народа, яго цёмнасць, забітасць. Аднак у

адрозненне ад асімілятараў, беды народа ён звязвае з яго падняволеным становішчам. Сам па сабе беларускі мужык у Ф.Багушэвіча выступае як сінонім маральнасці, чэснасці, працавітасці. Людзі працы - прыкрываюцца анучаю, жывуць у хатах з дзіркамі, дзе вецер, снег, ходзяць, працуюць дзень і ноч, льюць свой пот [6, с. 169]. Усе беды мужыка звязаны з яго прыгнечаным становішчам. Паны-прыгнятальнікі «ходзяць у золаце з плеч да ног», «маюць хатаў многа», дзесяткі слуг зарабляюць ім «сотнісот...» Вынікі мужыцкай працы прысвойваюць як памешчыкі-паны, так і дзяржаўныя чыноўнікі:

*Судоў нарабілі, начальстваў ці мала:*
*Пасрэднік і валасць, сынод і сенаты,*
*Прысуцтва і вокруг, управы, палаты.*
*А найбольш міравых, участковых і з'ездаў,*
*Што ў полі камення...* [6, с. 169].

«Дурны мужык, як варона» толькі таму, што дазваляе гэткі здзек над сабой.

Такім чынам, для абуджэння народа аўтар выкарыстоўвае яго супрацьпастаўленне прыгнятальнікам. Не шкадуючы фарбаў ён паказвае цяжкае жыццё простага народа, паказвае яго несправядлівасць, указвае на ворагаў, якія адначасова і эканамічна, і нацыянальна прыгнятаюць беларускі народ (паны – палякі, чыноўнікі - рускія), прызывае народ з'яднацца вакол «слова Праўды» [8, с. 387], пасля чаго лепшая доля прыйдзе і на Беларусь. За адлюстраваннем цяжкіх пакутаў народа, які імі выкупляе свае грахі, хаваецца месіянскі падтэкст: Беларусь мусіць узняцца з ямы палітычнага прыгнёту і рушыць па шляху свабоды і роўнасці, усталяваўшы новы, справядлівы лад. Надыход праўдзівай Беларусі непазбежны, ён падрыхтаваны нялюдскімі пакутамі народа [5, с. 252-253].

Нацыянальны праект Ф.Багушэвіча знайшоў шмат прыхільнікаў. Другі паэт-дэмакрат канца XIX ст. Адам Гурыновіч адзначыў у вершы-звароце да Ф.Багушэвіча ролю апошняга для Беларускага Адраджэння :

*Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,*
*Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы,*
*Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,*
*Няхай песнь смутная ідзе ў калейку*
*І будзіць у сэрцах мысль аб лепшай долі,*
*Якой мы не зналі дагэтуль ніколі* [6, с. 170].

## ***2. Палітычныя і прававыя погляды ў праграмах беларускіх палітычных арганізацый канца XIX – пачатку XX стагоддзя (Гоман, Беларуская сацыялістычная грамада)***

**«Гоман».** Культурна-асветніцкая праца беларускіх адраджэнцаў з самага пачатку была цесна звязана з барацьбой за палітычныя і сацыяльныя змены ў краіне. Адзін з сяброў «Кружка Беларускае Нацыянальнае Асьветы», што была ўтворана ў 1902 годзе, потым успамінаў: «Першыя крокі гуртка былі чыста культурнага характару: імкненнем яго была культурна-прасьветная праца сярод беларускага сялянства ў роднай мове, пісаньне і друкаваньне

беларускіх кніжак, азнаямленне грамадзянства і асабліва моладзі з беларускай гісторыяй і этнаграфіяй… Але тут жа сустрэўся (гурток) з непераможнымі перашкодамі, якія і папхнулі больш радыкальныя элементы на шлях рэвалюцыйнай барацьбы ня толькі за волю, але і за самае права беларускага народа на існаваньне» [4, с. 5].

Улічваючы, што пераважную частку ўсяго беларускага насельніцтва складала сялянства, развіццё нацыянальнага руху пайшло пад адзнакай неанародніцкіх ідэй «сялянскага сацыялізму».

Тэма сацыяльнага і беларускага нацыянальнага вызвалення ўпершыню прагучала ў беларускіх народнікаў, дзеячаў групы «Гоман», якая ўзнікла ў 1884 г. сярод студэнцкай моладзі ў Пецярбургу. Група падзяляла праграмныя і арганізацыйныя погляды народніцкай партыі «Народнай волі» і імкнулася стаць яе абласной арганізацыяй у Беларусі. Праграмныя ўстаноўкі групы «Гоман» былі сфармуляваны ў артыкулах, змешчаных у двух нумарах часопіса з той жа назвай.

У сваім часопісе «гоманаўцы» выказвалі прыхільнасць да ідэй «рускага абшчыннага сацыялізму». Пры гэтым яно ясна бачылі, што на большай частцы Беларусі сельскай абшчыны ўжо не існавала, што разбурэнне абшчыны ідзе з Захаду на Усход. Аднак яны спадзяваліся на тое, што абшчынныя ідэі яшчэ «занадта жывыя ў народзе, і яго эканамічныя ідэалы… надзвычай прасякнуты духам калектывізму» [7, с. 225].

Акрамя сацыялістычных ідэй «гоманаўцы» шмат увагі ўдзялялі нацыянальнаму пытанню. Яны абгрунтоўвалі сам факт існавання беларускай нацыі як самастойнай супольнасці людзей, яе права на сацыяльнае і культурнае разняволенне. У №2 «Гомана» было дадзена разгорнутае навуковае абгрунтаванне прагрэсіўнасці працэсу ўзнікнення нацый і права кожнай нацыі на вызначэнне свайго лесу. Адносна Беларусі аўтары адзначалі, што яна мае ўсе арыгінальныя якасці, якія самым натуральным чынам вылучаюць яе ў асаблівую галіну славянскага племені. Рашуча заяўляючы сваё імкненне абараніць Беларусь як ад польскага, так і ад вялікарасійскага прыгнёту, яны абвяшчалі права беларускага народа «кіраваць сабою», «распараджацца сваім лёсам», «заняць у Расіі такое ж месца, якое імкнуцца заняць іншыя больш ці менш буйныя народнасці» [6, с. 171].

На іх думку, Радзіма толькі тады можа забяспечыць сваю самастойнасць, калі яна «сама, сваімі ўласнымі сіламі даб’ецца свабоды, сама ўладкуецца» [6, с. 171]. «Гоманаўцы» канстатавалі, што ў народзе няма свядомага імкнення да незалежнасці, што яго неабходна ў ім сфармаваць. Галоўную ролю ў абуджэнні народа павінна сыграць інтэлігенцыя. Пры гэтым прадстаўнікі «Гоману» усведамлялі складанасці фармавання беларускай нацыянальнай эліты: «Беларускі народ, як нацыя плябейская чакае яшчэ з’яўлення сваёй інтэлігенцыі. Да гэтага часу ён выдзяляў з сябе сілы, якія служылі або польскай, або велікарускай культуры. Глуха, але настойліва пратэставаў ён супраць здрадніцкіх спробаў паланізаваць ці абвелікарусіць яго, і абедзве сілком навязаныя яму культуры праходзілі міма, не

прышчапіўшыся да яго. Свята захоўвае ён асновы свайго жыцця ў чаканні з'яўлення сваёй інтэлігенцыі, якая будзе не ламаць гэтыя асновы, а развіваць і удасканальваць іх… Лішні раз тады дакажа беларуская нацыянальнасць даказанае ўжо ня раз прыкладам іншых плебейскіх нацыянальнасцяў…, што не нізкі ўзровень культуры выклікае яе падпарадкаванне, а наадварот, падпарадкаванне выклікае застой» [7, с. 226].

Для выхавання народа ў духу нацыянальнай свядомасці і падрыхтоўкі яго да барацьбы за незалежнасць нацыянальная інтэлігенцыя павінна, на іх думку, па-першае, пачаць выданне спецыяльнага беларускага друкаванага часопіса, і, па-другое, стварыць самастойную беларускую рэвалюцыйную арганізацыю, якая будзе мець цесныя адносіны са сваімі рэгіянальнымі аддзяленнямі.

Група «Гоман» адной з першых сярод народніцкіх груповак узняла пытанне пра федэралізм, прычым не ў анархічнай народніцкай трактоўцы, а як форму саюза паміж асобнымі часткамі дзяржавы або нацыямі, што ўваходзяць у яе склад. «Мы, беларусы,- пісалі «гоманаўцы»,- павінны змагацца за інтарэсы беларускага народа і федэратыўнай аўтаноміі краіны... Мы сацыялісты таму што нашай галоўнай мэтай з'яўляецца эканамічнае паляпшэнне краіны на прынцыпах навуковага сацыялізму» [6, с. 172].

Вырашэнне як сацыяльнага, так і нацыянальнага пытанняў беларускія народнікі звязвалі са звяржэннем царызму. Расія ім бачылася ў будучым канфедэрацыяй асобных дэмакратычных рэспублік, уладкаваных на прынцыпах свабоднага пагаднення паміж імі [6, с. 172].

**Беларуская сацыялістычная грамада.** У канцы XIX ст. ствараюцца гурткі «Беларускай народнай асветы», арганізаваныя студэнтамі-беларусамі. Яны існавалі ў Маскве, Пецярбургу, Вільні, Гродне, Мінску. У іх праграмах прадугледжвалася «распаўсюджанне беларускай нацыянальнай школы для народа». Аднак супрацьдзеянне царскіх уладаў справе нацыянальнага адраджэння Беларусі вельмі хутка прывяло да стварэння на іх базе рэвалюцыйных арганізацый. Так, зімой 1901-1902 гг. у Пецярбургу ствараецца арганізацыя пад назвай Беларуская рэвалюцыйная партыя (БРП). З БРП у другой палове 1903 г. выдзяляецца Беларуская рэвалюцыйная грамада, якая прыкладна з 1904 г. Атрымлівае назву Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ).

Арганізатарамі і кіраўнікамі парты і былі браты Луцкевічы, В.Ластоўскі, К.Каставіцкі (К.Каганец), Ф.Умястоўскі, А.Бурбіс, В.Іваноўскі, А.Пашкевіч (Цётка), А.Уласаў і інш.

На першым з'ездзе, які адбыўся ў 1903 г., БРГ прыняла праграму, у якой характарызавала сябе як сацыялістычную арганізацыю «беларускага працавітага народа» [3, с. 410]. Сваёй канчатковай мэтаю яна абвясціла знішчэнне капіталістычнага ладу і пераход у грамадскую ўласнасць зямлі, яе нетраў, сродкаў вытворчасці і камунікацый. Тэрміновай задачай ставілася звяржэнне самадзяржаўя ў Расіі ва ўзаемадзеянні «з пралетарыятам усіх народаў Расійскага гасударства» [3, с. 410].

Праграма БРГ фактычна спалучала ў сабе ідэі як сацыял-дэмакратычных,

так і народніцкіх партый. У адрозненне ад першых, БРГ не праводзіла прынцыповай розніцы паміж пралетарыятам, сялянствам і іншымі групамі працоўных. Ідэя класавай барацьбы - базавая ў марксізме - прызнавалася грамадоўцамі ў агульным сэнсе і адмаўлялася фактычна ўнутры беларускай нацыі. Партыя імкнулася знайсці апору і ў рабочым класе, і ў сялянстве, і ў інтэлігенцыі [6, с. 173].

Праграма БРГ не вызначала форму будучага дзяржаўнага ладу краіны. У нацыянальным пытанні партыя выступала за тое, каб «усе народы мелі як найбольшую свабоду», а самай жаданай формай забеспячэння нацыянальнай свабоды ў часе капіталізму яна прызнавала дэмакратычную рэспубліку. Палітычную аснову яе павінны былі скласці: дэмакратычныя выбары, народнае заканадаўства, «спаўненне найвысшай уласці праз Канстытуцыйны сход», стварэнне народнага апалчэння замест пастаяннай арміі, роўнасць перад законам і судом, выбарнасць суда і іншыя дэмакратычныя правы і свабоды.

У блок сацыяльных патрабаванняў уваходзілі: усталяванне 8-гадзіннага працоўнага дня, памер мінімальнай працоўнай платы, роўная плата за роўную працу мужчынам і жанчынам, дзяржаўнае страхаванне, бясплатная медыцынская дапамога і інш.

У аснову аграрнай праграмы партыі была пакладзена эсэраўская ідэя ўраўняльнага землекарыстання пасля скасавання прыватна зямельнай уласнасці. БРГ заяўляла пра неабходнасць прапаганды «ідэй усестаронняга сябравання і таварыстваў» [3, с. 410]. Вырашыць сялянскае пытанне партыя прапаноўвала сілай [4, с. 29].

У цэлым праграма БСГ спалучала ідэі рэвалюцыйнага дэмакратызму з народніцкім сялянскім сацыялізмам. У 1905 г. Партыя нават змяніла марксісцкі лозунг «Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!» на дэвіз народнікаў - «Працавітая бедната ўсіх краёў, злучайся!».

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. садзейнічала ўздыму беларускага нацыянальнага руху. У пракламацыях 1905 г. БСГ выступала за ўстанаўленне ў Расіі дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі з супольным Канстытуцыйным сходам для ўсіх народаў і мясцовымі нацыянальнымі соймамі. Пракламацыі заклікалі сялян забіраць панскую зямлю і рыхтавацца да ўзброенай барацьбы з царскім войскам [6, с. 174].

У студзені 1906 г. на II з’ездзе БСГ была прынятая новая праграма, якая ўзмацніла сацыял-дэмакратычныя ідэі ў партыі. «У выніку гарачай дыскусіі выявілася, што эсэраўшчына мае дужа слабыя карані сярод грамадоўцаў, а пераважна кірунак сацыял-дэмакратыі – пераважна ў пэпэсаўскай інтэрпрэтацыі ў адносінах да нацыянальнага пытання», - пісаў А.Луцкевіч [4, с. 14]. У праграме БСГ рабілася заява аб тым, што партыя аб’ядноўвае «працавітую беднату Беларусі без адрознення нацыянальнасцей з канчатковай мэтаю замены капіталістычнага ладу сацыялістычным». БСГ адмаўлялася ад эсэраўскай ідэі сацыялізацыі зямлі, якая была ўключана ў першую праграму партыі. Замест яе высоўвалася праграма муніцыпалізацыі, то бок стварэнне абласнога зямельнага фонду з казённых, удзельных,

царкоўных землеўладанняў. Аграрная праграма партыі фактычна супала з праграмай меншавікоў.

Умовы для пераходу прыватных зямель ў абласны фонд і надзялення зямлёй сялян на правах пажыццёвай арэнды павінен быў выпрацаваць агульнабеларускі сойм. У праграме нават не згадвалася пра сацыялістычны шлях развіцця сялянскай гаспадаркі. У адрозненне ад бальшавіцкага разумення сацыялізму як грамадства, у якім адбудзецца жорсткае цэнтралізаванае абагульненне ўсіх сродкаў вытворчасці, БСГ адстойвала ідэі народнага сацыялізму, дзе зямля і сродкі вытворчасці знаходзяцца ў руках працоўных пажыццёва. А падаткі за карыстанне зямлёй павінны ісці на карысць краю [6, с. 174].

«Пэпээсаўская інтэрпрэтацыя нацыянальнага пытання» выразілася ў патрабавання для Беларусі аўтаноміі з мясцовым сеймам у Вільне. У адрозненне ад «чыстых» эсдэкаў нацыянальнаму пытанню партыя ўдзяляла вялікае значэнне. Менавіта таму найбольш цеснае супрацоўніцтва БСГ ажыццяўляла з ідэйна блізкімі ёй нацыянальнымі сацыялістычнымі партыямі – Польскай партыяй сацыялістычнай (ППС), Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыяй, Латышскім сацыял-дэмакратычным саюзам і інш.

Пасля паражэння рэвалюцыі 1905 г. У выніку рэпрэсій левае крыло БСГ было аслаблена (А.Бурбіс быў зняволены ў турму, А.Пашкевіч выехала за мяжу). Астатнія лідэры партыі (Луцкевічы, А.Уласаў, В.Іваноўскі) пачалі хіліцца ў права – на ліберальна-народніцкія пазіцыі. Так, у рэдакцыйным звароце чацвёртага нумара «Нашай долі», яны заявілі, што «зямлю трэба здабываць не сілаю, не грабяжом, а законам» [3, с. 411].

Пасля гэтага лідэры БСГ стварылі новую легальную газету на беларускай мове «Нашу ніву», ў якой з 1906 па 1915 гг. выкладалі свае сацыяльна-эканамічныя і культурна-асветніцкія погляды.

Пад час Першай сусветнай вайны і акупацыі Беларусі БСГ фактычна прыпыніла сваю дзейнасць. У канцы 1917 г., маючы каля 10 тыс. сябраў, партыя раскалолася па пытаннях стварэння незалежнай дзяржавы Беларусі, яе геапалітычнай арыентацыі, адносінаў да бальшавіцкага перавароту.

### ***3. Развіццё нацыянальнай палітыка-прававой думкі праз першыя беларускамоўныя друкаваныя выданні - газеты «Наша доля» і «Наша ніва»***

У чэрвені 1906 года на канферэнцыі БСГ у Вільні дэлегаты выказаліся за тое, каб ЦК БСГ хутчэй распачаў выданне сваёй партыйнай газеты. Першым органам БСГ і першым легальным перыядычным выданнем на беларускай мове стала газета «Наша доля», якая пачала выходзіць з першага верасня 1906 г. Яе рэдактарам стаў І.А.Туркекес, у выданні ўдзельнічалі Іван і Антон Луцкевічы, Цётка.

«Наша доля» мела рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак. У праграмным артыкуле «Да чытачоў» рэдакцыя абяцала змагацца за сацыяльную і нацыянальную свабоду, асвету на роднай мове, сацыяльнае і культурнае адраджэнне краю.

Газета вучыла беларусаў нацыянальнай салідарнасці, імкнулася пераадолець у іх свядомасці раскол на католікаў - «палякаў» і праваслаўных - «рускіх», які быў вынікам шматгадовай польскай і расійскай прапаганды. Ужо ў першым нумары «Нашай долі» быў змешчаны артыкул Цёткі з заклікам да нацыянальнага абуджэння:

*Наш палетак неараты,*
*Палынамі цвіце ніва.*
*Ну-ка, братцы, кумы, сваты,*
*Да работы станьма жыва!*
*Жыва, жыва за работу.*
*Без аглядкі, хто што можа,*
*Усе роўны без расчота,*
*Усіх праца будзе гожа!* [6, с. 175].

Называючы ўсіх беларусаў, незалежна ад веравызнання, «братамі па бядзе і нядолі» газета заклікала іх «трымацца разам, не водзіць адзін з другім сварак, выкінуць з свайго сэрца тую нянавісць, якую вашы ворагі ў вас засяваюць... Ведайце добра ж, пакуль вы ўсе разам - вы сіла, а як разлучыцеся ды пойдзеце кожны па сабе, дык тады вас передушаць, як мух» [6, с. 175].

Шмат увагі рэдакцыя «Нашай долі» прысвячала інфармаванню чытачоў пра вызваленчы рух, урадавыя рэпрэсіі, барацьбу сялян за беларускую школу, дзейнасць дэмакратычнай фракцыі Дзяржаўнай Думы. Рэвалюцыйнымі ідэямі былі прасякнуты апублікаваныя творы Цёткі (апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі», верш «Разумныя да не на дурня напалі» і інш.), Я.Коласа (апавяданне «Свабода», верш «Беларусам» і інш.), Ядвігіна Ш. («Суд»).

Газета друкавала вострапубліцыстычныя артыкулы і фельетоны, у якіх выкрывала антынародную палітыку ўрада («Як мужыку палепшыць сваё жыццё», «Авечы агітатар», «Даход расійскага цара», «Напасць чужынцаў» і інш.).

Радыкалізм рэдакцыйнай палітыкі выклікаў жорсткія рэпрэсіі ўладаў, якія фактычна паралізавалі працу рэдакцыі. Чатыры з шасці нумароў газеты былі канфіскаваны. Ва ўмовах спаду Першай рускай рэвалюцыі, узмацнення рэпрэсій частка рэдакцыі (браты Луцкевічы, А.Уласаў, В.Іваноўскі) перайшлі на больш памяркоўныя пазіцыі, пакінулі рэдакцыю і ў лістападзе 1906 году заснавалі новую легальную газету «Нашу ніву». Літаратурны аддзел «Нашай долі» аказаўся аслабленым, але ўлады за рэвалюцыйнасць шэрага нумароў газеты вырашылі яе зачыніць. 11 студзеня 1907 г. рашэннем Віленскай судовай палаты выданне газеты было спынена, а рэдактар Тукеркес прыгавораны да турэмнага зняволення на 1 год.

Газета «Наша ніва» стала лёсавызначальнай ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў. Яна пачала выходзіць у лістападзе 1906 г. і спыніла сваё выданне толькі з-за нямецкай акупацыі Беларусі ў часы першай сусветнай вайны (жнівень 1915 г.).

«Наша Ніва» стала галоўнай трыбунай, ідэолагам і арганізатарам

беларускага нацыянальнага руху. Рэдакцыя газеты вяла барацьбу супраць як вялікадзяржаўнага рускага, так і польскага шавінізму. Выступала за прызнанне беларускай нацыі і яе культуры, за раўнапраўе паміж народамі.

Газета была вымушана весці барацьбу з праўрадавымі акцябрысцка-чарнасоценскімі арганізацыямі, а таксама з польскімі памешчыцка-клерыкальнымі партыямі, якія імкнуліся асіміліраваць беларускі народ, далучыўшы праваслаўную частку беларусаў да рускіх, а каталікоў – да палякаў. Такія газеты, як «Окраины России», «Русское знамя», «Минское слово», «Северо-Западная жизнь» і іншыя адмаўлялі само існаванне самабытнага беларускага этнасу, гаварылі аб непатрэбнасці і немагчымасці адраджэння нашых нацыянальнай культуры, мовы, адукацыі.

У гэтых неспрыяльных умовах «Наша ніва» рашуча змагалася за нацыянальную спадчыну. адстойвала права народа на родную мову, заклікала да яе захавання. У № 35 «Нашай Нівы» за 1908 г. публіцыст Сяргей Палуян падкрэсліваў, што, толькі «адрадзіўшы мову, мы зможам паставіць на цвёрды грунт наш рух. Бо нацыянальны рух як вялікая жыццёвая гістарычная сіла можа жыць толькі тады, калі пад яго будзе падведзены такі фундамент, як гібка абробленая мова, дый літаратура і навука ў гэтай мове». У трох нумарах за 1912 г. (22, 23, 26) быў надрукаваны грунтоўны артыкул пад назвай «Ці маем права быць беларусамі?». У ім адзначалася: «Нязменны закон, якім кіруецца ўвесь свет: тварыць культурныя рэчы ўсясветнай вартасці можна толькі на сваёй роднай мове... Замяніць жа народу яго мову - гэта значыць забіць душу таго народа, яго асобенную творчаскую здольнасць. Мы, беларусы, не толькі маем права, але і павінны застацца беларусамі» [6, с. 177].

Разам з тым, у палеміцы з рускімі і польскімі шавіністычнымі выданнямі «Наша ніва» ніколі не сыходзіла на нацыяналістычныя пазіцыі, не атаясамлівала сваіх ворагаў з рускім і польскім народам, заўсёды падкрэслівала, што гэтыя народы маюць вялікую навуку і культуру, і беларусам трэба ведаць і вывучаць не толькі сваю, але і рускую, і польскую мовы. Так, у газеце ў перакладзе на беларускую мову друкаваліся творы такіх рускіх і польскіх аўтараў, як Э.Ажэшка, А.Міцкевіч, С.Жаромскі, У.Сыракомля, Л.Талстой, А.Чэхаў, М.Горкі і інш. «Наша ніва» адзначала юбілеі Л.Талстога, М.Гогаля, Т.Шаўчэнкі, Ф.Шапэна, Ч.Дарвіна.

Газета шмат зрабіла для развіцця беларускай літаратуры. На яе старонках пачыналі друкавацца М.Багдановіч, М.Гарэцкі, А.Гарун, З.Бядуля, Ц.Гартны і інш. Шэраг новых твораў беларускіх класікаў Я.Коласа, Я.Купалы ўбачылі свет менавіта на старонках «Нашай нівы». Газета папулярызавала беларускія тэатр, музыку, фальклор, займалася кнігавыданнем. Выдаўцы газеты лічылі сваім доўгам будзіць гістарычную памяць народа. У 1910 г. штотыднёвік з нумара ў нумар друкаваў «Кароткую гісторыю Беларусі» В.Ластоўскага.

У адрозненне ад «Нашай долі» «Наша ніва» адышла ад радыкальных рэвалюцыйных ідэяў. Вырашэнне асноўных сацыяльна-эканамічных пытанняў рэдакцыя звязвала ўжо не з рэвалюцыяй, а з Дзяржаўнай Думай. У

снежні 1906 г. у «Нашай ніве» былі надрукаваны патрабаванні да Дзяржаўнай Думы, якія высоўвала БСГ. Рэдактары газеты, лідэры БСГ, патрабавалі скасавання ўсіх абмежавальных законаў царызму адносна развіцця і жыццядзейнасці мясцовых нацыянальнасцяў, увядзення абавязковай бясплатнай народнай асветы з правам вучыцца на роднай мове. Рэдакцыя выступала за адмену цераспалосіцы, утварэння хутарской гаспадаркі, арганізацыю таннага крэдыту і дапамогі з боку дзяржавы для паляпшэння гаспадаркі, устанаўленне адзінага прагрэсіўнага падаходнага падатку і знішчэння ўскосных падаткаў на прадметы першай неабходнасці.

Газета падтрымлівала ідэю ўвядзення ўсесаслоўнай воласці (ураўнаванне ў правах і абавязках усіх жыхароў воласці незалежна ад саслоўнай прыналежнасці) і асобнага самакіравання для Беларусі, заснаванага на ўсеагульным роўным і прамым выбарчым праве з тайным галасаваннем.

На працягу ўсяго свайго існавання газета бараніла правы і інтарэсы беларускага працоўнага народа, народнай інтэлігенцыі, выступала ў ролі асветніцкага і культурнага цэнтру, была свайго роду «грамадскім інстытутам беларускай культуры» [9, с. 315].

### ***4. Беларуская мастацкая літаратура пачатку XX ст. як фактар фарміравання нацыянальнай свядомасці***

Вялікае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў у першыя дзесяцігоддзі XX ст. мела мастацкая літаратура. Літаратура эпохі беларускага адраджэння якасна адрознівалася ад рамантычнай шляхецкай літаратуры эпохі В.Дуніна-Марцінкевіча і А.Міцкевіча. Яе носьбіты, беларуская разначынная інтэлігенцыя, звярталіся ўжо не да паноў з надзеяй павярнуць іх да народа, а непасрэдна да мужыка-беларуса. Прадстаўнікі беларускай літаратуры пачатку XX ст. гаварылі ад імя народа і для народа, выкарыстоўвалі творчую народную вобразнасць, гаварылі на сакавітай народнай мове.

Найбольш вядомымі творцамі эпохі беларускага адраджэння былі Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, А.Пашкевіч (Цётка), Карусь Каганец, Андрэй Зязюля, Алесь Гарун і інш. Іх псеўданімы сведчаць аб іх накіраванасці на адлюстраванне пачуццяў і думак простага працоўнага народа.

Тэматыка творчасці беларускіх адраджэнцаў працягвала традыцыі, якія заклаў Ф.Багушэвіч. Яны развівалі ўзнятыя ім тэмы, працягвалі дзейнасць па фарміраванню беларускай нацыі.

Першапачатковым штуршком для творчасці большасці названых аўтараў стала іх цікаўнасць да беларускага фальклору. «І дома і ў цётак ён чуў аповяды пра родную мінуўшчыну, дзе выплывалі розныя асобы і падзеі, своеасаблівыя, загадкавыя, так не падобныя на ўсё, што вакол. Тут ён чуў і беларускую казку, і беларускую песьню з яе сумным прывабным напевам, поўным глыбокага невычэрпнага пачуцьця, тут чулася жывая беларуская прымаўка, трапныя «крылатыя» словы. Гэта, вядома, былі крупінкі, крохі, але ён чуйна іх падбіраў, хапаючы ў паветры», - пісаў бацька пра Максіма

Багдановіча [4, с. 11].

Захапленне народнай творчасцю натуральна прыводзіла да меркавання пра лёс свайго народа, падводзіла да імкнення забяспечыць яго ня горшае за іншых нацый існаванне. Калі суседзі – палякі, расейцы, летувісы, украінцы, латышы – маюць нацыянальныя літаратуры, родныя для гэтых народаў, дык чаму ж беларусам ня мець сваіх песняроў?

Янка Купала адзначаў, што яшчэ да пачатку сваёй творчасці «адчуваў сацыяльную ды нацыянальную крыўду да беларускага працоўнага люду… Усё ж я ўсьведамляў, што кніжка на беларускай мове не горшая ад астатніх, а нават лепшая, таму што ў ёй вялася гаворка пра гора блізкіх мне людзей, з якімі разам фізічна працаваў»:

*Кожны край мае тых, што апяваюць,*
*Чым ёсьць для народа ўпадак і хвала,*
*А беларусы нікога не маюць,*
*Няхай жа хоць будзе Янка Купала* [4, с. 11-12].

Перашкоды для нацыянальнага і сацыяльнага развіцця беларускага народа, для адраджэння беларускай культуры, якія існавалі ў Расійскай імперыі, прывялі беларускіх літаратараў у шэрагі палітычных нацыянальных арганізацый, перш за ўсё ў Беларускую сацыялістычную грамаду. Цесная сувязь культуры і палітыкі прывялі да своеасаблівага публіцыстычнага мастацкага стылю беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Гэта адзначае і даследчык У.Конан: «Нават у 1905-17 гг. беларуская літаратура, якая дасягнула вялікіх мастацкіх вышыняў, не была «чыстым» мастацтвам, якое б мела на першым пляне задачу – задаволіць спецыфічныя эстэтычныя патрэбы. Наадварот, яна была перш за ўсё сродкам нацыянальнага адраджэння беларускага народа, мастацкая творчасць адначасова была дзейнасцю палітычнай, грамадскай, навуковай, асветніцкай, інакш кажучы, дзейнасцю «утылітарнай»» [4, с. 27-28].

Адпаведна асноўнымі тэмамі беларускай літаратуры таго часу былі абуджэнне нацыянальнай свядомасці, прызыў да палітычнай і сацыяльнай барацьбы за свае правы.

Перш за ўсё беларускія літаратары ставілі задачу абудзіць народ, аднавіць яго веру ў сябе, свае сілы. Так, у вершы «Папросту» Янка Купала абмалёўвае маральнае аблічча беларускага народа:

*Простым мы словам з светам гаворым,*
*Песні аб цяжкай творым нягодзе,*
*З думкамі рвёмся к сонцу і зорам.*
*Рвёмся к свабодзе* [4, с. 53].

Паэт пералічвае лепшыя рысы ў характары беларускага народа, адзначаючы прастату, дэмакратызм, вернасць роднай зямлі. Беларус у паэта вылучаецца напоўненасцю ўнутранай годнасцю, цвёрдасцю і перакананасцю.

Беларускія літаратары сваёй творчасцю даводзяць існаванне беларускага народа, акрэсліваюць тэрыторыю яго пражывання:

*А хто брат мне тут і друг,*
*Ладзь-наладзь душу і слух*

*І за песняй думкай скоч*
*Там, дзе Нёман, Дзвіна, Буг*
*Точаць наша поле, луг,*
*Дзе шумяць у свет далёкі*
*Белавежа, Налібокі… (Я.Купала)* [4, с. 93].

Вызначальнай прыкметай беларускай нацыі, яе межаў, як і для Ф.Багушэвіча для іх з'яўляецца беларускамоўны абшар:

*Дзе дом мой, народ мой, - з якога я краю, -*
*Паслухайце смутную повесць маю. – …*
Спавядаецца Беларусь у вершы Я.Купалы -
*З канца ў канец, дзе загнанае слова*
*Звініць беларуса, - уладанне маё…*[4, с. 93].

«Нас восем мільёнаў!» - гэткімі словамі ў вершы «Маладая Беларусь» Янка Купала даводзіць шматлікасць нацыі. У сваіх творах літаратары старанна пашыраюць этнонім «беларусы». Паказваюць, што жаданне «тутэйшага люду» «людзьмі звацца», цесна звязана з усведамленнем імі сябе як самастойнай нацыі.

Беларускі народ звязвае не толькі мова, але і велічнае мінулае. Шмат твораў беларускія паэты-адраджэнцы прысвяцілі гісторыі беларускага народа. У іх творах паўстаюць Рагнеда і Усяслаў Чарадзей, Полацкае княства, Вялікае княства Літоўскае. Сярэднявечча паказана як час палітычнага і культурнага росквіту народа:

*У старыну Беларус, ні падданы,*
*Гаспадарыў, быў сам над сабою*
*І далёка ў свеці быў знаны*
*За літоўскай і ляшская зямлёю.*

Але ўсё змянілася:

*Але час прамінуў, і нядоля*
*На народ, як бы камень звалілась,*
*Беларуская слава і воля*
*Адыйшла, адцвіла, закацілась…*
*(Алесь Гарун)* [4, с. 64].

У час «нядолі» на гістарычным шляху беларускі народ перастрэлі «чужынцы»: у XVII-XVIII стст. – палякі, у XIX-XX – расейцы:

*Хто хацеў, той і смеў рабаваці,*
*Без прыпросу з'зджаліся госці –*
*Абдзіраць, аб'едаць, апіваці*
*І крышыць гаспадарскія косці (А.Гарун)* [4, с. 48-49].

Ворагамі беларускага народа выступаюць аднак не польскі і рускі народы, а класы прыгнятальнікі – паны-палякі і руская адміністрацыя. Менавіта апошнія галоўныя ворагі мужыка-беларуса. Але часы панавання падыходзяць да скону, хутка беларусы самі стануць «гаспадарамі ў сваім доме».

Фактычна, годнае мінулае нагадвала народа, што яшчэ ня ўсё страчана, што яно яшчэ можа быць адроджана. Але адраджэнне магло прыйсці толькі ў

барацьбе, уступіць у каторую народ мог толькі ўсвядоміўшы сваё цяжкае становішча, сваю «занядбалую сучаснасць». Менавіта таму, адным з самых распаўсюджаных матываў літаратуры пачатку XX ст., асабліва паэзіі, з'яўляецца гора, нядоля, крыўда беларускага мужыка, яго пакутлівае, невясёлае жыццё.

*Край наш бедны, край наш родны -*
*Гразь, балота ды пясок...*
*Край наш родны!*
*Бедны, голы,*
*Ты глядзішь як сірата,*
*Нудны ты, як наша доля,*
*Як ты, наша цямната.*

*Я.Колас «Наш край»* [6, с. 178].

Паэты спрабуюць дакрычацца да народа, каб ён паглядзеў збоку на свае пакутлівае жыццё і адчуў усю яго жахлівасць, несправядлівасць.

*Бацька голад мне быў,*
*Гадаваў і карміў;*
*Бяда маткай была,*
*Праца сілу дала.*
*Хоць пагарду цярплю,*
*Мушу быць глух і нем.*
*Хоць свет хлебам кармлю,*
*Сам мякіначку ем.*

*Я.Купала «Я мужык»* [6, с. 179].

Беларускія пісьменнікі-адраджэнцы суперажываюць народнаму жыццю, з пазіцый простага беларуса вызначаюць паняцці праўды і крыўды, справядлівасці і несправядлівасці, дабра і зла. І найбольш выразным сінонімам зла, няпраўды і несправядлівасці ў Я.Купалы з'яўляецца сінонім «крыўда». У сапраўдным народным гімне «А хто там ідзе?» менавіта глыбокая крыўда народная адзначаецца паэтам у аблiччы і поступе «грамады», але менавіта яна робіць мужыка не сляпым і глухім, як раней, а здольным на пратэст, на барацьбу за права «людзьмі звацца».

*А хто гэта іх,*
*не адзін мільён,*
*Крыўду несць навучыў,*
*разбудзіў іх сон?*
*— Бяда, гора.*
*А чаго ж, чаго захацелася ім,*
*Пагарджаным век,*
*ім, сляпым, глухім?*
*- Людзьмі звацца* [6, с. 179].

Праз асэнсаванне свайго цяжкага лесу паэты Адраджэння вядуць беларуса да разумення таго, што толькі барацьба можа выратаваць яго ад няволі і галечы, зрабіць вольным. Так, у сваім вершы «Змагайся» Цішка Гартны заклікаў свой народ:

*Мой брат, змагайся:*
*З нядоляй, з бядою –*
*Барыся, спрачайся*
*Да смерці ў бою…*[6, с. 180].

Але перамагчы ў барацьбе беларускі народ можа толькі пасля аб'яднання:

*Кінь сваркі і звадкі,*
*аднэй дзеці маткі,-*
*Мы злучаны думкай аднэй;*
*Пры згодзе і ладзе ў нас доля засядзе,*
*Палічаць і нас за людзей.*
*Я.Купала «За праўду»* [6, с. 180].

Тое ж пісаў і Я.Колас:

*А каб справіцца з няпраўдай,*
*З крыўдаю, з бядою,*
*Дык націснуць трэба людзям*
*Дружнай грамадою…*[4, с. 38].

Беларускія літаратары пачатку ХХ стагоддзя ў паэтычнай форме апісвалі тыя спадзяванні, мары, да якіх імкнуўся просты беларускі народ. Найбольш поўна мары сялян адбіліся у вершы Я.Купалы «Чаго нам трэба»:

*Трэба нам, трэба перш-найперш хлеба,*
*Хлеба, каб стала на цэленькі год,*
*Дроўцаў палена, конікам сена,*
*Капейку якую сабе на зварот.*

*Трэба нам, трэба, як сонца з неба,*
*Лепшы, даўжэйшы зямельны шнурок,*
*Сытай скацінкі, новай хацінкі,*
*Каб красаваўся пры хатцы садок* [4, с. 38].

Купала, фактычна, апісвае нармальнае чалавечнае жыццё для беларуса, якое выражаецца і ў тым, што ў сям'і павінны быць «боты на ногі, мультан жонцы на лепшы каптан». Далей згадваецца ім асвета і адукацыя: «Кніжак для дзетак, Трэба нам школы па вёсак прыдбаць». Затым – прававая дзяржава, што бараніла б інтарэсы грамадзянаў:

*Жыць смела ў хатцы і не баяцца,*
*Каб не ганялі у воласць, у стан.*

Потым ён згадвае бясплатную медыцыну, сацыяльнае забеспячэнне для абяздоленых [4, с. 38-39].

У творчасці беларускіх пісьменнікаў тэма сацыяльнага вызвалення - волі асабістай - неразрыўна звязана з тэмай нацыянальнага адраджэння, пабудовы сваёй дзяржавы:

*Дык хіба мы праў не маем,*
*Сілы шлях свой адзначаць*
*І сваім уласным краем*
*Край свой родны называць?*

*Я.Колас «Сымон-музыка»* [6, с. 181].

Найбольш дакладна праект палітычных і сацыяльных пераўтварэнняў, праграму нацыянальнай і сацыяльнай барацьбы выклаў Я.Купала ў вершы «Паўстань...» (1919 г.). «Ён адзначае, што, каб нацыя паўстала за волю і незалежнасць і перамагла ў барацьбе, яна павінна вылучыць з свайго асяроддзя «прарока», які мудрым словам змог бы скінуць з народа пакорлівасць, узбудзіць гістарычную памяць, сабраць усю Беларусь у адну сям'ю.

*Паўстань з народу нашага,*
*Прарок!*
*Зняць путы бацькаўшчыне устань,*
*Прарок!*

Аднак каб стаць рэальнай сілай, мяркуе паэт, ідэя павінна запаліць людскія сэрцы. Таму побач з выдатным Прарокам павінен стаць выдатны Пясняр, які б, «як бура, загудзеў пад звон кайдан», распаліў бы «у сэрцах спячых» свяшчэнны пажар.

*«Збудзіць нябожчыкаў паўстань, Пясняр!»*

І калі загнаныя, змардаваныя людзі ўзнімуць горда галовы, гатовыя да змагання, на чале іх павінен паўстаць таленавіты, смелы, самаадданы палкаводзец, які павядзе іх у бой за бацькаўшчыну, за яе свабоду і незалежнасць.

*Паўстань з народу нашага,*
*Ваяк!*
*Свой край заваяваць паўстань,*
*Ваяк!*

Лагічнае завяршэнне высілкаў Прарока, Песняра і Ваяка бачыць у стварэнні Беларускай дзяржавы, на чале якой павінен стаць Уладар.

*Паўстань з народу нашага,*
*Уладар!*

Такім чынам, у вершы «Паўстань...» Я. Купала вылучыў свае разуменне кіруючых сіл нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Пры гэтым паэт, несумненна, меў на ўвазе гістарычны вопыт некаторых суседніх дзяржаў, у якіх у розныя часы існавалі і буйныя мысліцелі, і паэты, і палкаводцы, і дзяржаўныя дзеячы. Розніца толькі бачылася Купалу ў тым, што ў беларусаў яны павінны былі з'явіцца адначасова і неадкладна» [6, с. 181-182].

Прадстаўнікі беларускай мастацкай літаратуры пачатку XX стагоддзя працягвалі працэс фармавання беларускай нацыі: адраджалі яе гісторыю, нармавалі беларускую літаратурную мову, абуджалі нацыянальную годнасць народа. Яны фактычна ўзначалілі барацьбу беларускага народа за нацыянальныя і сацыяльныя правы, закладвалі «векапомныя падваліны дзеля адраджэння свайго народа, дзеля адбудавання незалежнасці, сваёй беларускай дзяржаўнасці» [6, с. 182].

***5. Пытанні нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў творчай спадчыне ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху (І.Луцкевіча, А.Луцкевіча, Я.Лёсіка, В.Ластоўскага, А.Смоліча, А.Цвікевіча)***

«Пачатак XX ст. даў цэлую плеяду нацыянальных дзеячаў, якіх можна аднесці да сапраўдных пракокаў нацыянальнай ідэі. Змагары за незалежную і вольную Беларусь імкнуліся наладзіць парваную сувязь часоў, аднавіць гістарычныя традыцыі. Каб лепш зразумець вытокі нацыянальных праблем, яны аналізавалі геапалітычнае становішча Беларусі, культурна-цывілізацыйныя ўплывы на яе Захаду і Усходу з пункту гледжання адмоўных або станоўчых наступстваў для яе развіцця. Яны былі ўпэўнены, што Беларусь мае права (і здольна яго рэалізаваць) на свабоднае, дэмакратычнае развіццё, што беларускі народ знойдзе ў сабе сілы дамагчыся дзяржаўнай незалежнасці і заняць свой ганаровы пасад сярод іншых народаў. «Незалежнасць,- пісаў у 1921 г. беларускі нацыянальны дзеяч, відны вучоны-эканаміст Аркадзь Смоліч,- гэта найвышэйшая мэта, да якой ідуць народы, той кумір, якому ў ахвяру аддаюць яны сваіх лепшых сыноў. Мы ведаем належны кірунак. Справа незалежнасці Беларусі ёсць цяпер толькі справа часу».

На думку ідэолагаў адраджэння, такі напрамак ляжаў перш за ўсё праз адукацыю і выхаванне народа. «Мусім здабываць незалежнасць, будуючы школы, арганізацыі, друкуючы кнігі, збіраючы і павялічваючы культурнае багацце і духоўныя сілы нашага народа», - папярэджваў Аркадзь Смоліч. Бо толькі адукаваны народ зможа зразумець неабходнасць змагання за незалежную, вольную дзяржаву, за адраджэнне нацыянальнай культуры, за аб'яднанне і развіццё нацыі. «Народ - добрая рэч, але яму трэба расказаць, растлумачыць, яго трэба спачатку асвяціць, навучыць, а ўжо потым клікаць да сябе на нараду...», - пісаў старшыня Рады БНР, рэдактар нацыянальнай газеты «Вольная Беларусь» Язэп Лёсік.

Беларускія ідэолагі былі ўпэўнены ў тым, што галоўнымі сродкамі выхавання народа служаць нацыянальная мова і гістарычная традыцыя. Без мовы і нацыянальнай гісторыі ні адзін народ не зможа ўстаяць, ён непазбежна будзе асіміляваны іншымі народамі, знікне, растворыцца паміж імі. «Мова і гісторыя - гэта найпатрэбнейшыя і найдаражэйшыя скарбы народа», - падкрэслівалі амаль што ўсе ідэолагі беларускага адраджэння.

«Народ, - падкрэсліваў Я.Лёсік, - трэба навучыць, яму трэба наказаць, што пакуль не запануе ў краі яго родная беларуская мова, да таго часу ён будзе бедны, цёмны і галодны». Мысліцель бачыў прамую залежнасць паміж мовай, культурай і станам нацыянальнай, палітычнай і эканамічнай свабоды.

У галіне беларускай філалогіі вядомы ўплыў аказалі наступныя працы: Антона Луцкевіча - «Як правільна пісаць па-беларуску» і «Беларускі правапіс», Я.Лёсіка - «Практычная граматыка беларускай мовы», В.Ластоўскага - «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» і інш.

Кіраўнікамі беларускага нацыянал-дэмакратычнага руху былі распрацаваны шматлікія праблемы гісторыі беларускага народа. Імі, па

сутнасці, былі закладзены асновы нацыянальнай гістарычнай навукі. На думку беларускіх мысліцеляў, нацыянальная гісторыя павінна была вырашыць дзве ўзаемна абумоўленыя задачы: аднавіць гістарычную памяць народа і стаць падмуркам стварэння нацыянальнай дзяржавы. У разглядаемы перыяд асаблівае значэнне мелі такія гістарычныя даследаванні, як: «Чатырохсталецце першага кодэкса беларускага права» і «Статут Вялікага княства Літоўскага на фоне эвалюцыі нацыянальных адносін у Беларусі» Антона Луцкевіча, працы па гісторыі уніяцкай царквы яго брата Івана Луцкевіча, даследаванні ў галіне палітычнай і сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі Мітрафана Доўнар-Запольскага і інш. Пачэснае месца ў справе фарміравання гістарычнай свядомасці беларускага народа належала Вацлаву Ластоўскаму, які у 1910 г. у Вільні надрукаваў «Кароткую гісторыю Беларусі». Кніга ўяўляла сабой спробу стварэння першага падручніка на беларускай мове па гісторыі Беларусі. Новым у працы Ластоўскага было тое, што ён першым паказаў беларускі народ не толькі як аб'ект гісторыі, залежны ад волі суседніх народаў, але і як гістарычны суб'ект, творцу свайго лесу.

У прадмове да «Падручнага расійска-крыўскага слоўніка» ён даў сваю перыядызацыю гісторыі Беларусі паводле дзяржаўнага вызначэння: крыўска-рускі перыяд (X-XIII стст.), літоўскі перыяд (да 1386 г.), літоўска-польскі (да канца XVIII ст.) і расійска-беларускі перыяд (ад канца XVIII ст.). Ластоўскі рашуча адпрэчваў назвы «Беларусь», «беларусы», лічыў іх выдумкай расійскіх вялікадзяржаўных ідэолагаў і прапанаваў старую племянную назву: крывічы, Крывія. «Мы Крывічы, а не Русь Літоўская, Варажская ці Маскоўская, Белая ці Чорная; мы асобны славянскі народ»,- падкрэсліваў гісторык.

Пазней, у 1926 г., аналізуючы прычыны росквіту і заняпаду народаў і дзяржаў у артыкуле «Што спрыяе росту і упадку народаў і дзяржаў», Ластоўскі падкрэсліваў, што здаровае развіццё нацыі можа быць забяспечана толькі яе палітычнай незалежнасцю. На думку мысліцеля, нацыянальная дзяржава беларускага народа павінна быць пабудавана з улікам гістарычных рэспубліканскіх традыцый, уласцівых нашай краіне. Передумову для стварэння беларускай дзяржавы бачыў у гісторыі народа і славуты беларускі навуковец першай чвэрці XX ст. Мітрафан Доўнар-Запольскі. У перакладзенай на некалькі еўрапейскіх моў брашуры «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» (1919 г.) ён адзначаў, што «народ, каторы праз колькі сот гадоў самага цяжкага гістарычнага жыцця, нягледзячы на вострую нацыянальную барацьбу, на ўціск урада найдужэйшай на свеце дзяржавы не ўтраціў сваёй нацыянальнай самабытнасці, народ, меўшы праз некалькі стагоддзяў сваю дзяржаўную незалежнасць, народ, каторы мае вытворную вякамі культуру і літаратуру, свае яркія асаблівасці этнаграфіі і мовы - такі народ мае і цяпер усе правы на дзяржаўную незалежнасць».

Пытанне пабудовы незалежнай дзяржавы разглядалася беларускімі мысліцелямі з пункту гледжання не толькі гістарычных каранёў нацыі, але і яе сацыяльнай асновы. «Мы - нацыя сялянская, мужыцкая, аднародная ў сваёй масе па сацыяльнаму становішчу, нацыя без сваёй нацыянальнай

буржуазіі і са сваёй чыста мужыцкай нацыянальнай інтэлігенцыяй», - падкрэсліваў вучоны-філолаг і літаратурны крытык Максім Гарэцкі. З улікам гэтай асаблівасці беларускай нацыі і неабходна, на яго думку, распрацоўваць праграму нацыянальнага адраджэння Яна павінна ўлічваць інтарэсы беларускага мужыка-земляроба. А таму, што гэтыя інтарэсы не здольныя задаволіць ні панскі сойм Польшчы, ні маскоўскія бальшавікі з незразумелай для беларуса ідэяй «дыктатуры пралетарыяту», адзіным выразнікам спадзяванняў беларускай нацыі можа быць Беларускі Устаноўчы Сойм, у якім ніколі не возьмуць верх беларусы-паны, таму што гэта нацыя без паноў.

«Дыктатуру пралетарыяту», якая панавала ў беларускім краі пасля перамогі бальшавікоў, Гарэцкі называў фікцыяй замест ідэі, маной, створанай вайной, фронтам, голадам, рэвалюцыяй, патугай на сацыялізм, якая здзяйсняецца зусім не пралетарыятам, а сурагатам, створаным таксама вайной, выпадковым і ў масе сваёй не столькі рэвалюцыйным, колькі «індывідуальна-хцівым, прагавітым, індывідуальна-драпежным».

Такім чынам, рэвалюцыйныя падзеі 1917-1921 гг. больш дакладна вызначылі падыходы беларускіх ідэолагаў да пытання аб форме нацыянальнай дзяржаўнасці. Усё часцей у параўнанні з папярэднім перыядам гучыць думка аб тым, што рэалізаваць сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя патрэбы народа магчыма толькі ў сапраўды незалежнай Беларусі. «Дык якое бы райскае жыццё ні дэкляравалі нам маскоўцы, палякі ці нават ліцьвіны, мы - прапашчыя, няшчасныя людзі датуль, пакуль не зрэалізуем свайго незалежнага гаспадарства... бо і пры самай лепшай развязцы пытання аб сваёй залежнай ад іншага народа будучыні мы будзем мець горшую долю, чым пры самым благім ладзе незалежнага жыцця»,- быў упэўнены М.Гарэцкі.

«Адзіны лозунг, які павінен аб'яднаць нацыянальныя арганізацыі рознага палітычнага накірунку,- лічыў адзін з лідэраў нацыянальна-вызваленчага руху Аляксандр Цвікевіч,- гэта свабодная і незалежная Беларусь». Разам з тым, ідэолаг падкрэсліваў, што «...мы жадаем поўнай незалежнасці ад другіх, не адкідаючы ў той самы час прынцыпа саюзу з другімі суседнімі народамі ў справах эканамічных, стратэгічных і г.д.»

Ідэолагі беларускага адраджэння пачатку XX ст. не толькі тэарэтычна абгрунтавалі неабходнасць усталявання нацыянальнай дзяржавы, але і практычна імкнуліся да рэалізацыі гэтай ідэі. Іхнімі намаганнямі была здзейснена спроба ўтварэння нацыянальнай дзяржавы ў сакавіку 1918 г. калі Рада БНР прыняла Акт Незалежнасці Беларусі. Але як сапраўдныя нацыянальныя прарокі, беларускія мысліцелі-адраджэнцы разумелі, што шлях да незалежнасці доўгі і цярністы, што барацьба толькі пачынаецца, што яна патрабуе шматлікіх ахвяр. «Незалежнасць,- быў упэўнены А.Смоліч,- гэта рэзультат напружанай працы пакаленняў... Мусім, урэшце, быць прыгатаванымі і да ўсякіх акупацый, раздзелаў нашай Бацькаўшчыны, страшнага нацыянальнага прыціску, каб магчы і пры гэтых - можа, найцяжэйшых варунках будаваць далей гмах незалежнасці». Ён лічыў, што перамога прыйдзе тады, калі беларускае грамадства адчуе каштоўнасць незалежнасці, калі само захоча даць тыя ахвяры, якія ад яго вымагае

барацьба.

Прарочыя словы выдатных сыноў Беларусі не страцілі сваёй актуальнасці і сёння» [6, с. 182-188].

### *6. Нацыянальна-дзяржаўная ідэя ў праграмах беларускіх палітычных арганізацый (1914-1919 гг.)*

«Першая сусветная вайна актывізавала нацыянальна-вызваленчы рух беларусаў. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная і Кастрычніцкая рэвалюцыі ў Расіі падштурхнулі беларускія палітычныя партыі да тэарэтычнай распрацоўкі і практычнай рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнай дзяржаўнасці.

Восенню 1915 г., у выніку паражэння расійскай арміі, Беларусь была падзелена на дзве часткі: Заходнюю, акупіраваную немцамі, і Усходнюю, якая засталася ў складзе Расіі. Значная частка беларусаў, згодна з планамі эвакуацыі, апынулася на тэрыторыі Расіі. Беларускія асяродкі з'явіліся ў Петраградзе, Маскве, Кіеве і іншых месцах. Такім чынам, пачынаючы з 1915 г. ствараецца некалькі цэнтраў беларускага вызваленчага руху: у зоне нямецкай акупацыі з цэнтрамі ў Вільні, у Мінску і ў асяродках беларусаў-бежанцаў у расійскіх гарадах. Напярэдадні рэвалюцый 1917 г. усе гэтыя цэнтры распрацоўвалі канцэпцыю беларускай дзяржавы і вялі барацьбу за яе рэалізацыю.

Розныя палітычныя ўмовы, у якіх дзейнічалі беларускія нацыянальныя арганізацыі, паўплывалі на саму пастаноўку пытання аб нацыянальнай дзяржаўнасці. Так, напрыклад, Віленскі цэнтр арыентаваўся на цэнтральнаеўрапейскія краіны і ставіў сваёй мэтаю пабудову беларускай дзяржавы, якая павінна быць незалежнай ад Расіі. Мінскі цэнтр і беларускія бежанскія арганізацыі знаходзіліся пад моцным уплывам рэвалюцыйных падзей у Расіі і, улічваючы настрой народных мас, шукалі згоды рэвалюцыйных улад на прадстаўленне Беларусі аўтаноміі ў складзе Расіі.

У канцы 1915 г. у Вільні ствараецца Віленска-Ковенскі камітэт, у які ўвайшлі прадстаўнікі беларускіх, літоўскіх, польскіх і яўрэйскіх суполак. 19 снежня 1915 г. гэты камітэт выдаў Універсал, у якім абвяшчалася ідэя стварэння незалежнай дзяржавы па тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага - канфедэрацыя, дзе ўся ўлада будзе належаць народу. Але гэтая ідэя не знайшла шырокай падтрымкі ў беларускага насельніцтва.

Каардынацыйным органам беларускіх палітычных, грамадскіх і прафсаюзных арганізацый на часова акупіраванай тэрыторыі быў Беларускі народны камітэт (БНК). У яго ўваходзілі прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групы (частка БСГ), Віленскіх камітэтаў БСГ, Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны, рэдакцыі каталіцкага штотыднёвікі «Беларус» і іншых арганізацый. Узначальваў БНК А.І.Луцкевіч. Камітэт наладжваў сувязі з нацыянальнымі камітэтамі краю, імкнуўся бараніць інтарэсы беларусаў перад нямецкімі акупацыйнымі ўладамі.

Разам з тым, кіраўнікі БНК добра разумелі, што галоўнай умоваю рэалізацыі нацыянальнай ідэі з’яўляецца выхаванне нацыянальна-свядомых

грамадзян, гатовых на любыя ахвяры дзеля стварэння беларускай дзяржавы. «Дзяржава, - пісаў орган БНК газета «Гоман», - можа быць знішчана, разбіта, ды яна, у канцы канцоў, адбудуецца нанова, калі толькі сам народ захавае ў сабе іскру жыцця, творчую сілу».

У справе выхавання і адукацыі народа БНК надаваў вялікую ўвагу асобе настаўніка. Для падрыхтоўкі настаўнікаў у лістападзе 1915 г. былі створаны настаўніцкія курсы ў Вільні. У Свіслачы пачала дзейнічаць настаўніцкая гімназія, у якой выкладалі такія выдатныя дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння, як А.Луцкевіч, В.Ластоўскі, А.Пашкевіч (Цётка).

Нацыянальна-дзяржаўная ідэя атрымала далейшае развіццё ў праграме арганізацыі «Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі», створанай Вацлавам Ластоўскім у 1916 г. У ёй падкрэслівалася ідэя аб тым, што беларусам не трэба шукаць замежнай арыентацыі ў вырашэнні пытання аб сваёй будучыні, звязваць свой лес з Польшчай або Расіяй. Праграма заклікала суайчыннікаў арыентавацца на пабудову асабістай незалежнай дзяржавы, абапіраючыся на ўласныя сілы. З гэтай ідэяй В.Ластоўскі разам з І.Луцкевічам звярнуліся да міжнароднай супольнасці на канферэнцыях еўрапейскіх нацый, якія праходзілі ў Стакгольме і Лазане ў 1916 г.

На Лазанскай канферэнцыі ў выступленні І.Луцкевіча была прадстаўлена таксама ідэя Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора. Але ж аб'яднанне нацыянальна-вызваленчых рухаў пад лозунгам Злучаных Штатаў не адбылося. Літоўцы, баючыся асіміляцыі беларускай большасцю, у 1917 г. стварылі Літоўскую Тарыбу. У склад яе па патрабаванню Германіі ўвайшлі і акупаваныя беларускія тэрыторыі. У студзені 1917 г. на канферэнцыі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху, насуперак Літоўскай Тарыбе, была створана Віленская Беларуская Рада, якая падтрымлівала канцэпцыю суверэннай дзяржавы, высунутую арганізацыяй «Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі». У сакавіку 1918 г. яе прадстаўнікі ўдзельнічалі ў працы Рады БНР. Пад іх уплывам была прынята III Устаўная грамата, якая абвясціла незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Мінск пераўтвараецца ў сапраўдны палітычны цэнтр беларускага нацыянальнага руху. 25-27 сакавіка ў Мінску адбыўся з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый як левага, так і правага напрамкаў. На ім быў абраны выканаўчы орган - Беларускі Нацыянальны Камітэт (БНК). З’езд даручыў камітэту пачаць распрацоўку канстытуцыі «Беларускага краявога ўрада». Разам з тым, з’езд выказаўся ў падтрымку Часовага Урада і заявіў аб неабходнасці перадачы выканаўчай улады на тэрыторыі Беларусі БНК, а таксама прадастаўлення Беларусі аўтаноміі ў складзе Расіі.

БНК, а потым і Цэнтральная Рада (ЦРБ), абраная II з’ездам беларускіх нацыянальных арганізацый, неаднаразова звярталіся да Часовага Урада з патрабаваннем даць дазвол на стварэнне ў Беларусі органаў мясцовага кіравання, а таксама на арганізацыю нацыянальных вайсковых фарміраванняў. Але Часовы Урад адхіліў гэтыя прапановы. У кастрычніку 1917 г. для каардынацыі дзеянняў нацыянальных арганізацый ЦРБ была

пераўтворана ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР), у склад якой увайшлі і прадстаўнікі Цэнтральнай Вайсковай Беларускай Рады. Для канчатковага вырашэння пытання аб стварэнні беларускай дзяржавы ВБР паставіла перад сабою задачу падрыхтаваць скліканне Усебеларускага з'езда.

На Усебеларускім з'ездзе, які праходзіў у снежні 1917 г., верх узялі прыхільнікі ідэі аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі. Дэлегаты з'езда прынялі рэзалюцыю аб утварэнні на беларускім этнічным абшары краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета сялянскіх і рабочых дэпутатаў. Нягледзячы на дэклараванае бальшавікамі права нацый на самавызначэнне, ён быў разагнаны савецкай уладай у асобе Аблвыканкамзаха (Выканкам Саветаў Заходняй вобласці і фронту). На думку кіраўнікоў Аблвыканкамзаха, беларускія губерні павінны былі ўвайсці ў склад РСФСР як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка.

Разгон з'езда паскорыў эвалюцыю ідэі нацыянальнага руху ад канцэпцыі аўтаноміі да канцэпцыі поўнай незалежнасці дзяржавы. Ужо 18 снежня 1917 г. на падпольным пасяджэнні членаў прэзідыума Усебеларускага з'езда было вырашана рыхтавацца дьоа ўзброенай барацьбы за ідэалы беларускай дзяржаўнасці. 25 сакавіка 1918 г. была зроблена спроба практычна рэалізаваць ідэю суверэннай Беларусі ў абвяшчэнні незалежнасці БНР.

Такім чынам, мэта стварэння беларускай незалежнай дзяржавы аб'ядноўвала ўсе плыні беларускага нацыянальнага руху. І правая нацыянальна-дэмакратычная, і левая, радыкальна-сацыялістычная плыні цвёрда стаялі на пазіцыі прызнання права беларускага народа на самавызначэнне. І калі першыя спрабавалі яго рэалізаваць абвясціўшы ў сакавіку 1918 г. незалежную Беларускую Народную Рэспубліку, то другія рэалізавалі канцэпцыю аўтаноміі праз утварэнне БССР» [6, с. 188-194].

## *7. Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі) і яго эсэ «Адвечным шляхам»*

Ігнат Абдзіраловіч - гэта псеўданім, узяты з аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы». Сапраўднае імя аўтара - Ігнат Уладзіміравіч Канчэўскі. Ён нарадзіўся ў маі 1896 году ў сям'і сакратара акруговага вайсковага суду. Вучыўся ў Віленскай рэальнай вучэльні, пасля заканчэння якой паступіў у Пецярбуржскі тэхналагічны ўніверсітэт. Але цікавілі яго больш літаратура і філасофія. Да таго ж, ён далучыўся да нацыянальна-дэмакратычнага руху (падзяляў праграму эсэраў), і, у выніку, перавёўся на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэту.

Пасля сканчэння вайсковай службы ў час Першай сусветнай вайны увосень 1917 году Ігнат Канчэўскі паступіў на вышэйшыя кааператыўныя курсы пры Народным універсітэце імя А.Шаняўскага ў Маскве. Працаваў у Цэнтральным саюзе льнаводаў у Смаленску. У Савецкай Беларусі быў інструктарам Саўнаргасу ў Менску. Пазней жыве ў Вільні і працуе ў Саюзе беларускіх кааператараў, кіруе вучнёўскім гуртком геаграфіі ў Віленскай беларускай гімназіі, з'яўляецца сябрам Беларускага навуковага таварыства ў Вільне. Вершы і артыкулы Ігната Канчэўскага друкаваліся ў газетах «Наш

сцяг», «Наша думка», «Беларускія ведамасці», «Наша будучыня». Хворы на сухоты, Ігнат Канчэўскі памёр 21 красавіка 1923 году, на дваццаць сёмай вясне жыцця ў акупаванай палякамі Заходняй Беларусі, у Вільні.

Найбольш вядомым творам І.Абдзіраловіча стала філасофскае эсэ «Адвечным шляхам». Тэкст эсэ упершыню быў выдадзены ў Вільні ў 1921 годзе невялікім накладам, а потым каля шасцідзесяці год праляжаў у сховах спецфондаў. Наступная публікацыя тэксту адбылася толькі ў 1988 годзе.

Твор напісаны ў час, калі ў сусветнай філасофіі адбывалася руйнаванне ўніверсальных схемаў, пераацэнка каштоўнасцяў, калі на змену класічнай філасофіі прыходзіць мадэрнавы пошук новых форм. Акурат на гэты час прыпадае папулярнасць нігілістычных ідэй Фрыдрыха Ніцшэ і з’яўленне канцэпцый Шпенглера (першы том ягонага «Закату Еўропы» пабачыў свет у 1920 годзе), Анры Бергсана.

Варта адзначыць і тое, што час змены парадыгмы ў еўрапейскім мысленні на пачатку ХХ стагоддзя супаў з палітычнымі і сацыяльнымі пераўтварэннямі ў Беларусі, дзе ў гэты перыяд адбываецца фармаванне ўласнай ідэнтычнасці, што праяўляецца ў культуры Беларускага адраджэння, а ў палітыцы – у імкненні да пабудовы незалежнай дзяржавы. Безумоўна, што ў такім кантэксце пытанне беларускай ідэнтычнасці і пошуку сваіх ідэалаў было надзвычай актуальным.

Ужо ў назве тэксту - «Адвечным шляхам» - у спалучэнні з падназовам «Дасьледіны беларускага сьветагляду» адразу зададзены кантэкст беларускай ідэнтычнасці. Прычым, «шлях» можа разглядацца як адзін з архетыпаў, што злучае мінуласць і будучыню, мае позірк, звернуты наперад, да праменных ідэалаў. Менавіта шлях, а не ідэя, бо ідэя, здзяйсняючыся, увасабляецца ў застылыя формы, мярцвее і заканчвае існаванне; шлях жа сягае ў бясконцасць. «Адвечны» азначае тут нешта такое, што паходзіць з сівой даўніны, але існуе і цяпер - г.зн. нешта нязменнае, заўсёднае. Такім чынам, ужо ў назве тэксту паведамляецца пра нейкі заўсёды існы беларускі шлях, ад якога немагчыма ўхіліцца і які мусіць спраўдзіцца [10].

Першы раздзел працы прысвечаны беларускай ідэнтычнасці ў сістэме Захад - Усход. Да пытання беларускай ідэнтычнасці звярталіся ў той час многія аўтары (В.Ластоўскі, Дрыгвіч, Янка Купала, Тадэвуш Урублеўскі, Альбін Стаповіч, Усевалад Ігнатоўскі ды інш.). Усе гэтыя аўтары вызначалі прыналежнасць Беларусі да адной з цывілізацый, але толькі ў Абдзіраловіча статус Беларусі супадае са статусам мяжы паміж Захадам і Ўсходам. Мяжа, якая зазвычай акрэслівае, фармуе нацыю, у дадзеным выпадку становіцца яе ідэнтычнасцю.

Аўтар не сумняваецца ў існаванні свайго шляху, не звязанага з усходнім ці заходнім цэнтрам культуры, ён бачыць яго ў шматвяковай гісторыі, цягам якое, паводле Абдзіраловіча, толькі тыя творчыя асобы, што не аддавалі пераваг ніводнаму з бакоў, рабіліся нацыянальнымі героямі ці геніямі - Скарына, Усяслаў Чарадзей [10].

Праблемы беларускага народа аўтар звязвае з падзеленасцю (падвойнасцю) беларускай культуры і адсутнасцю «ўласных формаў жыцця».

Кажучы пра падвойнасць, аўтар найперш мае на ўвазе падзеленасць Беларусі паміж Захадам і Ўсходам на каталікаў і праваслаўных. «Рэлігія ў гэтым выпадку выступае ня проста як разнавіднасць веравызнання, але як носьбіт нечага большага. Яна з'яўляецца знакам, сымбалем у гегелеўскім разуменні, адзінствам, змест якога пераважае над формай. Гэта азначае, што асоба, якая стаіць перад выбарам рэлігіі, выбірае адначасна і пэўны тып цывілізацыі, культурную традыцыю, светагляд, грамадскі і дзяржаўны лад…» [1].

Аднак для Абдзіраловіч не прызывае пазбавіцца ад уплываў праз іх адмаўленне, а прапагандуе ідэю сінтэзу супрацьлеглых тэндэнцый, з'яднання іх у адно - каб на гэтай аснове будаваць уласную сістэму каштоўнасцяў. Дзеля таго ён даволі падрабязна аналізуе гісторыю гэтых уплываў, сродкі, праз якія адбываецца ўплыў.

Аўтар разглядае «гісторыю ваганняў беларусаў паміж Усходам і Захадам» і дае выразныя характарыстыкі абодвух. Яны на думку Абдзіраловіча, прадстаюць у якасці двух супрацьлегласцей. Усход увасабляе схільнасць да ўсяго скрайняга, выразнага, ярка падкрэсленага; імкненне да агульнай, «адналітнай» формы, з чаго з неабходнасцю вынікае ідэя адзінай палітычнай формы, як то «ўся ўлада цару» (манархізм) ці «ўся ўлада саветам» (таталітарызм). Пры гэтым любая незадаволенасць наяўнай сітуацыяй непазбежна вядзе да поўнага перакруту: белае становіцца чорным, чорнае - белым (супрацьлегласці мяняюцца месцамі, па сутнасці, нічога не змяняючы). Такім чынам, ува ўсходняй карціне свету ёсць толькі чорнае і белае (г.зн. прызнаецца толькі існаванне дзвюх скрайнасцяў, калі адмаўляецца існаванне трэцяга). На думку Абдзіраловіча, імкненне Ўсходу «ахапіць усё адзінаю формаю, без жалю адмятаючы ўсё непадобнае», даводзіць да абсурду як у палітыцы, так у сацыяльным і духоўным жыцці.

Захад увасабляе поўную супрацьлегласць Усходу. Тут няма і не можа быць адзінай формы, як у палітыцы (адсутнасць ідэі адзінай імперыі), так і ў духоўным і сацыяльным жыцці (няма адзінай рэлігіі). Змаганне паміж варожымі кірункамі часта можа ўзнікнуць, але даволі хутка барацьба сцішваецца і, супакоіўшыся, варожыя кірункі мірна суіснуюць разам (пасля падзення II Інтэрнацыяналу еўрапейскі сацыялізм мірна суіснуе з капіталізмам). Варожыя бакі шукаюць паразумення да часу, пакуль няма значнай перавагі аднаго з іх. Аснова заходнееўрапейскіх адносін - кампраміс. Адпаведна, яна адмаўляе адзіна правільнае ды імкнецца да разнастайнасці. Для Захаду характэрны прынцып «ня толькі ня лічыць шэрае чорным, але сьцерагчыся і белае назваць белым. І глыбокія народныя гістарычныя дасьледзіны навучылі нас, што калі заходні чалавек робіць вам прыемнасьць, дык гэта ня знача, што з яго боку ня будзе прыкрасьці. Яго пацалунак сьведчыць ня толькі аб прыхільнасьці, але і аб магчымасьці здрады…

Гэтая рыса Захаду моцна адчувалася ў яго адносінах да нас. Ён прынёс нам найлепшыя ідэі: гуманістычныя, ліберальныя, дэмакратычныя, але разам з пекнымі словамі заўсёды зьмяшчаліся гвалт духоўны і эканамічны, эксплёатацыя, ўціск, зьнявага. Пекныя словы і благія дзеі неяк дзіўна і незразумела для нас ужываліся ў заходнім жыцьці» [1].

І Захад і Усход маюць шмат прывабных рысаў, таму беларусы павінны імкнуцца да сінтэзу, «згарманізаваньня абодвух кірункаў».

Другі раздзел прысвечаны аналізу форм жыцця. Гісторыя Еўропы разглядаецца Абдзіраловічам як гісторыя усталявання тых ці іншых формаў жыцця і іх заняпаду. На яго думку прыхільнасць да стала вызначанай формы (стэрэатыпаў у дзейнасці адміністрацыі, войска, традыцый рэлігіі, права, побыту і г.д.) была выклікана «барбарскай няўмеласцю спраўляцца з усёю грамадою і рознасцю жыцьцёвых праяў». З-за страху зменаў народы пераймаюць або ствараюць формы свайго жыцця і слепа трымаюцца іх аўтарытэту, у той час, як усім павінна быць зразумела, што пры гарманічных суадносінах грамадства і асобы няма патрэбы ў адной дакладна вызначанай форме і маецца месца для творчасці форм.

«Чым слабей разьвіта духовасьць чалавека, тым большую вагу набірае форма: звычай, догмат, дактрына, незразумелы лёзунг… І вось большасьць эўрапэйскага грамадзянства (і Захад і Усход) набывае ідэялёгію, якую можна назваць духовым мяшчанствам. Яно ня лічыцца са зьменнасьцю, вечнай цякучасьцю жыцьця; вечная патрэба зьмяняцца, шукаць новага - надта марудная і клапатлівая праца. Адсюль выплывае прыхільнасьць да рознага роду аўтарытэтаў, пашана да пісаных законаў і канстытуцыяў, зацьверджаньне дактрын, ўстаноўленай маралі; паважаньне сваіх і чужых «цьвёрдых» перакананьняў, здольнасьці чалавека пасьвяціць ім сваё жыцьцё, ня гледзячы на тое, ці адпавядаюць яны яго ўнутранаму перакананьню, ці не: ўсё гэта ня робіць клопату ў кожным выпадку думаць, як трэба рабіць, і зьвяртацца да ўласнага сумленьня»[1].

Сляпая прывязанасць да аўтарытэтаў - духовае мяшчанства – навязваецца з дапамогай двух сілаў: моды і дысцыпліны. І з Захаду, і з Усходу на Беларусь ажыццяўляецца экспансія культурных стэрэатыпаў праз моду (добраахвотна) і праз дысцыпліну (прымусова). Беларусы ж павінны разумець, што пры ўсёй аб’ектыўнасці існавання формы, яна павінна быць здольнай да зменаў, «элястычная, цякучая, зьменная», адпаведная жыццю, што «ліецца, як рака». Народ, лічыў філосаф, павінен знайсці такую форму, якая б не стала ланцугом, стрымліваючым народную творчасць.

У трэцім раздзеле аўтар назірае творчасць - як касмічную сілу і як жыццёвую падставу, а таксама акрэслівае патрэбу сацыяльнай творчасці. Абдзіраловіч аналізуе сучасныя яму палітычныя рухі ў кантэксце прынцыпу сацыяльнай творчасці і робіць выснову пра неадпаведнасць іх гэтаму прынцыпу.

На ягонае меркаванне, сацыяльныя ідэалы спрабуюць здзейсніць шляхам захопу палітычнай улады. Аднак, раз грамадства падзелена на класы і кожная партыя грунтуецца на пэўным класе, то, адпаведна, яна дзейнічае ў інтарэсах гэтага класу. У выніку кожная партыя мае добрую праграму, у якой распавядаецца пра шчасце ўсяго народа, але словы не адпавядаюць справам.

На пачатку XX стагоддзя Беларусі давялося пазнаёміцца з рознымі палітычнымі накірункамі, але ніводзін з іх, паводле Абдзіраловіча, не адпавядае ідэалу сацыяльнай творчасці. Так, пра дэмакратаў ён кажа: «калі

выяўляюцца вынікі «рэальнай палітыкі», дык з-пад штандару з харошымі словамі «вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі» выглядае прагавіты твар шляхціца. І гэта зразумела, бо пры палітыцы рэальнай і дэмакратычнай, якая ня хоча лавіць жураўлёў ў небе, заўсёды ідзе аб скурных клясавых інтарэсах, аб скарыстаньні абавязкавага, прымусовага стану рэчаў у гаспадарстве» [1].

Гэтаксама ён прызнае і палітычную няздольнасць сацыялізму і камунізму. Калі першыя сацыялісты сваёй крывёй і самаахвярнасцю «пракладалі шлях да сьветлай будучыні» і прагнулі не захопу ўлады, а вызвалення чалавечага духу і «праменнасці жыцьця для ўсіх зьняважаных і пакрыўджаных», то пачынаючы ад Маркса, згаслі вялікія жаданні і мары аб вольным чалавеку. «Заместа «утопіяў» высунулася «навучная» ідэя захапленьня палітычнага апарату, каб сілком вясьці масы ў сацыялістычны рай. Натхнёнасьць сацыялізму зьнікла, замянілася пустой, буржуазнага характару, крыважорнай дактрынаю: Маркс спусьціў сацыялізм з «утапічнага неба» рунь звычайнай дэмакратычнай партыі, якая марыць аб захапленьні ўлады, зьмяніўшы сьвятую справу чалавечага вызваленьня на дасягненьне клясавай перамогі. Праўда, трэба ўзяць пад увагу, што тут ідзе аб клясе прыгнечанай, абрабаванай; але кожны, хто ведае сучасныя адносіны, павінен прызнаць, што з учарайшага раба выходзіць найлепшы рабаўладца»[1].

Крыху менш негатыўна ён ацэньвае эсэраў у Расіі і хрысціянскіх сацыялістаў на Захадзе. «Гэтыя кірункі сацыялізму болей чулыя да справы агульначалавечага адраджэньня, «верацъ у неабходнасьць» творчай чалавечай адзінкі, меней апіраюцца на клясавы грунт, але практычна, як кожная сэкта, … абхоплены духовым мяшчанствам, застылі ў пакланеньні дактрынам і аўторытэтам і меней дасягнулі, чымся іх спрытныя колегі» [1].

У выніку вышэйзгаданага аналізу Абдзіраловіч прыходзіць да высновы, што ніводная палітычная партыя не здолела вырашыць праблемы вольнай творчай асобы і сацыяльнай творчасці. Бо ў ідэале кожнай з іх былі прымус і дыктатура.

Галоўнаю падставаю грамадскай творчасці беларускага народа мысліцель лічыў палітычную незалежнасць, бо пад чужацкім панаваннем мы ахвяраваны на дэградацыю.

Чацвёрты раздзел паўстае як абагульненне, у якім аўтар сцвярджае неадменнасць пошуку непрымусовых форм жыцця дзеля здзяйснення ідэалу сацыяльнай творчасці і вырашэння праблемы беларускай ідэнтычнасці.

Аўтар зрабіў спробу знайсці і ў мінулым, і ў сучаснасці прыклады такога сацыяльнага аб'яднання, якое б не душыла імкнення да творчага развіцця вольнай, незалежнай асобы. У мінулым гэта - Запарожская Сеч, галоўнай адзнакай якой была адсутнасць прымусу да сваіх сяброў. «Сеча з аружжам у руках бараніла чалавечае права на волю і незалежнасць» [1]. А сучасным прыкладам непрымусовай арганізацыі, на думку Абдзіраловіча, з'яўляецца каапeрацыя. У ёй аўтар бачыў адзінае на той час грамадскае аб'яднанне, якое не да пускае прымусу ні ў адносінах да сваіх сяброў, ні ў адносінах да іншых грамадзян, якое не мае гатовых штампаў і шаблонаў на кожны дзень, «а калі такія штампы з'яўляюцца, жыццё іх выкідае вельмі лёгка, без рэвалюцыяў, за

вакно» [6, с. 196].

У 1922 г. ў артыкуле «Кааперацыя» Канчэўскі працягваў абгрунтаванне канцэпцыі «трэцяга шляху» сацыяльнага развіцця для Беларусі праз сялянска-рамесніцкія вольныя брацтвы і народную кааперацыю.

## ***8. Палітычныя і прававыя погляды Уладзіміра Самойлы (1878-1941)***

«Уладзімір Самойла, асветнік, філосаф, культурны і грамадскі дзеяч, паправу лічыцца адным з тэарэтыкаў беларускай нацыянальнай ідэі. У дарэвалюцыйны час ён актыўна займаўся літаратурнай і публіцыстычнай дзейнасцю, супрацоўнічаў з газетамі «Северо-западный край», «Минский курьер», «Наша ніва», «Виленские новости». Пасля рэвалюцыі жыў у Вільні. У.Самойла з’яўляўся адным з вядучых публіцыстаў заходнебеларускага перыядычнага друку вызваленчага кірунку. У сваіх артыкулах і эсэ выкрываў каланіялісцкую палітыку польскіх улад у дачыненні да нацыянальных меншасцей. У нарысах і эсэ, напісаных у 1920-я гады філосаф сцвярджаў гістарычную заканамернасць перамогі нацыянальна-вызваленчага руху заходніх беларусаў, выказваў спадзяванне на непазбежнасць уз'яднання беларускай нацыі. «Першая задача збудзіўшагася са сну народу - гэта выкарыстанне ўсіх метадаў і ўсіх спосабаў, якія вядуць да такога нацыянальнага аб'яднання», - пісаў мысліцель.

У славутым філасофскім эсэ «Гэтым пераможаш!..» (1924 г.) У.Самойла даў грунтоўную крытыку палітычным рэжымам, якія сваю ўладу засноўваюць выключна на «сістэме санкцый», інакш кажучы, жорсткіх законах, запалохванні грамадзян. Такія дзяржавы аўтар называе паліцэйскімі і лічыць, што «гэта форма дзяржаўнасці бывае найменш трывалай», бо захаванне вялікага апарату прымусу вымагае шмат сродкаў. Такая дзяржава паступова ідзе да свайго банкруцтва. Змагацца за правапарадак, на думку У.Самойлы, трэба толькі законнымі метадамі. Метад «барацьбы злом парушэннямі норм законаў» філосаф лічыць амаральным. Менавіта такі метад утрымання ўлады выкарыстоўваюць усякага роду рэвалюцыянеры пасля сваёй перамогі.

У цывілізаваным, прававым гаспадарстве, на думку У.Самойлы, падпарадкаванне грамадзян уладзе і закону грунтуецца не на страху перад судом і паліцыяй, а на павазе да норм закона, дзеючага ў краіне. «У такім грамадстве працоўная энергія народа з вялікшай карысьцяй зужываецца на карысную работу, а свабодная, кіраваная нормамі духовая актыўнасьць народу спакойна і мірна ўзвышаецца як у сваёй сколькасьці, так і ў сваім тыпе». Дзяржавы, пабудаваныя на прынцыпах павагі да закона, якому падпарадкоўваюцца аднолькава як улады, так і грамадзяне, пазбегнуць усёразбуральнай рэвалюцыі. Натуральныя змены ў дзяржаўным арганізме, заканадаўстве адбываюцца там у межах дзеючых канстытуцый. Аднаўляльную ролю ў такіх дзяржавах адыгрываюць прадугледжаныя канстытуцыяй выбары. У.Самойла называе выбары «сапраўднымі маленькімі, прадугледжанымі канстытуцыяй гаспадарства, перыядычнымі

рэвалюцыямі, якія народ робіць не мячом, а ня менш забойчым для дрэннае ўлады, хаця бязкроўным аружжам - выбарнай картачкай» .

Філосаф задаецца пытаннем: якія законы сапраўды могуць выклікаць павагу ў грамадзян? І сам жа адказвае: «...калі іх нормы сапраўды карысны для грамадзянства, запраўды нармуюць, а не забіваюць энергію людзей, калі забясьпечываюць лад, мір і разьвіцьцё грамадзянства ды гэтым усім узвышаюць, а не абніжаюць тып яго духовае актыўнасьці». Будучы ўпэўненым у гістарычнай прадвызначанасці аб'яднання беларускай нацыі і пабудовы нацыянальнай дзяржавы, У.Самойла заклікаў суайчыннікаў пазбягаць сумнага вопыту дзяржаў, дзе закон грунтаваўся не на прынцыпах маралі і справядлівасці, а на стварэнні сістэмы абмежаванняў, запалохваючы людзей грозным карным апаратам, памятаць, што «рэвалюцыйны метад барацьбы з злом дарогай фізічнага зьніштажэньня яго, дарогай гвалту, аказваецца бязсільным; інакш кажучы, «мэтад санкцыі», стары, «біблейны», сярэднявечны мэтад барацьбы з злом толькі плодзіць і памнажае ў сусьвеце гэнае зло, ад масы якога ў канцы канцоў гібее ўвесь гэты сьвет»» [6, с. 197-199].

*Пытанні 5, 7, 8 лекцыі састаўлены на падмурку матэрыялу выкладзенага ў вучэбным дапаможніку: Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.*

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lib.by/abdziralovic/. – Дата доступа: 21.03.2005.
2. Баршчэўскі, Л.П. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.П.Баршчэўскі, П.В.Васючэнка, М.А.Тычына. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.
3. Біч, М.В. Беларуская сацыялістычная грамада / М.В.Біч, С.С.Рудовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. М.В.Біч [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1993. - Т.1: А - Беліца. – с. 410-413.
4. Бяляцкі, А. Літаратура і нацыя / Алесь Бяляцкі. – Мн.: Арт Гейзер, 1991. – 104 с.
5. Булгакаў, В. Гісторыя беларускага нацыяналізму / В.Булгакаў. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – 326 с.
6. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
7. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.

8. Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX стагоддзя / Уклад., прадм. і заўв. У.Казберука. – Мн.: Маст. літ., 2001. – 606 с.
9. Конан, У. Наша ніва / У.Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. Г.П.Пашкова [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1999. - Т.5: М - Пуд. – с. 314-316.
10. Слінка, Т. Праблема беларускай ідэнтычнасці ў тэксце Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» / Т.Слінка. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://baj.ru/belkalehium/lekcyji/litaratura/slinka01.htm. – Дата доступа: 21.10.2007.

## ТЭМА 12.
## ПАЛІТЫЧНАЯ І ПРАВАВАЯ ДУМКА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

### 1. Палітычная і прававая думка Савецкай Беларусі ў 20-30-я гады XX ст.

#### *1.1. Рэалізацыя ідэі дзяржаўнага суверэнітэту БССР у партыйна-дзяржаўнай практыцы савецкай Беларусі*

Падчас рэвалюцый у Расеі адбылося адраджэнне беларускай дзяржаўнасці. У 1917 - 20 гг. на Беларусі разгарнулася канкурэнтная барацьба паміж двума формамі палітыка-прававога будаўніцтва - савецкай улады бальшавікоў і Беларускай Народнай Рэспублікай. Абедзве мадэлі развіваліся ў рамках сацыялістычных ідэй і ў сваіх статутных дакументах (Статутныя граматы БНР і Маніфест аб незалежнасці ССРБ ад 01.01.19 г., Канстытуцыя ССРБ 1919 г.) замацоўвалі прынцыпы сацыялістычнага грамадства [19, с. 197-199].

Беларуская Народная Рэспубліка з-за неспрыяльнага вонкава- і унутрыпалітычнага становішча засталася толькі «зародкам дзяржаўнага ўтварэння» і не змагла стаць дзяржавай у юрыдычным сэнсе [4, с. 178-179]. Мадэль дзяржаўнасці і права, заснаваная на цеснай пераемнасці ў спалучэнні буржуазных і сацыялістычных ідэй (напрыклад, адмена прыватнай уласнасці на зямлю і замацаванне палітычных правоў і свабодаў чалавека) была адпрэчаная гісторыяй і ўзяла верх мадэль радыкальнага пераўтварэння грамадства ў рамках БССР.

Для развіцця палітычнай і прававой думкі 1920 - 1930-х гадоў характэрны дзве асноўныя тэндэнцыі. Першая - гэта накіраванасць на нацыянальна-дзяржаўнае і нацыянальна-культурнае адраджэнне беларусаў. Яна была выклікана працэсам стварэння беларускай савецкай дзяржавы і палітыкай беларусізацыі. Другая тэндэнцыя - гэта паступовая абсалютызацыя камуністычнай ідэалогіі. У свядомасці грамадзян замацоўваліся такія яе догмы, як класавы характар дзяржавы і права, дыктатура пралетарыяту як вышэйшая праява дэмакратыі, прыярытэт інтарэсаў дзяржавы і дзяржаўнай уласнасці перад інтарэсамі асобы і прыватнай уласнасці і інш. Апошняя тэндэнцыя ў канцы канцоў перамагла і пасадзейнічала пераўтварэнню СССР у канцы 1920-х гадоў у дзяржаву з таталітарным палітыка-прававым рэжымам.

У асяроддзі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва былі як прыхільнікі сапраўднай незалежнасці (А.Чарвякоў, Зм.Жылуновіч, У.Ігнатоўскі і інш.), так і тыя, што жадалі бачыць Беларусь толькі часткай тэрыторыі савецкай Расіі. Так, у кастрычніку 1920 г. у артыкуле «Мір і Беларусь» сакратар ЦК КП(б)Б В.Г.Кнорын сцвярджаў: «Беларусь вызначалася як Савецкая Рэспубліка, уваходзячая ў Расійскую Федэрацыю, і такой яна і далей будзе». «Састаўной часткай РСФСР» назваў Беларусь III з'езд КП(б) Беларусі (лістапад 1920 г.).

З самага пачатку паміж прыхільнікамі гэтых двух тэндэнцый пачалася

барацьба, наступствы каторай адбіваліся на дзяржаўным статусе Савецкай Беларусі, палітыцы камуністычнай партыі.

Само ўзнікненне ССРБ у 1919 г. было рэакцыяй бальшавіцкага ўрада ў Маскве на «уздым нацыянальна-вызваленчага руху, абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе органаў» [10, с. 400], а таксама на неабходнасць узаемадзейнічаць з іншымі дзяржавамі [4, с. 185]. Літаральна праз месяц ССРБ была аб’яднаная з Літоўскай ССР, якая таксама не атрымала рэальных паўнамоцтваў, бо 1 чэрвеня 1919 г. УЦВК РСФСР з мэтай аб’яднання высілкаў усіх савецкіх рэспублік ва ўмовах грамадзянскай вайны прыняў дэкрэт аб стварэнні ваеннага саюза рэспублік, у адпаведнасці з якім фактычна цалкам абмяжоўвалася іх самастойнасць.

Паўторнае абвяшчэнне БССР 31 чэрвеня 1920 г., прыняцце дэкларацыі аб незалежнасці фактычна не змяніла яе статут. Абвяшчэнне яе раўнапраўя з іншымі савецкімі рэспублікамі сутыкалася з цвёрдай цэнтралізацыяй і дысцыплінай у РКП(бы). Аб гэтым сведчыць пастанову ІІІ з’езду КП(б)Б (лістапад 1920 г.), у якім аб прававым становішчы рэспублікі сказанае: «Беларусь … з’яўляецца складовай часткай СССР, і ўсё яе органы ў сферы агульных мерапрыемстваў павінны быць падпарадкаваныя адпаведным камісарыятам РСФСР» [4, с. 190].

У ліпені 1921 г. была ратыфікаваная новая Саюзная рабоча-сялянская дамова, у якой зноў абвяшчаліся як прынцыпы раўнапраўя і суверэнітэту, так і аб’яднанне большасці найважнейшых наркаматаў [16, с. 228-229]. Аднак з канца 1920 г. паступова пачынаецца пашырэнне рэспубліканскіх паўнамоцтваў, актывізацыя дзейнасці вышэйшых органаў улады ў Беларусі: Усебеларускага з’езду Саветаў, ЦВК і яго Прэзідыўма, Савета Народных Камісараў.

Пад ціскам прадстаўнікоў нацыянальных кампартый у 1922 г. партыйнае і савецкае кіраўніцтва РСФСР і савецкіх рэспублік пачало сістэматычна абмяркоўваць пытанне юрыдычнага афармлення аб’яднання рэспублік у адзіную дзяржаву. Падчас абмеркавання выявіліся два падыходы да формы пабудовы новай дзяржавы.

Сталін, які па сваёй пасадзе быў адказным за нацыянальную палітыку, лічыў, што рэалізацыя права нацый на самавызначэнне не павінна ісці далей за аўтаномію. У пісьме Леніну ў 1922 г. ён асуджаў камуністаў нацыянальных рэгіёнаў, якія «гульню ў незалежнасць адмаўляюцца разумець як гульню, упарта прызнаючы словы аб незалежнасці за сапраўдную манету і, таксама, упарта патрабуюць ад нас захавання літары канстытуцый незалежных рэспублік». І рабіў далей выснову: «...каб формы ўзаемаадносін паміж цэнтрам і ўскраінамі адпавядалі фактычнаму становішчу спраў, фіктыўная незалежнасць павінна быць заменена рэальнай аўтаноміяй» [3, с. 202].

Старшыня Саўнаркома У.Ленін выказаў нязгоду з канцэпцыяй аўтанамізацыі і настойваў на неабходнасці стварыць «новы паверх, федэрацыю раўнапраўных рэспублік». Згодна з гэтай ідэяй усе незалежныя рэспублікі, уключаючы РСФСР, павінны быць роўнымі ў прававым

становішчы. Прынцып, прапанаваны Леніным, быў падтрыманы ўсімі савецкімі рэспублікамі, у тым ліку і Беларуссю.

30 снежня 1922 г. І з’езд Саветаў СССР зацвердзіў праект Дагавора і Дэкларацыі аб утварэнні СССР. Пасля дадатковага разгляду на з'ездах саюзных рэспублік 31 студзеня 1924 г. II Усесаюзным з'ездам Саветаў была зацверджана першая савецкая Канстытуцыя. У цэлым яна давала магчымасці для развіцця федэрацыі ў дэмакратычным напрамку, выроўнівання эканамічнага і культурнага развіцця нацый. Разам з тым, у Асноўны закон увайшоў пастулат аб абмежаванасці суверэнітэту рэспублік на карысць цэнтральных органаў, які хаваў у сабе небяспеку зацвярджэння безумоўнага прыярытэту агульных інтарэсаў над інтарэсамі нацыянальнымі. Патэнцыйная пагроза ўзмацнялася і значнай колькасцю паўнамоцтваў аднесеных Канстытуцыяй да выключнай кампетэнцыі СССР: прадстаўніцтва ў міжнародных адносінах, пытанні вайны і міры, усталяванне сістэмы унутранага гандлю, сістэмы агульнасаюзных, рэспубліканскіх і мясцовых падаткаў, выданне законаў аб працы, ахове народнага здароўя, грамадзянскага і крымінальнага заканадаўства, судовым ладзе і судаводстве і інш.

У рэчышчы перамогі ленінскай лініі на стварэнне федэратыўнага саюза рэспублік, пашырэнне іх паўнамоцтваў для «самастойнага нацыянальна-культурнага будаўніцтва» і стварэння «неабходных гарантый для праяўлення гаспадарчай ініцыятывы кожнага сябра (рэспублікі)» [8, с. 134], Дэкрэтам ЦВК БССР ад 21.01.1922 г. усталёўвалася, што ўсё пастановы і распараджэнні аб’яднаных наркаматаў абавязковыя для рэспублікі ў выпадку іх пацверджання органамі ўлады ў Беларусі (акрамя найболей важных) [13, с. 230].

Але перыяд адносная самастойнасці савецкіх рэспублік быў нядоўгі. Пасля смерці Леніна, Сталін, які узначаліў уладу ў СССР, цалкам рэалізаваў сваю ідэю аўтанамізацыі.

### *1.2. Распрацоўка і рэалізацыя ідэалогіі беларусізацыі*

Адначасова з поспехамі ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва ў пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя распачалася палітыка нацыянальна-культурнага будаўніцтва – беларусізацыя. Вытокі беларусізацыі крыюцца ў поспехах нацыянальнага адраджэння пачатку XX стагоддзя, у папулярнасці ідэй развіцця нацыянальнай культуры як сярод насельніцтва Беларусі, так і сярод сяброў нацыянальна-дэмакратычных і сацыялістычных партый.

У ліку ініцыятараў і аўтараў беларусізацыі былі дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, якія ў час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны свядома прыйшлі да бальшавікоў, звязвалі з імі свае надзеі на нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне беларусаў. Многія з іх увайшлі ў склад кіруючых партыйных і савецкіх органаў: А.Р.Чарвякоў (Старшыня ЦВК і СНК БССР), З.Х.Жылуновіч (рэдактар газеты «Савецкая Беларусь»), У.М.Ігнатоўскі (нарком асветы БССР) і інш.

Па сутнасці, палітыка беларусізацыі ўяўляла сабою прыстасаванне

нацыянальнай палітыкі бальшавікоў да эканамічных, сацыяльных, этнічных умоў, і гістарычных і культурных традыцый беларусаў. Жаданні і спадзяванні народаў Расійскай імперыі, прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі, ціск прадстаўнікоў нацыянальных кампартый, ранейшыя передрэвалюцыйныя абяцанні бальшавікоў, неабходнасць аднаўлення гаспадаркі пасля грамадзянскай вайны вымусілі бальшавікоў часова адмовіцца ад ідэі неадкладнага ажыццяўлення сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, якая б зруйнавала межы між краінамі і народамі. Таму ў рашэннях X (сак.1921 г.) і XII (крас. 1923 г.) РКП(б) у якасці галоўнай мэты была абвешчана ліквідацыя фактычнай няроўнасці народаў былой Расійскай імперыі у галіне эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця. Так, у рэзалюцыі X з’езда была запісана: «Партыя павінна дапамагчы прыгнечаным масам невелікарускіх народаў: развіць і ўзмацніць у сабе савецкую дзяржаўнасць у формах, адпавядаючых нацыянальна бытавым умовам гэтых народаў, развіць і ўзмацніць у сабе дзейныя ў роднай мове суд, адміністратыўныя ўстановы, гаспадарчыя ўстановы ўлады, складзеныя з людзей мясцовых, ведаючых быт і псіхалогію мясцовага жыхарства, развіць у сабе прэсу, школу, тэатр, клубную справу і наогул культурна-асветныя ўстановы ў роднай мове, паставіць і развіць шырокую сець курсаў і школаў як агульнаадукацыйнага, так і прафесіянальна-тэхнічнага напрамку ў роднай мове для хутчэйшай падгатоўкі мясцовых кадраў па ўсім галінам кіравання і найраней у галіне асветы» [3, с. 205].

Такім чынам, распрацаваная канцэпцыя палітыкі беларусізацыі ахоплівала розныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай савецкай дзяржавы. Яна прадугледжвала навуковую распрацоўку праблем беларускай мовы, яе гісторыі, сучаснай лексікі, граматычных нормаў і тэрміналогіі. Вывучэнне беларускай мовы было абавязковым для ўсіх грамадзян краіны. Але творцы беларусізацыі добра разумелі, што неабходна ўлічваць нацыянальны склад рэспублікі. Таму, у адпаведнасці з праграмнымі ўстаноўкамі нацыянальных партый і арганізацый, прызнавалася раўнапраўе ў якасці дзяржаўных - беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай моў.

Мэтаю палітыкі беларусізацыі было, у першаю чаргу, фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларускага народа. І гэтаму, на думку ідэолагаў беларусізацыі, павінна было спрыяць развіццё грамадскіх навук і, перш за ўсё, краязнаўства. Развіццё краязнаўства не атаясамлівалася з беларусазнаўствам, а тлумачылася значна шырэй. На краязнаўчым з’ездзе ў 1926 г. У.Ігнатоўскі адзначаў, што без вывучэння жыцця, побыту, культуры нацыянальных меншасцей нельга вывучыць гісторыю свайго краю. Рэалізацыі гэтага напрамку садзейнічала адкрыццё і функцыянаванне такіх культурна-асветніцкіх устаноў, як беларускі універсітэт, інстытут беларускай культуры, дзяржаўная бібліятэка, дзяржаўны музей, цэнтральны архіў.

Пад час правядзення палітыкі беларусізацыі важным напрамкам нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва стала барацьба за зварот этнічных беларускіх зямель, якія ў час грамадзянскай вайны былі перададзены РСФСР. Выступаючы на VII з’ездзе Кампартыі Беларусі, кіраўнікі рэспублікі

А.Чарвякоў, У.Ігнатоўскі і іншыя выказваліся за ўзбуйненне Беларускай ССР, якое «павінна даць магутны штуршок развіццю ўсіх вытворчых сіл краю». Больш разгорнутае абгрунтаванне неабходнасці захавання тэрытарыяльна-этнічнай цэласнасці Беларусі было дадзена ў 1923 г. ў дакладной запісцы ЦК КП(б)Б у ЦК РКП(б) па пытанню аб тэрыторыі Беларускай ССР. У ёй звярталася ўвага на тое, што «ў момант абвяшчэння Савецкай Беларусі было прынята пад увагу палітычнае значэнне гэтага абвяшчэння, але не былі ўлічаны ўсе тыя асаблівасці, якія выдзяляюць Беларусь у асобны рэгіён у эканамічным, нацыянальна-бытавым і ў іншых адносінах і гэтым вызначаюць тэрыторыю Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь» [3, с. 203-204].

У пачатку сакавіка 1924 г. адбылося першае ўзбуйненне БССР. У яе склад былі ўключаны 15 паветаў і асобныя воласці Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. У выніку другога ўзбуйнення ў 1926 г. тэрыторыя БССР павялічылася на 15 727 кв. км і складала 126 311 кв. км.

Важным элементам палітыкі беларусізацыі была палітыка каранізацыі. Сутнасць яе зводзілася да правядзення кадравай палітыкі з улікам шматнацыянальнага складу карэннага насельніцтва Беларусі. Каб не дапусціць канфліктаў на нацыянальнай глебе, на замяшчэнне пасад у савецкім, партыйным, гаспадарчым апараце прызначаліся прадстаўнікі карэннага насельніцтва. Аднак пры правядзенні каранізацыі ўлічваліся не толькі нацыянальная прыкмета чалавека, але і яго прафесійныя якасці, веданню ўмоў і асаблівасцей Беларусі, дасканалыя веды беларускай і рускай моў.

У адносінах да нацыянальных меншасцей прадугледжвалася ажыццяўленне прынцыпу нацыянальна-культурнай аўтаноміі з элементамі аўтаноміі палітычнай.

### *1.3. Ідэалагічнае абгрунтаванне адыходу ад палітыкі беларусізацыі і станаўленне таталітарнай сістэмы*

У канцы 1920-х гадоў пачынаецца паступовае афармленне савецкага таталітарнага палітыка-прававога рэжыму. Па меры згортвання НЭПа, вяртання да апрабаваных адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання ў краіне пачала праводзіцца цэнтралізатарская палітыка, якая не цярпела ніякіх адступленняў ад сталінскага бачання пабудовы сацыялізму.

Таталітарная сістэма кіравання вызначаецца такімі прыкметамі, як унітарная ідэалогія, якая падтрымлівае ў насельніцтва перакананасць у апраўданасці такой сістэмы, жорсткі дыктатарскі рэпрэсіўны рэжым, які імкнецца да татальнага панавання над кожнай асобаю і грамадствам у цэлым. Усё, што не ўкладвалася ў сталінскае бачанне пабудовы сацыялізму, абвяшчалася варожым. Рэжым не мог цярпець самастойнасці ні ў эканоміцы, ні ў нацыянальнай палітыцы. Сталінская наменклатура з яе прынцыпамі прызначэнства не магла мірыцца з самастойнасцю кадраў на месцах. Пагрозаю рэжыму бачылася і адукаваная, незалежна думаючая нацыянальна-свядомая інтэлігенцыя [3, с. 207].

Яшчэ ў красавіку 1923 г. І.Сталін, які цудоўна разумеў, што

нацыянальныя адметнасці супярэчаць таталітарнаму праўленню, у дакладзе «Аб нацыянальных момантах у партыйным і дзяржаўным будаўніцтве» заявіў: «...права на самавызначэнне не можа і не павінна служыць перашкодай справе ажыццяўлення права рабочага класа на сваю дыктатуру. Першае павінна адступіць перад другім» [3, с. 207].

Адпаведна ўжо ў першай палове 1920-х гадоў пачалася ідэалагічная падрыхтоўка да барацьбы з нацыянальнай культурай і яе носьбітамі. У сярэдзіне 20-х на з’ездах КП(б)Б падымаюцца пытанні аб небяспецы аслаблення кантролю за культурнай працай збоку партыйных арганізацый. ХІ з’езд КП(б)Б (лістапад 1927 г.) канстатуе, што нацыяналістычныя колы інтэлігенцыі падмяняюць пралетарскі змест культуры дробнабуржуазным, адыходзяць ад формулы «культура пралетарская па зместу і нацыянальная па форме» [11, с. 207].

Пасля 1929 г., года «вялікага пералому», калі па словах Сталіна партыя адступіўшая пад час НЭПу перайшла ў наступ на капіталістычныя элементы [11, с. 208], у палітычных, эканамічных, культурна-ідэалагічных структурах пачалося згортванне астаткаў дэмакратычных свабодаў і плюралізму. У рэзалюцыях пленумаў ЦК КП(б)Б, якія адбыліся ў другой палове 1920-х гадоў, ХІІ (1929 г.) і ХІІІ (1930 г.) з’ездаў беларускіх камуністаў канстатавалася прырода, небяспека і сродкі барацьбы з такой з’явай, як нацыянал-дэмакратызм. Напрыклад, усе рашэнні ХІІ з’езда КП(б)Б былі прасякнуты ідэяй неабходнасці жорсткага ідэалагічнага кантролю над сферам культуры. Прадпісвалася сачыць за класавым зместам літаратуры і мастацтва, весці бязлітасную барацьбу з варожай пралетарыяту ідэалогіяй у друку, кіно, тэатры, на радыё [3, с. 208].

«У рашэннях пленумаў і з’ездаў КП(б)Б выявіўся погляд на палітыку беларусізацыі як варожую інтарэсам пралетарыяту, якая адлюстроўвае інтарэсы дробнай буржуазіі, інтэлігенцыі і заможных сялян. Беларуская нацыянальная культура характарызавалася як сродак ажыццяўлення нацыяналістычных ідэалаў, адраджэння буржуазна-дэмакратычнай дзяржаўнасці. Беларускую інтэлігенцыю, якая называлася носьбітам ідэалогіі нацыянал-дэмакратызму, папракалі ў імкненні да палітычнага ўраўнення сялянства з рабочым класам, пашырэння ўплыву інтэлігенцыі на дзяржаўны апарат. Галоўнае абвінавачанне, якое высунулі творцам беларусізацыі, заключалася ў тым, што апошнія нацыянальныя інтарэсы ставілі вышэй класавых. І рабілася выснова аб контррэвалюцыйнай сутнасці любой нацыянальнай ідэалогіі і палітыкі ў час дыктатуры пралетарыяту.

Ганенні на палітыку беларусізацыі і яе носьбітаў закранулі і гістарычную навуку. У афіцыйнай гістарыяграфіі былі зменены ўсе ацэнкі мінулага. У прыватнасці, беларускі нацыянальны рух, ад Каліноўскага і Багушэвіча да дзейнасці Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый РКП(б), абвяшчаўся рэакцыйным.

Новая палітычная лінія кіраўніцтва бальшавіцкай партыі і савецкага ўрада ў адносінах да Беларусі была накіравана на ліквідацыю яе суверэнных правоў, поўнае падпарадкаванне цэнтру.

Абвінавачанні ў нацыянал-дэмакратызме хутка былі персаніфікаваны. У лік ворагаў партыі і народа трапілі такія відныя палітычныя дзеячы, як А.Чарвякоў, У.Ігнатоўскі, Зм.Жылуновіч, А.Баліцкі, З.Прышчэпаў; пісьменнікі М.Гарэцкі, У.Дубоўка, Я.Пушча; кіраўнікі беларускіх палітычных арганізацый, рэабілітаваныя ўрадам БССР,- І.Серада, А.Цвікевіч, Я.Дыла, В.Ластоўскі, Я.Лёсік і інш. Усе яны праходзілі па сфабрыкаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі» (СВБ). Шырокая хваля рэпрэсій, якая пракацілася па Беларусі ў канцы 1920 - пачатку 1930-х гадоў, была пачаткам раскручвання рэпрэсіўнага апарата на поўную сілу. У яго жэрле на працягу 1930-х гадоў была, па сутнасці, знішчана эліта беларускай нацыі. Тэарэтычнае абгрунтаванне гэтага працэсу было зроблена І.Сталіным у 1937 г., на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК УКП(б). Пасля прыняцця ў 1936 г. Канстытуцыі «перамогшага сацыялізму» ён дабіўся адабрэння парадаксальнага тэзіса: быццам бы з узмацненнем пазіцый сацыялізму, далейшым прасоўванні савецкай дзяржавы наперад класавая барацьба ў краіне будзе ўсё больш і больш абвастрацца. Дадзенае рашэнне павінна было апраўдаць беззаконне і рэпрэсіі ў краіне Саветаў» [3, с. 208-209].

### *1.4. Развіццё прававой думкі ў 20-30-я гады XX ст.*

Пачатак XX стагоддзі стаўся звязаным з радыкальнай трансфармацыяй асноў сацыяльнага парадку. Разам з XIX ст. сыходзіць у мінулае лібералісцкая сістэма поглядаў на адносіны індывіда і грамадства, дзяржавы і грамадства, дзяржавы і эканомікі. Новы сацыяльны парадак атрымлівае назвы дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму, імперыялізму [14, с. 21].

Бурны рост новых тэхналогій, індустрыялізацыя, сусветныя эканамічныя крызісы 1870-1913 гг., пераход да манаполіі як новай формы сацыяльных і эканамічных адносін, трансфармацыя адносін уласнасці, імперыялізм, якія суправаджаліся распаўсюджваннем нацыяналістычных і сацыялістычных ідэй, што адмаўлялі індывідуалізм, прывялі да трансфармацыі ўсіх падсістэм грамадства, у тым ліку і права. Адбылася змена сутнасці права з-за мадыфікацыі разумення справядлівасці як яго асновы. Калі на папярэднім этапе яна асацыявалася з грамадскай думкай, розумам і правамі чалавека, то зараз - з калектывізмам, планавай эканомікай і сацыяльнай роўнасцю [2, с. 37].

Трансфармацыя закранула ўсе палітычныя і прававыя сістэмы, але ў найбольш радыкальнай форме яна выявілася ў перыяд Рэвалюцыі 1917 года ў Расійскай імперыі. Першапачаткова падчас рэвалюцыі быў здзейснены разрыў у развіцці права. У 1918 г. камуністычны ўрад адмяніў усё царскае заканадаўства [15, с. 322]. Бальшавікі верылі, што пасля перамогі камунізму права, як і дзяржава, павінны былі адмерці [18].

П.І.Стучка пісаў, што «наша праграма не ведала ідэі савецкага права» [17, с. 583]. Аднак жыццё прымусіла новую ўладу займацца законатворчасцю, таму бальшавікамі была распрацавана канцэпцыя «пралетарскага права», якое адмаўляе усё старое. У дадзеным выпадку яны

кіраваліся парадай Вальтэра: «Калі жадаеце мець добрыя законы, паліце свае старыя і ствarайце новыя». У першым праекце Дэкрэту аб судзе № 1 падкрэслівалася, што рэвалюцыйныя суды павінны кіравацца «у сваіх рашэннях і прысудах не пісанымі законамі зрынутых урадаў, а дэкрэтамі Саўнаркама, рэвалюцыйным сумленнем, рэвалюцыйнай правасвядомасцю» [12, с. 173].

Новае разуменне права было сфармулявана калегіяй Наркамюста: «Права - гэта сістэма (або парадак) грамадскіх адносін, якая адпавядае інтарэсам пануючага класа і якая ахоўваецца яго арганізаванай сілай» [17, с. 58]. У праве былі ў радыкальнай ступені адлюстраваныя прынцыпы новай эпохі, якія і вызначалі яго змест. Наркам юстыцыі з 1918-1928 гг. Д.І.Курскі пісаў: «Для нас, юрыстаў, ваенны камунізм уяўляў сабой пераважна сістэму прымусовых нормаў, калі гаспадарчыя адносіны будаваліся на пачатках прымусовага рэгулявання з цэнтра, калі … мы змушаныя былі пашырыць вобласць пазасудовых рэпрэсій, а для паскарэння гаспадарчай працы… шырока ўжываць адміністрацыйныя меры» [9, с. 38].

Праз нейкі час рэвалюцыя ў Расеі ўсё ж была змушаная пагадніцца з дарэвалюцыйным правам і аднавіць шматлікія яго элементы шляхам уключэння іх у новую сістэму, пабудаваную на мэтах, прынцыпах і перакананнях, дзеля якіх адбылася рэвалюцыя. Дадзеная тэндэнцыя выразна выявілася ў перыяд Нэпа. У вобласці права гэта адлюстравалася ў буйнамаштабнай рэцэпцыі буржуазнага права. П.І.Стучка прама пісаў, што з-за абмежаванасці ў часе яны амаль цалкам і даслоўна спісалі, напрыклад, Грамадзянскі кодэкс з лепшых узораў грамадзянскага права Захаду [1, с. 105]. Але новае заканадаўства ўсё роўна павінна было адказваць асноўным прынцыпам сацыялізму.

У канцы 20-х гадоў, з канчатковай перамогай таталітарных тэндэнцый, у СССР найбольш рэзкія адступленні ў праве ад сацыялістычных прынцыпаў ліквідаваліся. Права атрымала выразнае азначэнне ў адпаведнасці з класавым варыянтам пазітывісцкай канцэпцыі і да канца 80-х гадоў XX стагоддзі пераемна развівалася ў адпаведнасці са сваімі нязменнымі сацыялістычнымі прынцыпамі і функцыямі [5, с. 131-132].

Асноўнымі функцыямі савецкага права былі:

- па-першае, неабходнасць выключэння палітычнага панавання буржуазіі і забеспячэнні поўнаўладства пралетарыяту ў асобе Камуністычнай партыі. Дадзеная функцыя нязменна выяўлялася ў замацаванні ў змесце нормаў палажэнняў аб манапалізацыі улады партыяй, забароне антысавецкіх элементаў і інш.;

- другой функцыяй права была яго інструментальнасць. Пасля пераадолення разрыву ў пераемнасці часу «ваеннага камунізму» была ізноў прызнаная важная роля права. Але яно не ўсталёўвала рамак для дзейнасці ўлад, права з’яўлялася іх самым надзейным сродкам. Бальшавіцкая ўлада імкнулася вытравіць сапраўдны сэнс з такіх вечных сацыяльных катэгорый, як мараль, зло, дабрачыннасць, і ўкласці ў іх асаблівы класавы змест. «Для нас,- пісаў У.І.Ленін,- мараль падначалена інтарэсам класавай барацьбы

пралетарыяту». «У нас новая мараль,- пісала ў тыя дні газета «Красны меч»,- «наша гуманнасць» абсалютная, таму што ў яе аснове знаходзяцца слаўныя ідэалы разбурэння ўсякага насілля і гнёту. Нам усё дазволена, таму што мы першыя ў свеце ўзнялі меч не дзеля запрыгоньвання і ўціску, а ў імя ўсеагульнай свабоды і вызвалення ад рабства» [3, с. 209-210]. Таму ў савецкай дзяржаве заўсёды пераважала палітычная мэтазгоднасць у праватворчасці;

- трэцяй нязменнай функцыяй савецкага права было ўсталяванне дзяржаўнага парадку, які будзе спрыяць пабудове сацыялізму, а затым і камунізму. Адпаведна, змест права складалі нормы, якія замацоўвалі існаванне і дзейнасць інстытутаў, якія пад кіраўніцтвам партыі павінны былі закладваць асновы камуністычнага грамадства: калгасы, кааператывы, прафзвязы, савецкія грамадскія арганізацыі і трацейскія суды;

- наступнай функцыяй права было выхаваўчае ўздзеянне. Права, судовая практыка, дзейнасць праваахоўных і судовых органаў выступалі як формы палітыкі. Яны павінны былі забяспечваць поспех дзейнасці ўрада, удзельнічаць у выхаванні насельніцтва, падрыхтоўваць сваёй дзейнасцю адміранне права. Бакі грамадзянскай спрэчкі і грамадская думка пераконваліся ў разумнасці, справядлівасці прававыканаўчага рашэння, закона і ўлады, які яго выдаў.

Права было пабудавана і на нязменных прынцыпах, якія замацоўвалі асноўныя каштоўнасці савецкага грамадства і абумоўлівалі пераемнасць утрымання яго прававой сістэмы [6, с. 13]. Першым чынам, варта адзначыць прынцып сацыялістычнай законнасці: «Савецкія грамадзяне павінны выконваць законы, таму што гэтыя законы справядлівыя, а справядлівыя яны таму, што іх стварае сацыялістычная дзяржава, якая выяўляе інтарэсы ўсіх, а не якога-небудзь прывілеяванага класу» [5, с. 149]. Таму ад усіх патрабуецца выразнае і няўхільнае выкананне законаў. Дадзены прынцып быў цесна звязаны з прынцыпам імператыўнасці і публічнасці права: «Мы нічога «прыватнага» не прызнаем, для нас усё ў вобласці гаспадаркі ёсць публічна-прававое, а не прыватнае, - пісаў Ленін [12, с. 167]. Ва ўсіх галінах права дзяржаўныя інтарэсы мел перавагу, нават у абавязацельным, сямейным і спадчынным праве. Усюды выкарыстоўваліся і пераважалі імператыўныя метады рэгулявання. Адпаведна, любое парушэнне прававых нормаў разглядалася не столькі як парушэнне якіх-кольвечы правоў, а як замах на савецкае грамадства і дзяржаву і вельмі жорстка каралася. З іншага боку, змест прававых нормаў было нацэлены на падрабязную рэгламентацыю жыцця савецкіх грамадзян.

Прынцып публічнасці абумовіў велізарнае значэнне для ўсёй прававой сістэмы шэрагу прынцыпаў, якія звычайна адносяць да галіны канстытуцыйнага права. Першым чынам, гэта прынцып адзінства ўлады як супрацьлегласць буржуазнаму прынцыпу падзелу ўлад, бо ўлада прыналежыць працоўнаму народу, кіруючай сілай якога з’яўляецца камуністычная партыя. Яе дамінаванне таксама стала прынцыпам канстытуцыйнага права, і так як яна была «ядром палітычнай, дзяржаўнай і

грамадскай сістэмы» [7, с. 6], то ў праве знаходзілі замацаванне яе праграмныя ўстаноўкі.

Цэнтралізацыя ў пабудове партыі дала нараджэнне прынцыпу савецкага федэралізму, то бок фармальнай роўнасці савецкіх рэспублік, але фактычнай пабудовы ўнітарнай дзяржавы з мінімумам аўтаноміі ў яе суб’ектаў.

З усіх пералічаных прынцыпаў выцякаў, вызначальны для формы савецкага права, прынцып прыярытэту закону, дзе закон разумеўся не ў фармальным сэнсе, як у краінах ліберальнай дэмакратыі, а ў матэрыяльным - як нарматыўны прававы акт [18]. Існаванне шэрагу праватворчых органаў (Вярхоўная Рада, яе Прэзідыўм, Рада Міністраў) дзякуючы дамінаванню кампартыі не парушала прынцып адзінства ўлады. Варта таксама адзначыць наяўнасць у савецкім праве такіх прынцыпаў, як панаванне сацыялістычнай уласнасці на сродкі вытворчасці і прынцып планавання ў сферы гаспадаркі.

Савецкая правая навука прынесла з сабой асаблівасці і ў структуру савецкага права. Так, савецкая дактрына паклала пачатак падзелу грамадзянскага і гаспадарчага права ў БССР. На першых этапах савецкай улады грамадзянскае права як звязанае з таварна-грашовымі адносінамі, у аснове якіх ляжыць прыватная ўласнасць, наогул адмаўлялася савецкай юстыцыяй. Тую галіну права, якая рэгулявала адносіны ў дзяржаўным сектары эканомікі, пачалі называць гаспадарчым правам. А калі з пераходам да новай эканамічнай палітыкі (НЭП) узнікла неабходнасць у рэгуляванні таварна-грашовых адносін, у тэорыі права атрымала распаўсюджванне дактрына «двухсектарнага права». Згодна з ёю грамадзянскае права павінна было рэгуляваць адносіны ў прыватным сектары, а гаспадарчае - у сацыялістычным, дзяржаўным. Разам з тым, права перыяду нэпа не гарантавала маёмасных правоў грамадзян, не гаворачы аб асабістых і палітычных правах [3, с. 211].

Асаблівасці былі прыўнесены і ў развіццё крымінальнага права. У пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя вядучай была ідэя рэвалюцыйнай мэтазгоднасці. Так, у «Кіруючых пачатках па крымінальнаму праву РСФСР», на якія арыентаваліся і беларускія карныя органы, было запісана, што органы юстыцыі павінны дзейнічаць «без асобых правіл, без кодэксаў... пралетарыят прымяняе меры насілля на першых парах без асабістай сістэмы, ад выпадку да выпадку, неарганізавана» [3, с. 212].

Трэба прызнаць, што прыняты ў 1922 г. Крымінальны кодэкс РСФСР, які пастановаю ЦБК БССР быў уведзены ў дзеянне і ў Беларускай ССР без усялякіх змен, у значнай ступені абмяжоўваў самавольства розных карных органаў. Разам з тым, крымінальнае права не пазбегла палітызацыі і ідэалагізацыі. Так, пачынаючы з другой паловы 1930-х гадоў у СССР праяўляецца тэндэнцыя да пашырэння паняцця «злачынства». Крымінальная адказнасць прадугледжвалася за такія дзеянні, як парушэнне дысцыпліны працы, самавольнае пакіданне працоўнага месца, выпуск нядобраякаснай прадукцыі. Нават за самавольнае пакіданне рамесных вучылішчаў і школ фабрычна-завадскога навучання (ФЗН) уводзілася крымінальная адказнасць.

У крымінальным праве 1920-1930-х гадоў мела места і адмаўленне ад

прынцыпу «без віны не можа быць крымінальнай адказнасці.

### *1.5. Станаўленне беларускай юрыдычнай навукі ў 20-30-я гады XX ст.*

«20-30-я гады XX ст.- час станаўлення беларускай юрыдычнай навукі. Яе развіццю спрыяла стварэнне дзяржаваю арганізацыйных структур, аб'ядна ўшых творчую дзейнасць вучоных і педагогаў, прысвяціўшых свае даследаванні юрыдычнай тэматыцы.

Пачатковы этап беларускай юрыдычнай навукі цесна звязаны са стварэннем у Мінску Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Апошні ў 1929 г. быў пераўтвораны ў Акадэмію навук Беларускай ССР.

Першапачаткова ў БДУ працавалі 3 факультэты: рабочы, грамадскіх навук і медыцынскі. На факультэце грамадскіх навук налічвалася 4 аддзяленні, сярод якіх было прававое. У перыяд, аб якім ідзе гаворка, перад вучонымі-юрыстамі як першачарговая стаяла задача падрыхтоўкі неабходных праектаў канстытуцый 1927 і 1937 гг. і праектаў законаў, якія прымаліся органамі ўлады і кіравання.

Сярод юрыстаў, якія займаліся навуковай падрыхтоўкай праектаў законаў, трэба назваць М.М.Гуткоўскага («Сістэмагычны паказальнік (спроба сістэматыкі) заканадаўства Беларускай ССР за 1919-1928 гг.»; «Стварэнне законаў у БССР», «Афіцыйныя крыніцы заканадаўства БССР») і Ф.І.Гаузе, які працаваў у аддзеле заканадаўчых прапаноў НКЮ БССР і даследаваў пытанні кадыфікацыі заканадаўства БССР.

Нягледзячы на тое, што нацыянальнае заканадаўства ў цэлым паўтарала расійскае, а пасля 1924 г. агульнасаюзныя нарматыўныя акты, беларускія прававеды павінны былі ўлічваць і ўлічвалі неабходнасць распрацоўкі канстытуцыйных прынцыпаў размежавання саюзнай і рэспубліканскай кампетэнцыі ў канстытуцыях БССР. У прынятых беларускімі органамі ўлады і кіравання законах і пастановах таксама ўлічвалася гаспадарчая і прававая традыцыя Беларусі. Таму падрыхтаваныя пры ўдзеле беларускіх юрыстаў нарматыўныя акты мелі некаторыя, а часта і значныя адрозненні ад расійскіх (напрыклад, зямельны кодэкс 1922 г.).

Найбольш важкі уклад у развіццё юрыдычнай навукі ў 1920-1930-я гады ўнеслі такія навукоўцы-правазнаўцы, як Г.Я. Парэчын (канстытуцыйнае права і гісторыя дзяржавы і права), У.Н.Дурдзянеўскі (дзяржаўнае права буржуазных краін), М.О.Грэдзінгер і Ф.І.Гаузе (грамадзянскае і грамадзянска-працэсуальнае права), В.Н.Шыраеў (крымінальнае права), У.Л.Пічэта (гісторыя дзяржавы і права) і інш.

Г.Я.Парэчын ў кнізе «Наша канстытуцыя» (1927) даваў аналіз другой савецкай канстытуцыі беларускай савецкай дзяржавы з улікам прававога статуса БССР як члена Савецкай Федэрацыі. Аўтар супастаўляў палажэнні савецкай Канстытуцыі з канстытуцыямі буржуазных краін. Глыбокае веданне прадмета, папулярны характар выкладання матэрыялу дазволілі навукова-метадычнаму камітэту рэспублікі прапанаваць кнігу Г.Я.Парэчына ў якасці падручніка для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і сістэмы

прафтэхадукацыі. Акрамя таго, Г.Я.Парэчын з’яўляўся, па сутнасці, вядучым даследчыкам гісторыі беларускай савецкай дзяржавы першага дзесяцігоддзя з моманту яе заснавання (1917-1928 гг.). У шэрагу прац ён даў грунтоўны аналіз працэсаў утварэння БССР, дзяржаўнага будаўніцтва ў гады грамадзянскай вайны, узаемаадносін паміж БССР і РСФСР, удзелу БССР у стварэнні СССР, распрацоўцы канстытуцыйных актаў і інш. Асаблівую цікавасць нават з пазіцый сённяшняга дня выклікае артыкул вучонага «Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі» (1929 г.). У ім даецца пазітыўная ацэнка беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху, пачынаючы з К.Каліноўскага. Аналізуецца працэс утварэння беларускай нацыі і фарміравання яе самасвядомасці.

Аўтар прасочвае погляды рускіх народнікаў, А.Герцэна, сацыял-дэмакратаў на нацыянальнае беларускае пытанне і магчымасці яго вырашэння. Таму невыпадкова, што ў 1937 г., калі ішла барацьба таталітарнага рэжыму з парасткамі нацыянальнай свядомасці артыкул вядомага ў свой час правазнаўцы Г.Я.Парэчына быў ахарактарызаваны як нацыяналістычны.

Значны уклад у развіццё гісторыі дзяржавы і права ўнёс першы рэктар БДУ прафесар У.Пічэта. Кола яго навуковых інтарэсаў надзвычай шырокае. Ён даследаваў крыніцы права ВКЛ XV-XVI стст. Статуты XVI ст., Уставы на валокі 1557 г., зрабіў аналіз прававога становішча розных сацыяльных груп беларускага феадальнага грамадства.

Цывілісты М.Грэдзінгер і Ф.Гаузе ўнеслі значны уклад у распрацоўку праблем гэтай галіны права. Так, напрыклад, М.Грэдзінгер, аналізуючы спадчыннае права ва ўмовах будаўніцтва сацыялізму, адстойваў ідэю адзінства юрыдычных устанаўленяў у сферы наследавання ва ўсіх саюзных рэспубліках. Названы навуковец працаваў таксама ў галіне грамадзянскага працэсуальнага права і быў аўтарам першага падручніка па грамадзянскаму працэсу БССР.

Галоўным колам пытанняў, якія даследаваў вядомы ў нашай краіне юрыст Ф.Гаўзе, былі вельмі актуальныя праблемы абавязацельнага права.

Шмат новых напрацовак было зроблена ў 1920-1930-я гады у галіне крымінальнага права, так, напрыклад, прафесарам В.Н.Шыраевым распрацоўваліся праблемы сістэматызацыі крымінальных нормаў, удасканалення заканадаўчай тэхнікі, юрыдычных санкцый. А.С.Слупкоўскі ў кнізе «Асноўныя моманты развіцця і склад сучаснай злачыннасці ў БССР» зрабіў спробу на аснове статыстыкі ўстанавіць залежнасць характару злачынства ад сацыяльных, дэмаграфічных і нацыянальных фактараў, а таксама ад месца жыхарства суб’екта права і нават ад пары года. Аўтар прааналізаваў віды грамадска-небяспечных злачынстваў у цеснай сувязі з асаблівасцямі суб'екта злачынных дзеянняў.

Такім чынам, у дадзены перыяд пастугова афармляецца юрыдычная навука савецкай Беларусі. Разам з тым, на юрыдычнай навуцы, як і на ўсім грамадазнаўстве, ляжаў цяжар ідэалагічных забаронаў і патрабаванняў прытрымліваецца ўстановак і поглядаў кіруючай камуністычнай партыі на

ролю і задачы савецкага права» [3, с. 214-216].

## 2. Палітычная і прававая думка ў БССР у 40-80-я гады ХХ ст.

### *2.1. Новыя тэндэнцыі ў грамадска-палітычнай думцы пасля Вялікай Айчыннай вайны*

«Перамога над гітлераўскай Германіяй усяліла ў савецкіх людзей гонар за сябе, за сваю краіну. Вайна падвергла суроваму выпрабаванню таталітарнае мысленне, якое, не вытрымліваючы сутыкнення з рэчаіснасцю, пачало часткова мяняцца. Людзі, якія па волі лёсу трапілі за мяжу, маглі параўнаць жыццё ў СССР з бытам іншых краін, ацаніць і супаставіць дасягненні заходняй цывілізацыі з савецкай рэчаіснасцю. Вядучай грамадскай дамінантай пасляваеннага развіцця СССР стала патрэбнасць у абнаўленні старых палітычных і гаспадарчых структур, якія не маглі не толькі забяспечыць рух грамадства на ўзроўні агульнасусветнага прагрэсу, але і задаволіць элементарныя патрабаванні народа.

Вайна сфарміравала новы тып асобы і грамадзяніна. Яго адрознівала высокая самаацэнка, неардынарнасць, здольнасць прымаць самастойныя рашэнні, адчуваць сябе «свядомым гістарычным дзеячам». Гэты тып часцей за ўсё сустракаўся ў асяроддзі інтэлігенцыі, студэнцкай і вучнёўскай моладзі. Менавіта інтэлігенцыя, перш за ўсё творчая і навуковая, а таксама студэнты з'яўляліся носьбітамі дэмакратычных тэндэнцый у пасляваеннай грамадска-палітычнай думцы СССР і ў тым ліку БССР.

У беларускай грамадска-палітычнай думцы другой паловы 1940-х гадоў адносна новай стала тэндэнцыя накіраваная на адраджэнне нацыянальнай свядомасці і абарону нацыянальных правоў і дэмакратычных свабодаў, захаванне і развіццё беларускай мовы і культуры. Пасля вайны яна атрымала развіццё пераважна на тэрыторыі Заходняй Беларусі і насіла характар стыхійнага пратэсту супраць распачатай у гэтым рэгіёне палітыкі русіфікацыі ў галіне культуры і адукацыі. Носьбітам дэмакратычных тэндэнцый у грамадска-палітычнай думцы з’яўлялася ў асноўным студэнцкая і школьніцкая моладзь. Ствараліся шматлікія гурткі і арганізацыі культурна-асветніцкага тыпу, большасць з якіх была выкрыта органамі дзяржбяспекі, а іх арганізатары і актывісты былі арыштаваны і жорстка пакараны.

Імкненні да рэфармавання грамадска-палітычнага жыцця праяўляліся не толькі ў моладзевым асяроддзі, але і сярод прадстаўнікоў вышэйшых партыйных, савецкіх, гаспадарчых структур, куды пасля вайны было вылучана нямала неардынарных, таленавітых людзей. Аб гэтым сведчаць падрыхтаваныя ў той час праекты Канстытуцыі СССР і праграмы КПСС, у распрацоўцы якіх удзельнічалі і прадстаўнікі беларускай наменклатуры. Праекты прадугледжвалі пашырэнне правоў і свабодаў працоўных, абмежаванне тэрміну знаходжання ў партыйных і савецкіх выбарных органах, пачынаючы з гарадскога і заканчваючы рэспубліканскім звяном. Пры панаванні дзяржаўнай уласнасці прапаноўвалася дазволіць існаванне дробнай аднаасобнай сялянскай гаспадаркі і дзейнасць саматужнікаў.

Зразумела, што гэтыя праекты не маглі быць прыняты ва ўмовах сталінскага рэжыму.

Незадавальненне афіцыйнай палітыкай праявілася і пры выбарах у Вярхоўны Савет БССР (сакавік 1947 г.) і мясцовыя Саветы (1948 г.). Так, напрыклад, пратаколы выбарчых сходаў зафіксавалі крытычныя заўвагі адносна прымусовага характару выбараў, адсутнасці альтэрнатыўных кандыдатур. Сярод насельніцтва ў шэрагу раёнаў Гродзенскай, Мінскай, Гомельскай абласцей распаўсюджваліся лістоўкі з заклікамі не прымаць удзелу ў выбарах.

Але пачатак «стыхійнай дэсталінізацыі» ў свядомасці большасці савецкіх людзей яшчэ не звязваўся з імем самога Сталіна. Сталінскі рэжым цалкам ідэнтыфікаваўся з сацыялізмам, што рабіла яго амаль што недатыкальным.

Праяўленне ў пэўнай часткі беларусаў пачуцця нацыянальнага гонару, дэмакратычных, антытаталітарных настрояў абвастрыла ахоўную рэакцыю рэжыму. Пачалося ўзмацненне ідэалагічнай апрацоўкі свядомасці людзей. Сталінскі рэжым імкнуўся прапагандна-рэпрэсіўным шляхам закансерваваць існуючую сістэму грамадскіх адносін. Ідэалогія пасляваеннага сталінізму характарызавалася крайнім дагматызмам, нецярпімасцю да іншадумства. На афіцыйным узроўні праводзіліся кампаніі, накіраваныя на навязванне жорсткіх ідэалагічных стэрэатыпаў у навуцы, культуры, літаратуры, падаўлення нацыянальнай свядомасці народа. Услед за сумна вядомымі пастановамі ЦК УКП(б) «Аб часопісах «Звязда» і «Ленінград»» (1946 г.), якія распачалі ў СССР ідэалагічны прэсінг супраць творчай і навуковай інтэлігенцыі, выйшла пастанова ЦК УКП(б) «Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі», дзе ў безыдэйнасці, няправільным адлюстраванні савецкай рэчаіснасці абвінавачваліся такія пісьменнікі, як К.Крапіва (п’еса «Мілы чалавек») і А.Кучар (п’еса «Заложнікі»). У гэтай і іншай пастановах ЦК КП(б) Беларусі гучаць абвінавачанні творчай інтэлігенцыі ў безыдэйнасці, адсутнасці тэм, якія б выхоўвалі народ у духу савецкага патрыятызму, самаахвярнага служэння радзіме і камуністычным ідэалам.

3 верасня 1947 г., згодна з указаннем Галоўліта СССР, па ўсёй краіне праводзілася цэнзурная праверка бібліятэчных фондаў. Выемцы, у першаю чаргу, падлягалі трафейныя выданні, якія былі завезены ў СССР ў час вайны з заходніх краін. Разам з замежнай кантралявалася і айчынная літаратура. З бібліятэк былі канфіскаваны і адпраўлены ў спецсховішчы кнігі, аўтары якіх былі рэпрэсаваны, а таксама літаратура, дзе згадваліся асобы, абвешчаныя «ворагамі народа».

Наступ на творчую інтэлігенцыю не абмяжоўваўся толькі папрокамі. Усяго ў Беларусі ў пасляваенны перыяд было рэпрэсіравана 238 пісьменнікаў.

У 1947 г. з падачы ЦК УКП(б) пачалася барацьба з навуковай элітай краіны. Рэжым імкнуўся ізаляваць яе ад кантактаў са сваімі калегамі за мяжою. Той, хто ішоў на кантакты з замежнымі калегамі альбо выказваў нешта станоўчае ў іх бок, губляў у вачах ідэолагаў камуністычнага рэжыму

гонар і вартасць савецкага чалавека. Звычайнымі для таго часу былі абвінавачанні ў антыпатрыятызме, пакланенні Захаду, «бязродным касмапалітызме». Пад гэтыя абвінавачанні папалі такія беларускія вучоныя, як прафесары-медыкі Клюева і Роскін, біёлаг-генетык А.Р.Жэбрак, рэктар Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі М.М.Каўцэвіч, дэкан біяфака БДУ імя У.І.Леніна В.Д.Акімава і інш.

Але, нягледзячы на рэпрэсіі, большасць народа заставалася зачараваная мудрасцю любімага «правадыра», «бацькі і настаўніка» І.В.Сталіна. З ім звязвалі перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі. У 1947 г. на беларускай мове пачаў выходзіць збор твораў Сталіна. У рэспубліцы было створана 7250 гурткоў па вывучэнню яго біяграфіі. У другой палове 1940 - пачатку 1950-х гадоў з'явілася нямала літаратурных твораў, якія спявалі оды «бацьку» народаў. Прыкладам калектыўнага ўслаўлення дыктатара было пісьмо «Вялікаму Сталіну ў слаўную 70-ю гадавіну з дня нараджэння ад беларускага народа»:

*Як чыстая празрыстая крыніца*
*Струменем несціхаючым бруіць,*
*Так з сэрцаў нашых да цябе бруіцца*
*Любоў жывым струменем, як з крыніц.*
*Ты наша сонца, наша красаванне.*
*Жыві ж, наш бацька любы, многа год,*
*Прымі ж ад сэрцаў чыстых прывітанне,*
*Што беларускі шле табе народ!*

Па ўсёй краіне праходзілі сходы і мітынгі, на якіх народ знаёміўся са зместам пісьма і выказваў яму безумоўную згоду і падтрымку.

Такім чынам, дэмакратычныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства ў пасляваенны перыяд блакіраваліся савецкім палітычным рэжымам, які працягваў ідэалагічны і рэпрэсіўны ўціск» [3, с. 217-222].

### *2.2. Кансерватыўны і дэмакратычны напрамкі ў палітычнай думцы пасляcталінскай пары*

«Пасля смерці Сталіна ў краіне былі зроблены першыя спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Пачаўся пэўны паварот да калектыўных метадаў вырашэння палітычных, гаспадарчых, культурна-асветніцкіх праблем. Адносная дэмакратызацыя назіралася ў дзейнасці партыйных арганізацый, прафсаюзаў, камсамола. Былі пашыраны правы мясцовых Саветаў. Прымаліся меры па ўмацаванню законнасці і правапарадку: была скасавана асобая нарада пры міністэрстве ўнутраных спраў СССР, ліквідаваны ваенныя пракуратуры і трыбуналы. Аднаўляўся прынцып прэзумпцыі невінаватасці ў судаводстве. Пачаўся працэс рэабілітацыі ахвяр таталітарызму. Але, на жаль, большасць рэпрэсаваных прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі былі рэабілітаваны пасмяротна.

Некаторыя магчымасці для актывізацыі навуковага пошуку з'явіліся ў даследчыкаў. Пачалася рэабілітацыя цэлых галін навукі, перш за ўсё генетыкі і кібернетыкі.

Аднак з другой паловы 1950-х гадоў пачаўся і новая хваля русіфікацыі, якая, па сутнасці, была ініцыявана Першым сакратаром ЦК КПСС Мікітам Хрушчовым. На святкаванні 40-годдзя БССР ён сказаў: «Чым мы усе хутчэй будзем размаўляць на рускай мове, тым хутчэй пабудуем камунізм».

Далейшае ідэалагічнае абгрунтаванне гэтага тэзіса з'явілася ў праграме КПСС, прынятай XXII з'ездам кіруючай партыі (кастрычнік 1961 г.). Галоўны пастулат праграмы быў - зліццё савецкіх нацый у адзіную камуністычную нацыю, іх культур у адзіную камуністычную культуру.

Наогул, у грамадска-палітычнай думцы таго часу адлюстроўваўся складаны і супярэчлівы працэс барацьбы двух тэндэнцый - дэмакратычнай, якая імкнулася да вызвалення ўсіх сфер грамадскага жыцця ад скажэнняў сталінскай эпохі, і кансерватыўнай якая асабліва ўзмацнілася пасля 1964 г., калі М.С. Хрушчоў быў адлучаны ад улады. Апошняя праявілася ў імкненні захаваць і прыстасаваць да новых рэалій грамадскай свядомасці старыя рычагі кіравання.

Правадніком дэмакратычнай ідэалогіі аднаўлення выступала, перш за ўсё, творчая інтэлігенцыя, якая ўвайшла ў гісторыю як пакаленне «шасцідзесятнікаў». У межах гэтай тэндэнцыі ідзе спроба асэнсаваць прычыны і маштабы палітычных і маральных дэфармацый эпохі сталінізму і вывесці грамадства на шлях дэмакратычных пераўтварэнняў. З беларускіх дзеячаў культуры да «шасцідзесятнікаў» можна аднесці празаіка А.Кулакоўскага, які ў сваёй аповесці «Тры зоркі» дае крытычную ацэнку мясцовай савецкай наменклатуры, якая часта паводзіць сябе з падначаленымі людзьмі, як «удзельные князі», не прызнаючы ні ўлады, ні законаў, ні аўтарытэту; маладога празаіка Івана Чыгрынава, які імкнуўся да аб'ектыўнага з пункту гледжання агульначалавечай маралі паказу рэалій жыцця беларускай вёскі, якая ў часы вайны перажыла жахі акупацыі; Ніла Гілевіча, славутага беларускага паэта, які ў сваіх вершах асуджаў Сталіна і пароджаную ім сістэму; В.Каваленкі - літаратуразнаўца, які заклікаў выкарыстоўваць творчыя здабыткі замежных літаратараў, быць духоўнымі лекарамі грамадства; Васіля Тараса, які паставіў у літаратуры пытанне аб дэфіцыце павагі да чалавека ў савецкім грамадстве, і іншых.

Іх творчыя здабыткі выклікалі рэзка адмоўную рэакцыю партыйных структур. Аб гэтым сведчаць ацэнкі, дадзеныя вышэйназваным пісьменнікам на нарадзе творчай інтэлігенцыі, якая адбылася 19 сакавіка 1963 г. ў Мінску. Лепшых прадстаўнікоў беларускай творчай інтэлігенцыі абвінавацілі ў скажэнні савецкай камуністычнай рэчаіснасці і ў прыхільнасці да «варожай тэорыі ўсёдаравання», якая разыходзіцца з нормамі «класавай маралі», у выкарыстанні вопыту «крайніх буржуазных мадэрністаў» і інш.

У другой палове 1960-х гадоў у пастановах ЦК КПБ таксама падвяргаюцца крытыцы творы беларускіх пісьменнікаў, якія рэалістычна адлюстроўвалі рэчаіснасць: «Дабрасёлы» А.Кулакоўскага, «Мёртвым не баліць» В.Быкава і інш. Адказам на артыкул у «Советской Белоруссии» стаў ліст 53 пісьменнікаў у абарону В.Быкава, накіраваны ў ЦК КПБ. Ліст-пратэст, падпісаны такімі класікамі беларускай літаратуры, як М.Лынькоў,

Я.Брыль, М.Танк, П.Панчанка, А.Куляшоў, Г.Бураўкін, А.Вярцінскі і інш, адыграў на той час сваю станоўчую ролю.

Як водгук на адыход ад палітычнай адлігі і спробу рэстаўрацыі неасталінізму ў краіне пачаўся дысідэнцкі рух. Дысідэнтамі ( ад лац. dissidere - не згаджацца) называлі людзей, якія выступалі супраць несправядлівасці і парушэння правоў чалавека.

Татальны кантроль партыі за сродкамі інфармацыі, друка, культурным жыццём і г.д. не выключаў, аднак, таго, што людзі маглі знаходзіць і іншыя шляхі для абмену думкамі і ідэямі. Напрыклад, з дапамогаю выпуску самавыдавецкай літаратуры, распаўсюджвання інфармацыйных лістоў і пракламацый, нарэшце шляхам асабістых кантактаў і сустрэч. Ажыццяўленне кантролю над такімі нефармальнымі праявамі грамадска-палітычнай думкі замацоўвалася за шырока разгалінаванымі структурамі органаў КДБ і яго неабмежаванымі магчымасцямі і шматлікімі сродкамі сочкі і ціску на асобу.

Неабходна адзначыць і тое, што пад барацьбу з іншадумствам савецкай дзяржаве была падведзена прававая аснова. У крымінальныя кодэксы саюзных рэспублік былі ўведзены адпаведныя артыкулы. Так, згодна з артыкулам 67 Крымінальнага кодэкса БССР, за агітацыю і прапаганду, «якая праводзіцца ў мэтах падрыву ці паслаблення савецкай сістэмы», прадугледжвалася пазбаўленне волі тэрмінам ад 6 месяцаў да 7 год з высылкай тэрмінам ад 2 да 5 год.

Акцыі пратэсту ў Беларусі ў той час не былі вядомы шырокай грамадскасці, яны старанна замоўчваліся. Усе звязаныя з імі матэрыялы былі строга засакрэчаны.

Змагаючыся з дысідэнтамі, кіраўніцтва камуністычнай партыі і савецкага ўрада імкнулася стварыць уражанне аб шырокай падтрымцы народам унутранай і знешняй палітыкі Савецкага Саюза, у аснове якой ляжала марксісцка-ленінская ідэалогія. Для гэтага наладжваліся пампезныя святкаванні ў дні Кастрычніцкай рэвалюцыі і Першага мая, якія лічыліся рэвалюцыйнымі святамі. Формамі такіх урачыстасцей былі масавыя сходы, мітынгі, грандыёзныя дэманстрацыі, у якіх прымалі ўдзел дзесяткі тысяч чалавек. Першачарговай задачай кіруючай партыі было забеспячэнне чысціні марксісцка-ленінскай ідэалогіі, якая бачылася цэментуючай асновай савецкага грамадства.

У грамадска-палітычнай і навуковай думцы пасляваеннага часу шырока абмяркоўваліся зробленыя на партыйных з'ездах заключэнні, якім надавалася значэнне гістарычных. У працах гісторыкаў, філосафаў, правазнаўцаў, у перыядычным друку рабіліся спробы тэарэтычнага абгрунтавання высноў аб «перамозе сацыялізму» (1959 г.), «аб разгорнутым будаўніцтве камунізму» (1961 г.), «аб развітым і сталым сацыялізме», «аб новай гістарычнай супольнасці «савецкі народ»» (1972 г.) і інш.

Апошняя выснова была зроблена спачатку ў асабістай прамове Л.І.Брэжнева, а потым і на XXIV з’ездзе КПСС (1971г.). Было заяўлена, што ў краіне ўжо «ўзнікла новая гістарычная супольнасць людзей - савецкі народ».

Гэта азначала, што нацыі павінны разглядацца як перажытак мінулага. На практыцы гэта азначала поўную знявагу да нацыянальна-культурных асаблівасцей нацый і народнасцей, задушэння ўсяго, што садзейнічала іх захаванню, пашырэнню русіфікацыі па ўсіх напрамках.

Цікавыя думкі наконт перспектыў развіцця беларускай нацыі былі выказаны гісторыкам-дысідэнтам А.Каўкам у «Пісьме рускаму сябру» якое было надрукавана за мяжою ў 1979 г. Аўтар звяртаў увагу на вялікую шкоду палітыкі русіфікацыі, якая праводзілася ў Беларусі. Яе арганізатары, на думку вучонага, ігнаруюць элементарную ісціну аб тым, што кожны народ прыносіць у агульначалавечую скарбніцу «сваё імя і годнасць, непаўторны букет свайго разумення ісціны і прыгажосці». Сродкамі пераадольвання нацыянальнага нігілізму, пераўтварэння ў рэальнасць ідэі беларускай дзяржаўнасці аўтар лічыць падзвіжніцкую працу па адраджэнню духоўных каштоўнасцей народа. Аптымістычныя спадзяванні А.Каўкі на тое, што Беларусь нарэшце стане дэмакратычнай цывілізаванай дзяржавай, падзялялі лепшыя сыны бацькаўшчыны, якія ў наступныя дзесяцігоддзі прыклалі практычныя намаганні дзеля рэалізацыі незалежніцкіх, дэмакратычных ідэалаў.

Савецкую, у тым ліку і беларускую палітыка-прававую думку не абыходзяць такія распаўсюджаныя на Захадзе тэорыі, як канцэпцыя «дзяржавы ўсеагульнага шчасця» (вызначэнне краін заходняй дэмакратыі), тэорыя «канвергенцыі» (сумеснага існавання дзяржаў розных сацыяльных арыентацый пры ўспрыманні станоўчых рыс адзін аднаго і адмове ад аджыўшых рыс), тэорыя «прававой дзяржавы». Гэтыя канцэпцыі знаходзілі прыхільнікаў у неафіцыйнай думцы і падвяргаліся сакрушальнай крытыцы на афіцыйным узроўні. Так, тэорыя прававой дзяржавы была абвешчана буржуазнай ілжэнавукай, якую выкарыстоўвалі ідэйныя ворагі камунізму ў прапагандысцкіх мэтах. Асноўныя палажэнні тэорыі прававой дзяржавы ці катэгарычна адмаўляліся (прынцыпы цывільнага грамадства, размежавання ўлад, непахіснасць свабоды асобы), ці скажаліся з мэтаю дагадзіць палітычнаму самавольству (дэмакратызм законатворчасці, вяршэнства закона, адказнасць за правапарушэнне і інш.).

Такім чынам, адсутнасць дэмакратычных свабодаў у краіне, татальны кантроль з боку наменклатурнай улады за ўсім, што датычылася грамадска-палітычнага жыцця, у рэшце рэшт сталі прычынаю шырока распаўсюджанай у грамадстве апатыі і абыякавасці да палітыкі і ідэалогіі, прававога нігілізму» [3, с. 222-231].

### *2.3. Развіццё юрыдычнай навукі ў Беларусі (1945-1980-я гады XX ст.)*

«Асноўнымі прычынамі, якія актывізавалі развіццё даследаванняў у галіне дзяржавы і права, былі выхад БССР на міжнародную арэну, частковая дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, пашырэнне самастойнасці саюзных рэспублік у праватворчай дзейнасці і прыняцце на XXII з’ездзе КПСС (1961 г.) праграмы пабудовы камунізму. Апошняя выклікала распрацоўку шэрагу праблем, звязаных са змяненнямі функцый дзяржавы і

права ў працэсе пераходу ад сацыялізму да камунізму.

Таму невыпадкова ў краіне значнае развіццё атрымалі даследаванні ў галіне дзяржаўнага і міжнароднага права. З'яўляюцца працы, у якіх аналізуюцца пытанні суверэнітэту БССР у складзе СССР, міжнароднай правасуб'ектнасці БССР, разглядаюцца характэрныя рысы заходніх дэмакратый і іх дзяржаўнага апарату.

Так, напрыклад, сярод прац, у якіх даследуюцца вышэйназваныя праблемы, у першую чаргу патрэбна назваць дзве манаграфіі Ю.П.Броўкі «Международная правосубъектность БССР» і «Белорусская ССР - суверенный участник международного общения», манаграфію В.А.Дарогіна «Суверенитет в советском государственном праве», работу С.Р.Віхарава «Суверенитет БССР в составе СССР», кнігі В.П.Сярэбранікава «Конституционное право Франции» і Г.Г.Байчарова «Политическая организация США» і інш.

Пашырэнне праватворчасці дзяржаўных органаў БССР пацягнула за сабою ўзрастанне творчай актыўнасці вучоных-юрыстаў.

У галіне тэорыі дзяржавы і права распрацоўваліся такія праблемы, як роля мясцовых Саветаў як органаў самакіравання, шляхі ўдасканалення савецкага выбарчага права і прадстаўнічай сістэмы ў БССР, прававога становішча савецкіх грамадзян, задачы і метады народнага кантролю і інш. Курс на камуністычнае будаўніцтва абумовіў распрацоўку праблем уздзеяння права на стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, прававога забеспячэння планавага развіцця эканомікі рэспублікі, ролі права ў вырашэнні задач дзяржаўнага будаўніцтва, ролі права ў агульнай сістэме сацыяльных нормаў і г.д. Так, у кнігах С.Г.Драбязкі «Право и коммунизм», «Право и материальная база коммунизма», «Роль законодательства в создании материально-технической базы коммунизма» асвятлялася прырода сацыялістычнага агульнанароднага права, аналізаваліся ўмовы перарастання яго ў правілы камуністычнага супольнага жыцця. Вышэйназваныя праблемы распрацоўваліся таксама ў даследаваннях А.А.Галаўко, Н.А.Кудзінава, А.Г.Лейзерава, У.А.Кучынскага, А.Н.Крамніка і інш.

Арыентацыя савецкага грамадзянскага заканадаўства на рэгламентацыю дагаворных адносін паміж сацыялістычнымі прадпрыемствамі выклікала неабходнасць у актывізацыі даследаванняў у галіне грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага права. Акрамя выдання ў 1975-1978 гг. калектыўнай манаграфіі «Гражданское право БССР» (у трох кнігах), ішлі распрацоўкі асобных праблем грамадзянскага права. Сярод іх можна адзначыць работы Ф.І.Гаузе «Обязательственное право» і «Социалистический гражданско-правовой договор», кнігі В.Ф.Чыгіра «Договор подряда по капитальному строительству» і «Советское жилищное право» і інш.

У пасляваенны час узніклі такія новыя галіны ў прававой навуцы, як гісторыя дзяржавы і права Беларусі і судовая псіхалогія.

Згодна з прынятай канцэпцыяй гісторыі дзяржавы і права Беларусі яе перыядызацыя пачыналася з 1 студзеня 1919 г. - дня абвяшчэння БССР. Таму

даследаваўся ў асноўным савецкі перыяд беларускай гісторыі. Інстытутам філасофіі і права АН БССР у 70-я гады ХХ ст. была падрыхтавана «Гісторыя дзяржавы і права Беларускай ССР» у двух тамах, аўтарамі якой з'яўляліся такія вядомыя навукоўцы, як С.П.Маргунскі, У.А.Кучынскі, В.І.Шабайлаў, Э.А.Саркісава, В.А.Дарогін, В.С.Шыкуноў, І.І.Пацяружа, В.М.Арцемава, В.І.Семянкоў, Ю.П.Броўка і інш.

Асобныя даследаванні былі прысвечаны праблемам утварэння БССР, развіцця дзяржавы і права БССР у першыя гады савецкай улады, судоваму будаўніцтву, гісторыі развіцця судоў і пракуратуры ў рэспубліцы, дзейнасці Саветаў па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У кантэксце сказанага патрэбна адзначыць працы С.П.Маргунскага «Государственное строительство БССР на первом этапе её развития», «Создание и упрочение белорусской государственности»; манаграфію В.А.Круталевіча «Рождение Белорусской Советской республики»; работы І.І.Марціновіч «История суда в БССР» і «Адвокатура в БССР», манаграфію А.А.Галаўко «Деятельность Советов Белоруссии по осуществлению экономической политики в деревне в 1927-1936 годах»; працу Л.А.Прыходзькі «Государственно-правовое руководство коллективизацией сельского хозяйства Белоруссии» і інш.

У канцы 1960-1970-х гадоў з’яўляюцца работы Я.А.Юхо, якія былі прысвечаны гісторыі дзяржавы і права Беларусі феадальнага перыяду. Так, у манаграфіі Я.А.Юхо «Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI ст.» быў дадзены глыбокі аналіз прававога становішча розных груп насельніцтва Беларусі, крыніц феадальнага права, развіцця крымінальнага, грамадзянскага і сямейнага права, цэнтральных і мясцовых судовых органаў.

Найбольш эфектыўна ў галіне судовай псіхалогіі працавалі такія даследчыкі, як А.В.Дулаў, Г.Г.Шыханцоў, Ф.В.Глазырын, М.І.Порубаў і інш. Іх даследаванні былі прысвечаны праблемам псіхалагічнага аналізу на папярэднім следстве, псіхалогіі следчага і іншым пытанням. Так, напрыклад, А.В. Дулавым былі падрыхтаваны работы «Вопросы теории судебной экспертизы», «Введение в судебную психологию», «Основы психологического анализа на предварительном следствии», Д.П.Котаў і Г.Г.Шыханцоў напісалі «Практикум по судебной психологии»; М.І.Порубаў апублікаваў манаграфію «Допрос в советском уголовном процессе и криминалистике» і інш.

Такім чынам, нягледзячы на розныя ідэалагічныя забабоны і скажэнні, прававая навука пасляваеннага перыяду атрымала даволі хуткае развіццё і стала фундаментам для сённяшняй юрыдычнай навукі» [3, с. 231-234].

*Пытанні 1.5, 2.1, 2.2, 2.3 лекцыі састаўлены на падмурку матэрыялу выкладзенага ў вучэбным дапаможніку: Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.установаў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.*

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бабаев, В.К. О преемственности между социалистическими и прошлыми типами права / В.К. Бабаев // Государство и право, - 1975. - №12. – С. 102-107.
2. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624 с.
3. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.установ/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
4. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дап. / А.Ф.Вішнеўскі. – Мн.: Акад.МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319с.
5. Давид, Р. Основные правовые системы современности / Р. Давид, К. Жоффре-Спинози; пер. с фр. В.А. Туманова. - М.: Международные отношения, 1998.-400 с.
6. Довнар, Т.И. Преемственность в конституционном строительстве Белорусской ССР: автореф. … дис. канд. юрид. наук: 12.00.01. / Т.И. Довнар, ЛГУ им. А.А. Жданова. – Л., 1986. – 17 с.
7. Конституция (Основной закон) СССР. – М.: Юрид. лит., 1987. – 48 с.
8. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917-1945гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 238 с.
9. Курский, Д.И. Избранные статьи и речи / Д.И. Курский; Всесоюз.ин-т юрид.наук. - М.: Юрид. лит., 1948. – 194 с.
10. Лойка, Л. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка / Л. Лойка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6т. / пад рэд. М.В. Біч [і інш.]. – Мн.: БелЭн, 1993. - Т.1. А-Беліца/Беларус. – С. 400-407.
11. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л.Лыч, У.Навіцкі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – 453 с.
12. Нерсесянц, В.С. Философия права: учебник для вузов/ В.С. Нерсесянц. – М.: Изд-во НОРМА (Изд-ская группа НОРМА-ИНФРА М), 2000. – 652 с.
13. О силе для ССРБ декретов и распоряжений РСФСР: Декрет Президиума ЦИК ССР Белоруссии, 21.01.1922г. // Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзен): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд. – Мн.: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – С. 230.
14. Полякова, Н.Л. XX век в социологических теориях общества / Н.Л. Полякова. – Москва: Логос, 2004. – 384 с.
15. Социалистическое право // Всемирная история государства и права: энцикл. словарь/ под ред. А.В. Крутских. – М.: ИНФРА-М, 2001. – С. 322-324.
16. Союзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссией 1921 года // Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і

матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзен): вучэб. дапаможнік / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мн.: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003.–С. 228-229.
17. Стучка, П.И. Избранные произведения по марксистско-ленинской теории права / П.И.Стучка; сост. Г.Я. Клява; Институт истории партии при ЦК КП Латвии - филиал Института Марксизма-Ленинизма при ЦК КПСС. - Рига : Латвийское гос. изд-во, 1964. -748 с.
18. Тесля, А.А. О парадигмах юриспруденции/ А.А.Тесля. - [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://civil-law.narod.ru/wissled/teslya/paradig1.html. – Дата доступа: 26.09.2006.
19. Чудаков, М.Ф. Конституционный процесс в Беларуси (1447-1996 гг.): монография / М.Ф.Чудаков. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 327с.

## ТЭМА 13.
## ПАЛІТЫКА-ПРАВАВАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

### *1. Новыя палітыка-эканамічныя рэаліі канца 1980 - пачатку 1990-х гадоў і іх уздзеянне на палітычную і прававую думку Беларусі*

Канец 60-х - пачатак 70-х гадоў XX стагоддзя сталі перыядам рэзкай сацыяльнай трансфармацыі ўсіх сучасных грамадстваў і іх падсістэм - эканомікі, культуры, палітыкі, сістэмы сацыяльных адносін. Тэлекамунікацыйная рэвалюцыя дала старт цалкам новаму этапу ў сусветным працэсе сацыяльнага і эканамічнага развіцця. Радыкальным чынам пераўтвараецца эканамічная падсістэма і ўся сфера працы. Узнікае новая сістэма прафесійнай дыферэнцыяцыі, новыя прафесіі, змяняюцца сістэмы арганізацыі працы і кіравання. Ажыццяўляецца пераход ад гіганцкіх суперканцантраваных сацыяльна-эканамічных структур да малых дэцэнтралізаваных прадпрыемстваў [21, с. 291].

Савецкая дзяржава, з прычыны падвышанай сацыяльнай інерцыі, доўгі час ігнаравала глабальныя сацыяльныя заканамернасці, што прывяло да крызісу яе палітычнай і эканамічнай падсістэм. У сяр. 1980-х была зробленая спроба рэфармавання сацыялістычнага ладу на аснове дэмакратызацыі грамадскага жыцця, паслабленне цэнзуры, пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў, але глыбіня сістэмнага крызісу, марудлівасць рэформаў, асабліва ў часткі надання рэспублікам рэальнай самастойнасці, міжнацыянальныя канфлікты прывялі ў канцы 1991 г. да распаду СССР і абвяшчэнню суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Лібералізацыя палітычнага жыцця ў Савецкім Саюзе аказала значны ўплыў на рух саюзных рэспублік у напрамку стварэння суверэнных дзяржаў. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР XII склікання прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Перш за ўсё вышэйшай мэтаю, у імя якой абвяшчаўся дзяржаўны суверэнітэт, аб’яўлялася свабоднае развіццё і дабрабыт, годнае жыццё кожнага грамадзяніна рэспублікі.

Перад незалежнай беларускай дзяржавай устала задача пераўтварэння ўсіх падсістэм грамадства на шляху стварэння «дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы», у тым ліку перагляду, кадыфікацыі і сістэматызацыі заканадаўства, якое павінна было забяспечыць вяршэнства права і стаць дзейснай прыладай пераўтварэнняў. У выніку з 1990 па 1994 г. было прынята каля 400 заканадаўчых актаў [6, с. 2]. Шмат у чым гэта быў перыяд разрыву пераемных сувязяў з існаваўшым да гэтага савецкім правам з прычыны нацэленасці на паскарэнне сацыяльных, палітычных і эканамічных рэформаў.

У праве замацоўваліся заходнееўрапейскія ліберальныя каштоўнасці - абвяшчэнне індывідуальных свабодаў і рынкавай эканомікі ў якасці вышэйшай каштоўнасці. Пры гэтым не ўлічвалася магчымасць іх сутыкнення з устаяўшыміся ў беларускім грамадстве традыцыйнымі каштоўнасцямі. Як і ў іншых постсавецкіх дзяржавах, права будавалася на аснове паўнамаштабнай рэцэпцыі нормаў з прававых сістэм заходніх дзяржаў [12, с. 44] і міжнароднага права. У абсалютную большасць законаў, прынятых у

90-х гадах уключаныя палажэнні аб дзеянні міжнародных дамоваў, калі імі усталяваныя правілы іншыя, чым у адпаведным законе (арт.15 Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса ад 15 снежня 1998 г. і інш.) [15; 16; 25].

У кароткі прамежак часу з 1990 па 1994 гады было прынята гэтулькі ж нарматыўных актаў, колькі было прынята Вярхоўнымі Саветамі ўсіх скліканняў, пачынаючы з 1938 па 1990 гады, а за перыяд з 1994 па 2003 гады прынята 709 законаў, 199 дэкрэтаў, 2080 указаў Прэзідэнта, 256 актаў Канстытуцыйнага Суду, дзесяткі тысяч іншых нарматыўных актаў [5, с. 8]. Гэткая масавасць была выкліканая неабходнасцю карэннай перабудовы грамадства.

Па меркаванні Г.А.Васілевіча ў выніку нават сфармаваўся тып праватворчасці, «сутнасць якога зводзіцца ў асноўным да неабходнасці хуткага павелічэння заканадаўчага масіву», у шкоду іх узгодненасці і супадпарадкаванасці [5, с. 8]. Падобныя вынікі прававога забеспячэння рэформаў, выклікалі ў беларускім грамадстве распаўсюджванне прававога нігілізму [9, с. 271], як яркай прыкметы проціпастаўлення ў новым праве нарматыўнасці і справядлівасці.

Нацэленасць на паскоранае пераўтварэнне грамадства, карэнная змена яго прававой сістэмы з самога пачатку ўсведамлялася заканадаўцам, замацоўвалася ім у праграмных дакументах. Так, у Прэамбуле Дэкларацыі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным суверэнітэце» заяўлялася «... аб рашучасці стварыць прававую дзяржаву» [1, с. 253]. Імкненне прававога пераўтварэння замацоўвалася і ў Канстытуцыі 1994 гады, і ў яе новай рэдакцыі 1996 гаду, што сведчыць аб усведамленні этапу рэформаў і ў новы перыяд [10, с. 3].

Больш адкрыта аб інструментальнай функцыі права на сучасным этапе гаворыцца ў Пастанове Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь ад 23.04.1992 г. «Аб канцэпцыі судова-прававой рэформы»: «Прызнаць галоўнымі мэтамі судова-прававой рэформы: стварэнне прававой сістэмы, здольнай забяспечыць функцыянаванне прававой дзяржавы… Станаўленне дзяржаўнасці Беларусі і рэалізацыя судова-прававой рэформы мяркуюць кардынальнае абнаўленне дзейснага заканадаўства. Яно павінна адпавядаць па форме і па зместу духу часу, грамадскім запатрабаванням, навуковым падыходам і практычнаму досведу, адпавядаць міжнародна-прававым стандартам» [14].

Інструменталізм і прыярытэт інавацыйнай функцыі права Рэспублікі Беларусь прама замацоўваліся ў раздзеле 14 «Прававое забеспячэнне» «Асноўных накірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996-2000 гады», зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.11.1996 г. №464: «Меркаваныя меры і канцэптуальныя падыходы да сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны вызначаюць накірункі наступных пераўтварэнняў. Яны адэкватныя трансфармацыйным працэсам, якія працякаюць ва ўсім цывілізаваным свеце, і арыентаваныя на фармаванне новай эканамічнай сістэмы. Хуткасць, глыбіня і маштабы пераўтварэнняў у значнай меры вызначаюцца дзейснай прававой базай. Каб інтэнсіфікаваць

працэс рэформаў неабходна ў максімальна кароткі тэрмін стварыць прававое забеспячэнне вызначаных мерапрыемстваў» [17].

Аднак некрытычнае перайманне прававых нормаў, замацаваных імі метадаў рэгулявання эканомікі, узораў узаемаадносін улады і грамадства прывяло да рэзкай палярызацыі палітычных сіл, спаду сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны практычна па ўсіх паказчыках [5, с. 12]. У выніку ў асяроддзі кіруючай эліты склаліся ўяўленні аб неабходнасці пераарыентацыі палітыкі дзяржавы ў сацыяльную вобласць. Прыярытэтам стала рэалізацыя правоў чалавека на вольнае і годнае існаванне [3, с. 81]. Для яго дасягнення ставілася задача па разумным спалучэнні прынцыпаў рынка і дэмакратыі з некаторым карысным досведам савецкага перыяду ў выглядзе ўзмацнення дзяржаўнай улады, забеспячэння дысцыпліны, кіруемасці ў дзяржаве, уплыву дзяржавы на эканоміку, сацыяльнага забеспячэння грамадзян. Чарговы раз выявілася мадэль узнаўлення пераемнай сувязі ў праве пасля першапачатковага рэвалюцыйнага і радыкальнага яе разрыву.

Кардынальны разрыў пераемнасці ў каштоўнасным развіцці грамадства і права ў пачатку 90-х гг. XX стагоддзя, і іх перабудова на ліберальных і рынкавых каштоўнасцях, а таксама ўспрыманне і замацаванне ў сяр. 90-х гг. шэрагу каштоўнасцяў і інстытутаў, якія пераарыентуюць дзейнасць дзяржавы ў сацыяльнай сферы, прывялі да каштоўнаснай разбалансіроўкі прававой сістэмы Беларусі. Фактычна ў аснове права Рэспублікі Беларусь ляжаць каштоўнасці і прынцыпы і савецкага ладу, і лібералізму, і сацыяльнай дзяржавы.

Каштоўнасная супярэчлівасць права ўсведамляецца беларускім заканадаўцам. Так, «Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь» (2002 г.) да адмоўных тэндэнцый нацыянальнага заканадаўства адносіць: «…разбалансіраванасць асобных частак сістэмы заканадаўства, у тым ліку з-за дзеянні на тэрыторыі Рэспублік Беларусь нарматыўных прававых актаў СССР і БССР, наяўнасць значнай колькасці дублюючых і ў шэрагу выпадкаў супярэчлівых актаў, выдадзеных на аснове розных прынцыпаў права…» [13].

Такім чынам відавочна, што ў дзяржаўным і прававым развіцці краіны адлюстроўваюцца сутыкненні двух тэндэнцый, якія склаліся ў грамадскай свядомасці насельніцтва.

Першая тэндэнцыя накіравана на хутчэйшае духоўна-гуманістычнае абнаўленне грамадства на глебе выпрабаваных часам агульначалавечых каштоўнасцей дэмакратыі, незалежнасці, правоў асобы, народнага дабрабыту. Другая тэндэнцыя, выкліканая таталітарнай спадчынай папярэдняга перыяду, накіравана на падначаленне грамадства дзяржаве, монаідэалагізацыю грамадскай свядомасці, нівеліроўку індывіда, падтрымку прэстыжнасці каштоўнасцей улады і сілы, а таксама гіпертрафіраванага ўяўлення пра ролю вышэйшага аўтарытэту. У межах гэтай тэндэнцыі назіраюцца спробы стараннай эксплуатацыі аджылых сацыяльна-псіхалагічных стэрэатыпаў, прагматычнага выкарыстання іх прадстаўнікамі асобных сацыяльна-палітычных сіл у сваіх вузкаэгаістычных інтарэсах.

Такая агульная сітуацыя параджае ўнутраную супярэчлівасць, дваістасць у развіцці грамадства, дзяржавы і права Рэспублікі Беларусь, яе палітыка-прававой думкі, прымушае правячыя колы краіны суадносіць свае дзеянні з прававой і палітычнай свядомасцю насельніцтва.

## ***2. Канстытуцыйны працэс у Рэспубліцы Беларусь і яго адлюстраванне ў палітыка-прававой думцы краіны***

«У сучаснай палітыка-прававой думцы значнае месца пачала займаць такая навуковая катэгорыя, як канстытуцыяналізм. Пад ёю разумеецца, па-першае, абмежаванае канстытуцыяй дзяржаўнае кіраванне, па-другое, палітыка-прававая тэорыя, у якой абгрунтоўваецца неабходнасць усталявання канстытуцыйнага ладу, а таксама канстытуцыйныя ідэі, накіраваныя на ўдасканаленне дэмакратычных асноў дзяржавы.

Сучаснае агульнапрынятае разуменне сутнасці Канстытуцыі заключаецца ў тым, што яна з’яўляецца асноўным прававым механізмам абмежавання дзяржаўнай улады, г.зн. устанаўлівае межы ўмяшальніцтва дзяржавы ў галіну правоў і свабодаў чалавека і грамадзяніна. Таму ўсе сучасныя канстытуцыі па меншай меры замацоўваюць два важныя аспекты: абвяшчэнне і гарантаванне правоў і свабодаў чалавека і грамадзяніна; вызначэнне асноў канстытуцыйнага ладу, формы дзяржавы (формы кіравання, палітыка-прававы рэжым, формы дзяржаўнага ўладкавання) і інш.

З пачатку 1990-х гадоў у сувязі з набыццём Беларуссю суверэнітэту і да сённяшняга часу ў палітыка-прававой думцы рэспублікі шырока абмяркоўваюцца праблемы канстытуцыяналізму. Свае меркаванні па адзначаных пытаннях выказвалі вядомыя палітыкі, навукоўцы, юрысты-практыкі.

Так, дыскусія вакол пытання аб форме кіравання ў Рэспубліцы Беларусь мела даволі востры характар напярэдадні прыняцця Канстытуцыі ў 1994 г. Абгрунтоўваючы мэтазгоднасць замацавання ў Канстытуцыі той ці іншай формы кіравання, удзельнікі дыскусіі зыходзілі з уліку наступных абставін: стану эканамічнага развіцця краіны, ступені грамадскай згоды адносна фундаментальных светапоглядных каштоўнасцей, становішча партыйнай сістэмы, тыпу існуючай у краіне выбарчай сістэмы, палітыка-культурных традыцый, менталітэту народа, вопыту папярэдняга кіравання і рэальных суадносім палітычных сіл, якія выступаюць за тую ці іншую форму ўлады.

Праблема выбару канстытуцыйнай формы кіравання звялася ў асноўным да дылемы: парламенцкая або прэзідэнцкая. Падчас дыскусіі выдзеліліся тры асноўныя пункты гледжання адносна ролі канстытуцыйных форм кіравання.

Першы зводзіўся да таго, што чыста прэзідэнцкая сістэма часта выклікае канфрантацыю прэзідэнта з апазіцыяй у заканадаўчым органе, яна здольна прывесці да паралічу ўлады і некіруемасці дзяржавы. Развіццю дэмакратыі больш адпавядае чыста парламенцкая форма кіравання. Менавіта парламенцкі тып дэмакратыі можа забяспечыць падтрымку ўрадавых праграм з боку парламенцкай большасці і кіраўніцтва ва ўмовах шматпартыйнасці.

Другі пункт гледжання заключаўся ў тым, што ва ўмовах пераходнага грамадства, да якога адносілася постсавецкая Беларусь, неабходна моцная, адносна незалежная ад парламента выканаўчая ўлада, якой па азначэнню з’яўляецца менавіта прэзідэнцкая ўлада. Толькі яна можа забяспечыць хуткі і стабільны рух грамадства да ўмацавання дэмакратыі.

Трэці погляд з’яўляецца больш умераным, чым першы і другі. Яго прыхільнікі імкнуліся пазбегнуць катэгарычных высноў пры вызначэнні станоўчых і адмоўных бакоў той ці іншай формы кіравання. Перш чым асуджаць ці ўхваляць якую-небудзь канкрэтную форму кіравання, трэба прааналізаваць усю сукупнасць інстытутаў, існуючых у той ці іншай краіне, а таксама характэрныя для яе эканамічныя і культурныя фактары, якія могуць так ці інакш уплываць на функцыянаванне той ці іншай формы кіравання.

Супраць інстытута прэзідэнцкай улады ў Вярхоўным Савеце XII склікання прынцыпова выступала фракцыя Беларускага народнага фронту.

Сярод навукоўцаў у падтрымку парламенцкай рэспублікі найбольш абгрунтавана выступілі прафесар А.Вішнеўскі і дацэнт М.Гарбаток у артыкуле «Ці патрэбна Беларусі прэзідэнцкая форма кіравання?». Звяртаючыся да гістарычных традыцый, яны згадвалі беларускія сярэднявечныя традыцыі парламентарызму і абмежавання ўлады манарха. Таму, на думку аўтараў, парламенцкая форма адпавядала б гістарычнай спадчыне беларускага народа. Аналізуючы вопыт папярэдняга кіравання ў савецкай дзяржаве, які быў заснаваны на аўтарытарна-таталітарных метадах, вучоныя адзначалі, што гэты факт стварае пагрозу пераўтварэння прэзідэнцкай улады ў аўтарытарную.

А.Вішнеўскі і М.Гарбаток бачылі небяспеку ў канцэнтрацыі вялікай улады ў руках аднаго чалавека, згадваючы прыклады лацінаамерыканскіх краін, у якіх прэзідэнцтва прыкрывала дыктатарскія рэжымы. На іх думку, сацыяльны і гістарычны вопыт паказвае, што верагоднасць злоўжывання ўладаю пры прэзідэнцкай форме кіравання і перараджэнне яе ў дыктатуру дастаткова вялікія. Супраць прэзідэнцкай формы кіравання, якая імкнецца да індывідуалісцкай псіхалогіі, сведчыць і менталітэт беларускага народа, які грунтуецца на ідэях калектывізму, узаемадапамогі. І, у рэшце рэшт, менавіта парламент з’яўляецца выразнікам волі народа, прычым не толькі пазіцыі большасці, але і пункту гледжання меншасці.

Прыхільнікі моцнай прэзідэнцкай формы кіравання звярталіся таксама да яе адпаведнасці палітычнай культуры беларускага народа. Яны падкрэслівалі традыцыйную схільнасць народа да моцнай выканаўчай улады, якую ён звязвае з асобай прэзідэнта. Менавіта з першай асобаю ў дзяржаве народ атаясамлівае вынікі дзейнасці органаў выканаўчай улады. Напрыклад У.А.Мельнік лічыў, што беларускім народам не будзе ўспрыняты Прэзідэнт з прадстаўнічымі функцыямі, але натуральным чынам упішацца ў наш гістарычны вопыт прэзідэнт з функцыямі па аператыўнаму кіраванню краінаю.

На думку В. Чарнова, выканаўчага дырэктара фонду «Адкрытае грамадства», выбар прэзідэнцкай формы праўлення быў прадыктаваны

каштоўнаснымі арыенцірамі, характэрнымі для савецка-беларускай палітычнай культуры. Гэта, перш за ўсё, павага да моцнай, эфектыўнай улады, персаналізаванае ўспрыманне ўлады, неразуменне ролі прадстаўнічых органаў, што і прадвызначыла імкненне большасці грамадзян да пошуку харызматычнага лідэра, здольнага вывесці краіну з крызісу. Тым больш, што з гледзішча канстытуцыйнага працэсу ў сучасных грамадствах парламенцкая сістэма праўлення характэрна, як правіла, для краін з адносна ўстойлівай эканомікай, шматлікім сярэднім класам і з даўнімі, устойлівымі дэмакратычнымі традыцыямі. А прэзідэнцкая - для краін з вялікай удзельнай вагою нізшых слаёў, перманентнымі сацыяльнымі катаклізмамі, трывала ўкаранёнымі ў народзе аўтарытарнымі звычкамі. Таму большасць краін былога СССР пайшла па шляху абрання менавіта прэзідэнцкай формы кіравання.

Канстытуцыйнае развіццё прэзідэнцкай формы кіравання ў Беларусі прайшло, згодна з меркаваннем В. Чарнова, два этапы. На першым (1994-1996 гг.) прэзідэнцкая форма кіравання, якая фармальна ўяўляла сабой класічны ўзор канстытуцыйнай дэмакратыі прэзідэнцкага тыпу, у беларускіх умовах пайшла па шляху ўмацавання персанальнай улады.

На другім этапе, які пачаўся пасля лістападаўскага рэферэндуму, быў завершаны працэс персаналізацыі дзяржаўнай улады пераходам да суперпрэзідэнцкай рэспублікі. Аналагічнага пункту гледжання прытрымліваюцца і іншыя навукоўцы. Напрыклад, кандыдат юрыдычных навук С.Чыгрынаў лічыць, што ў фармальна-юрыдычным сэнсе Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у рэдакцыі 1996 г. абвяшчае асноўныя прынцыпы паўпрэзідэнцкай рэспублікі (Прэзідэнт не з'яўляецца главой выканаўчай улады, але мае права старшынства на пасяджэннях урада (арт. 84, п. 15). Фактычна ж паўнамоцтвы дзяржаўных органаў і рэальныя механізмы іх узаемадзеяння ў шмат чым набліжаюць Беларусь да суперпрэзідэнцкай рэспублікі (паўнамоцтвы прэзідэнта па фарміраванню дзяржаўных органаў усіх галін улады; выданне ўказаў і дэкрэтаў, якія маюць абавязковую сілу на ўсёй тэрыторыі дзяржавы; права адмены любых актаў урада)» [7, с. 238-242].

Моцная прэзідэнцкая ўлада, якая склалася ў сяр. 90-х, разглядалася кіруючымі элітамі як спосаб вываду краіны з крызісу, забеспячэнні парадку і дысцыпліны ў дзяржаве.

Але час змяніўся, і на пачатку XXI ст. асноўныя праграмныя дакументы краіны канстатуюць выкананне дадзеных задач. Так, Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны сцвярджаюць, што за перыяд 1996-2000 гг. «эканамічнае становішча краіны… стабілізавалася» [17], за 2001-2005 гг. «створана і паспяхова працуе эканоміка сацыяльна арыентаванага тыпу» [18]. Такім чынам, знікае патрэбнасць ў дамінаванні дзяржавы ў асноўных сферах жыцця грамадства, усведамляецца неабходнасць зніжэння ролі актаў Прэзідэнта ў сістэме праватворчасці.

Неабходнасць паніжэння, па меры рэалізацыі рэформаў, ролі і вагі ў заканадаўстве актаў, якія забяспечваюць аператыўнае кіраванне, адзначаецца ў юрыдычнай літаратуры. Па меркаванні Старшыні Канстытуцыйнага Суду

Рэспублікі Беларусь Г.А.Васілевіча: «Пакуль яшчэ не поўнасцю спарадкаваныя адносіны ў вобласці выдання актаў Прэзідэнтам і заканадаўчага рэгулявання тых жа адносін Парламентам. Актуальным застаецца пытанне аб суадносінах кодэксаў і дэкрэтаў, законаў і дэкрэтаў, законаў і ўказаў» [5, с. 10]. Пункты 15, 18 «Канцэпцыя ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь» таксама паказваюць на неабходнасць «забеспячэнні аптымальных суадносін законаў Рэспублікі Беларусь і дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», на неабходнасць выкарыстання апошніх «пры адмысловай неабходнасці ў аператыўнай змене прававога рэгулявання грамадскіх адносін» [13].

Мінімізацыі павінны быць падвергнуты і празмернасць у рэалізацыі прынцыпу публічнасці права, якая пераемна захавалася з савецкага перыяду. Неабходнасць ліквідацыі гэтай праявы пераемнасці ў палітыцы і праве адзначыў у сваім дакладзе на трэцім Усебеларускім народным сходзе 2006 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Г.Лукашэнка: «Прыйшоў час адыходзіць ад надзвычайнасці, ад «ручнога кіравання» эканомікай і грамадствам… Дзяржава па-ранейшаму павінна трымаць руку на пульсе жыцця грамадства ва ўсіх абласцях… Але разам з тым дзяржава, улада павінны ўсё ў большай ступені адчыняць магчымасці для праявы творчай ініцыятывы і самакіравання… Дзяржаве трэба змяніць акцэнт з адміністрацыйных метадаў кіравання прадпрыемствамі і галінамі вытворчасці на эканамічныя…» [11, с. 4, 10]. Ён таксама адзначыў, што важна, каб «усё большую ролю мелі такія структуры грамадзянскай супольнасці, як мясцовыя Саветы, прафсаюзы, моладзевыя і ветэранскія арганізацыі» [11, с. 11].

На неабходнасць дэцэнтралізацыі дзяржаўнага кіравання ўказвае і Старшыня Канстытуцыйнага Суду Рэспублікі Беларусь Г.А.Васілевіч: «Важнай задачай з’яўляецца развіццё мясцовага самакіравання. Эфект прававога рэгулявання будзе найбольшым пры знаходжанні аптымальных суадносін паміж цэнтралізаваным і дэцэнтралізаваным рэгуляваннем» [5, с. 12]. На перспектыву паступовага паніжэння ролі дзяржавы ў дзяржаўным кіраванні і эканоміцы ўказвае і першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Рубінаў [23, с. 5].

Такім чынам, прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у XXI стагоддзі, мэтай прававых пераўтварэння абвешчана паніжэнне ролі кіраўніка дзяржавы і яго актаў, паступовае развіццё мясцовага самакіравання, пашырэнне выкарыстання мер рынкавага рэгулявання эканомікі.

«Адной з найбольш актуальных і складаных праблем канстытуцыяналізму з’яўляецца праблема узаемадзеяння ўлад як вынік рэалізацыі прынцыпу іх падзелу. У сучаснай палітыка-прававой думцы да яе звярталіся палітыкі-практыкі, палітолагі, вучоныя-прававеды. Сярод апошніх трэба выдзеліць такіх вядомых беларускіх юрыстаў, як прафесары В.Ціхіня, А.Цікавенка, А.Вішнеўскі, А.Матусевіч, Р.Васілевіч і інш.

Акрамя адзначаных у Канстытуцыі трох галін улады сучасныя беларускія тэарэтыкі права прапаноўваюць выдзеліць яшчэ дзве - устаноўчую і кантрольную. Так, прафесар М.У.Сільчанка лічыць, што ўстаноўчую ўладу,

г.зн. права ўстанаўліваць Канстытуцыю дзяржавы, вызначаць уладкаванне вярхоўнай улады, замацоўваць асноўныя правы і абавязкі грамадзян, народ, які ёю валодае, дэлегуе аднаму з органаў дзяржавы. Як правіла, такім органам з'яўляецца парламент. Орган дзяржавы, які надзелены ўстаноўчымі паўнамоцтвамі, атрымлівае магчымасць фарміраваць прававую сістэму дзяржавы шляхам прыняцця Канстытуцыі і ўнясення ў яе змен і дапаўненняў.

Некаторыя даследчыкі (У.Кучынскі, М.Сільчанка, М.Палто) бачаць падставы для выдзялення яшчэ адной галіны ўлады - кантрольнай. На думку У.Кучынскага, у адрозненне ад ведамаснага і адміністрацыйнага кантролю, які вядзецца органамі, здзяйсняючымі і іншыя функцыі, і які часцей за ўсё займаецца іх «пабочнай» дзейнасцю, інстытуты кантрольнай улады займаюць адносна самастойнае месца, яны арганізацыйна адасоблены ад іншых галін улады. Да органаў, здзяйсняючых кантрольную ўладу, У.Кучынскі адносіць Канстытуцыйны Суд, органы пракурорскага нагляду і іншыя органы дзяржаўнага кантролю.

У прававой і палітычнай думцы сучаснай Беларусі назіраецца імкненне выдзеліць сэнс і задачы падзелу ўлад. На думку прафесара А.Матусевіча, асноўны сэнс падзелу ўлад заключаецца ў пэўнай незалежнасці дзяржаўных органаў адзін ад аднаго пры ажыццяўленні паўнамоцтваў, якія адносяцца да іх кампетэнцыі. Пры гэтым вучоны падкрэслівае, што роўнасць азначае роўную ступень незалежнасці розных галін улады пры ажыццяўленні ўскладзенных на іх паўнамоцтваў, а не роўнасць кампетэнцыі яе змястоўных аспектаў.

З падобнай трактоўкай згаджаюцца аўтары падручніка «Агульная тэорыя дзяржавы і права» А.Вішнеўскі, М.Гарбаток, У.Кучынскі: «...галіны ўлады не могуць быць роўнымі ў сваіх правах і незалежнымі адзін ад аднаго, інакш, па-першае, не будзе забяспечвацца іх функцыянальная самастойнасць, па-другое, дзяржава перастане быць адзіным механізмам». Сутнасць падзелу ўлад, упэўнены навукоўцы, у дакладным размежаванні іх функцый, правоў, абавязкаў, адказнасці, што не толькі не выключае іх узаемадзеяння, але і забяспечвае іх раўнавагу ў ажыццяўленні дзяржаўных функцый і ўзаемадзеянне ў вырашэнні складаных палітычных праблем.

Галоўная мэта падзелу ўлад, на думку А.Матусевіча,- гэта стварэнне механізма абароны грамадзян ад усеўладдзя дзяржавы, магчымасць забеспячэння трайной абароны натуральных правоў асобы ад замаху з боку дзяржавы шляхам размеркавання працэсу прыняцця рашэнняў паміж рознымі галінамі ўлады. Неабходна, лічыць вучоны, стварэнне механізмаў сацыяльнага партнёрства, узаемадзеянне не толькі паміж галінамі ўлады, але і з усімі іншымі суб'ектамі палітычнай сістэмы Беларусі: палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, народ і г.д.

Размежаванне функцый паміж галінамі дзяржаўнай улады не выключае, а, наадварот, прадугледжвае іх кааперацыю. Як падкрэслівае прафесар В.Ціхіня, аб'яднанне намаганняў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад неабходна дзеля вырашэння важнейшых дзяржаўных задач. Разам з тым, абвастрэнне адносін паміж імі (асабліва паміж заканадаўчай і выканаўчай)

можа паслабіць і нават паралізаваць кіраванне краінаю.

Пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г., які з'яўляўся спробаю вырашэння канфлікту паміж выканаўчай і заканадаўчай галінамі ўлады, былі унесены прынцыповыя змены ў Канстытуцыю 1994 г. Аналізуючы пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады ў Канстытуцыі рэспублікі рэдакцыі 1996 г., беларускія правазнаўцы прыйшлі да высновы, што ў дзяржаве аформілася яшчэ адна галіна ўлады - прэзідэнцкая. Прафесар А.Цікавенка назваў яе «арбітражнай па сваёй сутнасці ўладаю, ахоўнай, лідзіруючай па сваёй накіраванасці» . Магчымасць выдзеліць Прэзідэнта як асобую галіну ўлады бачыць і Р.Васілевіч.

Разам з тым, шэраг навукоўцаў, палітыкаў лічаць, што выдзяленне гэтай новай галіны ўлады супярэчыць асноўнаму прынцыпу падзелу ўлад - самастойнасці і роўнасці ўсіх яе галін. Узвышэнне адной з іх над іншымі вядзе да ўзурпацыі дзяржаўнай улады.

Такім чынам, неабходна прызнаць наяўнасць шырокага спектра ацэнак і самой канцэпцыі падзелу ўлад, і практыкі яе ажыццяўлення ў Рэспубліцы Беларусь у сучаснай палітыка-прававой думцы» [7, с. 242-247].

## ***3. Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці ў палітыка-прававой думцы сучаснай Беларусі***

Культура Беларусі спрадвеку ўспрымаецца як «культура памежжа» [27, с. 50]. Так, І.У.Канчэўскі (Абдзіраловіч) у сваім эсэ «Адвечным шляхам» прыводзіць словы Ф.Скарыны: «над зімнімі хвалямі Дзвіны я быў візантыйцам - Юрыем, а ў Кракаве, куды мяне пацягнула за еўрапейскай ведай - лацінкам Францышкам. А дапраўды, я не быў ні Юрыем, ні Францішкам…» [2]. Ідэі дваістасці беларускай культуры, яе функцыі мосту паміж Захадам і Расіяй развіваліся потым у творчасці Л.Акіншевіча і, да цяперашняга часу, сталі агульным месцам у беларускай гістарычнай і філасофскай літаратуры [20, с. 363; 22, с. 92; 26; 27, с. 50].

Частая змена культурна-цывілізацыйнай прывязкі Беларусі прывяла да таго, што нават па такіх элементах, як мова, рэлігія, нацыянальныя знакі, звычаі, а тым больш сістэма каштоўнасцяў, беларуская культура дагэтуль шукае кансенсус [24, с. 64-65].

Таму з абвяшчэннем дзяржаўнай незалежнасці Беларусь натуральным чынам у беларускім грамадстве, палітычных і навуковых колах распачалася дыскусія па праблемам нацыянальнай, дзяржаўнай ідэалогіі. У ліку найбольш грунтоўных даследаванняў у гэтай галіне можна назваць працы Е.Бабосава, В.Бабкова, В.Боўша, У.Конана, Л.Лыча, А. Мальдзіса, У.Мельніка, Ю.Хадыкі і інш. Удзельнікі дыскусіі ў першую чаргу імкнуліся разабрацца у сэнсе і ўзаемадносінах паняццяў «нацыянальная і дзяржаўная ідэалогія».

«Вядомы беларускі філосаф У. Конан лічыць, што нацыянальная ідэя ёсць «духоўна-творчы аналаг гістарычнага быцця народа ў яго трох вымярэннях - мінуўшчыне, сучаснасці і будучыні». Нацыянальная ідэя народа выяўляецца праз яго гістарычныя дзеянні і геапалітычныя праекты,

нацыянальны характар, самабытнасць яго культуры, уключаючы ў гэта паняцце эканоміку, сацыяльна-палітычныя структуры, літаратуру ды іншыя віды мастацтва, філасофію, рэлігію, мараль і прававыя інстытуты. Кожны народ, які выявіў гэтую ідэю ў гістарычных падзеях і ў самабытнай культуры, мае права на арганізацыю ў суверэнную нацыю і незалежную дзяржаву, падкрэслівае У.Конан. А задача нацыянальнай дзяржавы - стварыць аптымальныя ўмовы самарэалізацыі народа ў самабытных мове і культуры, якія з'яўляюцца непаўторнай гранню агульначалавечай цывілізацыі.

У.Мельнік у паняцце «нацыянальная ідэя» ўключае ўяўленне народа аб сваім мінулым (гістарычным існаванні), аб шляхах захавання сваёй цэласнасці, формах узаемаадносін з іншымі народамі, мэтах свайго далейшага развіцця. На яго думку, сэнс нацыянальнай ідэі, па-першае, у самаідэнтыфікацыі нацыі, па-другое, у яе «пасланні свету аб сваім быцці, аб сваіх інтарэсах і каштоўнасцях, як унікальнай гістарычнай супольнасці людзей». Вучоны звяртае таксама ўвагу на той факт, што нацыянальная ідэя ёсць канкрэтна гістарычны феномен, яе змест фарміруецца адначасова з развіццём нацыі. Нацыянальныя прыярытэты фарміруюцца з улікам дасягнутых вынікаў развіцця народа і змен ва ўмовах яго жыццядзейнасці. Разам з тым, у змесце нацыянальнай ідэі захоўваецца яе генетычная аснова, інакш кажучы, базавыя ідэі, пастулаты і каштоўнасці, якія адлюстроўваюць сэнс гістарычнага існавання, духоўны склад і нацыянальны характар народа. Страта народам сваіх базавых каштоўнасцей або іх замена каштоўнасцямі іншага народа вядзе да выраджэння нацыянальнай ідэнтычнасці гэтай супольнасці аб асіміляцыі з іншай нацыянальнай супольнасцю.

Па перакананню філосафа Е.Матусевіча, нацыянальная ідэя складаецца з фундаментальных каштоўнасцей пэўнай нацыянальнай супольнасці; распаўсюджанай у грамадстве каштоўнаснай арыентацыі; узору жыцця, які бачыцца пажаданым для большасці; сацыяльнага і маральнага ідэалу; асэнсавання месца і ролі краіны ў свеце; нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Ён уводзіць паняцце «агульнанацыянальная ідэя», якую лічыць больш шырокай па зместу, чым ідэя нацыянальная. Гэта ідэя, здольная аб'яднаць большасць грамадзян Рэспублікі Беларусь, захаваць правы і інтарэсы нацыянальных меншасцей, якія жывуць у краіне, і канфесій, якія дзейнічаюць на яе тэрыторыі, яна здольная стаць асновай для кансалідацыі і стабілізацыі грамадства, пераадолення сацыяльнай апатыі. Ядро агульнанацыянальнай ідэі, на думку Матусевіча, складаюць парадак, законнасць, справядлівасць, нацыянальнае адраджэнне.

У.Мельнік лічыць тоеснымі паняцці «ідэалогія нацыянальная» і «ідэалогія дзяржаўная». Бо дзяржава з моманту свайго канстытуіравання становіцца носьбітам ідэалогіі дадзенага народа. Таму дзяржаўная ідэалогія можа быць толькі нацыянальнай. Вучоны прапануе выкарыстоўваць тэрмін, спалучаючы абодва паняцці - «нацыянальна-дзяржаўная ідэалогія».

Іншыя падыходы да пытання аб суадносінах нацыянальнай і дзяржаўнай ідэалогій у акадэміка Я.Бабосава. Ён лічыць, што нацыянальная ідэя ва ўмовах шматпартыйнасці, поліэтнічнасці, поліканфесійнасці дзяржавы не

зможа стаць усёаб'яднальным фактарам. Яна была важнейшым сацыяльным інтэгратарам у час фарміравання нацыі, у пачатку XX ст. Але зараз, калі беларускі народ набыў дзяржаўную незалежнасць, «логіка Гісторыі падводзіць нас непазбежна да зближэння паняццяў «беларускасць» і «Бацькаўшчына». Інтэгратыўная ідэалогія, якая зараз патрэбна беларускаму народу, не можа быць толькі нацыянальнай, у яе аснове павінен ляжаць больш абагульняючы крытэрый, якім можа быць толькі грамадзянства.

Разам з тым, шэраг аўтараў у адзначанай дыскусіі настойваюць на неабходнасці напаўнення дзяржаўнай ідэалогіі менавіта нацыянальным зместам. У беларусаў, падкрэслівае доктар філасофскіх навук А.Майхровіч, ёсць толькі два шляхі: ці яны пацвердзяць сваю дзяржаўную, палітычную, эканамічную і духоўна-культурную адметнасць, ці будуць зноў паглынуты хвалямі суседніх моцных уплываў і інтарэсаў. «Уяўляецца, што вядучымі ўстаноўкамі і кампанентамі нашай духоўна-ідэалагічнай праграмы павінны быць, па-першае, грамадска-палітычныя каштоўнасці развітай грамадзянскай супольнасці; па-другое, фундаментальныя каштоўнасці сацыяльнага і культурнага жыцця беларускага народа (патрыятызм, радзіма, сям’я, традыцыі) і, па-трэцяе, агульначалавечыя маральныя каштоўнасці, народжаныя ў рэчышчы хрысціянскай традыцыі, у тым ліку і прынцыпы працоўнай этыкі».

Шэраг аўтараў укладваюць у змест беларускай нацыянальнай ідэалогіі такія каштоўнасці, як незалежная дэмакратычная дзяржава, беларуская мова і беларуская культура, традыцыйная беларуская талерантнасць. «Нацыянальна-спецыфічнае, - падкрэслівае прафесар Л.Лыч,- заўжды павінна быць прыярытэтным у нашым жыцці, чым толькі мы і зможам сцвердзіць сваю адметнасць сярод нацый і народнасцей сусветнай цывілізацыі, застацца ў ёй пэўным этнасам, а не нейкай бесструктурнай масай людзей...». Адказваючы сваім апанентам на заўвагу, што нельга ў шматнацыянальнай дзяржаве ставіць у аснову нацыянальнай ідэі інтарэсы адной, хай і тытульнай нацыі, вучоны піша: «...не варта баяцца ў межах разумнага, дапушчальнага аддаваць пэўны прыярытэт карэннай нацыі ў справе яе культурна-моўнага развіцця, да чаго абавязвае само гістарычнае прызначэнне яе на сваёй уласнай тэрыторыі».

Супрацьлеглай да пазіцыі вышэйпералічаных аўтараў, адстойваючых нацыянальныя прыярытэты пры выпрацоўцы нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі, з'яўляецца прапанова кандыдата філасофскіх навук Л.Крыштаповіча пакласці ў яе аснову ідэалогію заходнерусізму, якая з канца XIX ст. была афіцыйнай ідэалогіяй расійскага імперскага ўрада на тэрыторыі Беларусі. Сэнс канцэпцыі Крыштаповіча ў адмаўленні рынкавай эканомікі і прыватнай уласнасці, каштоўнасцей заходняй цывілізацыі, нацыянальна-культурнага адраджэння, беларускай ідэі і па сутнасці беларускай нацыянальнай дзяржавы. «Руская мадэль развіцця,- піша Крыштаповіч,- адзіная магчымая для нашай Айчыны - Беларусі, Расіі, Украіны, для славянства наогул...».

Такім чынам, па праблемах аб сутнасці і змесце нацыянальна-

дзяржаўнай ідэалогіі Беларусі ў сучаснай палітыка-прававой думцы існуе шырокі спектр падыходаў. Апошняе стварае ўмовы для канкурэнцыі ідэй, поглядаў і з'яўляецца гарантыяй для выпрацоўкі аптымальнай канцэпцыі ідэалогіі беларускай дзяржавы, якая б успрымалася нацыяй, народам і актыўна ўвасаблялася ў жыццё» [7, с. 252-258].

### ***4. Развіццё юрыдычнай навукі Рэспублікі Беларусь***

«Навука аб дзяржаве і праве шчыльна звязана з сацыяльна-палітычным ладам, заканадаўствам дзяржавы, развіццём прававых ідэй у грамадстве, агульным узроўнем прававой культуры народа. Карэнныя змены, якія адбыліся ў жыцці беларускага народа, пачынаючы з 1989 г., звязаны з законатворчай дзейнасцю Вярхоўнага Савета XII склікання, абранага на альтэрнатыўнай аснове. Прыняцце Вярхоўным Саветам шэрага важнейшых канстытуцыйных актаў, а таксама нарматыўных актаў, якія рэгламентавалі праваадносіны ў новых умовах суверэннай Беларусі, арыентаванай на рынкавую эканоміку, выклікала ажыўленне навуковых даследаванняў па ўсіх асноўных галінах прававой навукі.

Значным дасягненнем беларускіх вучоных-юрыстаў стала выданне «Юрыдычнага энцыклапедычнага слоўніка» (1992 г.). У яго падрыхтоўцы прымалі ўдзел такія вядомыя беларускія юрысты, як А.Абрамовіч, А.Баркоў, А.Галаўко, Т.Доўнар, Г.Дзербіна, В.Круталевіч і інш. Гэта было першае беларускае выданне, у якім выкладаліся асноўныя прававыя паняцці і сучасная беларуская прававая тэрміналогія, асноўныя прынцыпы розных галін права, крыніцы права, важнейшыя заканадаўчыя акты і іх змяненні, і тым самым прасочвалася дынаміка развіцця права.

У разглядаемы перыяд у рэспубліцы былі створаны свае школы тэорыі дзяржавы і права, гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага права і інш.

Беларускімі тэарэтыкамі права у апошнія гады былі выдадзены навучальныя дапаможнікі і падручнікі па агульнай тэорыі дзяржавы і права, у якіх з улікам сучаснага беларускага заканадаўства выкладзены сутнасць, заканамернасці і прынцыпы інстытутаў дзяржавы і права, дадзена характарыстыка канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзян рэспублікі. Асобныя праблемы тэорыі дзяржавы і права разглядаліся ў працах С.Драбязкі, А.Вішнеўскага, У.Кучынскага, М.Сільчанкі, А.Цікавенкі і іншых навукоўцаў. Вобласцю навуковых інтарэсаў С.Г.Драбязкі былі распрацоўка прававых асноў кіравання эканомікай, прынцыпаў і перадумоў станаўлення сацыяльнай дзяржавы.

А.Ф.Вішнеўскім падрыхтавана манаграфія «Палітыка-прававы рэжым савецкай дзяржавы (1917-1953)», у якой упершыню ў беларускім дзяржавазнаўстве даследуюцца праблемы паняцця і сутнасці палітыка-прававога рэжыму як элемента формы дзяржавы; станаўленне і ўмацаванне таталітарнага рэжыму ў савецкай дзяржаве; дзяржаўна-палітычнага кантролю як фактару ўмацавання таталітарнага рэжыму. У.А.Кучынскі займаецца праблемамі юрыдычнай адказнасці, канстытуцыйнага кантролю, месцам

Канстытуцыйнага Суда ў прававой дзяржаве. А.В.Матусевіч у кнізе «Палітычная сістэма. Становішча і развіццё» (1992) даследуе асноўныя тэндэнцыі развіцця палітычнай сістэмы сучаснага беларускага грамадства і высоўвае рад прапаноў па каардынацыі дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, нацый, народнасцей па рэалізацыі асноўных задач дзяржаўнай палітыкі.

У працах М.В.Сільчанкі асноўная ўвага надаецца праблеме тэорыі закона, яго вяршэнству ў сістэме нарматворчасці прававой дзяржавы. Праблемам аўтарытэта дзяржаўнай улады прысвечаны працы А.Г.Цікавенкі. Згодна з яго пунктам гледжання, умацаванню аўтарытэту дзяржаўнай улады можа садзейнічаць сацыяльна-палітычны дагавор большасці народа з дзяржаўнымі органамі і службовамі асобамі.

Да 80-90-х гадоў XX ст. адносіцца найбольш поўнае і паслядоўнае развіццё гісторыка-прававых даследаванняў, асабліва гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Буйным дасягненнем беларускай прававой культуры было перавыданне ў 1989 гаду Статута Вялікага княства Літоўскага 1588г., а таксама Статута Вялікага княства Літоўскага 1566г. у 2003г. У гэтай працы прынялі ўдзел відныя беларускія гісторыкі, юрысты, лінгвісты. Каментарыі і тлумачэнні да Статутаў былі зроблены такімі спецыялістамі ў галіне гісторыі дзяржавы і права Беларусі як Т.Доўнар, Г.Дзербінай, А.Марыскіным, Л.Паулавай, У.Сатоліным, Г.Шумаком, С.Сокалам, Я.Юхо і інш. У апошняе дзесяцігоддзе праведзены сур'ёзныя даследаванні ў галіне феадальнага права Беларусі. Вывучэннем крыніц феадальнага права займаліся Я.Юхо, Т.Доўнар, Г.Дзербіна.

У кнізе прафесара Я.А.Юхо «Крыніцы беларуска-літоўскага права» дадзена характарыстыка нарматыўных актаў прывілейнага перыяду, Судзебніка Казіміра 1468 г. і Статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.

У выдадзеным у 2001 г. курсе лекцый «Помнікі права Беларусі феадальнага перыяду» прафесара Т.І.Доўнар даецца падрабязны аналіз асноўных перыядаў развіцця феадальнага права, аналізуецца ўзровень і тэндэнцыі развіцця прававой культуры беларускага народа. Інстытутам грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі (XV-XVI стст.) прысвечана манаграфія Т.І.Доўнар «Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV-XVI стагоддзях». У ёй надаецца ўвага эвалюцыі такіх інстытутаў грамадзянскага права, як рэчавае права, сервітуты, абавязацельнае, залогавае і спадчыннае права, разглядаюцца праблемы злачынства і пакарання ў іх гістарычным развіцці. Інстытуту сямейнага права прысвечана манаграфія Г.В.Дзербінай «Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу». У 2001 г. была выдадзена манаграфія Р.А.Васілевіча, Т.І.Доўнар, Я.А.Юхо «Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі». У ёй працэс развіцця канстытуцыйнага права выкладзены ў храналагічным парадку ад асобных нормаў, змешчаных у старажытных граматах, і да сучаснай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Аўтары даюць характарыстыку канстытуцыйным актам, змяшчаюць іх арыгінальныя тэксты і робяць каментарыі да іх. Цікавасць

даследчыкаў выклікала і праблема саслоўна-прадстаўнічых органаў старажытнай Беларусі - Вальнага Сойма і павятовых соймікаў. Значная работа ў гэтай галіне праводзіцца А.А.Радаманам.

Даследаванню мясцовых органаў кіравання і суда ў Беларусі пасля далучэння яе да Расійскай імперыі прысвечана кніга кандыдата юрыдычных навук В.А.Шаўкапляс «Судовыя органы ў Беларусі (канец XVIII - першая палова XIX стст.)». Вучонай таксама праведзена даследаванне сістэмы карных органаў Расійскай імперыі, характару буржуазных судоў, паліцыі і пенітэнцыянарнай сістэмы. Вынікам яго стала кніга «Карны апарат Расіі ў другой палове XIX стагоддзя» (Мн., 1994).

У апошнія гады праводзіліся даследаванні савецкага перыяду гісторыі дзяржавы і права. Надрукавана значная колькасць архіўных дакументаў, якія па-новаму асвятляюць паслякастрычніцкія падзеі. У 1993 г. у Гомелі былі выдадзены тры кнігі дакументаў пад агульным загалоўкам «Кастрычнік 1917 года і лёсы палітычнай апазіцыі», у якой змешчаны матэрыялы па гісторыі грамадскіх рухаў і партый, якія бралі ўдзел у аднаўленні беларускай дзяржаўнасці.

З манаграфічных даследаванняў, якія ўбачылі свет у 90-х гадах XX - пачатку XXI стст., трэба адзначыць кнігу А.А. Круталевіча «На шляхах нацыянальнага самавызначэння. БНР-БССР-РБ» (Мн., 1995), у якой дадзены аналіз канстытуцыйнаму будаўніцтву Беларусі на асноўных этапах фарміравання яе дзяржаўнасці, падрабязна разглядаюцца асноўныя прынцыпы, пакладзеныя ў змест Канстытуцыі 1994 г. А таксама яго ж манаграфію «Гісторыя Беларусі: станаўленне нацыянальнай дзяржаўнасці» (Мн., 1999), у якой прааналізаваны працэс станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржавы, унутраныя і знешнія фактары, якія мелі ўздзеянне на працэс самавызначэння беларускага народа ў 1918-1920 гг.

У апошнія гады быў пакладзены пачатак новаму навуковаму напрамку - гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Вынікам калектыўнай творчасці беларускіх гісторыкаў, юрыстаў, гісторыкаў літаратуры і культуры сталі энцыклапедычныя даведнікі «Мысліцелі і асветнікі Беларусі X-XIX стагоддзяў» (Мн., 1995) і «Асветнікі зямлі беларускай X - пачатку XX стст.» (Мн., 2001), у якіх дадзены біяграфічныя звесткі аб беларускіх дзяржаўных, грамадска-палітычных і рэлігійных дзеячах, філосафах, вучоных, дзеячах нацыянальна-вызваленчага руху, якія ўнеслі важкі уклад у скарбонку нацыянальнай і сусветнай культуры, у тым ліку палітыка-прававой думкі, аналізуюцца іх творы. Найбольш значныя даследаванні ў гэтай галіне юрыдычнай навукі належаць С.А.Падокшыну, С.Ф.Сокалу, В.Ф.Шалькевічу, П.Г.Чыгрынаву і інш.

Паспяхова развіваецца ў Рэспубліцы Беларусь навука грамадзянскага права. На сучаснае права, у тым ліку і грамадзянскае, уздзейнічаюць дзве тэндэнцыі, якія вызначаюць развіццё сусветнай цывілізацыі. Гэта тэндэнцыі да ўсеагульнай глабалізацыі, з аднаго боку, і імкнення да захавання нацыянальнай своеасаблівасці і адметнасці - з другога. Названыя тэндэнцыі з новай вастрынёй ставяць пытанне аб дыферэнцыяцыі права па галінах і іх

адзінстве. У межах грамадзянскага права адпаведна стаіць задача аб ўзроўні дыферэнцыяцыі і адзінства яго інстытутаў. Такім чынам, у сучаснай беларускай цывілістыцы на новым узроўні вырашаюцца пытанні аб паняцці грамадзянскага права, яго інстытутаў, аб новым разуменні яго сістэмы і зместу. Новы Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, у падрыхтоўцы якога прымалі актыўны ўдзел беларускія цывілісты, засноўваецца на маністычным падыходзе да разгляду маёмасных адносін бытавога і камерцыйнага характару. У той жа час шырокае развіццё заканадаўства ў галіне гаспадарчай дзейнасці ставіць пытанне аб неабходнасці ўліку індывідуальных асаблівасцей гэтай сферы грамадскіх адносін. Таму шэраг спецыялістаў у галіне грамадзянскага права лічаць лагічным прыняць Прадпрымальніцкі кодэкс, каб пакласці канец шматлікасці нарматыўных актаў у гэтай сферы. Такога пункту гледжання прытрымліваюцца Л.Г.Русак, В.Г.Камянкоў і інш. На думку іх апанентаў, непрадуманая структура такога кодэкса можа прывесці да сур’ёзных разыходжанняў паміж Грамадзянскім і Прадпрымальніцкім кодэксамі, да расхіствання адзінага правапрымянення.

Супраць распрацоўкі і прыняцця асобнага Прадпрымальніцкага кодэкса і выдзялення асобай галіны - гаспадарчага права - найбольш паслядоўна выступае В.Ф.Чыгір. Сістэмны разгляд комплексу вышэйадзначанай праблемы грамадзянска-прававой навукі ажыццяўляецца вядомым беларускім цывілістам У.А.Вітушкам у кнізе «Курс грамадзянскага права. Агульная частка» у двух тамах (Мн.,-2003).

Вялікі ўнёсак у даследаванне праблем грамадзянскага і працоўнага права зроблены прафесарам Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь Д.Л.Калбасіным. Ім падрыхтаваны шэраг падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па вышэйназванай тэматыцы: «Трудовое право» для студэнтаў ВНУ (2002), «Гражданское право» (общая часть)» (2000), «Гражданское право (особенная часть)»(2001), «Гражданское право (общая и особенная части)» (2003), манаграфія «Содержание трудового договора на современном этапе» (1990).

Беларускімі цывілістамі праведзены даследаванні асобных праблем і інстытутаў грамадзянскага права. Асаблівую вядомасць сярод юрыстаў-практыкаў набылі кнігі В.Ф.Чыгіра «Прыватызацыя жылля» (Мн., 1993), «Юрыдычныя асобы» (Мн., 1999), «Крэдыт і субсідыі на набыццё жылля» (Мн., 1996), В.Н.Гадунова «Прававое рэгуляванне нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі» (Мн., 1990), І.В.Паповай «Аўтарскае права» і інш.

Тэарэтычныя праблемы крымінальнага права знайшлі сваё адлюстраванне ў вучэбным дапаможніку «Крымінальнае права Беларусі: Закон, злачынства, адказнасць» (Мн., 1997), у падрыхтоўцы якога прымалі ўдзел А.У.Баркоў, І.А.Грунтоў, Т.І.Доўнар і інш., а таксама ў асобных манаграфіях І.С. і С.І.Цішкевічаў «Кваліфікацыя крадзяжу маёмасці» (Мн., 1996), А.А.Вішнеўскага і У.П.Шыянка «Расследаванне крымінальных спраў, звязаных з супрацьзаконным атрыманнем крэдытаў або датацый» (Мн., 2000) і інш.

Вельмі значны уклад у развіццё юрыдычнай навукі краіны ўнёс

заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь прафесар І.І.Басецкі. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны 7 дактароў і 32 кандыдаты юрыдычных навук. Па ініцыятыве І.І.Басецкага і пры яго непасрэдным удзеле ажыццяўляецца даследаванне больш 50 актуальных праблем, вынікі якіх накіраваны на ўзмацненне барацьбы са злачыннасцю, удасканаленне правятворчага працэсу, паляпшэнне дзейнасці органаў унутраных спраў. Ім падрыхтаваны 323 навуковыя працы, у тым ліку 17 манаграфій і 3 падручнікі. (Организованная преступность. Мн., 2001; Преступность: Опыт координации противодействия. Мн., 2002; Терроризм: Генезис явления и опыт противодействия. Мн., 2002; Предупреждение и раскрытие экономических преступлений. Мн., 1991; Оперативно-розыскная деятельность. Мн., 1994; Теория и практика оперативной работы. Мн., 2000 і інш.)

Тэарэтычным і практычным праблемам удасканалення судовай сістэмы і звязанага з ёй заканадаўства прысвечаны манаграфіі дактароў юрыдычных навук І.І.Марціновіча і М.Н.Пастухова «Судова-прававая рэформа ў Рэспубліцы Беларусь» (Мн., 1995), І.І.Марціновіча «Адвакатура Беларусі: Гісторыя і сучаснасць» (Мн., 2002), М.І.Пастухова «Рэабілітацыя невінаватых: Асновы прававога інстытута» (Мн., 1993). У апошняй даследуюцца асноўныя палажэнні інстытута рэабілітацыі, іх прымяненні на стадыі папярэдняга расследвання ў судах першай інстанцыі ў вышэйстаячых судах.

Такім чынам, з пачатку 1990-х гадоў з'яўляюцца значныя работы па ўсіх асноўных галінах прававой навукі, ідзе стварэнне нацыянальных школ розных напрамкаў юрыспрудэнцыі» [7, с. 258-267].

*Пытанні 2, 3, 4 лекцыі састаўлены на падмурку матэрыялу выкладзенага ў вучэбным дапаможніку: Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.устаноў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.*

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь: Дэкларацыя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 27 ліп. 1990 г. // Дагавары і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права: дапаможнік / склад. Я. Юхо [і інш.]. – Мн.: БДУ, 2000. – С. 252-256.

2. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lib.by/abdziralovic/. – Дата доступа: 21.03.2005.

3. Абрамовіч, А.М. Канстытуцыйная рэформа: праблемы і перспектывы / А.М. Абрамович // Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. \Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1996. - №3 – С. 81-84.

4. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж. Берман; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624 с.

5. Василевич, Г.А. Конституционные нормы и принципы как основа национальной правовой системы / Г.А. Василевич // Конституция Республики Беларусь – основа преобразования государства и общества (к 10-летию Основного Закона): материалы респ. науч. конф., Минск, 3 марта 2004г. / Бел. гос. университет; редкол.: Г.А. Василевич [и др.]. – Мн.: БГУ, 2004. – С. 3-17.

6. Василевич, Г.А. Конституционные принципы и нормы – важнейшие составляющие законодательного регулирования общественных отношений / Г.А. Василевич // Вестник ПГУ. Серия D. Экономические и гуманитарные науки. – 2004. - №7.- С. 1-7.

7. Вішнеўская І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш.навуч.установў/ І.У.Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.

8. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дап. / А.Ф.Вішнеўскі. – Мн.: Акад.МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319с.

9. Дробязко, С.Г. Общая теория права: учеб. пособие / С.Г. Дробязко, В.С. Козлов. – Мн.: НО ООО «БИП-С», 2003. – 336 с.

10. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканском референдуме 24 ноября 1996 г.). – Мн.: Амалфея, 2003. – 48 с.

11. Лукашенко, А.Г. Государство для народа: Доклад Президента А.Г.Лукашенки на третьем Всебелорусском народном собрании / А.Г.Лукашенко // Советская Белоруссия. – 2005. – 3 марта. - №42. – С. 1-12.

12. Лукашук, И.И. Глобализация, государство, право, XXI век / И.И. Лукашук. – М.: Спарк, 2000. – 279 с.

13. О концепции совершенствования законодательства Республики Беларусь: Указ Президента Респ. Беларусь, 10 апр. 2002 г., N 205 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. - №46. – 1/3636.

14. О концепции судебно-правовой реформы: Постановление Верховного Совета Республики Беларусь, 23 апреля 1992г. // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь, - 1992. - N 16. - ст. 270.

15. О национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь / Закон Республики Беларусь от 6 октября 1994 г. N 3277-XII // Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/webnpa/text_txt.asp?RN=V19403277. – Дата доступа: 25.08.2006.

16. О товарных знаках и знаках обслуживания/ Закон Республики Беларусь от 5 февраля 1993 г. № 2181-XII // Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2005. – Режим доступа: http://pravo.by/webnpa/text_txt.asp?RN=V19302181. – Дата доступа: 21.05.2005.

17.Об утверждении Основных направлений социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996-2000 годы: Указ Президента Республики Беларусь, 14 ноября 1996г. №464 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь". – 1996. - N 32. - ст. 829.

18.Об утверждении Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2001-2005 годы: Указ Президента Республики Беларусь, 8 августа 2001г., №427 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2006.

19.Основные положения Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2006-2010 годы // Президент Респ. Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/press28530.html#doc . – Дата доступа: 25.09.2006.

20.Основы идеологии белорусского государства: учебное пособие для вузов / С.Н. Князева, С.В. Решетникова; под общ. ред. С.Н. Князева, С.В. Решетникова. – Мн.: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – 491 с.

21.Полякова, Н.Л. XX век в социологических теориях общества / Н.Л. Полякова. – Москва: Логос, 2004. – 384 с.

22.Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: монография / Я.Г. Риер. - Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. – 154 с.

23.Рубинов, А. Еще раз об идеологии / А. Рубинов // Советская белоруссия. – 2006. – 28 июля. - №140. - С. 4-5.

24.Рудкоўскі, П. Ад ідэнтычнасьці да саборнасьці. Пара зацемак з нагоды дыскусіі вакол беларускай тоеснасьці / П. Рудкоўскі // ARCHE Пачатак. - 2006. - №1-2. - С. 62-68.

25.Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь от 15 декабря 1998 г. №219-З // Ведомости Национального Собрания Республики Беларусь. – 1999. - №13-14.

26.Шпарага, О. Поиск идентичности в контексте пограничья: белорусская версия / О. Шпарага. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.belintellectuals.com/community.phd?id=48. – Дата доступа: 27.10.2005.

27.Яскевич, Я.С. Основы идеологии белорусского государства: мировоззренческие ценности и стратегические приоритеты: учеб.-метод. пособие / Я.С. Яскевич.- Мн.: РИВШ БГУ, 2003. – 360 с.

## ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ, КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

### Тэма 1-2. Прадмет, задачы і праблемы перыядызацыі гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Палітычная і прававая думка на землях Беларусі ў IX - пачатку XIII ст.

*Семінар 1.*

1.1. Прадмет гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.
1.2. Праблемы вызначэння прадмета дысцыпліны.
1.3. Задачы гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі
1.4. Крыніцы па гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі.
1.5. Перыядызацыя гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі. Яе асаблівасці.
2.2. Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі XI - пачатку XIII ст.
2.3. Прыняцце хрысціянства. З’яўленне царкоўна-палітычнай ідэалогіі.
2.4. Сутнасць ідэалогіі цэзарапапізму.
2.5. Зараджэнне палітыка-прававой думкі на старажытнабеларускіх землях.
2.6. Грамадска-палітычныя погляды Ефрасінні Полацкай.
2.7. Грамадска-палітычныя погляды Клімента Смаляціча.
2.8. Грамадска-палітычныя погляды Кірылы Тураўскага.
2.9. Палітычныя ідэі старажытнарускіх летапісаў.

*Першакрыніцы:*


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005. – 1015 с.
2. Аповесць мінулых гадоў // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
3. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997.
4. Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1.
5. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т.1.
6. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд: вучэбны дапаможнік. Мн., 1997.
7. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206с.
8. Дагаворы і граматы як крыніца беларускага феадальнага права. Мн., 2000.

9. Жыціе Еўфрасінні Полацкай (або «Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еуфрасінні») // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.; тое ж // Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994. С. 25–41; http://starbel.narod.ru/zhytyefr.htm
10. Жыціе Кірылы Тураўскага. // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.; тое ж. http://starbel.narod.ru/zhytkirtur.htm
11. Кирилл Туровский. [Собрание из 68 сочинений]. // Мельнікаў А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі. Жыццё, спадчына, светапогляд. 2-е выд., Мн., 2000. – http://starbel.narod.ru/kirtur/kt_gal.htm
12. Кірыл Тураўскі. Слова на антыпасху. Слова ў Нядзелю кветную. Слова на Сабор 318 святых айцоў. Прытча пра душу і цела Слова, каб не забывалі настаўнікаў сваіх. Малітвы. // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
13. Кірыла Тураўскі. Притча о человеческой души и о телеси // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
14. Клімент Смаляціч. Пасланне да Фамы прасвітара // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
15. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура: падручнік / А.А.Лойка. – Мн.: Выш.шк., 2001. – 319 с.
16. Памяць святога айца нашага Кірыла, епіскапа Тураўскага // Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994.
17. Повесть временных лет. // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.; тое ж. – перевод Д.С. Лихачева – http://old-russian.chat.ru/01povest.htm
18. Слово о полку Игореве // // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.

*Літаратура:*

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.lib.by/abdziralovic/. – Дата доступа: 21.03.2005.
2. Акудовіч В. Разбурыць Парыж: два няспраўджаныя эсэ / В. Акудовіч. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://knihi.com/frahmenty/9akudovich.htm. – Дата доступу: 21.12.2007.
3. Алексеев Л.В. Полоцкая земля в IX – XIII вв. М., 1966.
4. Арлоў У. Еўфрасіння Полацкая. Мн., 1992.
5. Асвета і педагагічная думка Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1985.
6. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага/ Ю.Бардах/ Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
7. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ Г.Дж.Берман/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.
8. Вишневский А.Ф., Лукошко И.В. Крещение Белой Руси: особенности и последствия. Мн., 1992.
9. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў/ І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
10. Гісторыя філасофіі: вучэб. дапам. для ВНУ / Ч.С. Кірвель [і інш.]; ГрДУ імя Я.Купалы; пад рэд. праф. Ч.С. Кірвеля. - Гр.: ГрДУ, 1997. – 917 с.
11. Громов М.Н., Козлов И. С. Русская философская мысль X–XVII веков. М.,1980.
12. Еремян, В.В. Государственный строй Древней Руси как сочетание полисной демократии и княжеской власти / В.В.Еремян// Право и политика. – 2004. - №2. – с.85-126.
13. Еремян, В.В. Некоторые особенности возникновения древнерусской государственности: от общины родовой к общине территориальной. Часть 1/ В.В.Еремян // Право и политика. – 2002. - №7. – с.91-126.
14. Еремян, В.В. Некоторые особенности возникновения древнерусской государственности: от общины родовой к общине территориальной. Часть 2// Право и политика. – 2002. - №8. – с.116-127.
15. Ермаловіч М. Сведчанні «Слова...» //Спадчына. 1990. № 2.
16. История политических и правовых учений: учебник / О.Э. Лейст [и др.]; под ред. О.Э. Лейста. – М.: Изд-во Зерцало, 2000. – 688 с.
17. Конан Ул. «Паче всех воссиявший...» // Крыніца. 1994. № 7 (1).
18. Лягчылін А.А. Метадалагічны дыскурс філасофскай традыцыі на Беларусі / А.А. Лягчылін, І.М. Бабкоў // Ноумен: сб. науч. работ по философии и социальным наукам. Вып. 6 / ред. совет: А.И.Зеленков (пред.) [и др.]; редкол.: А.В.Рубанов (гл.ред.) [и др.]. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2006. – с.6-19.
19. Майхрович А.С. Поиск истинного бытия и человека: Из истории философии и культуры Беларуси. Мн, 1992.

20.Мельнікаў А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі, Жыццё. Спадчына. Светапогляд. Мн., 1997; 2-е выд., Мн., 2000.
21.Мельнікаў А. «Жыціе» і жіцце Еўфрасінні, ігуменні Полацкай // Адраджэнне. Гіс-тарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.
22.Мельнікаў А. «Тураўскі златавуст» // Спадчына. 1990. № 2.
23.Надсан А. Святы Кірыла Тураўскі // Спадчына. 1996. № 1–2.
24.Полякова, Н.Л. XX век в социологических теориях общества / Н.Л. Полякова. – Москва: Логос, 2004. – 384 с.
25.Тарасаў С. Хрышчэнне Полацкай зямлі // Спадчына. 1990. № 3.
26.Фроянов И.Я. Киевская Русь. Л., 1980.
27.Шалькевич В.Ф. Евфросинья Полоцкая // Женщины-легенды. Мн., 1993.
28.Шалькевіч В. Еўфрасіння Полацкая // Полацак (Кліўленд, ЗША). 1994. № 4.
29.Шалькевіч В.Ф. Філасофская думка Беларусі. Мн., 1976.
30.Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248 с.
31.Штыхаў Г. В. Вытокі беларускай дзяржаўнасці // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1.
32.Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Мн., 1974.
33.Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.
34.Юхо Я.А. Паходжанне дзяржавы на Беларусі // Спадчына. 1990. № 4.

**Тэма 3. Палітычная і прававая думка Беларусі XIV-XV ст.**

*Семінар 2.*

1. Перадумовы фармавання палітычнай і прававой думкі на землях Беларусі ў XIV-XV ст.
2. Характар палітычнай і сацыяльнай сістэмы ў перыяд палітычна-тэрытарыяльнай кансалідацыі беларуска-літоўскіх земляў у Вялікім княстве Літоўскім.
3. Прыняцце каталіцызму. Сутнасць ідэалогіі папства (папацэзарызму), асаблівасці яе ўплыву на землях Беларусі.
4. Палітычныя ідэі сярэднявечных ерасяў у ВКЛ.
5. Праграма стварэння аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў ВКЛ і яе рэалізацыя.
6. Царкоўна-палітычная дзейнасць і грамадска-палітычныя погляды Р.Цамблака.
7. Палітыка-прававое значэнне рэлігійнай уніі хрысціянскай царквы для дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага XIV–XV стст.
8. Палітычныя ідэі «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх».
9. Палітычныя ідэі «Беларуска-літоўскага летапіса 1446 г.».
10. Палітычныя ідэі «Хронікі Быхаўца».

*Першакрыніцы:*


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005. – 1015 с.
2. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. – http://bk.knihi.com/letapisy/
3. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзен): вучэб.дапаможнік/ А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо; пад рэд. А.Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд., дап. – Мн.: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 320 с.
4. Грыгорый Цамблак. Слова пахвальнае Яўфімію Тырнаўскаму. Слова на Узвіжанне святога крыжа // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
5. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права. Мн., 2000.
6. Летапіс вялікіх князеў літоўскіх // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.; тое ж. // Спадчына. 1991. № 1–5.
7. Летапісная аповесць пра князеў Міндоўга, Войшалка, Тройдзеня // Спадчына. 1990. № 3, 4.
8. Пахвала вялікаму князю Вітаўту // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
9. Полное собрание русских летописей. Т. 32. Хроника Литовская и Жмойтская. Хроника Быховца. Баркулабовская летопись. Летопись Аверки и Панцырного.– М., 1975. – http://izbornyk.narod.ru/index.html; http://izbornyk.narod.ru/psrl3235/; http://starbel.narod.ru/razn/barkulab.htm; http://starbel.narod.ru/razn/pancern_averko.htm
10. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи белорусско–литовские. Никифоровская летопись. Супрасльская летопись. Слуцкая летопись. Виленская летопись. Летопись Арх. общества. Академическая летопись. Волынская краткая летопись. Летопись Красинского. Летопись Рачинского. Ольшевская летопись. Румянцевская летопись. Евреиновская летопись. Могилёвская хроника Сурты и Трубницкого. М., 1980. – http://izbornyk.narod.ru/index.html; http://izbornyk.narod.ru/psrl3235/; http://www.history.univ.kiev.ua/letopis/
11. Хроника Быховца. М., 1966. – http://starbel.narod.ru/byh.htm; http://www.vostlit.narod.ru/

12.Хроніка Быхаўца // Полымя 1993. № 10–12. – http://txt.knihi.com/bk/letapisy/letapisy5.html

*Літаратура:*

1. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
2. Бардах, Ю., Линодорский, Б, Пиетрчак М. История государства и права Польши /Пер. С польск. – М.: "Юрид.лит.", 1980. – 560с.
3. Бегунов Ю.К. К вопросу о церковно-политических планах Григория Цамблака // Советское славяноведение. 1981. № 3.
4. Берман, Г.Дж. Западная традиция права: эпоха формирования/ пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Изд-во МГУ: Издательская группа ИНФРА-М – НОРМА, 1998. – 624с.
5. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
6. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
7. Горина Л. «Похвальное слово Евфимию Тырновскому» Григория Цамблака как исторический источник // Славянские культуры и Балканы. IX – XVII вв. София, 1978.
8. Грицкевич А. Положение православной церкви в Беларуси в XIV–XVI вв. (до Люблинской унии 1569) // Христианизация Руси и белорусская культура. Мн., 1988.
9. Дончева-Панайотова Н. «Похвальное слово Киприану» Григория Цамблака как произведение древнеболгарской и древнерусской литературы // Болгарская русистика. 1980. № 1.
10. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. Мн., 1994.
11. Из истории свободомыслия и атеизма в Беларуси. Мн., 1978.
12. Казакова Т. Уніяцкія ідэі ў Вялікім княстве Літоўскім пачатку XV ст. // З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі). Мн., 1996.
13. Казбярук У. Гедымін у летапісах // Спадчына. 1992. № 5.
14. Каллиганов И. Новая попытка реконструкции биографии Григория Цамблака // Советское славяноведение. 1983. № 1.
15. Католицизм в Белоруссии: традиционализм и приспособление. Мн., 1987.
16. Марзалюк, І. Наша «кіеўская» й «літоўская» спадчына / І.Марзалюк // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступа: 20.09.2007.
17. Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Мн., 1990.
18. Мартос А. Літоўска-Новагародская мітраполія // Спадчына. 1992. № 6, 1993. № 1.

19.Нікалаеў,М. Пачаткі кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага / М.Нікалаеў // Спадчына. – 2002. - №5-6. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/spadczyna/2002-5-6/02.htm. – Дата доступа: 20.09.2007.

20.Озолин Л.И. Из истории гуситского революционного движения. Саратов, 1962.

21.Падокшын С.А. Гусізм і грамадскі рух Беларусі і Літвы XV – XVII ст. // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1967.

22.Падокшын, С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура (філасофска-гістарычны аналіз) / С.А.Падокшын. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 111с.

23.Прыгодзіч М. Беларускія летапісы // Роднае слова. 1993. № 5.

24.Риер, Я.Г. Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа: Монография. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2003. – 154с.

25.Розин, В.М. Генезіс права: методологический и культурологический анализ. – М.: NOTA BENE Медиа Трейд Компани, 2003. – 336с.

26.Розин, В.М. Становление права в культуре средних веков // Право и политика. – 2003. - №9. – с.126-136.

27.Семянчук А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі. Гродна, 1999. - http://kamunikat.net.iig.pl/www/knizki/historia/siemienczuka/letapisy/letapisy_spis.htm.

28.Чамярыцкі В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў. Мн., 1969.

29.Яцук В. У истоков белорусской философии // Философия и научный коммунизм. Мн., 1982. Вып. 9.

**Тэма 4-5. Палітычныя і прававыя погляды беларускіх гуманістаў (Ф.Скарына, М.Гусоўскі, М.Літвін, Л.Сапега). Палітычная і прававая думка эпохі Рэфармацыі ў Беларусі.**

*Семінар 3.*

1.1. Перадумовы і асаблівасці фармавання палітычнай і прававой думкі эпохі Рэнесансу на Беларусі.

1.2. Палітычныя і прававыя погляды Ф.Скарыны.

1.3. Палітычныя і прававыя погляды М.Гусоўскага.

1.4. Палітычныя і прававыя погляды Міхалона Літвіна.

1.5. Прававыя ідэі Льва Сапегі.

2.1. Палітычная і прававая думка пратэстантызму. Яе асаблівасці на беларускіх землях.

2.2. Палітычныя погляды прадстаўнікоў лютэранства. А.Кульва.

2.3. Асноўныя прычыны папулярнасці кальвінскіх ідэй. Дзяржаўныя і палітычныя погляды Мікалая Радзівіла Чорнага.

2.4. Палітычныя і прававыя погляды Андрэя Волана.

2.5. Раскол кальвінісцкага руху, з’яўленне антытрынітарызму ў ВКЛ. Два напрамкі антытрынітарызму.

2.6. Палітычныя і прававыя погляды правага крыла аптытрынітарыяў. Палітычныя і прававыя погляды Сымона Буднага.

2.7. Палітычныя ідэі ў творчай спадчыне Васіля Цяпінскага.

2.8. Палітычныя і прававыя погляды радыкальнага крыла антытрынітарыяў (П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі і інш.).

*Першакрыніцы:*


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005. – 1015 с.
2. Біблія. Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзеннай Ф. Скарынай ў 1517–1519 гг. Мн, 1990–1991. Т. 1–3.
3. Будны С. Аб свецкай уладзе. З «Пасвячэння» // Мысліцелі і асветнікі Беларусі X – XIX ст. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.
4. Будны С. Творы – http://starbel.narod.ru/razn/spravka_bud.htm
5. Будны Сымон. О светской власти // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – нач. XIX в. Мн., 1962.
6. Будны Сымон. Прадмова да „Катехізіса”// Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Мн., 1991; тое ж: Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
7. Волан А. Аб палітычнай або грамадзянскай свабодзе // Культура. 15 чэрвеня 1994. С. 10–11.
8. Волан А. Да палякаў і да ліцьвінаў. // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
9. Волан А. О государе и его личных добродетелях // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. Мн., 1991.
10. Волан А. Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці // Мысліцелі і асветнікі Беларусі X–XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.
11. Волан А. Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці // Спадчына. 1991. № 6. С. 95–104; 1992. № 1.; Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.
12. Волан А. Прамова да Сената Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага, або якім павінна праўленне дабрачыннага караля (1573) //

– www.kamunikat.net.iig.pl/; тое ж. // Фрагмэнты. № 10. – www.frahmenty.knihi.com/10volan.htm

13. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд: вучэбны дапаможнік. Мн., 1997.

14. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI-XVIII ст.ст.: хрэстаматыя / Аўт.-склад. Т.І.Доўнар, Ю.П.Доўнар, Л.Л.Голубева; Пад рэд. Т.І.Доўнар. – Мн.: БДУ, 2004.- 206с.

15. Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мн., 1980 (і іншыя годы выдання); тое ж. – http://starbel.narod.ru/hus.htm

16. Литвин Михалон. О нравах татар, литовцев и москвитян. М., 1994; тое ж. Михалон Литвин. О нравах татар, литвинов и москвитян. – http://www.vostlit.narod.ru/haupt-Dateien/index-Dateien/L.htm

17. Сапега Л. Зварот да ўсіх саслоўяў Вялікага княства Літоўскага //Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989.

18. Сапега Л. Лісты // Спадчына. 1998. № 2.

19. Сапега Л. Письмо... Юзафату Кунцевичу от 12 марта 1622 г. // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. Мн., 1991.

20. Скарына Ф. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мн., 1988.

21. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. / Уступ, падрыхт. тэкстаў А.Ф. Коршунава. Мн., 1990. – http://starbel.narod.ru/skaryna.htm

22. Статут Великого княжества Литовского 1529 года (Текст, перевод и словарь-комментарий) / Минск. АН БССР; под ред. К.И. Яблонского. – Минск: Изд-во Акад. Наук БССР, 1960. – 253 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vostlit.narod.ru/Texts/Dokumenty/Litva/XVI/1520-40/Statut1529/text1.htm . – Дата доступа: 11.07.2005.

23. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. Мн., 2003. – http://litopys.org.ua/statut2/st1566.htm

24. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. – www.starbel.narod.ru/statut1588

25. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Мн., 2002.

26. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989.

27. Хроніка Быхаўца. // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. Імя Я.Купалы; падрыхт. А.І.Богдан і [інш]; навук.рэд. В.А.Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мн.: Бел.навука, 2005.

28. Цяпінскі Васіль. Прадмова да Евангелля. – http://starbel.narod.ru/tiap.htm

*Літаратура:*

1. Bardach J. Elity Wielkiego Księstwa Litewskiego a polski przekład De Respublica Emendanda Andrzeja Frycza Modrzewskiego // Kultura staropolska – kultura europejska. Prace ofiarowane J. Tazbirowi w 70-tą rocznicę urodzin. W., 1997.
2. Bardach J. Statuty litewskie w ich kręgu prawno-kulturowym // Bardach J. O dawniej i niedawniej Litwie. Poznań, 1988.
3. Банькоўскі-Цюліг М. Студэнты і студэнткі з Беларусі ў швейцарскіх універсітэтах (XVI– пач.XX стст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 4.
4. Бардах Ю. Литовские статуты – памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI веке. М., 1976.
5. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага / Пер. М.Раманоўскага, А.Істоміна; Прадм. Г.Сагановіча. – Мінск, 2002. – 459с.
6. Бардах, Ю., Линодорский, Б, Пиетрчак М. История государства и права Польши /Пер. С польск. – М.: "Юрид.лит.", 1980. – 560с.
7. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: дапамож. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / І.У. Вішнеўская. – Мн.: Тэсей, 2004. – 272 с.
8. Галенчанка Г.Я. Васіль Цяпінскі – паслядоўнік скарынінскай справы // 450 год беларускага кнігадрукавання. Мн., 1968.
9. Галенчанка Г.Я. Сымон Будны. Васіль Цяпінскі // Славутыя імены Бацькаўшчыны. Мн., 2000.
10. Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993.
11. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф.Шалькевіч. – Мн.: Маладзежнае навуковае супрацоўніцтва, 2002.- 248с.
12. Грыцкевіч А. Леў Сапега // Славутыя імены Бацькаўшчыны. Мн., 2000.
13. Дварчанін І.С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мн., 1991.
14. Дзербіна Г. В. Права і сям'я Беларусі эпохі Рэнесансу. Мн., 1997.
15. Дзербіна Г.В. Статуты Вялікага княства Літоўскага як праява прававой культуры Рэнесансу // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый" (Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 22). Мн., 2001.
16. Дзербіна Г.В. Тэндэнцыі Адраджэння у сярэднявяковым праве Беларусі // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1987. № 1.
